ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
«ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА»
ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ»
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»
УСТАНОВА КУЛЬТУРЫ «ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ»

ВІЦЕБСКІ КРАЙ

Т. 7

Матэрыялы VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай Году народнага адзінства

25 лістапада 2021 г., Віцебск

Мінск 2022

УДК 947(Р476.5)
ББК 63.3(4Беи-Вит)5
В54

Рэцэнзенты:
дырэктар Віцебскага філіяла ўстановы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны ўніверсітэт "МІПСА"», кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. Л. Дзядзінкін,
галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Д. В. Юрчак

Рэдакцыйная калегія:
Т. М. Адамян (гал. рэд.), В. М. Камендантава, Л. І. Рагачова, В. М. Аўсяннікава, А. М. Васілеўская, Н. В. Фенчанка

Віцебскі край : матэрыялы VII Міжнароднай навукова-практычнай
В54 канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай Году народнага адзінства, 25 лістапада 2021 г., Віцебск / Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Кафедра гісторыі і культурнай спадчыны, Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» ; рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2022. – Т. 7. – 623, [1] с.
ISBN 978-985-7293-04-9.

У т. 7 штогадовага выдання «Віцебскі край» увайшлі матэрыялы VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай Году народнага адзінства, якая адбылася 25 лістапада 2021 г. у ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна».

Выданне адрасавана гісторыкам, музейным супрацоўнікам, архівістам, краязнаўцам, бібліятэкарам, педагогам, усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

УДК 947(Р476.5)
ББК 63.3(4Беи-Вит)5

ISBN 978-985-7293-04-9

© Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», 2022
© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2022

ПРАДМОВА

25 лістапада 2021 г. у ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» адбылася VII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край», прысвечаная Году народнага адзінства. Яе арганізатарамі выступілі Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава, Віцебскі абласны краязнаўчы музей.

Для ўдзелу ў канферэнцыі было пададзена каля 100 заявак ад краязнаўцаў, гісторыкаў, супрацоўнікаў архіваў, музеяў, бібліятэк, вышэйшых навучальных устаноў з Беларусі, Польшчы, Расіі. Сярод беларускіх удзельнікаў канферэнцыі былі прадстаўнікі з Мінска, Віцебска, Полацка, раённых цэнтраў Віцебскай вобласці. Пленарнае пасяджэнне канферэнцыі было прысвечана гістарычным вытокам Дня народнага адзінства. Шырокая тэматыка прадстаўленых дакладаў закранала разнастайныя пытанні гісторыі Беларусі, гісторыі мастацтва, літаратуразнаўства і фальклору, краязнаўства.

У т. 7 штогадовага выдання «Віцебскі край» увайшлі матэрыялы VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край». Матэрыялы дакладаў публікуюцца ў аўтарскай рэдакцыі, меркаванні аўтараў могуць не супадаць з меркаваннем рэдкалегіі. У зборніку матэрыялаў канферэнцыі захаваны аўтарскі парадак спасылак у бібліяграфічных спісах літаратуры да артыкулаў.

Выданне адрасавана гісторыкам, музейным супрацоўнікам, архівістам, краязнаўцам, бібліятэкарам, педагогам, усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

Дулаў А.М. *(г. Віцебск)*

ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЫТОКІ ДНЯ НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

17 верасня 2021 г. Рэспубліка Беларусь адзначыла новае свята – Дзень народнага адзінства. Дата была абрана невыпадкова: менавіта ў гэты дзень у 1939 г. пачаўся вызваленчы паход Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, вынікам якога стала ўз'яднанне беларускага народа ў межах адзінай дзяржавы, што мела выключнае гістарычнае значэнне. Мэта дадзенай працы – раскрыць гістарычныя вытокі Дня народнага адзінства.

Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. У 1918 г. была адноўлена незалежная Польская дзяржава, улады якой імкнуліся да адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. (да першага падзелу). Неўзабаве была распачата польска-савецкая вайна, выніковую кропку ў якой паставіў Рыжскі мірны дагавор. Ён быў падпісаны ў сакавіку 1921 г. паміж РСФСР і УССР з аднаго боку і Польшчай – з другога. Ад імя Савецкай Беларусі дагавор падпісала РСФСР. Паводле II артыкула дагавора да Польшчы адышлі беларускія землі з насельніцтвам звыш 3 млн чалавек, з якіх больш за 70% складалі этнічныя беларусы. Рыжскі мір фактычна ўзаконіў захоп Польшчай значнай часткі беларускіх і ўкраінскіх земляў.

За далучанымі да Польшчы беларускімі землямі замацавалася неафіцыйная назва «Заходняя Беларусь». У польскіх жа дакументах гэтыя тэрыторыі абазначаліся назвай «Крэсы ўсходне» (усходнія ўскраіны II Рэчы Паспалітай). Беларускія землі былі падзелены на чатыры ваяводствы: Палескае, Навагрудскае, Беластоцкае і Віленскае. Да апошняга належалі і землі сучаснай Віцебшчыны. Паводле дзеючага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу гэта Браслаўскі, Глыбоцкі, Мёрскі, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі раёны і большая частка Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці.

Польскія ўлады разглядалі анексіраваныя беларускія землі фактычна як аграрна-сыравінны прыдатак цэнтральнага і заходняга рэгіёнаў Польшчы і абмяжоўвалі іх развіццё. Звыш 80% насельніцтва Заходняй Беларусі было занята ў сельскай гаспадарцы. Сяляне пакутавалі ад беззямелля і малазямелля, падатковага прыгнёту і свавольства чыноўнікаў. Вялікая разбежка была ў кошце на прамысловыя тавары шырокага ўжытку (запалкі, соль, газа, тытунь) і танную сельскагаспадарчую прадукцыю. Буйныя зямельныя ўладанні знаходзіліся ва ўласнасці памешчыкаў, у той час як большасць сялянскіх гаспадарак мела надзел ад 2 да 10 га. Беззямельныя і малазямельныя сяляне наймаліся падзёншчыкамі, арандавалі зямлю, ішлі працаваць на лесараспрацоўкі. Некаторыя ў пошуках лепшай долі выязджалі за мяжу – у Заходнюю Еўропу, ЗША, Канаду, Паўднёвую Амерыку. Па розных падліках у 1921–1939 гг. з Заходняй Беларусі выехалі ад 120 да 150 тыс. чалавек [3, с. 169].

Аграрная рэформа, якая праводзілася ў польскай дзяржаве, паспрыяла пераадоленню феадальных пережыткаў і павысіла эфектыўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці. Аднак моцна ўдарыў па сельскагаспадарчай галіне сусветны эканамічны крызіс. У 1934–1938 гг. назіралася ажыўленне. Ураджайнасць збожжавых дасягнула 10–12 ц/га. Вырасла пагалоўе буйной рагатай жывёлы і свіней. У 1937–1938 гг. па ўраджайнасці збожжа Заходняя Беларусь дасягнула ўзроўню Францыі, ураджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур была вышэй, чым у ЗША [2, с. 358].

Тым не менш большасць сялян не сталі заможнымі. На іх стале звычайнымі стравамі былі бульба, капуста, хлеб, рыба, зрэдку мяса. А неўраджаі пачатку 1930-х гг. выклікалі нават хвалі масавага голаду. Сялянская гаспадарка ў значнай ступені захоўвала натуральны характар – у ёй вырабляліся ўсе неабходныя рэчы (абутак, адзенне, хатнія і гаспадарчыя прылады) (Дадатак 1, фота 1, 2).

Пераважная большасць прамысловых прадпрыемстваў Заходняй Беларусі былі дробнымі, на іх працавала ад 5 да 20 рабочых. 2/3 прадпрыемстваў і рабочых прыходзіліся на долю харчовай прамысловасці. Імкліва развівалася дрэваапрацоўка, асабліва выраб фанеры, што было звязана з эксплуатацыяй лясных багацця ў манаполіямі. Дарэчы, у выніку высечкі лясоў з 1921 па 1936 г. іх плошча зменшылася на 400 тыс. га [2, с. 354].

У цэлым тэмпы прамысловага развіцця Заходняй Беларусі былі значна ніжэйшымі, чым у БССР, дзе ажыццяўлялася індустрыялізацыя, у выніку чаго да канца 1930-х гг. рэспубліка з аграрнай ператварылася ў аграрна-індустрыяльную.

Прычым эканамічнае становішча рабочых у Заходняй Беларусі было значна горшым у параўнанні з цэнтральнай Польшчай. Нават за аднолькавую працу яны атрымлівалі куды меншы заробак. Пачасціліся выпадкі прымянення працы жанчын і падлеткаў, якім плацілі ў 2 разы меней, чым мужчынам. Дадайце сюды пераважна ручную працу, працягласць працоўнага дня ў 10–12 гадзін і адсутнасць тэхнікі бяспекі, антысанітарыю на прадпрыемствах, сістэму штрафаў. А падчас сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. паўстала і праблема беспрацоўя.

Нягледзячы на міжнародныя абавязацельствы паводле дадатковага пратакола да Версальскага трактата паміж Польшчай і краінамі Антанты, падпісанага ў 1919 г., і Рыжскага мірнага дагавора, а таксама на сакавіцкую Канстытуцыю Рэчы Паспалітай 1921 г., правы нацыянальных меншасцей пастаянна парушаліся. Здзяйснялася мэтанакіраваная палітыка паланізацыі і асіміляцыі беларускага насельніцтва.

Беларусы дыскрымінаваліся ў сферы працоўных адносін, дзе перавага аддавалася палякам. У сялян складваліся напружаныя адносіны з польскімі каланістамі-асаднікамі. Абмяжоўваліся грамадзянскія і палі-

тычныя правы беларусаў, якіх польскія ўлады атаясамлівалі з камуністамі. У прыватнасці, груба абмяжоўваліся выбарчыя правы працоўных.

Польскія памешчыкі пасля вяртання ў свае былыя маёнткі помсцілі сялянам за падтрымку савецкай улады. Пасля 1926 г., калі ў Польшчы быў усталяваны аўтарытарны рэжым «санацыі» («аздараўлення») Ю. Пілсудскага, рэпрэсіі ў дачыненні да камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных актывістаў набылі масавы характар. Паліцыя хапала людзей нават за падазрэнне ў прыналежнасці да кампартыі. Звычайнай з'явай стала збіццё ў паліцэйскіх участках. Падчас разгрому Беларускай сялянска-работніцкай грамады (у канцы 1926 – пачатку 1927 г.) былі арыштаваны 946 чалавек. Сотні беларускіх актывістаў былі кінуты ў турмы ў 1931–1932 гг. 116 з іх былі павешаны па прыгаворах надзвычайных судоў [2, с. 367]. Вельмі жорстка падаўляліся выступленні сялян. Фактычна здзяйсняліся карныя экспедыцыі, падчас якіх учыняліся масавыя расправы над людзьмі, знішчалася маёмасць сялян.

Сімвалам рэпрэсій стаў створаны ў 1934 г. канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай, праз які за час яго існавання прайшло каля 10 тыс. зняволеных, у тым ліку беларусы. Верагодна, польскія ўлады «натхніліся» вопытам нацысцкай Германіі, дзе ўжо дзейнічаў падобны лагер у Араніенбургу. У афіцыйных дакументах лагер называлі «лагерам ізаляцыі». Рашэнне аб ізаляцыі прымалася не судом, а грамадзянскай адміністрацыяй. Пры гэтым яно не падлягала абскарджанню. У адрозненне ад ГУЛАГа ў Бярозу-Картузскую накіроўвалі не на 10 ці 25 гадоў, а на тэрмін да 3 месяцаў. Але ствараліся нечалавечыя ўмовы дзеля таго, каб зламаць чалавека, знішчыць у ім асобу, пазбавіць нават думак аб барацьбе. А тэрмін мог бясконца працягвацца кіраўніцтвам лагера. Праўда, можна было хутка выйсці на волю праз публічнае пакаянне на старонках газет і падпісанне дэкларацыі аб адмове ад сваіх перакананняў (Дататак 1, фота 3, 4).

Камендантамі (надзіральнікамі) тут служылі сапраўдныя садысты і каты. Праходзіць праз вароты лагера зняволеных прымушалі на каленях, ім давалі нумары, якія нашываліся на адзенне, размовы паміж сабой забараняліся, перамяшчацца па лагеры можна было толькі бягом. Новых вязняў змяшчалі ў так званы каранцін, дзе зімой тэмпература была ніжэй нуля. Ён, як і карцар, быў значным выпрабаваннем. Днём вязні стаялі тварам да сцяны, а ўначы спалі на бетоннай падлозе. У каранціне людзі маглі знаходзіцца ад некалькіх дзён да двух-трох тыдняў. Вязняў прымушалі выконваць цяжкую і часта бессэнсоўную, прыніжальную фізічную працу. Асноўным сродкам падаўлення іншадумцаў было рэгулярнае збіццё, якое пачыналася з моманту прыбыцця ў лагер. Збівалі рукамі, нагамі, гумовымі і драўлянымі дубінкамі [гл.: 4; 5].

Зачыняліся беларускія школы, іх на 1938/1939 навучальны год не засталося ўвогуле [3, с. 169]. Польскіх школ, якія служылі інструментам паланізацыі, таксама не хапала, таму шмат беларускіх дзяцей, пераважна з вёскі,

заставаліся па-за адукацыяй. Забараняліся і канфіскоўваліся беларускія газеты і часопісы, за іх выданне штрафаваліся друкарні, зачыняліся клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні. У дзяржаўных установах не дазвалялася гаварыць па-беларуску. Зачыняліся праваслаўныя храмы.

Барацьба беларусаў за свае правы. Нацыянальны ўціск меў неадназначныя вынікі: адны беларусы пачыналі адносіць сябе да палякаў, у іншых наадварот адбываліся крышталізацыя і ўзмацненне беларускай нацыянальнай самасвядомасці, імкненне адстойваць свае правы. З самага пачатку 1920-х гг. распачаўся нацыянальна-вызваленчы рух, які першапачаткова набыў форму ўзброенай партызанскай барацьбы. Узначалілі яго беларускія эсэры і камуністы. Сацыяльную базу руху склалі сяляне, сельская інтэлігенцыя і рамеснікі. Найбольш вядомымі кіраўнікамі партызан сталі К. Арлоўскі, С. Ваўпшасаў, В. Корж. У адказ польскія ўлады ўзмацнілі паліцэйскі тэрор. Развівалася і легальная парламенцкая форма барацьбы, у польскім сейме ўзнікла фракцыя Беларускі пасольскі клуб.

На хвалі ўздыму вызваленчага руху ў 1923 г. была ўтворана як складовая частка польскай кампартыі Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), якая хутка набыла папулярнасць. Калі напачатку партыя налічвала звыш 500 членаў, то на 1927 г. – ужо звыш 3 тыс. Прычым прыкладна трэць з іх рэгулярна знаходзілася ў турмах. Праяўлялася тэндэнцыя збліжэння камуністычнага руху з беларускім нацыянальна-дэмакратычным, што выявілася ў стварэнні і дзейнасці масавай арганізацыі – Беларускай сялянска-работніцкай грамады (налічвала больш за 100 тыс. чалавек), разгромленай польскімі ўладамі. Культурна-асветнай працай з 1921 г. займалася Таварыства беларускай школы (ТБШ). Моцным быў уплыў КПЗБ на прафсаюзы, якія адстойвалі інтарэсы працоўных.

Чарговы ўздым нацыянальна-вызваленчага руху назіраўся ў другой палове 1930-х гг. Адказам стала новая хваля рэпрэсій. Ішлі масавыя судовыя працэсы, прыпынялася дзейнасць беларускіх культурніцкіх арганізацый, у прыватнасці ТБШ. Моцным ударам стаў роспуск Выканкамам Камінтэрна ў 1938 г. кампартыі Польшчы і яе складовых частак з-за беспадстаўных абвінавачанняў: быццам у кіраўніцтва партыі прасачыліся агенты дэфензівы. Раней, у 1936 г. у Мінску быў арыштаваны сакратар ЦК КПЗБ Іосіф Лагіновіч, якому двойчы (у 1938 і 1939 гг.) быў вынесены смяротны прысуд. Рэпрэсіям падвергліся і іншыя партыйныя работнікі, якія знаходзіліся ці былі выкліканы ў БССР. Гэта быў працяг рэпрэсій, распачатых у Савецкім Саюзе супраць удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі яшчэ ў 1933 г. Насілле наклала негатыўны адбітак і на працэс аб'яднання беларускага народа ў межах адзінай дзяржавы [3, с. 175–176].

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. 23 жніўня 1939 г. быў заключаны савецка-германскі дагавор аб ненападзе з дадатковым сакрэтным пратаколам, паводле якога германскія войскі не павінны былі перасякаць устаноўле-

ную мяжу ў выпадку ваеннага канфлікту з Польшчай. Як слушна заўважыў беларускі гісторык У. Ладысеў, «з інтарэсамі Польшчы вялікія дзяржавы абышліся прыкладна так, як урадавыя колы Польшчы з інтарэсамі і тэрытарыяльнай цэласнасцю Беларусі ў час рыжскіх перагавораў у 1920-я гады» [3, с. 176]. І з гэтай думкай цяжка не пагадзіцца.

На пачатку Другой сусветнай вайны, ва ўмовах, калі значныя польскія тэрыторыі і важнейшыя цэнтры былі заняты вермахтам, 17 верасня 1939 г. часці Чырвонай арміі ўступілі на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Маштабных ваенных дзеянняў паміж польскім і савецкім войскамі не было. Праўда, адбыліся асобныя сутычкі і нават баі, асабліва жорсткія за Гродна 20–21 верасня. Асноўная частка насельніцтва сустракала байцоў Чырвонай арміі як вызваліцеляў, нярэдка хлебам-соллю і кветкамі. Яшчэ да прыходу савецкіх часцей у некаторых вёсках і мястэчках рабочыя і сяляне раззбройвалі паліцэйскіх і асаднікаў, бралі ўладу ў свае рукі (Дадатак 1, фота 5, 6).

Адразу пачалася стваральная праца па наладжванні новага жыцця на вызваленай тэрыторыі. Былі ўтвораны органы новай улады – ваяводскія і павятовыя Часовыя ўпраўленні, пры якіх арганізоўваліся атрады рабочай гвардыі, на вёсцы – сялянскія камітэты. Часовыя ўпраўленні стваралі на фабрыках і заводах камітэты рабочага кантролю, наладжвалі забеспячэнне гарадоў прадуктамі харчавання, вырашалі іншыя праблемы сацыяльнай сферы. Сялянскія камітэты дзялілі землі памешчыкаў і асаднікаў, бралі на ўлік іх маёмасць, дапамагалі беззямельным і малазямельным сялянам [3, с. 177] (Дадатак 1, фота 7). З восені 1939 г. адкрыліся школы, навучанне пераводзілася на родную мову, дзясяткі тысяч дзяцей рабочых і сялян, адукацыя для якіх раней была недаступнай, пайшлі ў школу.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР было юрыдычна аформлена ў канцы кастрычніка 1939 г. праз усенароднае волевыяўленне на Народным сходзе ў Беластоку. Пераважная большасць дэпутатаў выказалася ў падтрымку савецкай улады, сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў і ўз'яднанне беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве [1, с. 97–102]. Сход абраў паўнамоцную камісію для паездкі ў Маскву, каб перадаць рашэнне пра ўступленне Заходняй Беларусі ў склад СССР. Прававое афармленне прыняцця Заходняй Беларусі ў склад БССР было завершана на 3-й пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР 14 лістапада 1939 г. [1, с. 102–103] (Дадатак 1, фота 8, 9).

У той жа час існавалі адмоўныя моманты. Асобы польскай нацыянальнасці (сем'і асаднікаў і работнікаў лясной аховы) падвергліся дэпартацыям. Былі рэпрэсіраваны многія дзеячы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху [3, с. 178–179]. Мелі месца выпадкі ігнаравання партыйнымі і савецкімі чыноўнікамі, прысланымі на працу ў Заходнюю Беларусь, мясцовай спецыфікі і традыцый, злоўжывання службовым становішчам. І хаця ў адносінах

да службовых асоб прымаліся меры, такія дзеянні выклікалі недавер да савецкай улады.

Некаторыя публіцысты падкрэсліваюць, што дзеянні Савецкага Саюза ў жніўні – верасні 1939 г. парушалі нормы міжнароднага права. З юрыдычнага пункту погляду гэта так. Але ж ёсць яшчэ і маральны, і геапалітычны аспекты праблемы. Уз'яднанне беларускага народа стала актам гістарычнай справядлівасці і, безумоўна, мела ў цэлым станоўчае значэнне. Беларускія землі і амаль усе беларусы апынуліся ў складзе аднаго нацыянальна-дзяржаўнага ўтварэння, што ў гістарычнай перспектыве закладала асновы для афармлення незалежнай Рэспублікі Беларусь. А ў той час далучэнне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны стала адным з фактараў, што дазволіў СССР стварыць умовы для зрыву гітлераўскага бліцкрыгу летам 1941 г., а, значыць, у канчатковым выніку паспрыяў і разгрому нацысцкай Германіі.

Ацэньваючы значэнне ўз'яднання, падаецца, што дата новага свята абрана ўдала. Яна можа служыць напамінам пра няпросты шлях беларусаў да ўласнай дзяржаўнасці і пра ахвяры, прынесеныя нашым народам на гэтым шляху, а таксама падкрэслівае важнасць дзяржаўнага суверэнітэту і народнага адзінства ў сённяшніх умовах.

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларуская** нацыя: уз'яднанне. Верасень 1939 г. – чэрвень 1941 г. : зб. дак. і матэрыялаў / аўт.-уклад. У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 2004. – 199 с.

2. **Гісторыя** Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 613 с. : іл.

3. **Ладысеў, У. Ф.** Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг. / У. Ф. Ладысеў // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / рэдкал.: А. П. Вайтовіч [і інш.]. – Мінск, 2000. – С. 166–179.

4. **Лицкевич, О.** Концлагерь по-польски. Береза-Картузская в воспоминаниях и документах / О. Лицкевич // Беларуская думка. – 2010. – № 3. – С. 78–85.

5. **Они** не стали на колени : сб. воспоминаний и документов о концлагере Береза Картузская / сост.: В. Поссе и Л. Аржаева, при участии И. Акридиной ; под ред. Я. Миско. – Минск : Беларусь, 1966. – 348 с.

ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

Аляксеева Т.У. *(г. Віцебск)*

АГРАГАРАДОК АКЦЯБРСКАЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У склад Акцябрскага сельсавета ўваходзяць 18 вёсак: Барышына, Бондары, Высокая, Забалоцінка, Зазыбы-2, Заходнікі, Копці, Ласосіна, Лужына, Любава, Лятохі, Маклакі, Акцябрская, Арлова, Сялюты, Сакольнікі, Шапуры, Шульцава. Плошча сельсавета складае 11 259 га, насельніцтва – 4880 чалавек.

На тэрыторыі Акцябрскага сельскага савета праходзяць чыгунка Масква – Полацк, аўтамабільная магістраль Віцебск – Орша – Мінск. Наяўнасць іх, а таксама блізкасць да абласнога цэнтра робяць аг. Акцябрская прыгодным для ўнутранага турызму. Галоўная рака мясцовасці – Лучоса, што трапляе ў Заходнюю Дзвіну.

Аграгарадок Акцябрская – цэнтр сельсавета. Знаходзіцца за 10 км на поўдзень ад Віцебска, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Забалоцінка. У 2021 г. насельніцтва аг. Акцябрская складала 2614 чалавек.

Вёска Акцябрская пачала будавацца ў 1964 г. Спачатку на гэтым месцы былі лясы і дрыгва. Вёску называлі «вёскай будучага». Годам яе нараджэння мясцовыя жыхары лічаць 1967 г.

Населены пункт ствараўся як цэнтральная сядзіба гаспадаркі. Саўгас «Сялюты» быў арганізаваны 6 сакавіка 1959 г. Яго дырэктарам быў Станіслаў Францавіч Карчэўскі. Цэнтр саўгаса мяняўся ў розныя перыяды: 1959–1962 гг. – в. Сялюты; 1962–1975 гг. – в. Сакольнікі; з 1975 г. – в. Акцябрская. Будаўніцтва будучага аграгарадка пачалося з 1964 г. Ужо ў 1966 г. былі ўзведзены першыя двухпавярховыя дамы на сучаснай вул. Цэнтральнай.

У 1967 г. была прынята Пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб мерах па далейшым паляпшэнні жыллёва- і культурна-бытавога будаўніцтва на вёсцы». Паводле дакумента сядзіба саўгаса Сялюты была ўключана ў праграму комплекснага эксперыментальна-паказальнага будаўніцтва. Праект быў распрацаваны архітэктарам А. Бельскім ужо ў 1968 г.

З гэтага ж года пачаў працаваць дзіцячы сад. Кіравала ім Людміла Дзянісаўна Сасноўская. У 1981 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё дашкольнай установы ў сучасным будынку.

У 1970-я гг. в. Акцябрская актыўна будавалася. Узводзіліся эксперыментальныя дамы гарадскога тыпу з сучаснымі бытавымі ўмовамі. Было праведзена добраўпарадкаванне тэрыторыі, закладзены паркавыя зоны, створаны штучны вадаём, на цэнтральнай плошчы з’явіўся фантан.

Вядома, што першапачаткова населены пункт называўся в. Цэнтральная, а ў сакавіку 1974 г. быў перайменаваны ў в. Акцябрская. Гэта адбылося «пасля ўзвядзення адміністрацыйнага будынка і пераводу з в. Сакольнікі дырэкцыі саўгаса і з вёскі Шапуры выканкама Акцябрскага сельсавета» [1, с. 726]. Па некаторых звестках такую назву вёска атрымала ў гонар Героя Савецкага Саюза Марыі Акцябрскай. Гэта першая ў свеце жанчына-танкіст, якая помсціла фашыстам за смерць мужа.

У 1972 г. па выніках конкурсу на лепшую пабудову праект забудовы в. Акцябрская быў узнагароджаны дыпломам 1-й ступені і залатым медалём.

У 1972 г. быў адкрыты Палац культуры з бібліятэкай, музычнай школай і памяшканнямі для гурткоў. Першым дырэктарам установы быў Мікалай Васільевіч Талкачоў.

У 1972 г. саўгасу Сялюты было прысуджана ганаровае званне імя 50-годдзя СССР.

Вывучаць вопыт перадавога саўгаса прыязджалі дэлегацыі з Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Францыі, Кубы і іншых краін. Тройчы наведваў гаспадарку першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў, быў з візітам і сакратар ЦК КПСС Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў.

У 1975 г. пачала функцыянаваць Акцябрская бальніца. У 1976 г. будаўніцтва в. Акцябрская было адзначана прэміяй Савета Міністраў БССР.

1975 г. – стартавы ў працы Віцебскай занальнай дарожна-кліматычнай станцыі (у далейшым – дарожна-доследнай).

У 1975 г. на аснове аб'яднання Нікрапольскай і Сялюцкай школ адкрылася Акцябрская сярэдняя школа. Узначаліў установу Яўген Якаўлевіч Жуклевіч. У канцы 2021 г. установа адукацыі атрымала імя Героя Савецкага Саюза Івана Паўлавіча Собалева (Дадатак 2, фота 1). Нарадзіўся ён 11 снежня 1907 г. у в. Шапуры Віцебскага раёна. Скончыў Ленінградскую ваенна-інжынерную школу ў 1931 г. Служыў у Чырвонай арміі з 1927 г., на фронт трапіў у 1941 г. Камандзір асобнага матарызаванага пантонна-маставога батальёна Собалеў «з батальёнам прайшоў шлях ад Сталінграда да Берліна і Прагі. Забяспечваў фарсіраванне водных рубяжоў на тэрыторыі Расіі, Украіны, Прыбалтыкі, Румыніі, Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі. Вызначыўся ў верасні 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра.

Да 1955 г. І.П. Собалеў служыў у Савецкай арміі, палкоўнік. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі» [2, с. 342]. У яго гонар названа вуліца ў в. Шапуры. З'яўляўся ганаровым грамадзянінам г. Віцебска. Памёр 27 кастрычніка 1989 г.

У 1984 г. быў адкрыты музей баявой і працоўнай славы Акцябрскай сярэдняй школы ў гонар 40-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У раздзеле працоўнай славы былі прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя ўзнікненню першых камун у вёсках Васюты і Шульцава

і ўтварэнню на іх аснове першага калгаса, а таксама лепшым людзям гаспадаркі. Раздзел баявой славы «прысвечаны ўдзельнікам грамадзянскай вайны – ураджэнцам Акцябрскага сельскага савета; нашым землякам – удзельнікам баёў за Маскву і Сталінград; вызваленню Беларусі, аперацыі "Багратыён"; Дню Перамогі» [2, с. 719].

У музеі захоўваліся лісты франтавікоў, іх успаміны, спісы 262-й стралковай дывізіі, якая вызваляла в. Шапуры, спісы пахаваных у брацкіх магілах, успаміны родных і сяброў, падарункі ветэранаў школе.

У 1978 г. першых навучэнцаў прыняло Акцябрскае сельскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 64 механізацыі сельскай гаспадаркі. Некалькі разоў установа адукацыі мяняла сваю назву. Зараз гэта УА «Віцебскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж сельскагаспадарчай вытворчасці». Больш за 20 гадоў яго кіраўніком быў Анатоль Якаўлевіч Галыня. Каледж выпускае спецыялістаў шырокага профілю для сельскай гаспадаркі. Тут можна атрымаць спецыяльнасці трактарыста, кандытара, прадаўца і інш.

У 1988 г. на месцы былой Школы-камуны імя М.І. Калініна (дзейнічала ў 1919–1941 гг.) усталяваны памятны камень з мемарыяльнай дошкай. Гэта дзіцячая камуна вельмі падобная да той, якую апісаў у сваёй «Педагагічнай паэме» А. Макаранка. Кіраваў ёю вядомы педагог Аляксандр Фаміч Шыпула.

У 1988 г. была адкрыта новая бальніца, а ў 2008 г. на яе базе з'явілася першае на Віцебшчыне аддзяленне паліятыўнай дапамогі (хоспіс).

З 2004 г. у будынку былога Дома быту працуюць Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей і Віцебскі раённы цэнтр рамёстваў «Адраджэнне». Гісторыка-краязнаўчы музей Віцебскага раёна – адзін з самых маладых музеяў гэтага краю, урачыстае адкрыццё якога адбылося ў сакавіку 2004 г. Першым дырэктарам установы культуры быў мясцовы краязнавец Сяргей Міхайлавіч Канапелька. Дзякуючы яго намаганням была створана экспазіцыя «Старонкі гісторыі». Зараз дырэктарам з'яўляецца Андрэй Аляксандравіч Кулябкін.

У экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы раскопак гарадзішча і селішча Лужасна, пячаткі віцебскіх князёў, гербы Віцебска, Суража, м. Янавічы. Можна азнаёміцца і з матэрыяламі, што раскрываюць дзейнасць вядомых землякоў: М.Ц. Лынькова, М.Я. Нікіфароўскага, Ф.А. Сурганава і інш. Значнае месца ў экспазіцыі адведзена тэме Вялікай Айчыннай вайны ў гісторыі Віцебшчыны. «На вітрынах змешчаны баявыя ўзнагароды, дакументы, фотаматэрыялы, прысвечаныя партызанскай барацьбе, падполлю, баям за вызваленне Віцебска, асаблівасцям правядзення аперацыі "Багратыён" у наваколлях Віцебска» [1, с. 217]. Асабліва прывабліваюць у музеі касцюмы народнага ансамбля танца «Колас».

У Цэнтры рамёстваў «Адраджэнне» праца вядзецца па традыцыйных для Віцебскага раёна мастацкіх кірунках: саломапляценне, кераміка, ткацтва, вышыўка, лозапляценне. Пры Цэнтры рамёстваў дзейнічаў народны клуб «Традыцыя». Кіраўніком яго з'яўлялася Вера Васільеўна Казлова.

З 2010 г. в. Акцябрская набыла статус аграгарадка.

У 2014 г. быў адкрыты мемарыяльны знак «Мы не ў праве забыць», які паказвае пераемнасць подзвіга герояў Вялікай Айчыннай вайны і воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Людміла Думм (Людміла Цімафееўна Барсукова) – былая загадчыца дзіцячага сада – склала гімн сваёй краіне і аграгарадку:

Беларусь мая, родная, дарагая!
Край цяпла, любові, дабрыні…

Аўтарка называе вёску аграгарадком мары. Сцвярджае, што тут жыве моцны народ, які ставіць перад сабой вялікія мэты, а таксама захоўвае памяць пра продкаў.

Аматарскаму аб'яднанню ветэранаў вайны ў Афганістане «З болем у сэрцы» ў 2007 г. прысвоена званне народнага. У яго ўвайшлі 15 воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Акцябрская вясковая бібліятэка ў год абслугоўвае 800 чытачоў. Кніжны фонд бібліятэкі налічвае каля 17 тыс. экзэмпляраў. Пры бібліятэцы дзейнічае аб'яднанне для падлеткаў – клуб «Ветразь», у якім вядзецца праца па прававым выхаванні. Загадчык бібліятэкі Таццяна Паўлаўна Дзмітрыева ў 2017 г. распрацавала банер «Беларускі краязнаўчы алфавіт Акцябрскага сельскага савета», які размешчаны на ўваходзе ў бібліятэку (Дадатак 2, фота 2).

У 2021 г. падрыхтаваны горадабудаўнічы праект «Генеральны план аг. Акцябрская з дэтальным планам шматкватэрных жылых дамоў у аг. Акцябрская Віцебскага раёна».

У сучаснасці на тэрыторыі аграгарадка функцыянуюць дзіцячы сад, агульная сярэдняя школа, музычная школа, аддзяленне «Беларусбанка», музей, хоспіс, бальніца, царква Смаленскай Боскай Маці.

Развіта і прамысловасць аграгарадка. Гэта прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Янтэх», замежнае прадпрыемства «Ізі Вуд Сістэм», ААТ «Палідрэў», «Вітгран».

У цэнтры аграгарадка размешчана паркавая зона – любімае месца адпачынку жыхароў. Побач знаходзіцца памятны знак на фоне афганскай панарамы. У 1993 г. быў створаны Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане. У аграгарадку жывуць воіны-інтэрнацыяналісты. Кожны год адбываецца мітынг у гонар іх подзвігу.

Як бачна, аг. Акцябрская мае багатую гісторыю і спадчыну. Інфраструктура яго добра развітая. Насельніцтва з кожным годам павялічваецца. Блізкае знаходжанне ад абласнога цэнтра дае магчымасць для эфектыўнага эканамічнага і культурнага развіцця аграгарадка.

ЛІТАРАТУРА

1. **Віцебскі** раён : краязнаўчыя нарысы / І. А. Абрамава [і інш.] ; уклад. М. В. Півавар. – Мінск : Паркус плюс, 2008. – 328 с.

2. **Памяць** : Віцебскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: А. П. Красоўскі [і інш.] ; уклад. У. І. Мезенцаў ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – 772 с. : іл.

Бараненко Т.В. *(г. Полоцк)*

ОДЕЖДА КАК ПРИНАДЛЕЖНОСТЬ: УНИФОРМА ЖИТЕЛЬНИЦ ПОЛОЦКА НАЧАЛА XX в.

Среди многочисленных вариантов городского костюма отдельно выделяется одинаковая по стилю, покрою, цвету и ткани специальная (служебная) одежда, целью которой является создание единого облика определенной социальной группы, отличной от других сферой интересов, занятости, – униформа. Все мы сталкиваемся с униформой в процессе своей жизнедеятельности. Отношение к ней у всех разное: кто-то ею гордится, кто-то пренебрегает, у кого-то отношение к ней тривиально. Также и мы по-разному относимся к людям в форме, зачастую ассоциируя с нею мужскую половину социума.

Однако уже в начале XX в. униформа все чаще начинает встречаться на улицах губернских и уездных городов Российской империи среди представительниц прекрасного пола. Полоцк как важный социально-экономический, политический, культурный центр одноименного уезда не остается в стороне от общегосударственных изменений.

Стоит отметить, что в историографии изучения униформы времен Российской империи имеется целый ряд исследований по истории мужской униформы начала XX в. [2; 3; 12]. Женская униформа в Российской империи начала XX в., униформа жительниц Полоцка данного периода, в особенности, на этом фоне является неизученной и до недавнего времени не выделялась, рассматриваясь в контексте общеимперского женского костюма [1; 11]. Поэтому в данной статье автор попытается более детально проанализировать форменную одежду жительниц Полоцка начала XX в., использовав уже известные научные исследования, сохранившиеся письменные документы, а также введет в научный оборот ранее неизученные визуальные источники – женские фотографии начала XX в.

Согласно сферам занятости, интересам жительниц г. Полоцка начала XX в. женскую униформу можно разделить на следующие группы: 1) униформа воспитанниц учебных заведений; 2) профессиональная униформа (воспитательницы, кормилицы, служанки, сестры милосердия и т. д.); 3) облачение духовенства (игумения, монахини, послушницы).

Из «Путеводителя по городу Полоцку», выпущенному в 1910 г., можно узнать, что в начале XX в. в городе действовал целый ряд учебных заведе-

ний, в которых могли проходить обучение и воспитание юные жительницы Полоцка: женская гимназия, учительская семинария, первое городское шестиклассное училище, второе городское четырехклассное училище, Спасо-Евфросиниевское женское епархиальное училище, частное шестиклассное реальное училище, частная женская четырехклассная с подготовительным классом прогимназия, двухклассное с третьим рукодельным классом женское приходское училище, женское приходское училище, начальное училище при Учительской Семинарии, Двухклассная Иоанно-Богословская церковно-приходская школа, соборная женская одноклассная церковно-приходская школа, образцовая одноклассная церковно-приходская школа при Спасо-Евфросиниевском Епархиальном женском училище [8, с. 10–13].

Российские женские гимназии ведут происхождение от петербургского Мариинского училища, открытого в 1858 г. К началу правления Николая II существовало несколько типов гимназий – Ведомства учреждений императрицы Марии, Министерства народного просвещения и частные. До 1880-х гг. большинство гимназисток носили «вольную» одежду, которая, внутри каждого заведения была единой по цвету, силуэту и включала в себя скромные, приглушенных оттенков платья и передники. Затем костюмы подвергли мягкой унификации. Воспитанницы гимназий Министерства народного просвещения и Мариинских надели форму, состоявшую из платья, передника, пелерины (не во всех гимназиях), шерстяных чулок, туфель или бот, а также верхней одежды – пальто и шапочки. Платья, непременно ниже колена, шили из шерсти серого, зеленого, коричневого и реже бордового цветов (что оговаривалось уставом заведения). Воротник-стоечка, не слишком узкий и не слишком широкий, был украшен кружевами [11, с. 299].

Полоцкая женская гимназия была открыта 1 января 1903 г. на базе частного училища госпожи В.Ф. Рульковиус. Содержательница училища в гимназии заняла должность главной надзирательницы, в которой проработала до закрытия заведения в 1918 г. [8, с. 10–11; 9, с. 73].

В стенах гимназии ученицам надлежало выглядеть опрятно и строго. На сохранившихся фотографиях мы можем увидеть воспитанниц младших классов в строгих платьях темного тона ниже колена с воротником-стойкой белого цвета. Поверх платья одет белый передник. Стоит отметить, что фотографирование воспринималось в начале XX в. как событие неординарное, «праздничное», поэтому можно предположить, что белый передник входил в комплект праздничной униформы гимназисток, а в повседневности его заменяли на передник более темного, возможно, черного цвета [5]. Волосы девочек аккуратно зачесаны, уложены, у многих заплетены и завязаны на банты черного или белого цвета. На ногах можно заметить чулки темного цвета. Обувью же девочкам служили туфли или ботинки [5] (Дадатак 3, фота 1).

На копии фотографии начала XX в. изображены две выпускницы Полоцкой женской гимназии – Т.И. Вышинская (в замужестве Озерникова) (1894–

1962) и Е.Г. Казьянина (в замужестве Александрович) (1892–1979). Девушки окончили данное учебное заведение в 1911 и 1910 гг. соответственно и изображены, вероятнее всего, во время обучения в старших классах гимназии. Согласно фотоснимку (погрудное изображение) на девушках одеты строгие платья или комплект (блуза и юбка) темного оттенка с белым ажурным воротником-стойкой. Поверх платья или блузы одет, вероятнее всего, белый передник, украшенный небольшими рюшами и аккуратным бантом темного оттенка, который расположен на груди [5] (Дадатак 3, фота 2). А вот на фотографии, что датируется 1917 г., изображена группа из четырех гимназисток [5] (Дадатак 3, фота 3). Глядя на нее, можно отметить, что униформа девушек претерпела определенные изменения: все те же однообразные строгие платья темного оттенка украшает уже не белый воротник-стойка, а заменивший его небольшой ажурный отложной воротник. Данный пример может свидетельствовать об изменении униформы под влиянием модных тенденций, что появлялись в женской одежде в начале XX в.

Униформа воспитанниц Спасо-Евфросиниевского женского епархиального училища была также строга и лаконична. На сохранившемся фотоснимке 1916 г. ростовского фотографа Т.А. Панова изображена начальница училища игумения Нина (Боянус) с ученицей Катей Леоновой. Девочка одета в строгое длинное платье (подол ниже колена) прямого покроя темного цвета. Рукава имеют манжеты, а по горловине расположен воротник-стойка, украшенный ажурной белой лентой. Поверх платья – фартук с нагрудником, широким поясом и складками [6] (Дадатак 3, фота 4).

На групповых фотографиях воспитанниц учебных заведений города нередко можно заметить и их преподавателей. Так, на копии студийного фотоснимка фотографа Бернштейна, датированного 1912 г., запечатлены трое преподавательниц Полоцкой женской гимназии. Как видно на фотокарточке, одежда для преподавательниц данной гимназии не была унифицирована, однако отличалась сдержанностью и строгостью. И лишь небольшими «отступлениями» от этого правила служило наличие достаточно скромных аксессуаров в костюме женщин – броши, прикрепленные под воротником-стойкой, кулон (или часы) на цепочке на груди [5] (Дадатак 3, фота 1).

Таким образом, по своей строгости и лаконичности форменная одежда воспитанниц полоцких учебных заведений была приближена к военному образцу и только с течением времени изменялась согласно веяниям моды. Для воспитанниц она служила сдерживающим, дисциплинирующим элементом, обеспечивающим пристойное поведение.

В черте уездного Полоцка в начале XX в. располагался Спасо-Ефросиниевский женский монастырь. Часто на улицах города можно было встретить его насельниц, так как монастырь не был общежительным, а принадлежал к разряду штатных. Особенностью таких монастырей являлось то, что всем необходимым сестры должны были себя обеспечивать сами и, соот-

ветственно, должны были изыскивать способы заработка в городе [6, с. 116].

Ношение монашеского облачения жительницами монастыря в начале XX в., как и в предыдущий исторический период, было направлено на усмирение плоти, отрешенность от мирского. Оно было довольно консервативно и менее других форменных одежд подвержено влиянию модных тенденций рассматриваемого периода.

Следует отметить, что облачение жительниц монастыря зависело от этапов, которые они прошли в течение своей жизни в монастыре. Так, монахини носили подрясник (нижнее, длинное (до пят) одеяние прямого кроя с наглухо застегнутым воротом и узкими рукавами), поверх – черная ряса прямого кроя. Голову сестер покрывал черный или белый апостольник (платок особого колоколообразного покроя с вырезом для лица. На затылочной части апостольник стягивается лентой в знак контроля над помыслами. Свободно спускается на спину и грудь, может достигать пояса или быть несколько короче. В официальной обстановке и во время богослужения монахини ходят в черных апостольниках, в быту в некоторых монастырях они заменяются на белые или серые). В руках – единственный аксессуар – четки для отсчитывания количества молитв. Начальница женского монастыря – игумения – дополняла свое одеяние ношением на шее наперстного креста (Дадатак 3, фота 5).

Особая униформа была и у послушниц монастыря. Им разрешалось носить подрясник, поверх которого одевался белый передник, на голове – аккуратно завязанный платок. Именно в такой униформе мы можем увидеть послушницу Спасо-Ефросиниевского женского монастыря Фёклу Клоп на сохранившейся фотокарточке начала XX в. [6] (Дадатак 3, фота 5).

С началом Первой мировой войны многим женщинам пришлось примерить новую для себя форму одежды – униформу сестер милосердия. В зданиях городских учреждений и учебных заведений Полоцка, эвакуированных в 1914–1915 гг. вглубь России, были открыты госпитали и многочисленные лазареты [4, с. 88–97].

Согласно п. 54 «Нормального устава общинъ сестеръ милосердія Россійскаго общества Краснаго Креста», утвержденного в мае 1903 г., «Сестры милосердія и испытуемыя общины <…> носятъ установленную одежду, состоящую изъ шерстяного или холстинковаго платья коричневаго или сѣраго цвѣта, бѣлаго передника и бѣлой головной косынки. Сестры милосердія, сверхъ того, имѣютъ на передникѣ отличительный знакъ своего званія, нашитый на нагрудникѣ знакъ краснаго креста. При исполненіи обязанностей сестры и испытуемыя носятъ на лѣвой рукѣ повязку съ знакомъ краснаго креста» [7, с. 14–15].

В 1915 г. в типографии Санкт-Петербурга в свет выходит «Списокъ сестеръ милосердія Россійскаго Общества Краснаго Креста, назначенныхъ для ухода за ранеными и больными воинами въ лечебныя учрежденія Краснаго

Креста, военнаго вѣдомства, общественныхъ организацій и частныхъ лицъ. Составленъ по свѣдѣніямъ, имѣющимся въ Канделяріи Главнаго Управленія Россійскаго Общества Краснаго Креста къ 1-му августа 1915 года», в котором выделен пункт «Правила ношенія формы сестрами милосердія и лицами женскаго санитарного персонала Россійскаго Общества Красного Креста». Согласно «Правил ношения формы»:

«1. Сестры милосердия <…> носят форму, установленную утвержденным августейшей покровительницей общества государыней императрицей Марией Феодоровной 13 мая 1903 г. нормальным уставом общин сестер милосердия Краснаго Креста, или уставами тех общин, которые действуют на основании своих особых уставов. <…>

3. Лица женскаго санитарнаго персонала, не имеющия звания сестры милосердия, но допущенные к уходу за ранеными и больными и для несения хозяйственных обязанностей (за исключением прислуги) в лечебных учреждениях Краснаго Креста и принятых Главным управлением общества под флаг Краснаго Креста, носят серые шерстяные или холстинковые платья с белым передником (но без нагрудного креста) и белую головную косынку.

4. При указанной в ст. ст. 1 и 3 форме сестры милосердия и лица женского санитарнаго персонала, находясь при исполнении служебных обязанностей, носят на левой руке белую нарукавную повязку со знаком Красного Креста. На улице (при сопровождении раненых) нарукавная повязка надевается на верхнее платье. В районе военных действий ношение нарукавной повязки разрешается и вне обязанностей службы по ближайшим указаниям подлежащих главноуполномоченныхъ Российскаго Общества Красного Креста» [5; 10, с. 15] (Дадатак 3, фота 6).

Таким образом, приведенные документы свидетельствуют о строгой регламентации и унификации в отношении внешнего вида и ношения униформы сестрами РОКК.

Униформа жительниц г. Полоцка начала XX в., являясь разновидностью женского городского костюма данного периода, символизировала социальную функцию, выполняемую ее носительницей в обществе, и тем самым определяла ее принадлежность к той или иной социальной структуре города (воспитанницы институтов, гимназистки, преподаватели, сестры милосердия). Помимо этого, ношение девушками той или иной униформы ставило целью воспитание определенных качеств личности.

Для отдельных образцов женской униформы (воспитанниц учебных заведений, преподавателей, сестер милосердия) начало XX в. является периодом дальнейшего становления, формирования, развития данного вида костюма. Вместе с этим следует отметить и определенное отрицание модных нововведений в отношении облачения духовенства.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Бялявіна, В. М.** Жаночы касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

2. **Введенский, Г. Э.** Пять веков русского военного мундира / Г. Э. Введенский. – Санкт-Петербург : Алант, 2005. – 336 с.

3. **Глинка, В. М.** Русский военный костюм XVIII – начала XX века. Альбом / В. М. Глинка. – Ленинград, 1988. – 228 с.

4. **Ліхадзедаў, У. А.** Місія міласэрнасці: ілюстрацыйная гісторыя Чырвонага Крыжа ў Беларусі = Миссия милосердия: иллюстративная история Красного Креста в Беларуси = Mission of mercy: illustrative history of the Red Cross in Belarus / У. Ліхадзедаў ; аўтар прадмовы В. Мычко. – Мінск : Звязда, 2019. – 192 с.

5. **Национальный** Полоцкий историко-культурный музей-заповедник. – Коллекция «Фотодокументы». – Фотография, фотография (копия). – КП-23 39170; КП-23 39171; КП-23 46441; НД 009545; НД 010916; НД 010489.

6**. Нина (Боянус)**, игум. Наши беседы о жизни / игум. Нина (Боянус). – Москва, 2004. – 208 с.

7. **Нормальный** устав общин сестер милосердия Российского общества Красного Креста. – Самара : Типография Губернского правления, 1903. – 28 с.

8. **Путеводитель** по городу Полоцку. К торжеству перенесения в. мощей Ефросинии, княжны Полоцкой, из г. Киева в г. Полоцк. – Полоцк : Типография Х. В. Клячко, 1910. – 24 с. – Национальный Полоцкий историко-культурный музей-заповедник, КП 6-2826.

9. **Романенкова, Н. Г.** Из истории Полоцкой женской гимназии / Н. Г. Романенкова // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 1997 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева. – Полацк, 1998. – С. 73–75.

10. **Список** сестер милосердия Российского Общества Красного Креста, назначенных для ухода за ранеными и больными воинами в лечебные учреждения Краснаго Креста, военного ведомства, общественных организаций и частных лиц. Составлен по сведениям, имеющимся в канделярии Главнаго управления Российского Общества Красного Креста к 1-му августа 1915 года. – Петроград : Государственная типография, 1915. – 924 с.

11. **Хорошилова, О. А.** Костюм и мода Российской империи. Эпоха Николая II / О. А. Хорошилова. – Москва : Этерна, 2012. – 462 с.

12. **Чернушкин, А. В.** Русская армия XIX – начала XX века: 1801–1825: Кавалерия – Артиллерия – Казачьи войска – Ополчение. 1825–1917: Пехота – Кавалерия – Артиллерия / А. В. Чернушкин. – Москва : Астрель, 2004. – 180 с.

Бородин В.В. *(д. Богатырская, Полоцкий район)*

КРАЕВЕД И.И. ДОЛГОВ – ИССЛЕДОВАТЕЛЬ ИСТОРИЧЕСКОГО НАСЛЕДИЯ ПОЛОЦКА В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX ВЕКА

Одной из основных составляющих динамичного развития краеведения была роль выдающихся личностей. Участниками краеведческого движения в Полоцке были люди разных профессий и социального положения. Ученые с европейским образованием во главе с Г. Грубером создали Музей иезуитского коллегиума. Преподаватели кадетского корпуса принимали активное участие в работе своего музея, изучали историю края, пытались создать музей местных памятников старины, кружок любителей археологии и «подземный музей» в Софийском соборе. Интерес к истории края среди жителей Полоцка оставался традиционным и достаточно прочным [2, с. 3]. Этот период дал много имен людей, оставивших печатные и рукописные воспоминания о своем увлечении историей и идеей создания музея. Среди них И.И. Долгов, А.К. Морель, М.И. Зорин, А.П. Тыртов, Е. Стабровский, М. Кайгородов, В.П. Викентьев и др. Об одном из них в данной работе пойдет речь.

Значительное место в общественной жизни города в конце XIX – начале XX в. занимала деятельность учителя и краеведа Ивана Ивановича Долгова. Уроженец Петербургской губернии, выпускник Петербургского университета, он стал белорусским историком, археологом, любителем полоцкой старины. В 1886 г. Иван Долгов пришел на работу в Полоцкий кадетский корпус на кафедру русского языка и в течение 25 лет находился в центре педагогической, научной и культурной жизни нашего города. Действительно, в Полоцке не было практически ни одного общества или учреждения, в деятельности которых И.И. Долгов не принимал бы участия.

Кроме кадетского корпуса Иван Иванович преподавал в женской гимназии и Спасо-Евфросиниевском епархиальном училище. Он регулярно проводил экскурсии для воспитанников разных учебных заведений не только Полоцка, но и Витебска. Преподаватель стремился прививать своим ученикам любовь к родному краю, воспитывать чувство патриотизма. Иван Долгов был одним из основателей музея в Полоцком кадетском корпусе и автором описания истории этого учебного заведения. Благодаря активной жизненной позиции своего учителя кадеты побывали с экскурсиями в Киеве, Крыму, Москве, Поволжье, на Кавказе [1].

Крупна и почтенна была роль И.И. Долгова в знаменательном для белорусского края событии перенесения св. мощей преподобной Евфросинии в Полоцк. Не всем может быть известно, каким пламенным, убежденным сторонником этой идеи был сам И.И. Долгов. Высокопреосвященнейший митрополит Серафим (Мещеряков) (бывший епископ Полоцкий) вспоминал, что первый человек, от которого он услышал о перенесении в Полоцк мощей святой, был «добрый христианин Иван Иванович».

Во время перенесения мощей преподобной Евфросинии Полоцкой на Родину в 1910 г. Долгов как член Полоцкого Епархиального Совета работал над подготовкой и проведением праздничных мероприятий: принимал участие в разработке церковного церемониала, работал в комитете по приему высокопоставленных гостей и паломников, являлся инициатором издания и редактором «Братского церковного листка», гостеприимно принимал представителей иногородней прессы. Иван Иванович давал подробные ответы на волнующие вопросы по истории города многочисленным археологам, историкам, этнографам, писателям, артистам, которые очень часто обращались к местному краеведу [3, с. 239].

Узнагароды: савецкія ордэн Леніна (21.02.1945), два ордэны Чырвонага Сцяга (03.11.1944, 15.11.1950), ордэн Кутузава II ступені (19.05.1943), Айчыннай вайны I ступені (29.06.1945), Чырвонай Зоркі (23.04.1942), медаль «За баявыя заслугі» (17.11.1939); польскі ордэн «Крыж Грунвальда» 3-га класа (11.05.1945).

З 1918 па 1944 г. і з 1946 па 1953 г. – у РСЧА/СА. У 1944–1945 гг. – у ЛВП. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У перыяд ВАВ – начальнік штаба і намеснік камандзіра стралковага корпуса, начальнік Упраўлення тылу 7-й, 55-й, 67-й армій, а з 1944 г. – начальнік тылу ЛВП.

З 1947 г. – на выкладчыцкай працы ў ваенных ВНУ.

Сляскі Эўгеніюш (Яўгеній Мартынавіч) (30.12.1872/11.01.1873–24.10.1935), Лепельскі раён, былы маёнтак Тадуліна.

Генерал брыгады (31.03.1924) войска Польскага.

Узнагароды: расійскія ордэны Святой Ганны II (10.06.1915), III (з мячамі і бантам; ?)) і IV «За храбрасць» (1906) ступеней, Станіслава II (з мячамі; 1916), III (з мячамі; 25.12.1904) ступеней; ордэн «Віртуці Мілітары» 5-га класа і іншыя польскія ўзнагароды.

З 1893 па 1917 г. – у РІА (падпалкоўнік). Удзельнік руска-японскай, Першай сусветнай, савецка-польскай войнаў. З 1917 г. – на службе ў 1-м Корпусе Польскім: камандзір эскадрона, затым дывізіёна 2-га ўланскага палка.

У лістападзе 1918 г. быў прыняты палкоўнікам на службу ў Войска Польскае. Займаў пасады камандзіра Татарскага коннага палка, 13-га ўланскага палка, 9-й коннай брыгады (кбр). З кастрычніка 1920 г. – камандзір 9-й кбр і адначасова інспектар кавалерыі Лодзінскай ваеннай акругі. З мая 1923 г. – начальнік 2-га Коннага дэпартамента, 2-га Дэпартамента кавалерыі Міністэрства вайсковых спраў. З чэрвеня 1924 г. – камандзір 4-й кавалерыйскай дывізіі. Са снежня 1925 г. выконваў абавязкі намесніка камандуючага Акругі 6-га корпуса. З мая 1926 па красавік 1927 г. – камандзір 8-й асобнай кбр.

Жыў у в. Глінч (цяпер – у складзе гміны Жукава Картузскага павета Паморскага ваяводства Польшчы). Пахаваны на сельскіх могілках у Жукаве.

Стшалкоўскі (Стралкоўскі) Себасцьян (02.01.1925–08.11.2005), Глыбоцкі раён, Празароцкі с/с, былыя фальваркі Вялікае ці Малое Стальмахова.

Генерал брыгады (12.10.1972) – генерал дывізіі (1978) Войска Польскага.

Узнагароды: польскія Камандорскі і Афіцэрскі крыжы ордэна Адраджэння Польшчы, Сцяга Працы II ступені, залаты і сярэбраны Крыжы Заслугі, сярэбраны і бронзавы медалі «Заслужаным на полі Славы»; савецкі ордэн Айчыннай вайны II ступені.

У 1940 г. разам з маці быў дэпартаваны ў Казахскую ССР, дзе працаваў трактарыстам у калгасе. З 1943 па 1986 г. – у ЛВП. У маі 1943 г. уступіў у 1-ю Польскую дывізію пяхоты імя Т. Касцюшкі. Прымаў удзел у бітве пад в. Леніна (Горацкі раён, Магілёўская вобласць). Пасля заканчэння Афіцэрскай школы пяхоты імя Т. Касцюшкі ў г. Разані працягнуў баявую службу ў 1-й Арміі ЛВП.

У пасляваенны час служыў у Войсках памежнай аховы. З 1950 г. займаў камандныя пасады ў кватармайстарскіх часцях Узброеных Сіл, затым выкладаў у Акадэміі Генштаба, займаў пасаду намесніка камандуючага ВМС па тэхнічнай частцы. З 1969 г. – начальнік Вышэйшай афіцэрскай

аўтамабільнай школы імя генерала А. Вашкевіча. З 1974 г. – кватармайстар, ён жа намеснік камандуючага Паморскай ваеннай акругі. З 1977 па 1986 г. – начальнік Жыллёва-будаўнічай службы, ён жа намеснік галоўнага кватармайстра ЛВП.

Сушыньскі Стэфан (Сушынскі Стэфан Ігнацьевіч) (27.12.1871/08.02.1872–23.12.1941), Талачынскі раён, Воўкавіцкі с/с, былы маёнтак Багрынава – цяпер у складзе в. Багрынава.

Генерал-падпаручнік (01.04.1920), генерал брыгады (з 03.05.1922), затым генерал дывізіі (01.02.1924) Войска Польскага.

Узнагароды: расійскія ордэны Святога Уладзіміра IV ступені (з мячамі і бантам; 14.11.1915), Святой Ганны II (з мячамі і бантам; 16.04.1915) і III (31.01.1909) ступеней, Святога Станіслава II (13.05.1914; мячы да ордэна, 14.11.1916) і III (25.12.1905) ступеней; польскія сярэбраны крыж ордэна «Віртуці Мілітары» (1922), Камандорскі крыж ордэна Адраджэння Польшчы (02.05.1922), два Крыжы Храбрых, залаты Крыж Заслугі; ордэн Кароны Італіі 3-га класа; ордэн Ганаровага Легіёна 3-га класа (Францыя); ордэн Кароны Румыніі 1-га класа; ордэн Белага Арла 3-га класа (Каралеўства Югаславія).

З 1891 па 1917 г. – у РІА (палкоўнік), з 1918 па 1927 г. – у ВП. Удзельнік Першай сусветнай (1914–1917) і савецка-польскай (1919–1920) войнаў.

Са снежня 1917 г. фарміраваў 2-гі ўланскі полк 1-га Корпуса Польскага, з красавіка па ліпень 1918 г. камандаваў 1-м уланскім палком 1-га Корпуса Польскага. З лістапада 1918 г. – начальнік рамонтнага аддзела арганізацыйна-мабілізацыйнага дэпартамента Міністэрства вайсковых спраў Польскай Рэспублікі. З чэрвеня 1919 г. – камандзір 5-й коннай брыгады (кбр), а са жніўня 1920 г. – 7-й кбр ВП. Са студзеня 1921 г. – камендант Варшавы.

З пачаткам польска-нямецкай вайны ў верасні 1939 г. пераехаў у Вільню, дзе быў арыштаваны 7 лістапада таго ж года супрацоўнікамі НКУС. Утрымліваўся ў турмах Беластока, Мінска, Оршы, Віцебска. Пазней быў этапіраваны ў Карагандзінскі выпраўленча-працоўны лагер (Казахская ССР), дзе памёр у лагерным шпіталі.

Пахаваны на лагерных могілках ля г. п. Далінскае (Далінка) у складзе сучаснай Шахцінскай гарадской адміністрацыі Карагандзінскай вобласці Казахстана.

Трукан Ян (03.06.1937–09.08.2010), Пастаўскі раён, цяпер аг. Дунілавічы.

Генерал брыгады (1992) – генерал дывізіі (1995) Войска Польскага.

Узнагароды: Афіцэрскі і Камандорскі крыжы ордэна Адраджэння Польшчы і інш.

З 1957 па 1997 г. – у ЛВП/ВП. Скончыў афіцэрскую школу ўзбраення (1960) у Ольштыне, Ваенна-тэхнічную акадэмію (1968) у Варшаве.

З 1960 г. выкладаў у Цэнтры падрыхтоўкі спецыялістаў артылерыі, а з 1968 г. – у Цэнтральным інстытуце Службы ўзбраення і электронікі (ЦІСУЭ). Пасля заканчэння Акадэміі Генштаба ў 1973 г. вярнуўся да выкладчыцкай працы ў тым жа інстытуце. З 1982 г. – начальнік службы ўзбраення і электронікі Варшаўскай ваеннай акругі. З 1986 г. – камендант ЦІСУЭ. З 1989 г. – начальнік Тэхнічных служб, ён жа намеснік камандуючага Варшаўскай ваеннай акругай. З 1992 па 1997 г. – намеснік начальніка Інспекцыі лагістыкі Генеральнага Штаба. Жыў у Варшаве, дзе пахаваны на вайсковых могілках у Павонзках.

Тшамескі Юзаф Францішак (24.12.1878–04.07.1923), Браслаўскі раён, аг. Ахрэмаўцы, былая в. Бяльмонт (Бяльмонты).

Генерал брыгады (03.05.1922) Лекарскага Корпуса Войска Польскага. Доктар медыцыны.

Узнагароды: польскія ордэн «Віртуці Мілітары» 5-га класа, Крыж Храбрых; французскія ордэны Ганаровага Легіёна 5-га класа і Акадэмічных пальмаў 5-га класа.

З 1904 г. служыў ваенным урачом у Рускім Імператарскім Флоце. Удзельнік руска-японскай вайны. У 1914–1915 гг. – урач і кіраўнік навуковай часткі аперацыі пад кіраўніцтвам О. Свердрупа ў Карскае мора з мэтай выратавання палярных экспедыцый Г.Я. Сядова, У.А. Русанава і Г.Л. Брусілава.

З 1919 г. – урач трэніровачнага лагера, затым намеснік начальніка санітарнай службы Арміі Польскай у Францыі. Пасля перадыслакацыі арміі ў Польшчу перайшоў на службу ў ВП (афіцыйна прыняты 01.01.1920). Удзельнік савецка-польскай вайны (1919–1920) як начальнік санітарнай службы Паўднёва-Усходняга, затым Паморскага франтоў. З сакавіка 1920 г. – начальнік гігіенічнага аддзела Санітарнага дэпартамента Міністэрства вайсковых спраў Польскай Рэспублікі. У далейшым – начальнік санітарнага аддзела Галоўнага камандуючага ВП, затым памочнік начальніка санітарнага аддзела Міністэрства вайсковых спраў. Скончыў жыццё самагубствам.

Хелхоўскі Уладыслаў (Уладзіслаў Казіміравіч) (29.11.1864–02.01.1924), Верхнядзвінскі раён, Дзёрнавіцкі с/с, былы маёнтак Фартун (Фартунава).

Палкоўнік (23.11/06.12.1910) Рускай Імператарскай арміі – тытулярны генерал брыгады (23.10.1923) Войска Польскага.

Узнагароды: ордэны Святога Уладзіміра IV ступені (з мячамі і бантам; 1904), Святой Ганны II (з мячамі; 1905), III (з мячамі і бантам; 1904) і IV (1901) ступеней, Святога Станіслава II (з мячамі; 1905) і III (з мячамі і бантам; 1901) ступеней.

Скончыў Полацкі кадэцкі корпус, 2-е ваеннае Канстанцінаўскае вучылішча. З 1884 па 1918 г. – у РІА, з 1919 па 1921 г. – у ВП. Удзельнік паходу ў Кітай (1901), руска-японскай вайны (1904–1905).

З лютага 1919 г. служыў у Галоўным інтэнданцтве ВП, затым быў пераведзены ў вайсковы рэзерв. Займаў пасады каменданта Ковельскага, Грубешаўскага, Дубенскага паветаў, каменданта ў гарадах Корасцень, Паворск, Тамашаў. У час савецка-польскай вайны – начальнік тылу 3-й арміі, затым камендант г. Замосце, начальнік аператыўнай групы «Шчабжэзын». У далейшым – камендант Лідскага, Аўгустоўскага, Дзісенскага паветаў. З мая па кастрычнік 1921 г. – у службе тылу 2-й арміі.

Чэрнуў (Чарноў) Апалоніюш (03.01.1929–01.02.2018), Браслаўскі раён, Відзскі с/с, былая в. Даведзіны.

Генерал брыгады (05.11.1978) Войска Польскага. Доктар ваенных навук (1977).

Узнагароды: ордэны Адраджэння Польшчы 4-га і 5-га класаў, залаты Крыж Заслугі.

У красавіку 1940 г. быў дэпартаваны разам з маці ў Казахскую ССР, дзе працаваў трактарыстам у калгасе. У час Вялікай Айчыннай вайны рана страціў маці. У чэрвені 1946 г. выехаў у Польшчу. Уладкаваўся працаваць на цукровым заводзе ў г. Мыслібуж і адначасова працягнуў перарваную вучобу. Праз тры гады скончыў фізіка-матэматычны ліцэй.

З 1949 па 1991 г. – у ЛВП/ВП. Скончыў Афіцэрскую авіяцыйную школу (ААШ; 1949) у Дэмбліне, Акадэмію Генштаба (1956), паслядыпломныя аперацыйна-стратэгічныя курсы пры Акадэміі Генштаба (1969).

З 1951 г. – інструктар пілатажу ў ААШ у Радаме. У 1953 г. і з 1956 г. – на камандных пасадах у часцях Ваенна-паветраных сіл. З 1961 па 1968 г. – старшы штурман ВПС. З 1969 г. – намеснік начальніка штаба ВПС, з 1972 г. – намеснік камандзіра 3-га корпуса ВПС, а з 1976 г. – зноў намеснік начальніка штаба ВПС. З 1977 г. – камандзір 3-га корпуса ВПС. З 2 студзеня 1986 г. па 2 лютага 1990 г. – ваенны аташэ пры Пасольстве ў СССР. З 1990 г. – памочнік міністра нацыянальнай абароны. Жыў у Варшаве, дзе пахаваны на вайсковых могілках у Павонзках.

Шыманоўскі Пётр Віктаравіч (01.08.1858–17.11.1926), г. Віцебск.

Генерал-маёр (14.08.1910) Рускай Імператарскай арміі – тытулярны генерал дывізіі Войска Польскага (26.12.1923).

Узнагароды: ордэны Святога Уладзіміра III ступені (25.10.1915), Святой Ганны II (1899) і III (?) ступеней, Святога Станіслава II (1892) і III (?) ступеней.

З 1875 па 1910 г. і з 1914 па 1917 г. – у РІА. Скончыў Арлоўскі Бахціна кадэцкі корпус

(1875), Нікалаеўскае кавалерыйскае вучылішча (1877), афіцэрскую кавалерыйскую школу (1878).

З 1907 г. – камандзір 11-га гусарскага Ізюмскага Яго Каралеўскай Высокасці Прынца Генрыха Прускага палка. З пачаткам Першай сусветнай вайны – начальнік 104-й брыгады дзяржаўнага апалчэння.

Адзін з арганізатараў польскіх добраахвотных часцей пры рускай арміі ў процівагу Польскім легіёнам пры аўстра-венгерскай арміі. Асабіста арганізаваў Пулаўскі легіён. Быў кіраўніком рэкруцкага бюро для палякаў Расіі і скарбнікам Арганізацыйнага камітэта Польскіх легіёнаў, што фарміраваліся з 1915 г. З ліпеня 1915 г. па красавік 1916 г. – камандзір брыгады польскіх стралкоў.

Са снежня 1918 г. – у Войску Польскім: начальнік зборнага пункта для афіцэраў. З 01.04.1921 – у адстаўцы ў званні генерал-падпаручніка. Жыў у Варшаве, дзе і пахаваны.

У дакладзе выкарыстаны матэрыялы БД «Первая мировая война. 1914–1918», дакументы і ўліковыя запісы БД «Подвиг народа», БД «Русская армия в Первой мировой войне», БД «Офицеры Русской Императорской Армии», БД «Generals.dk», польскай «Вікіпедыі».

ЛІТАРАТУРА

1. **Ендржеевский** Владислав Антонович [Электронный ресурс] // Русская армия в Первой мировой войне. – Режим доступа: http://www.grwar.ru/persons/person/6748. – Дата доступа: 12.09.2021.

2. **Зарака-Заракоўскі** Баляслаў Францавіч // Памяць : Полацк : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; склад. С. С. Чарняўская ; навук. рэд.: Г. В. Штыхаў, С. В. Тарасаў ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2002. – С. 422.

3. **Зарака-Заракоўскі** Баляслаў Францавіч / Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3 : Гімназія – Кадэнцыя. – С. 407.

4. **Зарако-Зараковский** Болеслав Францевич / Б. Д. Долготович // Военачальники земли белорусской : энцикл. спр. – Минск : БелЭн, 2005. – С. 141.

5. **Зарако-Зараковский** Болеслав Францевич // Великая Отечественная. Комдивы : воен. биогр. слов. : [в 5 т.] / под общ. ред. В. П. Горемыкина. – Москва : Кучково поле, 2014. – Т. 3 : Командиры стрелковых, горнострелковых дивизий, крымских, полярных, петрозаводских дивизий, дивизий ребольского направления, истребительных дивизий (Абакумов – Зюванов). – С. 311–313.

6. **Петровский** Степан Фёдорович / Б. Д. Долготович // Военачальники земли белорусской : энцикл. спр. – Минск : БелЭн, 2005. – С. 148.

7. **Петровский** Степан Фёдорович // Великая Отечественная. Комдивы : воен. биогр. слов. : [в 5 т.] / под общ. ред. В. П. Горемыкина. – Москва : Кучково поле, 2015. – Т. 4 : Командиры стрелковых, горнострелковых дивизий, крымских, полярных, петрозаводских дивизий, дивизий ребольского направления, истребительных дивизий (Ибянский – Печененко). – С. 1196–1198.

8. **Пятроўскі** Сцяпан Фёдаравіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1975. – Т. 8 : Паддубнікі – Рабкі. – С. 663–664.

9. **Пятроўскі** Сцяпан Фёдаравіч // Памяць : Верхнядзвінскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф. Бубала ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 2000. – Кн. 2. – С. 41.

10. **Савченко** Емельян Григорьевич / Б. Д. Долготович // Военачальники земли белорусской : энцикл. спр. – Минск : БелЭн, 2005. – С. 126.

11. **Саўчанка** Емяльян Рыгоравіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1973. – Т. 9 : Рабкор – Сочы. – С. 374.

12. **Саўчанка** Емяльян Рыгоравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1 : Пузелі – Усая. – С. 233.

13. **Хелховский** Владислав Казимирович [Электронный ресурс] // Русская армия в Первой мировой войне. – Режим доступа: http://www.grwar.ru/persons/person/10244. – Дата доступа: 12.09.2021.

Гайдукоў К.П. *(г. Віцебск)*

ЗАСЛУЖАНЫ ПІЛОТ СССР ВІКТАР МАРКАВІЧ КУПАЛА

«Заслужаны пілот СССР» – гэта ганаровае званне, якое было ўстаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 верасня 1965 г. Гэта званне прысвойвалася пілотам 1-га класа з лётнага саставу грамадзянскай авіяцыі Савецкага Саюза за асаблівыя заслугі ў асваенні сучаснай авіяцыйнай тэхнікі, прымяненне найбольш дасканалых метадаў самалётаваджэння, высокія паказчыкі ў выхаванні і навучанні лётных кадраў, шматгадовую безаварыйную лётную працу і за выдатныя дасягненні па прымяненні авіяцыі ў народнай гаспадарцы краіны.

Першы Указ аб прысваенні гэтага высокага звання быў падпісаны 16 жніўня 1966 г. У спісе першых 27 заслужаных пілотаў значылася імя нашага земляка Віктара Маркавіча Купалы.

Ён нарадзіўся 1 (па новым стылі 14) чэрвеня 1914 г. у в. Селішча Высоцкай воласці Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер – у складзе Высоцкага с/с Аршанскага раёна Віцебскай вобласці) у шматдзетнай сялянскай

сям'і. Бацька, Марк Фаміч, быў пісьменным (скончыў тры класы царкоўнапрыходскай школы), працавітым і таму паважаным у вёсцы чалавекам, які займаўся цяслярскай справай. Менавіта яго вяскоўцы абралі старшынёй камітэта сялянскай беднаты (камбеда), а пазней старшынёй сельсавета пасля ўсталявання савецкай улады ў павеце. Маці, Дар'я Ермалаеўна, шчыравала ў дамашняй гаспадарцы, гадуючы семярых дзяцей, а з пачаткам калектывізацыі ўступіла ў мясцовы калгас.

З дзевяці гадоў Віктар дапамагаў бацькам весці гаспадарку – пасвіў жывёлу, працаваў на зямлі. Ён цягнуўся да ведаў і скончыў школу 1-й ступені ў в. Высокае, а затым няпоўную сярэднюю (сямігадовую) школу ў г. Оршы. У 1928 г. паступіў і праз тры гады скончыў Аршанскі аўтадарожны тэхнікум (цяпер не існуе), дзе атрымаў спецыяльнасць «аўтамеханік-шафёр», па якой працаваў пры тэхнікуме да 1932 г. Прымаў актыўны ўдзел у камсамольскай рабоце.

У 1932 г. па накіраванні Аршанскага гаркама ЛКСМБ паступіў у 2-ю авіяцыйную школу пілотаў і авіятэхнікаў Грамадзянскага Паветранага Флоту (ГПФ) СССР у расійскім Тамбове. У 1935 г. паспяхова скончыў навучанне і атрымаў кваліфікацыю «пілот грамадзянскай авіяцыі». Пазней, згодна з Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 22 верасня 1935 г., як ваеннаабавязаны атрымаў персанальнае воінскае званне «лейтэнант». Быў накіраваны на працу ва Уральскае ўпраўленне ГПФ (уваходзіла ў склад Галоўнага ўпраўлення ГПФ пры Савеце Народных Камісараў (з 1946 г. Савет Міністраў СССР)) у г. Уфе і залічаны ў 9-ты лётны атрад. На самалёце-біплане По-5 перавозіў пошту і разнастайныя народнагаспадарчыя грузы. У пачатку 1938 г. быў накіраваны ў Батайскую школу грамадзянскай авіяцыі (Растоўская вобласць, РСФСР), дзе засвоіў пілатаванне груза-пасажырскага біплана Р-5 і манаплана ПС-40 (пасажырская версія АНТ-40). У тым жа годзе паспяхова скончыў курсы павышэння кваліфікацыі і атрымаў накіраванне ў Заходнесібірскае ўпраўленне грамадзянскай авіяцыі ў г. Омску, дзе быў залічаны ў начны лётны атрад.

На першай у Савецкім Саюзе начной паштовай лініі абслугоўваў участак Краснаярск – Свярдлоўск. У пачатку 1939 г. атрымаў кваліфікацыю пілота 2-га класа і быў пераведзены на працу ў Новасібірскі аэрапорт. Лятаў на пасажырскіх самалётах ПС-9 (ён жа АНТ-9), ПС-40, на паштовым самалёце ПС-41 (грамадзянская версія бамбардзіроўшчыка СБ біс 2). З пачаткам савецка-фінляндскай вайны (снежань 1939 г. – сакавік 1940 г.) быў прызваны на службу ў Чырвоную армію. На самалёце СБ (ваенная версія АНТ-40) лятаў па абслугоўванні сувязі дзеючых франтоў – на Мурманскім, Петразаводскім і Ухцінскім напрамках. Пасля заканчэння вайны вярнуўся да працы ў Новасібірскім аэрапорце.

З набліжэннем ваеннай пагрозы з боку гітлераўскай Германіі ў сакавіку 1941 г. пачалася скрытая мабілізацыя ў краіне. У тым жа месяцы Віктар Маркавіч Купала як камандзір запасу быў прызваны на службу ў Ваенна-

паветраныя сілы (ВПС) Чырвонай арміі і накіраваны на службу ў 212-ты далёкабамбардзіровачны авіяцыйны полк (ДБАП; базіраваўся ў г. Смаленску) у складзе 42-й далёкабамбардзіровачнай авіяцыйнай дывізіі. Аснову палка склалі грамадзянскія пілоты, якія мелі вопыт палётаў у складаных метэаралагічных умовах і ў начны час, што было вырашальным пры назначэнні на камандныя пасады ў бамбардзіровачнай авіяцыі. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў чэрвені 1941 г. полк быў поўнасцю падрыхтаваны да вядзення баявых дзеянняў і з першага яе дня распачаў баявую працу.

У ноч на 23 чэрвеня 1941 г. камандзір экіпажа 5-й эскадрыллі лейтэнант Купала на самалёце ДБ-3 паспяхова выканаў баявое заданне па бамбардзіроўцы баявой тэхнікі праціўніка ў раёне Варшавы. 24 чэрвеня ён вылецеў зноў на заданне. Пазней Віктар Маркавіч так апісваў свой другі вылет:

«В первый день войны полк был в бою, получив боевое крещение. Первый день экипажи полка выполнили боевые задания успешно, без потерь. 23 июня в связи с прорывом фронта бронетанковыми частями немцев в брестском направлении нам и другим частям ВВС был дан приказ выполнить массированный налет на силы противника.

Немцы бросили против наших самолетов много истребителей. В воздушном бою под Брестом (район Кобрина) мой штурман сбил Мессершмитт-109. Нас атаковали еще два Мессершмитта и сумели поджечь нам левую силовую установку. Загорелся бензин из разбитых баков. Я дал команду экипажу покинуть самолет на парашютах. Штурман Токарев и я спаслись, радист и стрелок погибли от огня истребителей врага. Я немного обгорел, спас меня затяжной прыжок с парашютом. Еще в самолете получил тяжелое ранение левого плеча. Штурман на земле сделал перевязку своим нательным бельем. Выбирались по болоту. В итоге трудного пути (телега, поезд, самолет) с ранением я был доставлен в Москву. После выздоровления прибыл в свой полк…»

Паранены лётчык праходзіў курс лячэння і рэабілітацыі ў Першым Маскоўскім камуністычным ваенным шпіталі ў Ляфортаве (цяпер – Галоўны ваенны клінічны шпіталь імя М.Н. Бурдэнкі). Не далячыўшыся, з адкрытай ранай рукі, ён вярнуўся ў свой полк, які тым часам перадыслацыраваўся ў г. Ялец Арлоўскай вобласці РСФСР, і са жніўня 1941 г. працягнуў баявую працу. У надзвычай складаных умовах ашаламляльнай перавагі праціўніка вадзіў самалёт на бамбардзіроўку камунікацый і мотамеханізаваных калон праціўніка на найбольш небяспечных участках фронту. Усяго зрабіў 17 баявых вылетаў, у тым ліку 9 начных. Характарызаваўся як адважны і смелы лётчык, які добра вывучыў тактыку знішчальнай авіяцыі праціўніка. За поспехі ў баявой працы камандзірам палка прадстаўляўся да ўзнагароджання ордэнам Леніна, але прадстаўленне не было рэалізавана з-за пазнейшага выбыцця з часці. У снежні 1941 г. 212-ты ДБАП быў выведзены ў тыл і звернуты на фарміраванне 748-га ДБАП, пасля чаго баявая праца для лётчыка Купалы скончылася. Неўзабаве ён перанёс цяжкую аперацыю, якая аказала-

ся няўдалай. Медыцынскай камісіяй быў прызнаны нягодным да воінскай службы і 25 сакавіка 1942 г. звольнены з радоў Чырвонай арміі.

Вярнуўся да сям'і ў Новасібірск. Неаднаразова звяртаўся ў ваенкамат з просьбай аб адпраўцы на фронт і праз пэўны час дамогся вяртання на службу ў Чырвоную (з 25.02.1946 – Савецкую) армію. Атрымаў дазвол на ваджэнне транспартных самалётаў. У званні капітана служыў камандзірам транспартнага атрада 9-га перагоначнага авіяцыйнага палка ў ВПС Заходнесібірскай ваеннай акругі. Зарэкамендаваў сябе як высокакваліфікаваны лётчык, які шчыра і добрасумленна ставіўся да выканання службовага абавязку. Па стане на лістапад 1945 г. меў больш за 6 тыс. гадзін агульнага налёту. Актыўна займаўся фізічнай культурай і аднавіў падарванае вайной здароўе. Па новым рашэнні медыцынскай камісіі быў прызнаны годным да палётаў на самалётах любога тыпу.

23 сакавіка 1946 г. у званні маёра быў звольнены з радоў Савецкай арміі і вярнуўся да мірнай працы ў Заходнесібірскім упраўленні грамадзянскай авіяцыі. За кароткі час прайшоў шлях ад пілота-інструктара да начальніка лётна-тэхнічнага атрада. Лятаў на самалёце ПС-84, больш вядомым як Лі-2. У 1956 г. скончыў гадавыя курсы ўдасканальвання сярэдняга і вышэйшага начальніцкага саставу Грамадзянскай авіяцыі ў Ленінградзе, пасля чаго працягнуў працаваць у тым жа ўпраўленні начальнікам штурманскага аддзела. Прымаў актыўны ўдзел у пераводзе тэхнічнага парка на новы тып самалётаў з рэактыўнымі рухавікамі. У 1957 г. прайшоў навучанне ваджэнню найноўшага пасажырскага самалёта ТУ-104.

12 ліпеня 1957 г. – адметная дата ў гісторыі савецкай грамадзянскай авіяцыі. У гэты дзень лётчыкам быў выкананы на ТУ-104 першы ў краіне рэгулярны рэйс па маршруце Новасібірск – Свярдлоўск – Масква. На борце самалёта знаходзіліся 50 пасажыраў. За штурвалам гэтага хуткаснага лайнера быў вопытны лётчык Віктар Маркавіч Купала, які тым самым зняў узроставыя абмежаванні (пілатаваць рэактыўныя самалёты дазвалялася лётчыкам не старэй за 35 гадоў) і адкрыў дарогу многім іншым лётчыкам, якія жадалі асвоіць рэактыўную авіяцыю. Ён вярнуўся да лётнай работы, арганізаваў і на працягу 18 гадоў узначальваў 204-ты лётны атрад рэактыўных самалётаў. Дарэчы, 12 ліпеня 1957 г. таксама лічыцца датай нараджэння Новасібірскага міжнароднага аэрапорта «Талмачова», цяпер найбуйнейшага ў Сібіры.

Віктар Маркавіч паспяхова сумяшчаў абавязкі камандзіра атрада і камандзіра лётнага экіпажа. Першым у Заходняй Сібіры (у 1963 г.) ён перасягнуў рубеж у 5 млн агульных гадзін налёту. Дасканала засвоіў ваджэнне розных тыпаў пасажырскіх рэактыўных самалётаў, актыўна навучаў маладых пілотаў рабоце на гэтай складанай тэхніцы. Змястоўныя веды і найбагацейшы досвед ахвотна і настойліва перадаваў падначаленым, ад якіх неадменна патрабаваў высокай дысцыпліны і творчага падыходу да справы. Падкрэ-

сліваў: «*Безнадежных ситуаций ни у кого никогда не бывает, а у пилотов гражданской авиации тем более. Ищи, думай, пробуй! Самое главное – тщательная подготовка к любому рейсу. Пусть даже ты уже сотни раз прошел по этому маршруту, пусть штурман может о нем рассказать в стихах, ты все равно должен быть готов к любой неожиданности*». Вынікам добрасумленнага падыходу да выканання сваіх абавязкаў кожным членам атрада, якім камандаваў В.М. Купала, была адсутнасць выпадкаў аварыйных сітуацый па віне лётнага саставу. За асаблівыя заслугі ў асваенні сучаснай авіяцыйнай тэхнікі і шматгадовую безаварыйную лётную працу Віктар Маркавіч быў адзначаны ў 1966 г. ганаровым званнем «Заслужаны пілот СССР».

Толькі ў 1977 г. ён пакінуў лётную справу і перайшоў на пасаду начальніка лётна-метадычнага цэнтра пры вучэбна-трэніровачным атрадзе ў Заходнесібірскім упраўленні грамадзянскай авіяцыі (з 1964 г. – у структуры Міністэрства грамадзянскай авіяцыі СССР). У 1979 г. выйшаў на заслужаны адпачынак і пераехаў на жыхарства ў Віцебск. Праз год вярнуўся ў грамадзянскую авіяцыю. Працаваў начальнікам штаба лётнай эскадрыллі пры аэрапорце Віцебск у складзе Беларускага ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі. Толькі ў 1987 г. канчаткова выйшаў на заслужаны адпачынак і пераехаў на жыхарства ў сталіцу Беларускай ССР (цяпер – Рэспублікі Беларусь) горад-герой Мінск. Жыў у мікрараёне Сокал (Кастрычніцкі раён). Вёў актыўную патрыятычную работу сярод дзяцей і моладзі. Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці як дэпутат раённага Савета дэпутатаў, шмат зрабіў для добраўпарадкавання мікрараёна Сокал.

Памёр 17 лютага 2012 г.

Палкоўнік запасу. Заслужаны пілот СССР (16.08.1966). Кавалер ордэнаў Леніна (двойчы), Айчыннай вайны I і II ступеней, Дружбы народаў, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалёў «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы» і іншых узнагарод. Член калегіі Міністэрства грамадзянскай авіяцыі СССР.

У заключэнне хацелася б прыгадаць імёны яшчэ двух вядомых ураджэнцаў вобласці, якія былі ўшанаваны ганаровым званнем «Заслужаны пілот СССР». Гэта:

Андрэйчык Міхаіл Васілевіч (24.01.1932), ураджэнец вёскі Андрэйчыкі Ушацкага раёна. Заслужаны пілот СССР (04.02.1983). Камандзір Валгаградскага аб'яднанага авіяатрада ГПФ.

Семянкоў Аляксей Іванавіч (02/15.03.1915–16.11.2000), ураджэнец былой в. Цесалы Гарадоцкага раёна. Герой Расійскай Федэрацыі (26.01.1998). Заслужаны пілот СССР (16.08.1966). Кавалер ордэнаў Леніна (двойчы), Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга (двойчы), Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені (двойчы), Чырвонай Зоркі (тройчы) і шматлікіх медалёў. Генерал-лейтэнант авіяцыі. У 1970–1975 гг. – першы намеснік міністра грамадзянскай авіяцыі, затым першы намеснік старшыні Дзяржаўнай камісіі авіянагляду пры Савеце Міністраў СССР.

ЛІТАРАТУРА

1. **«В воздушном** бою под Брестом…» [Электронный ресурс] // Живой журнал. – Режим доступа: https://s7-direct-line.livejournal.com/181809.html. – Дата доступа: 26.08.2016.

2. **Ведомости** Верховного Совета СССР. – 1965. – № 40. – С. 585–586 ; 1966. – № 34. – С. 795–796.

3. **Купало** Виктор Маркович. Данные с учетно-послужной картотеки [Электронный ресурс] // Память народа. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/heroes/kld-card_uchet_officer9972191 /. – Дата доступа: 31.10.2021.

4. **Купало** Виктор Маркович. Наградной лист в архивном банке документов (архивные материалы ЦАМО РФ. – Ф. 33. Оп. 690306. Д. 2087). – Режим доступа: http://podvignaroda.ru/?#id=43806352&tab=navDetailDocument. – Дата доступа: 31.10.2021.

5. **Купало** Виктор Маркович. Учетная карточка в архивном банке документов [Электронный ресурс] // Подвиг народа. – Режим доступа: http://podvignaroda.ru/?#id=1375721773&tab=navDetailManCard/. – Дата доступа: 31.10.2021;

6. **Купало** Виктор Маркович [Электронный ресурс] // Государственное учреждение образования «Средняя школа № 194 г. Минска». – Режим доступа: http://sch194.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=45171/. – Дата доступа: 26.08.2016.

7. **Подвиг** народа в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг. [Электронный ресурс] // Подвиг народа. – Режим доступа: http://podvignaroda.ru/?#tab=navHome. – Дата доступа: 31.10.2021.

Гонтараў Д.М. *(в. Багатырская, Полацкі раён)*

УРАДЖЭНЦЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў ПОЛЬСКІХ ЗЛУЧЭННЯХ БРЫТАНСКАЙ АРМІІ НА ФРАНТАХ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Жыхары Беларусі доўгі час нічога не ведалі пра лёс сваіх суайчыннікаў з Другога польскага корпуса і Першай польскай асобнай паветрана-дэсантнай брыгады. Сёння ў Рэспубліцы Беларусь ужо няма ніводнага ветэрана ўзброеных сіл саюзнікаў на Захадзе. Аднак ёсць унікальныя артэфакты і ўзнагароды, гісторыі беларускіх жаўнераў польскага войска, якія ўдзельнічалі ў бітве пад Монтэ-Касіна і аперацыі «Маркет – Гардэн». Усё гэта – неад'емная частка вайсковай мінуўшчыны Беларусі.

Мэта работы: узнаўленне імёнаў і ўсведамленне гераічнага лёсу ўраджэнцаў Віцебшчыны, якія ўдзельнічалі ў барацьбе з нацызмам у складзе польскіх злучэнняў армій саюзнікаў на франтах Другой сусветнай вайны.

Армія Андэрса фарміравалася ў Савецкім Саюзе ў 1941 г. з польскіх ваеннапалонных і іншых грамадзян міжваеннай Польскай рэспублікі, вызваленых з савецкіх лагераў [1, с. 28].

Паколькі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна да 1939 г. уваходзілі ў склад польскай дзяржавы, у дадзенае злучэнне трапіла шмат беларусаў і ўкраінцаў. У арміі Андэрса ваявала каля 8 тыс. беларусаў, у тым ліку і выхадцы з Віцебскага краю.

Забеспячэнне арміі Андэрса (2-га польскага корпуса) ажыццяўлялася як савецкім урадам (прадукты харчавання і ўзбраенне), так і брытанцамі (экіпіроўка). Амаль усе польскія фарміраванні выкарыстоўвалі ў якасці абмундзіравання форму брытанскіх узброеных сіл.

Корпус быў накіраваны на прарыў абарончай лініі «Густаў», якая закрывала падыходы да Рыма. Перад воінскім злучэннем была пастаўлена задача авалодаць стратэгічнай вышынёй каля манастыра Монтэ-Касіна [2, с. 51]. У гэтай бітве корпус панёс самыя вялікія страты. Усе, хто змагаўся на полі бою, сталі кавалерамі Памятнага крыжа Монтэ-Касіна – узнагароды для ўдзельнікаў бітвы [3, с. 69].

Падчас даследавання мы прыйшлі да высновы, што 28 выхадцаў з Віцебшчыны загінулі ў бітве пад Монтэ-Касіна.

У 1946–1950 гг. каля тысячы чалавек, дэмабілізаваных з брытанскай арміі, вярнуліся ў БССР. Так, напрыклад, удзельнік бітвы пад Монтэ-Касіна, ураджэнец Мёршчыны ***Уладзімір Міклушонак*** вярнуўся да сям'і толькі ў 1948 г. Доўга працаваў у калгасе, зведаў горыч сталінскіх рэпрэсій.

У гады Другой сусветнай вайны нашы суайчыннікі змагаліся з нацыстамі ў радах Першай польскай асобнай паветрана-дэсантнай брыгады; трое з іх паходзілі з Віцебшчыны і ўдзельнічалі ў аперацыі «Маркет – Гардэн» у 1944 г. Узгадаем імёны некаторых вайскоўцаў – ураджэнцаў Прыдзвіння, што загінулі падчас гэтага манеўру:

1. Старшы стралок **Станіслаў Копец**, ураджэнец Браслаўшчыны.
2. Стралок роты сувязі **Максім Шыляк**, выхадзец з Докшыцкага краю.
3. Сапёр **Антоній Галай**, малая радзіма якога – Лепельшчына.
4. Стралок **Уладзіслаў Хамянок** з Полаччыны.

1 верасня 2019 г. у г. Мёры Віцебскай вобласці адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў памяць пра беларусаў у арміі Андэрса. Гэта падзея была прымеркавана да ўганаравання воінаў-землякоў, якія ваявалі супраць нямецкіх захопнікаў у складзе баявых злучэнняў брытанскай арміі на Заходнім фронце (1939–1945).

Сённяшнім беларусам варта разумець, што лёс гэтых людзей – важная і неад'емная старонка вайсковай гісторыі Беларусі. Нам трэба памятаць усіх тых, хто паклаў сваё жыццё на алтар перамогі над нацызмам [4, с. 3].

У выніку працы намі былі ўзноўлены 39 імён ураджэнцаў Віцебшчыны ў польскіх злучэннях брытанскай арміі ў барацьбе з нацызмам у гады Другой сусветнай вайны і складзены спіс з загінуўшых 28 чалавек у бітве пад Монтэ-Касіна.

Сабраная інфармацыя пра землякоў у Другім польскім корпусе і Першай польскай асобнай паветрана-дэсантнай брыгадзе ў складзе брытанскіх

узброеных сіл у гады Другой сусветнай вайны была ўпарадкавана ў форме мультымедыйнага рэсурсу, які створаны ў праграме Microsoft Power Point.

ЛІТАРАТУРА

1. **Грыбоўскі, Ю. В.** Беларусы ў бітве за Монтэ-Касіна : артыкулы, дакументы / Ю. В. Грыбоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 121 с. : іл.

2. **Зямчонак, І.** Ваколіцы Парыжа: старонкі гісторыі Пастаўскага Паазер'я / І. Зямчонак. – Гродна : Ратуша, 2004. – 104 с. – (Мястэчкі даўняй Віленшчыны).

3. **Зямчонак, І.** Мястэчка пры гасцінцы: старонкі гісторыі Варапаева і бліжэйшых населеных пунктаў / І. Зямчонак. – Мінск : Беларусь-Інфарм-Сэрвіс, 1995. – 136 с.

4. **Мельнікаў, І. В.** Забытыя героі: жаўнеры з Беларусі ў Другім польскім корпусе і Першай польскай асобнай паветрана-дэсантнай брыгадзе / І. В. Мельнікаў. – Мінск : Альфа-кніга, 2017. – 127 с.

Даниленко С.Н. *(г. Могилев)*

ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ НАРОДНЫХ УЧИЛИЩ НА ТЕРРИТОРИИ ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ В КОНЦЕ XVIII – НАЧАЛЕ XIX в.

В начале XIX в. в Российской империи был проведен целый ряд образовательных реформ, направленных на формирование унифицированной школьной системы. Одним из таких мероприятий было создание светских учебных заведений – народных училищ.

Основание и деятельность народных училищ на территории Витебской губернии имели ряд особенностей. 29 января 1794 г. было торжественно открыто Витебское народное училище. В это время Витебск был уездным городом Полоцкой губернии, и согласно Уставу 1786 г. в нем полагалось создание малого народного училища. Однако белорусский генерал-губернатор Петр Богданович Пассек предложил Комиссии об учреждении училищ открыть в Витебске не малое двухклассное народное училище, а большое четырехклассное. В письме, адресованном Комиссии об учреждении училищ, П.Б. Пассек сообщал, что «в городе Витебске желающих обучаться малолетних детей состоит до двухсот человек» [2, с. 109]. Комиссия об учреждении училищ, «видев особливое рачение оного г. генерал-губернатора в распространении столь полезных государству заведений и отдавая оному достодолжную честь и справедливость», пошла навстречу просьбе П.Б. Пассека и разрешила открытие в Витебске четырехклассного училища [2, с. 109]. В город над Двиной были направлены подготовленные в Петербургской учительской семинарии педагоги «с нужными для того книгами и другими пособиями» [2, с. 109]. Первыми учителями Витебского четырехклассного училища стали: Семен Карпилович, преподававший арифметику, геометрию,

механику, гражданскую архитектуру, физику, латинский и российский языки в 3-м и 4-м классах; Кирилл Сохович – учитель географии, политической и естественной истории в 3-м и 4-м классах; Трофим Мартынович – учитель всех предметов 2-го класса; Владимир Сохович – учитель всех предметов 1-го класса и рисования. Однако ожидания П.Б. Пассека не оправдались. В первый год работы Витебского народного училища в нем обучались всего 27 человек.

В конце 1796 г. Полоцкая и Могилевская губернии были объединены в одну Белорусскую с назначением губернским городом Витебска. В связи с этим с 1 мая 1797 г. четырехклассное училище в Витебске стало главным народным училищем.

Повышение статуса Витебского народного училища не повлияло на увеличение числа желающих в нем обучаться, а, наоборот, происходит резкое снижение количества учеников. В связи с этим в 1798 г. губернатор Белорусской губернии Семен Семенович Жегулин направил в Комиссию об учреждении училищ специальное отношение, в котором указал на необходимость закрытия двух старших классов в Витебском главном народном училище. Свое предположение С.С. Жегулин объяснял тем, что «число учеников в высших двух классах столь мало, что сумма, издерживаемая на содержание тех классов учителей, употребляется вотще: ибо в 3-м классе состоят только два, а в четвертом ни одного ученика; да и во втором находится двое же». Малочисленность учеников в Витебском народном училище негативно сказывалась на профессиональной деятельности учителей учебного заведения. Как свидетельствовал С.С. Жегулин: «Учителя тех классов, хотя и получают определенное им жалованье, но пребывают в праздности и, теряя время без пользы общественной, скучают сами жребием своим» [3, с. 154].

Малое число учеников старших классов губернатор обосновывал религиозным фактором, а именно «по причине общей всех здешних обывателей к религии униатского закона приверженности» [3, с. 154]. В качестве положительного примера С.С. Жегулин приводил Могилев, в котором «все почти обыватели – благочестивые, пекутся о воспитании детей своих, отдавая охотно для учения в состоящие там училища» [3, с. 154]. Исходя из этого, глава губернии предложил после ликвидации старших классов в Витебском народном училище «Могилевское же большое утвердить главным Белорусским» [3, с. 154–155].

После рассмотрения отношения С.С. Жегулина Комиссией об учреждении училищ было принято решение сохранить старшие классы Витебского главного народного училища, несмотря на все приведенные против этого аргументы. Примечательно, что в ответе белорусскому губернатору Комиссия не преминула напомнить о роли личности губернатора в деле народного просвещения. В ответе говорилось, что «чрез содействие его, г. губернатора, яко попечителя о просвещении народном, единственно для пользы оного

устроенном, те классы не будут оставаться впраздне, зная при том из опытов, что вкус к наукам не вдруг, но временем приобретается; без поддержания же оного со стороны начальства, не уповательно, чтобы приращение в науках могло само по себе возникнуть, а тем менее распространиться» [3, с. 155].

В конце XIX в. материальное положение Витебского народного училища, как и других училищ края, существенно ухудшилось. Все чаще в Комиссию об учреждении народных училищ стали поступать обращения о недостаточном финансировании городскими думами учебных заведений. На 1 января 1801 г. Витебская городская дума не доплатила Белорусскому приказу общественного призрения 4838 руб. 64 коп. Директор училищ Белорусской губернии С.В. Цветковский в донесении сообщал, что «чины и служители школьные не только расходных и, за неимением особого для школы дома, квартирных денег, но и жалованья в надлежащее время и в положенном количестве не получают» [4, с. 195]. Учитель Витебского главного училища К.А. Канаровский-Сохович сообщал в Комиссию об учреждении народных училищ, что за восемь лет существования училища еще ни разу городская дума не вносила денежные суммы на содержание библиотеки и прочие учебные пособия, что было предусмотрено уставом 1786 г. (всего накопилось около 3 тыс. руб.). По словам К.А. Канаровского-Соховича, суммы, предусмотренные на содержание библиотеки и покупку других пособий, присваивал местный городовой «на прочие надобности» [4, с. 195].

В 1803 г. была проведена очередная инспекция училищ Витебской губернии, по результатам которой было принято решение, согласно которому народные училища Витебской губернии «имеют остаться на особенном содержании» [5, с. 25].

Вскоре Виленский университет, которому с 1803 г. подчинялись все учебные заведения белорусских губерний, разработал и утвердил «Предначертание штата открытых училищ в белорусских губерниях». В соответствии с данным документом штат Витебского главного народного училища должен был состоять из директора училища, учителей первого, второго, третьего и четвертого классов, российского и немецкого языков, а также рисования.

С 1802 г. Витебское народное училище и все училища Витебской губернии возглавлял титулярный советник К.А. Канаровский-Сохович. Он обладал высоким для того времени уровнем образования. Окончил Переяславскую духовную семинарию, Киевскую академию и Санкт-Петербургскую учительскую семинарию. После окончания последней в 1793 г. он был определен учителем исторических наук в Витебское народное училище. По наблюдениям визитатора Платера, который инспектировал Витебское народное училище в 1808 г., К.А. Канаровский-Сохович совмещал «должность учителя вместе с должностью директора с примерною рачительностью, с пользою для училищ и отменным успехом учеников» [1, с. 413]. Положительно Платер охарактеризовал также работу губернского секретаря Димара-Си-

мановича, который с 1 января 1797 г. преподавал в училище математические и физические науки, российский и латинский языки. Как отмечал Платер: «Нельзя не отдать справедливости способностям сего учителя, хорошему его обращению с учениками и порядочному обучению» [1, с. 413].

К началу XIX в. количество учеников в Витебском главном народном училище значительно увеличилось. Так, в 1808 г. в нем обучался 131 человек, из них 112 мальчиков и 19 девочек.

Витебское народное училище имело небольшую библиотеку, которая состояла из 254 книг на российском языке и 88 – на латинском, французском, немецком, польском и итальянском языках (для сравнения, библиотека Могилевского народного училища насчитывала около 600 изданий) [1, с. 413].

Полоцкое народное училище было торжественно открыто 15 апреля 1789 г. и изначально считалось главным. Однако после того как в 1797 г. Полоцк утратил статус губернского центра, а Витебск приобрел его, высшие классы в Полоцком народном училище были упразднены. С этого времени Полоцкое училище состояло только из двух классов и двух учителей, «из коих один обучает предметам второго класса и рисовать, сверх того некоторым предметам 3 класса за особую плату; другой предметам первого класса» [1, с. 421]. С 1797 г. образовательный процесс в Полоцком народном училище был организован в соответствии с Уставом 1786 г. для малых народных училищ, кроме истории и географии, которые преподавал учитель 2-го класса. Как отмечал визитатор Платер, который посетил Полоцкое народное училище в 1808 г., «оба учителя исполняют должности свои с надлежащей рачительностью» [1, с. 422].

В 1799 г. народные училища были открыты в Велиже и Невеле. Хотя еще в 1788 г. П.Б. Пассек сообщал императрице Екатерине II о возможности открытия на территории Полоцкой губернии народных училищ в Велиже и Невеле. По всей вероятности, сказалось отсутствие подготовленных учительских кадров.

Невельское малое народное двухклассное училище было открыто 19 августа 1799 г. В собственность училищу был отпущен деревянный дом, находящийся «в центре города близ Преображенского монастыря, на крутом берегу реки Еменки», как раз в том месте, где ныне проходит шоссе [6, с. 4].

Первым учителем Невельского училища стал титулярный советник Н. Котловский, который 19 августа 1799 г. и открыл училище, а 1 января 1800 г. был назначен второй, младший учитель – мещанин Петр Белинский [6, с. 4].

Сколько было учеников при открытии училища, в делах никаких сведений не сохранилось, но можно предположить, что их было приблизительно столько же, сколько числилось по ведомости за 1803 г. (с этого года ведутся дела Витебской дирекции народных училищ), т. е. около 38 человек (32 мальчика и 6 девочек) [6, с. 4].

В 1803 г. Невельское народное училище посетил губернатор и нашел в нем порядки «одобрительные» и успехи «доброхвальные», а потому распорядился расширить программу преподавания в Невельском малом народном училище прохождением истории и географии по примеру больших народных училищ, и на эти предметы было добавлено из средств города еще по 300 руб. [6, с. 5].

В 1809 г. училище инспектировал «визитатор из Петербурга», которого встречали с большим торжеством. В присутствии визитатора были проведены экзамены, и он нашел порядки и успехи в училище «похвальными», а потом и «объявил учащим и учащимся свое удовольствие». Кроме того, поручил Котловскому выбрать лучших учеников для зачисления их стипендиатами на казенный счет в Санкт-Петербургскую гимназию [6, с. 6].

В 1819 г. Невельское малое народное училище в соответствии с уставом от 5 ноября 1804 г. было преобразовано в двухклассное уездное училище.

В отличие от различных уездных училищ, Невельское народное училище не испытывало проблем с количеством учеников, в нем никогда не было менее 30 учеников (в среднем число учащихся колебалось от 30 до 49 человек) [6, с. 11]. Сохранилось здание Невельского уездного училища, в котором в настоящее время находится Невельский многопрофильный техникум.

Таким образом, в начале XIX в. на территории Витебской губернии действовали народные училища в Витебске, Полоцке, Велиже и Невеле. После создания Министерства народного просвещения в 1802 г. и опубликования «Устава учебных заведений подведомых университетам» народные училища Витебской губернии перешли в ведение Виленского университета. Учебные предметы, способ их преподавания и распоряжение временем в народных училищах полностью соответствовали Уставу 1786 года. Обучение в народных училищах было доступным всему населению, а сами учебные заведения сохранили всесословный характер.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Выписка** из рапорта члена главного училищ правления камер-юнкера графа Платера, обозревавшего в сем году училища в Могилевской и Витебской губерниях // Периодическое сочинение об успехах народного просвещения. – [1808?]. – № 21. – С. 399–437.

2. **Об открытии** в Витебске четвероклассного училища // Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из Архива Министерства народнаго просвещения. – Санкт-Петербург : Изд. М-ва нар. просвещения, 1893–. – Т. 1 : Учебныя заведения в западных губерниях до учреждения Виленскаго учебнаго округа, 1783–1803 / введ. И. Корнилова. – 1893. – С. 109–113.

3. **О несогласии** Комиссии училищ на закрытие в г. Витебске двух высших классов главного народного училища // Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из Архива Министерства народнаго просвещения. – Санкт-Петербург : Изд. М-ва нар. просвещения, 1893–. – Т. 1 : Учебныя заведения в за-

падных губерниях до учреждения Виленскаго учебнаго округа, 1783–1803 / введ. И. Корнилова. – 1893. – С. 153–155.

4. **О предложении** Белорусскому приказу общественного призрения изыскать потребные суммы на нужды училищ Белорусской губернии // Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из Архива Министерства народнаго просвещения. – Санкт-Петербург : Изд. М-ва нар. просвещения, 1893–. – Т. 1 : Учебныя заведения в западных губерниях до учреждения Виленскаго учебнаго округа, 1783–1803 / введ. И. Корнилова. – 1893. – С. 194–198.

5. **Предначертание** устроения училищ в округе императорского Виленского университета сообразно с Высочайше утвержденными предварительными правилами Народного просвещения и общим уставом того же университета и училищ его округа // Периодическое сочинение об успехах народного просвещения. – 1804. – № 7. – С. 21–63.

6. **Чубов, П. И.** Невельское уездное училище Витебской губернии за 100 лет существования (1799–1899) / П. И. Чубов. – Витебск : Губернская типолитография, 1899. – 36 с.

Иванова Т.П. *(г. Витебск)*

БОЕВОЙ ПУТЬ ИЗВЕСТНОГО БЕЛОРУССКОГО ПРАВОВЕДА, УЧАСТНИКА ОСВОБОЖДЕНИЯ ВИТЕБСКА И.А. ЮХО

В 2021 г. исполнилось 100 лет со дня рождения Иосифа Александровича Юхо (1921–2004), известного отечественного правоведа, профессора, доктора юридических наук, профессора Белорусского государственного университета, основателя научной школы истории государства и права Беларуси, автора ряда учебников и публикаций по соответствующей дисциплине.

И.А. Юхо родился в Минске 19 марта 1921 г., здесь же окончил общеобразовательную школу. Поступил в Белорусский политехнический институт. Затем был призван в Красную армию. Участник Великой Отечественной войны, в частности, и боев под Витебском.

Цель работы: изучение боевого пути в годы Великой Отечественной войны известного белорусского правоведа И.А. Юхо.

Материалами для исследования послужили документы Центрального архива Министерства обороны Российской Федерации. Материалы размещены на сайте «Память народа», представляющем собой электронный банк документов периода Великой Отечественной войны. Методы исследования: анализ, синтез, сравнение, обобщение.

Как свидетельствуют исследованные материалы, И.А. Юхо был призван в ряды Красной армии в 1939 г. Место призыва – Минск, Ворошиловский допризывной пункт. В 1941 г. окончил Горьковское училище зенитной артил-

лерии. В годы Великой Отечественной войны служил в войсках противовоздушной обороны. Согласно архивным документам участвовал в военных действиях с 22 июня 1941 г. до 16 мая 1945 г. Воевал под Москвой, на Брянщине, под Смоленском, Витебском, Минском, затем на территории Прибалтики.

В материалах Центрального архива Министерства обороны Российской Федерации на хранении имеются: послужной список Иосифа Александровича Юхо в составе учетно-послужных карточек офицерского состава, в частности по данным на 13 декабря 1941 г., а также наградные документы – о награждении орденами Красного Знамени, Отечественной войны I степени [6] и медалями, сведения о ранении [8].

И.А. Юхо воевал в 16-й воздушной армии Вооруженных сил СССР. Был дважды тяжело ранен в боях. Известна дата первого ранения – 20 ноября 1941 г. Затем переведен из военной части 1710-й зенитной артиллерийской дивизии в военную часть 368-го озад (отдельный зенитный артиллерийский дивизион) МЗА (малокалиберная зенитная артиллерия) Куйбышевской ПТО (противотанковая дивизия). Дата прибытия – 10 марта 1943 г.

В архиве содержатся документы о награждении И.А. Юхо орденом Красной Звезды. Дата награждения – 24 февраля 1942 г. Дата подписания документа – 17 января 1942 г. согласно приказу № 44 от 17 января 1942 г. Военного Совета Западного фронта [6]. В фонде есть и приказ от 24 июля 1944 г. № 03/н (г. Смоленск) по части 8Т дивизии противовоздушной обороны:

«От имени Президиума Верховного Совета Союза ССР за образцовое исполнение боевых заданий командирован на фронт борьбы с немецкими захватчиками и проявленные при этом доблесть и мужество награжден орденом Красной Звезды старший лейтенант Юхо Иосиф Александрович». Документ содержит подписи командира дивизии полковника Купчего и начальника Штаба 8Т дивизии полковника Нагорного. В этот период И.А. Юхо являлся командиром батареи 368-го отдельного дивизиона малокалиберной зенитной артиллерии.

Согласно архивным документам приведенные выше данные рассекречены приказом Министерством обороны Российской Федерации от 8 мая 2007 г., что и позволило использовать материалы в процессе изучения боевого пути будущего известного белорусского правоведа.

И.А. Юхо, согласно наградным документам, награжден и медалью «За оборону Москвы» [9].

И.А. Юхо участвовал в операции «Багратион» в составе Западного фронта, освобождал Витебск, Полоцк.

В документах называется место службы И.А. Юхо в мае – августе 1944 г. – 81-я дивизия противовоздушной обороны [7].

По окончании освобождения Беларуси И.А. Юхо воевал в Восточной Пруссии. Награжден медалью «За победу над Германией в Великой Отечественной войне».

Завершил службу И.А. Юхо в звании майора 26 декабря 1945 г. (368 оа (отдельная армия) дн ВФ ПВО 993 аи ПТО).

В других биографических сведениях содержится информация о награждении И.А. Юхо орденом Красной Звезды и девятью медалями.

Среди наград И.А. Юхо современного периода – медаль Франциска Скорины [10, с. 261].

Профессиональная деятельность Иосифа Александровича Юхо началась после Великой Отечественной войны. Закончил юридический факультет БГУ. Являлся аспирантом Академии наук БССР. Защитил кандидатскую диссертацию, затем докторскую.

И когда в 1963 г. в учебный процесс подготовки юристов БГУ вводится новая дисциплина – «История государства и права Беларуси», то ее преподавателем назначается именно И.А. Юхо. Научное наследие доктора юридических наук, профессора Иосифа Александровича Юхо способствовало развитию белорусской историко-правовой науки и юридического образования. Достояние И.А. Юхо содействует сегодня воспитанию следующих поколений юристов [2, с. 71].

Жизненный путь известного юриста прервался в 2004 г. Похоронен И.А. Юхо на Минском военном кладбище [1, с. 358].

Материалы о жизненном и профессиональном пути И.А. Юхо содержатся в энциклопедиях, архиве Министерства обороны Российской Федерации. В Стародорожском художественном музее Республики Беларусь экспонируется стенд, посвященный И.А. Юхо: его книги, труды, художественные произведения, в частности, портрет ученого, выполненный Е.Н. Тихоновичем в 1995 г. Доктору юридических наук, профессору И.А. Юхо была посвящена научная конференция правоведов БГУ, приуроченная к 90-летию ученого, собраны материалы к 100-летию со дня его рождения.

Обнародование архивных материалов предоставило возможность исследовать аспекты военной биографии белорусского правоведа Иосифа Александровича Юхо, ввести в научный оборот новые исторические факты, использовать их для популяризации жизни и деятельности известной личности Беларуси.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Арлоў, У.** Язэп Юхо / У. Арлоў // Імёны свабоды. – 3-е выд. – 2015. – С. 356–358.

2. **Горбат, Д. Г.** И. А. Юхо – основатель научной историко-правовой школы Беларуси / Д. Г. Горбат // Роль личности в истории государства и права Беларуси : Респ. науч.-теорет. конф. – Минск, 2016. – С. 70–71.

3. **Маслыка, Г. А.** Юхо Іосіф Аляксандравіч / Г. А. Маслыка// Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1 : Дадатак : Шчытнікі – ЯЯ. – С. 222–223.

4. **Памяць** і слава: Юхо Іосіф Аляксандравіч : да 90-годдзя з дня нараджэння / рэдкал.: С. А. Балашэнка [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2011. – 175 с. – (Memoria et Gloria).

5. **Центральный** архив Министерства обороны Российской Федерации (ЦАМО) [Электронный ресурс] // Память народа. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/. – Дата доступа: 15.06.2021.

6. **ЦАМО.** – Ф. 33. Оп. 682520. Д. 245.

7. **ЦАМО.** – Ф. 33. Оп. 686044. Д. 3210

8. **ЦАМО.** – Ф. 58. Оп. 818883. Д. 96.

9. **ЦАМО.** – Ф. 13608. Оп. 20398. Д. 96.

10. **Юрыдычны** факультэт : гісторыя. Сучаснасць. Імёны / рэдсавет: С. А. Балашэнка (старш.) [і інш.] ; рэдкал.: С. А. Балашэнка (адк. рэд.), А. В. Шыдлоўскі (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 260–261.

Каплиев А.А. *(г. Минск)*

КАДРОВОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ ЗДРАВООХРАНЕНИЯ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ 1930-х гг. В ОТРАЖЕНИИ СТАТИСТИЧЕСКИХ ДАННЫХ (на материалах Витебской области)

В советской историографической традиции тема развития здравоохранения БССР в конце 1930-х гг. рассматривалась в преимущественно комплиментарном ключе, что было обусловлено принятой в то время идеологией, трактовавшей советскую медицину как «лучшую в мире» [2]. Постсоветская белорусская историография в значительной степени унаследовала часть оценок периода господства марксистско-ленинской методологии, особенно в контексте изучения межвоенного периода в истории Беларуси, в рамках которого эффективная советская модель здравоохранения традиционно противопоставляется упадку медицины в Западной Беларуси.

В немалой степени подобной оценке способствуют данные официальной статистики, которые в абсолютных числах демонстрировали значимый рост основных показателей развития здравоохранения БССР в конце 1930-х гг. [1; 4; 5]. Однако детальное изучение статистической информации советского здравоохранения показывает также и противоречивые тенденции в становлении межвоенной медицины в БССР. Настоящая статья раскрывает особенности кадрового обеспечения здравоохранения Беларуси в конце 1930-х гг. на примере Витебской области.

В период между двумя войнами на территории Советской Беларуси были сделаны значимые шаги для увеличения обеспечения населения медицинским персоналом: открыты два медицинских института – в Минске (1921) и Витебске (1934), развернута сеть из более 20 медицинских школ и училищ, организованы курсы и программы повышения квалификации медицинского персонала. В связи с организацией собственных центров подготовки врачей

количественная обеспеченность БССР медицинским персоналом должна была неуклонно возрастать. Однако до конца 1930-х гг. сохранялись и негативные тенденции в медицинском обслуживании населения, особенно в сельской местности. Так, формальный рост общего количества врачей в Витебской области (532 в 1938 г. и 543 в 1939 г.) не соответствовал реальной картине на местах, когда около 1/5 всех врачебных должностей в регионе не были заняты специалистами (табл. 1). Более того, по отдельным специальностям количество врачей уменьшилось: если в 1938 г. в Витебской области было 232 терапевта, то в 1939 г. только 207. Также уменьшилось количество офтальмологов, невропатологов, дерматовенерологов, эпидемиологов и судмедэкспертов [3, л. 9–10].

Таблица 1. Занятость врачебных должностей в Витебской области в 1938–1939 гг. [3, л. 7]

Год	Число врачебных должностей		Процент заполнения штатов
	Штатных	Занятых	
1938	1 146	953	83,2
1939	1 203,5	989	82,2

Данная тенденция особенно ярко проявилась в сельских районах, где в конце 1930-х гг., несмотря на устойчивый рост, были замещены немногим более половины всех врачебных должностей (рис. 1).



Рисунок 1. Замещение врачебных должностей в сельской местности по Витебской области в 1937–1939 гг.

Подобная ситуация объясняется множеством факторов, одним из которых становилось нежелание молодых специалистов работать в сельской

местности и их «бегство» (терминология официальных документов периода) преимущественно в крупнейшие города БССР и РСФСР. Так, в Витебской области основное число врачей было сконцентрировано только в крупнейших городах – Витебске, Полоцке и Орше, с преобладанием Витебска (табл. 2).

Таблица 2. Количество врачей в крупнейших городах Витебской области в 1938–1939 гг. [3, л. 10]

Города	Число врачей	
	1 938	1 939
Витебск	289	283
Полоцк	30	34
Орша	46	45
ВСЕГО	365	362

В то же время в сельской местности проживало меньшее число докторов, а количество населения, приходившегося на одного врача, было гораздо значительнее, чем в городах. Так, даже на 1 января 1940 г. в Витебской области оставались неукомплектованными 40 врачебных участков, или 64 ставки докторов. В Освейском районе во всех 4 врачебных участках отсутствовали врачи, в Бешенковичском районе 6 врачебных участков были вакантными, в Лиозненском – 4, Россонском – 3, Сиротинском – 4 [3, л. 9].

В отношении среднего медицинского персонала наблюдалась более сбалансированная ситуация. Традиционно основу оказания медицинской помощи на селе составляли именно средние медработники, что обусловило более высокий процент занятия фельдшерских должностей в сельской местности (табл. 3).

Таблица 3. Динамика движения среднего медицинского персонала в Витебской области в 1938–1939 гг. [3, л. 15]

Должности	1938			1939		
	всего	в городах	в сельской местности	всего	в городах	в сельской местности
Штатных	3 297	2 312	985	4 053,5	2 837,5	1 216
Занятых	3 130	2 249	881	3 671,5	2 673	998,5
Процент занятых должностей	94,9	97,3	89,5	90,5	94,2	82,1

Следует также отметить не только количественные, но и качественные характеристики медицинского персонала Витебской области в конце 1930-х гг. Так, 95% врачей, работавших на амбулаторных участках, являлись специалистами со стажем работы до 3 лет, на больничных врачебных участках – 57,7% со стажем до 3 лет и 23% со стажем до 5 лет. Из всех 77 вра-

чей в сельской местности 75,3% составили врачи со стажем работы до 3 лет [3, л. 17].

Что касается образовательного уровня среднего медицинского персонала, то значительную долю составляли работники, не окончившие профильные профессиональные учреждения образования. Так, в городах только 59,4% средних медработников имели профильное образование, в сельской местности – 70% [3, л. 17]. При этом в ряде районов преобладающее количество акушерок не имело законченного профессионального образования, например, в Дриссенском районе из 27 акушерок 11 трудились без соответствующего образования, Лиозненском из 27 – 14, Меховском из 12 – 9, Полоцком из 32 – 12, Россонском из 18 – 10, Толочинском из 24 – 14. Идентичная ситуация сложилась и с профессиональным образованием фельдшеров: из 22 фельдшеров в Лиозненском районе 14 не имели медицинского образования, Меховском из 15 – 7, Оршанском из 57 – 27, Толочинском из 23 – 9 [3, л. 17].

Таким образом, как в количественном измерении, так и в отношении квалификации медицинского персонала в конце 1930-х гг. продолжал существовать значительный дисбаланс между городом и сельской местностью. Соответственным было положение с обеспеченностью медицинских учреждений (табл. 4).

Таблица 4. Обеспеченность больничными койками населения Витебской области на 1 тыс. человек населения [3, л. 28]

Местность	Число коек	Коек приходилось на 1 тыс. человек населения
г. Витебск	1 397	8,3
г. Полоцк	390	13,8
г. Орша	485	14,6
Вся остальная часть области	2 007	2,0
Всего по области	4 279	3,5

Данное положение привело к консервации тенденций 1920-х гг., когда сельские жители обращались за медицинской помощью в лечебные учреждения крупных городов. Так, процент занятости коек городских лечебных учреждений сельским населением в среднем превышал треть: в Витебске 22,8% больничных коек было занято сельскими жителями, в Полоцке – 47,2%, в Орше – 41,2% [3, л. 28].

Подводя итоги изложенного, следует отметить, что, несмотря на в целом положительные показатели выполнения программ пятилетних планов в области строительства здравоохранения БССР, к концу 1930-х гг. сохранялись негативные явления в области обеспечения медицинской помощью, прежде всего сельского населения. Интенсивная подготовка врачебных и фельдшерских кадров сопровождалась нежеланием молодых специалистов работать

в сельской местности и их миграцией в крупные города. Подобные явления были характерны для здравоохранения БССР на всем протяжении межвоенного периода, а их преодоление относится уже к послевоенному этапу развития страны.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Абраменко, М. Е.** Формирование советской системы здравоохранения на Витебщине (1917–1941 гг.) / М. Е. Абраменко // Вестн. Витеб. гос. мед. ун-та. – 2005. – Т. 4, № 1. – С. 115–120.

2. **Анищенко, К. Н.** Развитие здравоохранения Белорусской ССР в годы предвоенных пятилеток (1928–1941 гг.) : автореф. дис. … канд. мед. наук : 14.00.33 / К. Н. Анищенко ; Мин. гос. мед. ин-т. – Минск, 1975. – 16 с.

3. **Государственный** архив Российской Федерации. – Ф. 8009. Оп. 6. Д. 530.

4. **Тищенко, Е. М.** Здравоохранение Беларуси в XIX–XX веках / Е. М. Тищенко. – Гродно : [б. и.], 2003. – 269 с.

5. **Тищенко, Е. М.** Основные тенденции в развитии здравоохранения БССР в предвоенное десятилетие / Е. М. Тищенко, С. А. Ситкевич // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 14 крас. 2017 г. – Мінск, 2018. – Вып. 16. – С. 273–279.

Карпекін К.Р. *(г. Віцебск)*

МАЁНТАК ЧАРНАРУЧЧА ЛЁЗНЕНСКАЙ ВОЛАСЦІ АРШАНСКАГА ПАВЕТА Ў СЯРЭДЗІНЕ XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

У канцы XVIII ст. на беларускіх тэрыторыях каля 60% зямлі належала памешчыкам, падобная сітуацыя захоўвалася і да сярэдзіны XIX ст., калі памешчыцкія ўладанні складалі каля 64% зямельнага фонду. У выніку правядзення рэформы 1861 г. да пачатку XX ст. яны скараціліся прыкладна на 1/3, тым не менш застаючыся важным складнікам сацыяльна-эканамічнага развіцця. Па сённяшні дзень у Беларусі захаваліся некаторыя сядзібныя дамы, гаспадарчыя пабудовы, паркі былых маёнткаў, якія з'яўляюцца турыстычным патэнцыялам краіны.

У межах Лёзненскай воласці Аршанскага павета паводле стану на 1910 г., налічвалася 111 разнастайных пасяленняў, у тым ліку 11 маёнткаў і 8 фальваркаў [13, с. 124]. Адным з гэтых маёнткаў было Чарнаручча, гісторыі якога і прысвечана дадзенае даследаванне.

Найбольш раннія звесткі пра згаданы маёнтак, якія ўдалося выявіць, адносяцца да першай чвэрці XVIII ст. У той час Чарнаручча, якое значылася фальваркам, належала князю, маршалку ковенскаму Багуславу Агінскаму (карыстаўся гэтымі землямі пан Ліпскі). Затым, відаць, пасля смерці

Б. Агінскага ў 1730 г. фальварак перайшоў да яго старэйшага брата – ваяводы віцебскага Марцыяна Міхала Агінскага. У сваю чаргу той у жніўні 1744 г. падзяліў уладанні паміж нашчадкамі і «вернымі сваімі слугамі», і ў выніку пераразмеркавання фальварак Чарнаручча дастаўся Стэфану Беліковічу – чашніку браслаўскаму [4, с. 338, 350].

У 1777 г. сяло Чарнаручча разам з 36 прыгоннымі хрысціянскага веравызнання належала Храпавіцкім [1, арк. 38].

У 1780-я гг. маёнтак складаўся з аднайменных сяльца і вёскі, а таксама з вёсак Антонкава і Крупені. Сяльцо Чарнаручча, дзе стаяла памешчыцкая сядзіба, знаходзілася на беразе безыменнага ручая, ад якога жывіліся дзве сажалкі, што аддзялялі сяльцо ад вёскі, на захад ад сяльца размяшчаліся могілкі. Вёска Чарнаручча мела дзве вуліцы – па абодва бакі ад дарогі. Антонкава размяшчалася на паўночны захад ад цэнтра маёнтка і складалася з некалькіх будынкаў, хаатычна раскіданых каля дарогі. Крупеня, у сваю чаргу, знаходзілася ў супрацьлеглым баку ад Чарнаручча – на паўднёвы ўсход і ўяўляла сабой вёску з адной вуліцы (Дадатак 4, фота 1).

Паводле вынікаў рэвізіі 1781 г. у сяльцы Чарнаручча дваровыя людзі не жылі, у в. Чарнаручча жылі 60 сялян (31 мужчына і 29 жанчын), у Антонкаве – 6 (2 мужчыны і 4 жанчыны), у Крупені налічвалася 79 жыхароў (34 мужчыны і 45 жанчын). Такім чынам, усяго ў маёнтку было 145 прыгонных сялян.

У 1783 г. Чарнаручча належала стацкаму дарадцу Івану Храпавіцкаму. У гэты час за маёнткам было замацавана 570 дзесяцін зямлі, з якіх 232 займала ворыва, 252 – лес, 10 – сенажаці (астатнюю плошчу займалі дарогі, вадаёмы, балота, агароды і пабудовы) [11, арк. 1].

Калі ў канцы XVIII ст. у сяльцы Чарнаручча жылі толькі памешчыкі, то ў 1810-я гг. і надалей тут жылі і дваровыя людзі (пра гэта сведчаць звесткі з метрычных кніг) (Дадатак 1 пасля тэксту).

З першай паловы XIX ст. маёнтак перайшоў да баронаў Эльснераў, і менавіта ў гэты час тут быў узведзены сядзібны дом, які, паводле меркавання шэрага даследчыкаў, быў драўляным і праіснаваў да Другой сусветнай вайны [14, с. 227; 15, s. 286] (Дадатак 4, фота 2).

У пачатку 1850-х гг. Чарнаруччам валодаў калежскі асэсар, барон Восіп Фёдаравіч Эльснер. Ён меў дачку Амалію, якая нарадзілася ў 1832 г. і 7 лютага 1854 г. выйшла замуж за журналіста Горы-Горацкага земляробчага інстытута, калежскага рэгістратара Івана Дзем'яновіча (ён таксама нарадзіўся ў 1832 г.). Адметна, што жаніх быў праваслаўнага веравызнання, нявеста – рымска-каталіцкага, і вянчаліся яны ва Узнясенскай праваслаўнай царкве ў м. Лёзна [8, арк. 25 адв. – 26].

Колькасць дваровых людзей, якія пражывалі ў маёнтку ў сярэдзіне XIX ст., была невялікай, і іх склад пастаянна змяняўся па розных прычынах. Па-першае, некаторыя з сялян уцякалі ад памешчыка: у 1850 г. з Чарнаручча збег 24-гадовы Фёдар Лявонаў, у 1851 г. – 51-гадовы Якаў Фамін (прозвішчы

сялян у дакументах не ўказаны). Абодва гэтыя сяляне не мелі сем'яў, што, відаць, і падштурхнула іх да ўцёкаў, бо цэлай сям'і хавацца было б значна складаней. У 1855 г. з маёнтка ўцякла сялянка Рыпіна, пакінуўшы ў Чарнаруччы мужа – 42-гадовага селяніна Ціта Карнеева.

Па-другое, некаторых сваіх сялян памешчык аддаваў у рэкруты: так, у 1852 г. быў здадзены ў салдаты 21-гадовы Іван Лявонаў (брат Фёдара Лявонава, які ўцёк за 2 гады да гэтага, і можна меркаваць, што гэты факт паўплываў на рашэнне памешчыка). У 1854 г. на службу ў армію быў адпраўлены 21-гадовы Аляксей Ларыёнаў (ён не меў уласнай сям'і і дагэтуль жыў з братам).

Па-трэцяе, склад насельніцтва маёнтка змяняўся праз мэтанакіраванае перасяленне дваровых людзей памешчыкам. У прыватнасці, 25-гадовы селянін Павел Антонаў быў пераселены ў в. Ушыўка, якая размяшчалася непадалёк ад Чарнаручча. Пры гэтым маці згаданага селяніна, яго браты і сёстры засталіся пры двары памешчыка [5, арк. 736 адв. – 737].

У «Поўным спісе населеных месцаў Магілёўскай губерні», складзеным у 1857 г., Чарнаручча значыцца фальваркам. На той час там пражывала 14 сялян, якія з'яўляліся прыхаджанамі Лёзненскай праваслаўнай Узнясенскай царквы [12, арк. 362 адв.].

Паводле рэвізіі 1858 г. у маёнтку Чарнаручча жыло 18 дваровых людзей (9 мужчын і столькі ж жанчын) (Дадатак 2 пасля тэксту).

У 1870 г. маёнтак Чарнаручча перайшоў у спадчыну да калежскага дарадцы, барона Эдуарда Восіпавіча Эльснера, які паводле веравызнання з'яўляўся лютэранінам. У 1882 г. агульная плошча маёнтка складала 828 дзесяцін, з якіх асноўная частка (674 дзесяціны) была занята лясамі, 60 дзесяцін займала ворыва, 56 дзесяцін – сенажаць (такім чынам, на працягу стагоддзя плошча маёнтка значна павялічылася). У гэты час у Чарнаруччы меліся карчма, млын і бровар (млын і бровар штогод давалі па 300 руб. даходу) [10, с. 176–177].

У 1910 г. маёнтак па-ранейшаму належаў барону Эльснеру. Даволі супярэчлівай выглядае інфармацыя, што сам памешчык прытрымліваўся лютэранскага веравызнання, а маёнтак адносіўся да рымска-каталіцкага прыхода. За 30 гадоў памеры маёнтка скараціліся больш як у 3 разы: паводле стану на 1910 г. яго агульная плошча складала 252 дзесяціны зямлі, з якіх 202 былі прыдатнымі, а 50 – непрыдатнымі. У гэты час маёнтак складаўся з 4 двароў, дзе пражывала 30 мужчын і 28 жанчын [13, с. 123].

У пэўнай ступені пра стан маёнтка Чарнаручча ў апошнія гады існавання сведчаць вопісы маёмасці, складзеныя ўжо ў савецкі час. У прыватнасці, паводле вопісу ад 23 снежня 1918 г. за былым маёнткам лічылася 26 дзесяцін ворыва, 17 – лугоў, 73 – лясоў і хмызнякоў, 3 – пад балотамі і дарогамі, 4 – пад садам, агародам і пабудовамі. Акрамя таго, на тэрыторыі маёнтка быў сад з 38 дрэў і 20 ягадных кустоў [3, арк. 6].

Згодна з вопісам маёмасці, складзеным у жніўні 1920 г., на тэрыторыі маёнтка размяшчаліся наступныя будынкі: 1) сядзібны дом (драўляны, абкладзены цэглай, крыты гонтам, складаўся з 10 пакояў, меў 14 двайных і 14 адзіночных дзвярэй, 8 галандскіх і 1 рускую печку, 1 пліту, 2 ганкі, пад домам меўся цагляны склеп, памеры дома – 55,5 на 18 аршын); 2) дом для рабочых (драўляны на цагляным падмурку, крыты гонтам, складаўся з 8 пакояў, меў 8 двайных і 7 адзіночных дзвярэй, 46 акон, 2 галандскія і 4 рускія печкі, 2 пліты, 2 ганкі, пад домам меўся склеп з 2 уваходамі, памер дома – 40 на 18 аршын); 3) дом для рабочых (драўляны, без падмурка, крыты гонтам, падзелены калідорам на 2 пакоі, меў 12 акон, 1 галандскую і 1 рускую печку, 1 пліту, памер дома – 27 на 9 аршын); 4) свіран (драўляны на цагляных слупах, крыты гонтам, падзелены на 2 паловы, меў 2 дзвярэй, 2 акны, 10 засекаў, памер – 21 на 120 аршын); 5) стайня з вазоўняй (драўляная на цагляных слупах, крытая гонтам і дранкай, мела 4 варот, 10 памяшканняў, памер – 49,5 на 14 аршын); 6) жывёльны двор (цагляны, крыты гонтам, меў 5 знешніх і 2 унутраных варот, 22 акны, у жылым памяшканні пры двары былі 2 рускія печкі, памер двара – 63 на 21 аршын); 7) хлеў (драўляны на цагляным падмурку, крыты гонтам, меў 3 дзвярэй, памер – 24 на 9 аршын); 8) малацільня (драўляная, крытая саломай, мела 2 дзвярэй, 2 варот, памер – 57 на 15 аршын, пры малацільні мелася адасобленае памяшканне памерам 15 на 15 аршын і сушыльня з 1 печкай); 9) пуня (драўляная, крытая дранкай, мела 1 вароты, памер – 42 на 9 аршын); 10) лядоўня (драўляная, крытая дранкай, мела 1 дзверы, памер – 7 на 7 аршын); 11) лядоўня (2-павярховая, драўляная, крытая дранкай, мела 2 дзвярэй, памер – 8 на 8 аршын); 12) лазня (драўляная, крытая дранкай); 13) 2 драўляныя скляпы для захоўвання гародніны [2, арк. 4–5].

У 1918 г. на базе маёнтка была створана сельскагаспадарчая арцель, у якой у студзені 1920 г. налічваліся 22 сябры (як дарослыя, так і малалетнія) [3, арк. 1–2].

Да сённяшніх дзён ад колішняга маёнтка Чарнаручча амаль нічога не засталося (па сутнасці, толькі рэшткі парку і алеі). Да нядаўняга часу там стаяў і цагляны будынак (верагодна, частка сядзібнага дома) (Дадатак 4, фота 3), але ў пачатку 2000-х гг. ён быў зруйнаваны.

Дадатак 1

Звесткі пра дваровых людзей маёнтка Чарнаручча паводле метрычных кніг 1810-х – пачатку 1860-х гг. [6, арк. 59 адв., 122 адв., 147, 190 адв., 194; 7, арк. 53 адв., 97 адв., 98 адв.; 9, арк. 1 адв., 16 адв., 80 адв., 81 адв., 93 адв.].

Дата	Падзея
27 жніўня 1813 г.	У Акулы Іванова і Марфы нарадзіўся сын Іван
10 кастрычніка 1820 г.	У Яўсевія Паўлава і Лукіі нарадзіўся сын Піліп
30 сакавіка 1825 г.	У Прохара Ігнатава і Феадосіі нарадзілася дачка Феадосія
27 верасня 1829 г.	У Андрэя Парфенава і Ірыны нарадзіўся сын Ігнацій
24 сакавіка 1830 г.	У Фёдара Цімафеева і Алены нарадзілася дачка Лісавета
26 верасня 1852 г.	Памёр сын Марыі Якаўлевай Цімафей (ва ўзросце 1 года)
20 кастрычніка 1854 г.	У маёнтку памерла «прахожая сялянка» Марыя (ва ўзросце 53 гадоў)
27 жніўня 1855 г.	Васа Паўлава нарадзіла дачку Наталію (па-за шлюбам)
9 мая 1858 г.	Еўдакія Антонава нарадзіла дачку Алену (па-за шлюбам)
21 мая 1858 г.	Васа Паўлава нарадзіла сына Канстанціна (па-за шлюбам)
1 кастрычніка 1861 г.	Памерла незаконнанароджаная дзяўчынка Алена (ва ўзросце 4 гадоў)
28 кастрычніка 1861 г.	Памерла дзяўчынка Маланія (ва ўзросце 7 гадоў)
8 снежня 1862 г.	Памерла незаконнанароджаная дзяўчынка Еўдакія (ва ўзросце 2,5 гадоў)

Дадатак 2

Спіс дваровых людзей маёнтка Чарнаручча, 26 мая 1858 г. [5, арк. 736 адв. – 737].

№ п/п	Імёны, імёны па бацьку	Узрост
1	Максім Ларыёнаў	36 гадоў
2	Мар'я (жонка Максіма Ларыёнава)	33 гады
3	Ціт Альхімаў	37 гадоў
4	Іван Малахаў	31 год
5	Кацярына Восіпава (жонка Івана Малахава)	29 гадоў
6	Сцяпан (сын Івана Малахава)	8 гадоў
7	Пётр (сын Івана Малахава)	7 гадоў
8	Лісавета (дачка Івана Малахава)	5 гадоў
9	Надзея (дачка Івана Малахава)	2 гады
10	Ігнацій Антонаў	18 гадоў
11	Кузьма Антонаў (брат Ігнація Антонава)	16 гадоў
12	Наста Антонава (маці Ігнація Антонава)	47 гадоў
13	Аўдакія Антонава (сястра Ігнація Антонава)	23 гады
14	Малання (незаконнанароджаная дачка Насты Антонавай)	4 гады
15	Алена (незаконнанароджаная дачка Насты Антонавай)	2 тыдні
16	Ціт Карнееў	42 гады
17	Васіль Іваноў	24 гады
18	Мар'я (сястра Васіля Іванова)	20 гадоў

ЛІТАРАТУРА

1. **Ведомость** о дворянах Могилевской губернии, по разделению на двенадцать нижеписанных уездов, с показанием какие каждый из них имеет во владении местечки, села и деревни и сколько в оных христиан и жидов состоит. – 1777. – 112 л.

2. **Дзяржаўны** архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 14. Воп. 1. Спр. 1298.

3. **ДАВВ.** – Ф. 2268. Воп. 2. Спр. 248.

4. **Историко-юридические** материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией и. д. архивариуса сего архива М. Веревкина. – Витебск : Типолитография Г. А. Малкина, 1888. – Вып. 18. – 492, XLI с.

5. **Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2151. Воп. 1. Спр. 149.

6. **НГАБ.** – Ф. 2301. Воп. 2. Спр. 159.

7. **НГАБ.** – Ф. 2821. Воп. 1. Спр. 4.

8. **НГАБ.** – Ф. 2821. Воп. 1. Спр. 5.

9. **НГАБ.** – Ф. 2821. Воп. 1. Спр. 8.

10. **Опыт** описания Могилевской губернии : в 3 кн. / под ред. А. С. Дембовецкого. –Могилев-на-Днепре : Типография губернского правления, 1884. – Кн. 3. – 327 с.

11. **Расійскі** дзяржаўны архіў старажытных актаў. – Ф. 1354. Воп. 232. Спр. Ч-1с.

12. **Расійскі** дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 1290. Воп. 4. Спр. 80.

13. **Список** населенных мест Могилевской губернии. – Могилев : Губернская типография, 1910. – 250 с.

14. **Страчаная** спадчына / уклад. Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.

15. **Aftanazy, R.** Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczy pospolitej / R. Aftanazy. – Wrocław : Zakład Narodowy imenia Ossolińskich, 1991. – T. 1 : Województwa mińskie, mścisławskie, połockie, witebskie. – 336 s.

Котович Т.В. *(г. Витебск)*

БЕЛЫЕ КАЗАРМЫ В ВИТЕБСКЕ: КВАРТАЛ-ПАМЯТНИК

Белые казармы занимали целый большой квартал в Задвинье.

По выписке из ведомостей 1747 г. в посаде Русском (в Задвинье) находилось 24 дома и 4 огорода [1, с. 47]. Впервые квартал обозначен на Плане Витебска 1797 г. как полковой двор на правом берегу Западной Двины.

Полковые дворы были учреждены в 1724 г. при разделении всех губерний на так называемые полковые дистрикты – административно-территориальные единицы, подушная подать с населения которых должна была идти на содержание расквартированных в них полков (именовались также штабными дворами, «вечными квартирами» полков). Представляли собой канцелярии штабов полков, осуществляли кроме военных и военно-хозяйственных функций контроль над собиравшими подушную подать «комиссарами от земли», наблюдение за движением «податных душ», поимку и возвраще-

Ил. 1. Квартал бывших Белых казарм. Аэросъемка. 1941 г.

Ил. 2. Немецкая аэрофотосъемка 1941 г. Квартал Белых казарм (слева Канатная улица, сверху – север – Госпитальная, справа – Нижне-Петровская, снизу – юг – Казарменный переулок. Сверху в самый центр Белых казарм по ул. Госпитальной упирается Верхне-Петровская)



Ил. 3. Фрагмент Плана Витебска 1797 г. На правом берегу Западной Двины располагается полковой двор

ние владельцам беглых крепостных, различные полицейские функции, а также ведение судебных дел между военными чинами и населением дистрикта. Закрыты в 1727 г., восстановлены в 1729 г. и окончательно упразднены в 1736 г. в связи с изменениями в организации подушного сбора [6].

Несмотря на упразднение полковых дворов в первой половине XVIII в. на плане конца столетия квартал все еще обозначается этим названием. На чертеже отмечены три главных здания и другие строения в квадрате квартала.

На «Геометрическом плане губернского г. Витебска (с показанием на оном публичных каменных и деревянных строений, значущих по прожекту и в старом виде (1800–1809))» также обозначен квартал с указанием строений, выходящих за его пределы в переулки.

На «Уменьшенном плане губернского города Витебска мая 1858 года, снятом по плану 1852–53 гг.» квартал указан как «Военный гошпиталь» и его расположение обозначено по уже красной линии улицы (в отличие от предыдущих планов) Канатной.

Ил. 4. Фрагмент Плана Витебска 1800–1809 гг.

В «Исторических сведениях о примечательнейших местах Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся» М. Без-Корнилович отмечал: «… после императорского дворца лучшим зданием в городе дом дворянского собрания, Гимназия, обширные строения, принадлежащие к соборам Успенскому и Никольскому, дома Приюта и Губернского Правления. Тюремный замок, *Сухопутный гошпиталь (на заречной стороне)* (выделено нами. – *Т. К.*) и несколько других принадлежащих частным лицам» [1, с. 42].

Ил. 5. Фрагмент Плана 1858 г. На правом берегу Западной Двины расположен квартал Военного госпиталя

В плане квартала военного госпиталя на Канатной от 1862 г. в самом центре располагается квадрат сада, занимающий большое пространство. На картах Витебска 1820-х гг. мы также обнаруживаем обозначение насаждений в центре этого квартала.



Ил. 6. Фрагмент чертежа с частью каменного трехэтажного главного корпуса Витебского военного госпиталя и Планом общего расположения зданий Витебского военного госпиталя, где А – каменный 3-этажный главный корпус; В – каменный 2-этажный большой флигель; С – каменный 2-этажный малый флигель; G – каменные заборы; М – сад. От 9 ноября 1862 г. НИАБ [5]

Ил. 7. Фрагмент Плана Витебска 1821 г. На правом берегу Западной Двины располагается квартал с обозначением небольшого количества построек, иных по очертаниям, нежели на планах двадцатилетней давности, с растительными насаждениями в центре квартала

В 1880–1890 гг. в Витебске находились 2-я бригада 41-й пехотной дивизии, 163-й пехотный Ленкоранский полк, 164-й пехотный Закатальский полк, 21-й резервный пехотный кадровый батальон. Располагались штаб 16-го армейского корпуса и управление начальника артиллерии, 41-я артиллерийская бригада.



Ил. 8. План Витебска 1904 г. с очертаниями квартала казарм
с традиционными постройками по линии Канатной улицы

На плане Витебска 1904 г. квартал на ул. Канатной именуется Казармы. Напротив него располагается квартал Артиллерийских казарм по Старо-Монастырской улице, которые будут обозначаться как Красные («Красные казармы по Старо-Монастырской улице – 6 отдельных зданий <…> с огромным двором <…>, с конюшнями на 10 000 лошадей») [3] в отличие от пехотных Белых на ул. Канатной.

Летом 1914 г. в Витебске была организована 5-я подвижная починочная артиллерийская мастерская, действовавшая несколько месяцев и снова возобновившая работу в августе 1915 г. Через год она стала 5-й тыловой артиллерийской мастерской Северо-Западного фронта. Весной 1918 г. мастерская была преобразована в завод сельскохозяйственных машин и орудий Комитета по борьбе с безработицей. Место размещения – Белые казармы. В обозрении состояния всех казарм в Витебске на январь 1919 г. помечено:

«Белые казармы, расположенные кварталом по улицам Канатной, Поперечно-Петровской, Нижне-Петровской и Казарменным переулком, заняты все мастерскими, столовыми и прочими дополнительными учреждениями комитета по борьбе с безработицей, и пока существует это учреждение в таких размерах, как теперь, не может быть использовано для других целей, да и мало пригодно для чего-нибудь другого. <…> на углу Канатной и Поперечно-Петровской помещено заводо-управление» [3].

В обозрении допущена ошибка: Белые казармы расположены между Канатной (нынешней Димитрова), Нижне-Петровской (ныне Комсомольской, однако обозначенный фрагмент улицы не существует), Казарменным переулком (ныне не существующим) и Госпитальной (ныне улица Евстегнеева). Поперечно-Петровская (ныне улица Зеньковой) находится дальше и от Казарм ее отделяет целый жилой квартал, что видно на плане Витебска 1922 г. Заводо-управление помещалось в здании на углу Канатной и Госпитальной, а не на углу Канатной и Поперечно-Петровской, как было указано в документе.

Белые казармы представляли собой четыре здания с пристройками и каменные одно-, двух- и трехэтажные бараки [4].

На схеме завода «Вистан» мы наблюдаем расположение бывших Белых казарм, занимающих четвертую часть всего большого пространства. Центральное здание было отдано под конструкторское бюро, а затем там располагалось заводоуправление. Правое здание – под конструкторский цех, левое обозначено как 1-й корпус. Эта схема была реальной во второй половине XX в.

Сегодняшнее состояние исторических зданий драматично. Левому зданию пока повезло больше: 15 лет назад оно было продано предпринимателям, отремонтировано ими и перестроено, там теперь размещается большое количество мелких фирм и офисов. Правое здание бывших казарм фасадом выходит на улицу Димитрова, быв. Канатную, а частью – во двор заводской территории с бывшим Казарменным переулком. Его ожидает та же участь. Центральное было продано в 2018 г. и пока находится в запущенном виде.

Ил. 9. План Витебска 1922 г.

История Белых казарм в Витебске – это уникальная история от помещений полкового двора конца XVIII в. до офисных помещений в начале XXI в. и пока оставленных без призора фрагментов бывших заводских корпусов. Это – и история огромного квартала в задвинской стороне, история известных личностей, оставивших значительный след в истории города. Это история заводчан, их семей, их забот, их рабочей гордости. Это и история архитектуры. Белые казармы – это квартал-памятник.



Ил. 10. Расположение помещений в квартале Белых казарм: 1) предполагаемое перестроенное здание под чугунолитейные мастерские; 2) существующее здание мастерских; 3) склады; 4) кузница; 5) баня; 6) прачечная; 7) четыре навеса; 8) главный склад; 9) механическая мастерская; 10) конюшня; 11) сарай; 12) склады; 13) сарай; 14) локомобиль (двигатель для выработки электричества); 15–18) мастерские; 19) столовая и кухня; 20) мастерская; 21) сторожка; 22) уборная; 23) кузница; 24) контора [2]

Зимой 1920 г. Комитет по борьбе с безработицей был уничтожен. Дальнейшая история предприятия представлена в фондовом документе на ил. 11.

	Западной области (с 13.09.1918 - Западной Коммуны, с 01.01.1919 - БССР, с 02.02.1919 - РСФСР)
1922-10.1927	Витебский завод сельскохозяйственных машин и орудий № 3 Витебского губернского объединения предприятий металлопромышленности "Метпрома" (с 1924 г. - Белорусского государственного объединения металлообрабатывающей промышленности, с 09.1927 - Белорусского государственного треста металлообрабатывающей промышленности) Высшего Совета народного хозяйства БССР), г. Витебск Витебской губернии РСФСР (с 17.07.1924 - Витебского округа)
10.1927-1932	Витебский завод сельскохозяйственных машин и орудий № 3 "Красный металлист" Белорусского государственного треста металлообрабатывающей промышленности (с 01.1930 - Белорусского объединения металлообрабатывающей промышленности "Белметтреста", с 1933 г. - Белорусского государственного треста металлических изделий "Белметизтреста") Высшего Совета народного хозяйства БССР (с 05.01.1932 - уполномоченного Народного комиссариата тяжелой промышленности СССР при Совете Народных Комиссаров БССР), г. Витебск Витебского округа (с 26.07.1930 - БССР)
1932-1935	Витебский станкостроительный завод уполномоченного Народного комиссариата тяжелой промышленности СССР при Совете Народных Комиссаров БССР (с 04.10.1934 - Народного коиссариата местной промышленности БССР), г. Витебск БССР
1935-06.1941	Витебский станкостроительный завод имени С.М.Кирова Народного коиссариата местной промышленности БССР (с 22.08.1937 - Народного комиссариата машиностроения СССР, с 05.02.1939 - Главного управления станкостроительной промышленности "Главстанкопрома" Народного комиссариата тяжелого машиностроения СССР, с 05.06.1941 - Народного комиссариата станкостровения СССР), г. Витебск БССР (с 20.02.1938 - Витебской области)
1941-06.09.1963	Витебский станкостроительный завод имени С.М.Кирова Главного управления станкостроительной промышленности "Главстанкопрома" Народного комиссариата (с 15.03.1946 - Министерства) станкостроения СССР (с 05.03.1953 - Министерства машиностроения СССР, с 19.04.1954 - Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР, с 1957 г. - Управления машиностроения и станкостроения (с 04.1962 - Управления станкостроения и общего машиностроения) Совета народного хозяйства БССР), г. Витебск
05.09.1963-09.02.1966	Витебское станкостроительное объединение Управления станкостроения и общего машиностроения Совета народного хозяйства БССР (с 10.1965 - Главного управления по производству прецизионных станков Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР), г. Витебск
09.02.1966-30.12.1985	Витебский станкостроительный завод имени С.М.Кирова Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР, г. Витебск
30.12.1985-20.03.1986	Витебское станкостроительное производственное объединение Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР, г. Витебск
20.03.1986-15.04.1988	Витебское станкостроительное производственное объединение имени С.М.Кирова Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР, г. Витебск
15.04.1988-05.06.1996	Производственное объединение "Витебский станкостроительный завод имени С.М.Кирова" Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР (с 19.09.1991 - Республики Беларусь, с 14.10.1991 - Государственного комитета Республики Беларусь по промышленности и межотраслевым производствам, с 23.09.1994 - Министерства промышленности Республики Беларусь), г. Витебск
05.06.1996-	Витебский станкостроительный завод "ВИСТАН" Министерства промышленности Республики Беларусь, г. Витебск

Ил. 11. Фондовый каталог государственных архивов Республики Беларусь [7]



Ил. 12. Схема завода «Вистан»

Ил. 13. Район Белых казарм сегодня. Фото А. Гергаева

ЛИТЕРАТУРА

1. **Без-Корнилович, М.** Исторические сведения о примечательнейших местах Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М. Без-Корнилович. – Санкт-Петербург, 1855. – С. 47.

2. **Государственный** архив Витебской области (ГАВт). – Ф. 238. Оп. 1. Д. 2. Л. 429.

3. **ГАВт.** – Ф. 1001. Оп. 1. Д. 44. Л. 55.

4. **ГАВт.** – Ф. 1001. Оп. 1. Д. 44. Л. 67.

5. **Национальный** исторический архив Беларуси. – Ф. 3209. Оп. 1. Д. 2118. Л. 75.

6. **Российский** государственный архив древних актов : путеводитель : в 4 т. – Т. 3, ч. 1. – 1997 ; Ч. 2 : 2. Учреждения местного управления XVIII в., 2.1. Учреждения общегосударственного управления, 2.1.5. Учреждения военного управления. 2.1.5.1. Полковые дворы.

7. **Фондовый** каталог государственных архивов Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/109358. – Дата доступа: 20.01.2021.

Лаўрык Ю.М. *(г. Мінск)*

ФАРМІРАВАННЕ КНІЖНАЙ ПРАСТОРЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПАЧАТКУ НОВАГА ЧАСУ Ў СВЯТЛЕ ПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ НА ПАЎНОЧНЫХ МЕЖАХ ДЗЯРЖАВЫ

Прапанаваны матэрыял з'яўляецца часткай даследавання, прысвечанага высвятленню перадумоў, якія паўплывалі на фарміраванне кніжнай прасторы Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) у канцы XV ст. і ў першай трэці XVI ст. (у тым ліку на з'яўленне і даволі хуткі заняпад кнігадрукавання). У папярэдніх працах, ажыццёўленых у межах даследавання, разглядалася, у якой ступені да гэтага спрычыніліся стасункі ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай [5] і Крымскім ханствам [6]; сёння аўтар разглядае ў азначаным кантэксце ўзаемадачыненні ВКЛ з рыцарскімі ордэнамі, што асталяваліся ў Прыбалтыцы.

Тэўтонскі ордэн стыхійна ўзнік у канцы XII ст. у Палесціне і неўзабаве быў афіцыйна зацверджаны Папам Рымскім [7, с. 11–12]. Пасля выгнання хрысціянскага рыцарства са Святой Зямлі ордэн нейкі час абараняў Венгрыю ад набегаў полаўцаў, але не здолеў канчаткова ўкараніцца і ў Сяміградзі; пасля гэтага «нямецкія браты» прыбылі ў Прусію, верагодна, у 1229 г. [16, s. 405–406, 427]. Тут вялікі магістр Герман фон Зальца пачаў будаваць планы па ўтварэнні самастойнай крыжацкай дзяржавы [16, s. 130].

Ордэн паступова авалодаў Хэлмінскай зямлёй, Прусіяй і Памяраніяй, а з часам пачаў уяўляць сур'ёзную пагрозу для Каралеўства Польскага і ВКЛ, у тым ліку для яго беларускіх зямель, на якія неаднаразова ажыццяўляліся

збройныя напады [7, с. 19, 28, 29, 42, 46, 47, 49–50 і інш.]. Каб супрацьстаяць крыжацкай агрэсіі, у 1385 г. паміж ВКЛ і Каронай была заключана Крэўская унія, аднак крыжацкія рэйзы працягваліся яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў [2, с. 114–115, 116–117, 120–121, 125–127 і інш.].

Крэс панаванню ордэна на паўднёва-ўсходнім узбярэжжы Балтыкі быў пакладзены толькі ў XV ст.: у выніку паражэння пад Грунвальдам у 1410 г. прускія крыжакі страцілі сваю мілітарную, а пасля падпісання ў 1466 г. Таруньскага міру – і эканамічную моц, а таксама былі вымушаны прызнаць васальную залежнасць ад Кароны. Урэзаны тэрытарыяльна і пазбаўлены не толькі найбольш важнай на той час крыніцы даходу – гандлю паморскіх гарадоў, але нават і дзяржаўнага суверэнітэту, Тэўтонскі ордэн у апошняй трэці XV ст. не быў у стане адыгрываць тую ролю, што і раней; так пачаўся яго заняпад [12, s. 64–65].

Імкнучыся аднавіць status quo ante, вялікі магістр Генрых фон Рыхтэнберг у лютым 1477 г. заключыў дамову з Маціусам Корвінам, а ў чэрвені 1478 г. новы вялікі магістр Трухсэс узяў у аблогу паморскія замкі Бродніцы, Хэлмна і Старгард. Аднак пераможная выправа каралеўскіх войск у Вармію і далей непасрэдна ў землі ордэна змусіла вялікага магістра ў кастрычніку 1479 г. прызнаць паражэнне і скласці васальную прысягу Казіміру [13, s. 120–123]. Тым не менш ордэнскае кіраўніцтва не пакідала надзеі пазбавіцца залежнасці ад Польшчы, што змушала яго шукаць саюзнікаў. Маскоўскія спробы арганізаваць сумесна з Данія й і ордэнам антыпольскую кааліцыю прывялі да чарговай выправы каронных войск у Прусію ў 1520 г. і разгрому крыжакоў [10, с. 160–161], ВКЛ зноў захоўвала нейтралітэт [3, с. 409].

Секулярызацыя Прускай правінцыі Тэўтонскага ордэна ў 1525 г. сталася заканамерным вынікам яго заняпаду. Апошні вялікі магістр Альбрэхт Гогенцолерн прыняў тытул герцага прускага, падаўшы навастворанае герцагства ў васальную залежнасць Жыгімонту I [18, s. 125–126].

Лівонскі ордэн быў заснаваны ў пачатку XIII ст. для абароны калоній нямецкіх купцоў і місіянераў, а пасля арганізацыі ў Лівоніі царкоўнай структуры знаходзіўся ў васальнай залежнасці ад мясцовых біскупаў, якія атрымалі годнасць імперскіх князёў [16, s. 408–411, 436–437]. У выніку разгрому ў 1236 г. лівонскага рыцарства пры Саўле кангрэгацыя была ўключана ў 1237 г. у склад Тэўтонскага ордэна як асобная правінцыя на чале з ландмайстрам [1, с. 37–39]. Лівонскі ландмайстар прызначаўся вялікім магістрам з Мальбарка (пазней – з Караляўца) і de jure падлягаў яго ўладзе, але на практыцы захоўваў аўтаномію і праводзіў самастойную палітыку. Таму ў літаратуры Лівонскае ландмайстарства нярэдка працягвае фігураваць як «Лівонскі ордэн», а на азначэнне Прускага ландмайстарства ўжываецца назва «Тэўтонскі ордэн».

Асабліва выразна самастойнасць лівонскага рыцарства праяўляецца з XV ст., калі лівонцам здаралася нават выбіраць ландмайстра без згоды Ка-

раляўца, як, у прыватнасці, у 1436 г. [9, с. 273], а з 1459 г. удзел вялікага магістра ў прызначэнні Лівонскага ландмайстра ператвараецца ў фармальнасць [1, с. 106]. У 1513 г., згодна з паведамленнем «Лівонскай хронікі» Балтазара Русава, «…магістр Вольтер фон Плетенберг адкупіўся ў маркграфа Альбрэхта, вялікага магістра ў Прусіі, ад прысягі ў вернасці і ад леннай залежнасці, так што магістрам у Лівоніі з таго часу не было больш патрэбы атрымліваць ленную інвестытуру ад вялікага магістра ў Прусіі» [9, с. 300]. У 1520 г. вялікі магістр Альбрэхт замацаваў новы статус Лівоніі адмысловым актам [9, с. 300].

Лёсы Лівоніі і Прусіі шмат у чым дэманструюць падабенства. Так, падтрымка Свідрыгайлы скончылася для лівонцаў паражэннем у бітве на р. Святой пад Вількомірам у 1435 г., дзе загінула значная частка рыцарства на чале з магістрам, «…з прычыны чаго Лівонія надзвычай аслабела» [9, с. 272]. Не пакінулі гэтай бітвы без увагі і рускія летапісцы, адзначаючы, што «…велми давно и за много лет не бывало таковаго побоища в Литовской земли» [8, с. 215]. Гэта паражэнне можна параўнаць з разгромам прускіх крыжакоў пад Грунвальдам.

З прычыны слабасці ордэна актывізавалі змаганне з ім лівонскія біскупы і гарады (перадусім, рыжскі арцыбіскуп і г. Рыга [1, с. 101]), а з часам далучылася і земскае рыцарства. Аднак дзякуючы прадбачлівай палітыцы ордэнскаму кіраўніцтву ўдалося пазбегнуць утварэння ў Лівоніі змовы кшталту Прускага саюза [1, с. 104–106]. У большай ступені да эканамічнага аслаблення Лівонскага ордэна прывёў захоп Маскоўскай дзяржавай Ноўгарада ў 1470-я гг. і яе палітыка, скіраваная супраць панавання Ганзы ў балтыйскім гандлі [10, с. 132–133].

Таму ў апошняй трэці XV – першай палове XVI ст. Лівонія імкнулася ў асноўным, да мірнага суіснавання з ВКЛ, нават спрабавала заключаць ваенныя дамовы, скіраваныя супраць супольных ворагаў. У прыватнасці, у 1480 г. лівонскі магістр звяртаўся да караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра з просьбай пра дапамогу ў вайне супраць залежнага ад Масквы Пскова [3, с. 397]. У 1501 г. быў заключаны саюз з ВКЛ супраць Маскоўскай дзяржавы, і Лівонія самастойна распачала ваенныя дзеянні на сваёй заходняй мяжы. Аднак ВКЛ не змагло падтрымаць яе і ўступіць у вайну – спачатку з прычыны смерці караля Яна Альбрэхта, якая адчыніла перад вялікім князем Аляксандрам шлях да польскай кароны, затым дзеля неабходнасці бараніць паўднёвыя землі ад рэгулярных татарскіх наездаў. Гэта прывяло да разгрому лівонскіх войск пад Гельмедам [1, с. 116, 120].

Уплывы на фарміраванне кніжнай прасторы стасункаў ВКЛ з прыбалтыйскімі ордэнамі былі зменнымі і неадназначнымі. Пачатковы этап (XIII і XIV стст.) характарызуецца скрайне негатыўным уплывам на стан кніжнай прасторы паўночнабеларускіх зямель, якіх дасягалі крыжацкія выправы (гаварыць пра існаванне ў гэты час на этнічна балцкіх тэрыторыях ВКЛ

кніжнай культуры мы яшчэ не можам). Аднак у канцы XIV ст. такая палітыка крыжакоў спрычынілася да заключэння Крэўскай уніі (1385), што сталася спрыяльным фактарам для распаўсюджання на тэрыторыі ВКЛ лацінскай кнігі як рукапіснай, так пазней і друкаванай.

Паводле ўмоў уніі Ягайла забавязваўся «…усіх грамадзянаў Вялікага Княства Літоўскага абодвух палоў і незалежна ад статусу, стану або займанай пасады, якія пад нашай уладаю на Літве і Русі пражываюць, да веры каталіцкае і паслушэнства святой Рымскай Царкве прывесці, схіліць і заклікаць» [21, s. 610–611]. У рэчышчы рэалізацыі гэтых умоў была заснавана Віленская рымска-каталіцкая дыяцэзія, якая ахоплівала сваёй юрысдыкцыяй не толькі тэрыторыю этнічнай Літвы, але і беларускія землі, дзе неўзабаве пачалі ўзводзіцца першыя касцёлы (у Гайне, Крэве, Абольцах, Лідзе, Ашмянах) [14, s. 22]. У канцы XV ст. у Віленскай дыяцэзіі налічвалася ўжо 130 касцёлаў, якія ў сваёй дзейнасці мусілі выкарыстоўваць адпаведную літаратуру. Верагодна, не ўсе парафіяльныя бажніцы мелі ў дастатковай меры, неабходнае для адпраўлення набажэнстваў абсталяванне; аднак, прынамсі, у палове з іх павінны былі захоўвацца і актыўна выкарыстоўвацца патрэбныя для набажэнства літургічныя кнігі: Евангеллі, лекцыянары, службоўнікі, агенды, градуалы, антыфанары і інш. [20, s. 188–189].

Кнігамі, а таксама літургічнымі шатамі і начыннем (або сродкамі на іх набыццё) святыню забяспечваў фундатар; на гаспадарскіх землях у гэтай якасці выступаў вялікі князь літоўскі. Захаваліся звесткі пра тыя ці іншыя кнігі (прычым, не толькі літургічныя), ахвяраваныя каранаванымі асобамі касцёлам, напрыклад, Ягайла супольна з каралевай Ядвігай падараваў віленскаму кафедральнаму сабору пэўную кнігу, азначаную як librum passionalis (паводле Е. Ахманьскага, гэта была «Залатая легенда» Якуба дэ Варажэн) [19, s. 75]. Кнігі нярэдка паступалі і дзякуючы прыезджым іерархам і кліру: так, першы віленскі біскуп Андрэй Ястрэмбец завяшчаў той жа святыні два пісаныя на пергамене пантыфікалы, а трэці, разам з усімі іншымі кнігамі, – капітуле [19, s. 73–83].

Калі гаварыць пра бібліятэкі шэраговага лацінскага святарства, дык яны маглі мець у сваёй аснове падборку выданняў, непасрэдна патрэбных для выканання прафесійных абавязкаў, гэта значыць, звязаных з правядзеннем абрадаў, чыненнем малітваў, падрыхтоўкай казанняў і г. д. Так, збор твораў («Opera») Анзельма Кентэрберыйскага ў XVI ст. належаў пробашчу з в. Новы Двор Лідскага павета Марціну Юдзевічу, а святары ў Глыбокім і Дрысвятах мелі ва ўласнасці кнігі нелітургічнага характару [20, s. 199].

Паколькі адпаведных навучальных устаноў у Вялікім Княстве Літоўскім на той час не было, падрыхтоўка кліру (як і вучоба свецкіх) адбывалася ў замежных вучэльнях; прыехаўшы з ВКЛ за мяжу, для заняткаў ва ўніверсітэтах студэнты набывалі кнігі. Напрыклад, паводле актаў рэктарскага суда («Acta Rectoralia») Кракаўскага ўніверсітэта за 1469–1536 гг. вядома,

што пэўны Станіслаў з Вільні мусіў закласці ў якасці забеспячэння штрафу «Хроніку» Вінцэнта Кадлубкі [15, p. 46–50]. Адтуль жа мы даведваемся, што Тамаш з Майшаголы пазычаў Паўлу з Любліна «Градуал» і з цяжкасцю змог дамагчыся яго вяртання [15, p. 49], а таксама, што закладзеныя кнігі нярэдка пераходзілі з рук у рукі сярод беларускіх студэнтаў [15, p. 46].

Вяртаючыся з вучобы дадому, былыя студэнты прывозілі кнігі з сабой, пра што гавораць інскрыпцыі, напрыклад, на выданні «De priscorum proprietate verborum» М. Юніануса (Trevisia, 1477): «Книга Адамова Якубовича с Котры… с Литвы с волости городенское, Зброшкова… брата, ему ж накладалася на науку до Кракова болеи десять лет, из детинства ест при школе… виленскои ласкаве ховался, небощик князь Иондрей (Swirski), негды каноник и кустош костола виленского святого Станислава» [4, с. 57; 19, s. 76]. Для нас гэты запіс важны і тым, што сведчыць пра даволі ранняе знаёмства беларусаў з друкаванай кнігай.

Лацінская кніга трапляла ў ВКЛ не толькі праз неабходнасць забеспячэння новазбудаваных касцёлаў літургічнай літаратурай ці будучы прывезенай былымі студэнтамі. Сярод іншых шляхоў, непасрэдна звязаных з узаемадачыненнямі ВКЛ і прыбалтыйскіх ордэнаў, можна назваць, напрыклад, ваенныя трафеі [11, s. 223], дарункі царкоўных іерархаў з ордэнскіх зямель [17, s. 331] і іншыя; аднак цяжка назваць гэтыя крыніцы паступленняў літаратуры шырокамаштабнымі. Пазней, у сярэдзіне XVI ст., былы Тэўтонскі ордэн ужо ў постаці Прускага герцагства істотным чынам спрычыніўся для пашырэння пратэстанцкай друкаванай кнігі і кнігадруку на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (пераважна, на ўласна літоўскіх землях) – аднак гэта ўжо выходзіць па-за храналагічныя межы нашага даследавання.

ЛІТАРАТУРА

1. **Арбузов, Л. А.** Очерк истории Лифляндии, Эстляндии и Курляндии / Л. А. Арбузов ; пер. с нем. 3-го изд. Владимир Бук. – Санкт-Петербург : Тип. М. М. Стасюлевича, 1912. – VI, 296 с., 4 л. портр. : карт.

2. **Виганд** из Марбурга. Новая прусская хроника (1394) / Виганд из Марбурга ; изд. подгот. И. А. Настенко ; [пер. с лат., предисл., коммент. и послесл. Н. Н. Малишевского]. – Москва : Русская панорама, 2014. – 256 с. : ил., цв. ил. – (Сер. «Mediaevalia» : средневек. лит. памятники и источники).

3. **Гісторыя** Беларусі : у 6 т. / [рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : Соврем. школа : Экоперспектива, 2008. – Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / [Ю. Бохан і інш.]. – 685 с., [2] л. карт : іл.

19. **Ратч, В.** Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России / В. Ратч // За нашую вольнасць : творы, дакументы / К. Каліноўскі ; уклад., прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. – Мінск, 1999. – С. 151.

20. **Смирнов, А. Ф.** Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии / А. Ф. Смирнов. – М. : Изд-во АН СССР, 1963. – 391 с.

21. **Смирнов, А. Ф.** Кастусь Калиновский / А. Ф. Смирнов. – Минск : Госиздат БССР, 1963. – 200 с.

22. **Фалькович, С. М.** Идейно-политическая борьба в польском освободительном движении 50–60-х годов XIX века / С. М. Фалькович. – Москва : Наука, 1966. – 333 с. – (Академия наук СССР. Ин-т славяноведения).

23. **Фірыновіч, А. Э.** Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў / А. Э. Фірыновіч. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 315 с.

24. **Цытовіч, С. Г.** 1863 год у Горы-Горках быўш. Магілёўскай губ.: (падзеі паўстання) / С. Г. Цытовіч. – Менск : [б. и.], 1929. – 124 с.

25. **Leszczyński, J. T.** Rzeczpospolita Czterech Narodów / J. T. Leszczyński. – Kielce-Piekoszów : GENS, 2005. – 56 s.

Мазец В.Г. *(г. Мінск)*

ВІЦЕБШЧЫНА ВА ЎМОВАХ ПЕРАБУДОВЫ: НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

На пазачарговым Пленуме ЦК КПСС 11 сакавіка 1985 г. генеральным сакратаром быў абраны М. Гарбачоў, па ініцыятыве якога ў Савецкім Саюзе пачаліся карэнныя змены ў грамадска-палітычным жыцці. XXVII з'езд КПСС, які адбыўся 25 лютага – 6 сакавіка 1986 г., адобрыў дзейнасць Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза па рэалізацыі

курсу на ўдасканаленне грамадскіх адносін, паглыбленне сацыялістычнай дэмакратыі і забеспячэнне галоснасці, які быў узяты на красавіцкім 1985 г. Пленуме ЦК КПСС [1, с. 338].

Ва ўмовах задэкларованай дэмакратызацыі і галоснасці ў Беларускай ССР адбывалася пашырэнне сацыяльнай актыўнасці, якое суправаджалася стварэннем вялікай колькасці новых грамадска-палітычных арганізацый, пераважна ў асяроддзі моладзі, якія выступалі за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, за гарантаванае савецкім заканадаўствам усебаковае развіццё беларускай мовы і культуры. У красавіку 1986 г. у гонар Узгорскага замка, з якога пачыналася летапісная гісторыя Віцебска, быў створаны клуб аматараў даўніны «Узгор'е», заснавальнікамі якога з'яўляліся І. Цішкін і М. Паўлаў. Арганізацыя мела на мэце ахову помнікаў гісторыі і культуры і развіццё ў віцяблян беражлівых адносін да архітэктурных і культурных каштоўнасцей свайго горада [8, с. 10–11].

Фактычна такія ж мэты ставіў перад сабою створаны летам 1986 г. у Оршы клуб аматараў гісторыі і даўніны «Повязь», кіраўніком якога быў А. Сярожкін. У 1987 г. у Полацку У. Арлоў і С. Сокалаў арганізавалі гісторыка-культурнае аб'яднанне «Маладзік», якое імкнулася аказваць дапамогу ў рэстаўрацыі і археалагічных раскопках. Аўтар шэрага грунтоўных публікацый, прысвечаных грамадска-культурнаму жыццю Віцебшчыны, кандыдат гістарычных навук М. Півавар абгрунтоўвае выснову пра тое, што рэгіянальныя гісторыка-культурныя аб'яднанні адыгралі значную ролю ў грамадскім і культурным жыцці Прыдзвіння. Менавіта дзякуючы дзейнасці клубаў у Віцебску, Полацку і Оршы былі выратаваны некаторыя помнікі гісторыі і культуры, а таксама адбыўся пералом у грамадскай думцы і ў адносінах дзяржаўных устаноў да нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны [7].

Да вясны 1988 г. колькасць маладзёжных нефармальных арганізацый у рэспубліцы павялічылася да 40, у іх складзе налічвалася каля 3 тыс. чалавек [1, с. 345]. У маі 1988 г. пад уплывам нарастаючай палітызацыі грамадства кіраўніцтва КПСС вымушана было пайсці і на прызнанне магчымасці існавання «любой грамадскай дзейнасці», што азначала прыняцце неабходнасці існавання палітычнага плюралізму і абумовіла стварэнне масавых нефармальных арганізацый – «народных франтоў». 24–25 чэрвеня 1989 г. адбыўся ўстаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту за перабудову «Адраджэнне» (БНФ) [1, с. 348].

27 кастрычніка 1989 г. быў прыняты Закон БССР «Аб выбарах народных дэпутатаў Беларускай ССР», у якім другім, трэцім і чацвёртым артыкуламі заканадаўча замацоўвалася ўсеагульнае, роўнае і прамое выбарчае права [2]. Шэраг артыкулаў дадзенага Закона гарантаваў дэмакратычнасць працэдуры выбараў народных дэпутатаў Беларускай ССР [2]. Дзеля рэалізацыі гарантаваных Законам выбарчых правоў 18 студзеня 1990 г. у Віцебску

быў створаны клуб выбаршчыкаў «За дэмакратычныя выбары». Грамадская арганізацыя, якой фактычна кіраваў Б. Хамайда, была зарэгістравана выканаўчым камітэтам Віцебскага гарадскога савета. Згодна са статутам клуба асноўнай яго мэтай з'яўлялася фарміраванне палітычнай культуры жыхароў горада, актыўны ўдзел у перадвыбарчай кампаніі, аб'яднанне намаганняў грамадскасці і дэпутатаў для вырашэння існуючых праблем. Прадстаўнікі клуба былі актывістамі перадвыбарчай кампаніі, выступалі з ініцыятывай правядзення шэрага мітынгаў у Віцебску [5, арк. 22].

У адпаведнасці з новым Законам БССР 4 сакавіка 1990 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет і ў мясцовыя Саветы. У выніку народнымі дэпутатамі Вярхоўнага Савета БССР, якія прадстаўлялі Беларускі народны фронт, былі абраны ад Віцебскай Чыгуначнай акругі С. Навумчык і ад Наваполацкай Маладзёжнай акругі – Л. Баршчэўскі [4].

Прымаючы да ўвагі ўзросшую палітычную актыўнасць грамадзян у рашэнні задач далейшага развіцця дэмакратыі, больш поўнае ажыццяўленне самакіравання народа ў адпаведнасці з артыкуламі 6, 7 і 49 Канстытуцыі Беларускай ССР, Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пастанавіў:

– да прыняцця Законаў Беларускай ССР і СССР «Аб грамадскіх аб'яднаннях» даручыць Савету Міністраў Беларускай ССР да 1 верасня 1990 г. прыняць Часовае палажэнне «Аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян у Беларускай ССР» [3].

Гэта пастанова давала рэальную магчымасць легітымізацыі палітычных партый і грамадскіх арганізацый, непадкантрольных кіруючай партыйна-дзяржаўнай наменклатуры.

30 кастрычніка 1990 г. чатыры дэпутаты Віцебскага гарсавета звярнуліся ў Прэзідыум выканкама з просьбай зарэгістраваць Віцебскую Раду Беларускага народнага фронту. Гэты зварот быў накіраваны ва ўпраўленне юстыцыі аблвыканкама, якім у рэгістрацыі Рады БНФ было адмоўлена. Аднак нягледзячы на дадзеную акалічнасць сябры Беларускага народнага фронту ў г. Віцебску праводзілі значную працу. Так, у лістападзе 1990 г. сустаршыня Віцебскай Рады БНФ М. Паўлаў разам з двума грамадзянамі звярнуліся ў выканаўчы камітэт гарадскога савета па дазвол усталяваць крыж «Пакутнікам Беларусі» на Успенскай гары, на месцы гібелі І. Кунцэвіча. 12 лістапада 1990 г. выканкамам гарсавета ў правядзенні названага мерапрыемства было адмоўлена, аднак усё роўна было арганізавана шэсце да месца гібелі І. Кунцэвіча прадстаўнікоў уніяцкай канфесіі і сяброў БНФ [5, арк. 20].

Напярэдадні ўсесаюзнага рэферэндуму па захаванні СССР Віцебскай Радай БНФ на плошчы Свабоды 10 сакавіка 1991 г. быў праведзены мітынг пад агульнымі лозунгамі незалежнасці Беларусі, няўдзелу ў адзначаным плебісцыце [5, арк. 20].

Акрамя абласнога цэнтра, актыўную дзейнасць прадстаўнікі Беларускага народнага фронту разгарнулі таксама ў Наваполацку і Полацку. Так, у лістападзе 1990 г. была афіцыйна зарэгістравана Рада БНФ у г. Полацку [5, арк. 20].

Члены Беларускага народнага фронту ў г. Наваполацку з дапамогай народных дэпутатаў спрабавалі праз выканаўчы камітэт гарадскога савета ўзняць пытанне аб скасаванні камсамольскіх і піянерскіх арганізацый у школах горада. Найбольш актыўна імі праводзілася работа па агітацыі насельніцтва ў неабходнасці вывучэння ў дашкольных установах і школах горада Наваполацка беларускай мовы за кошт зніжэння заняткаў па рускай мове.

У інфармацыі выканкама Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў аб ходзе выканання пастановы Савета Міністраў БССР ад 20 верасня 1990 г. № 240 «Аб Дзяржаўнай праграме развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР» адзначалася, што «ў вобласці праводзіцца тлумачальная работа з бацькамі аб перспектывах развіцця дашкольнага выхавання і народнай адукацыі ў сувязі з наданнем беларускай мове статусу дзяржаўнай» [6, арк. 72]. Неабходна адзначыць, што ў вобласці назіралася тэндэнцыя росту дашкольных устаноў з беларускай мовай выхавання і навучання. Так, у снежні 1990 г. з 944 дзіцячых садоў 426 працавалі па праграме з беларускай мовай выхавання і навучання. У красавіку 1991 г. з 960 дзіцячых садоў Віцебскай вобласці 467 ажыццяўлялі сваю работу ў рамках праграмы навучання і выхавання толькі на беларускай мове. У 98 рускамоўных садках было адкрыта 139 беларускамоўных груп, у якіх навучаліся больш за 3,6 тыс. дзяцей [5, арк. 21].

Устанаўлівалася моўная пераемнасць у дзейнасці дзіцячых дашкольных устаноў і агульнаадукацыйных школ. Да канца 1990 г. у Віцебскай вобласці было адкрыта 106 беларускамоўных 1–4-х класаў, з іх 87 1-х класаў пачалі функцыянаваць толькі ў 1990/1991 навучальным годзе. З паглыбленым вывучэннем беларускай мовы і літаратуры працавалі 20 школ Віцебшчыны. У Віцебскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў у адукацыйны працэс быў уведзены курс «Родная мова і літаратура», а таксама прадугледжана вывучэнне гісторыі культуры Беларусі для ўсіх катэгорый педагагічных работнікаў [6, арк. 73].

Значную работу па папулярызацыі беларускай мовы праводзіла Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, суполкі якога функцыянавалі ў сямі раёнах вобласці [5, арк. 21].

З мэтай прапаганды беларускай мовы і літаратуры, нацыянальнай культуры, паглыблення ведаў па гісторыі беларускага народа ў Полацку 8 верасня 1990 г. быў адкрыты Музей беларускага кнігадрукавання. Яшчэ раней, у маі 1990 г., у тым жа Полацку ўпершыню было праведзена Усесаюзнае свята славянскага пісьменства, а ў кастрычніку – урачыстае святкаванне 500-год-

дзя з дня нараджэння Францыска Скарыны. У лістападзе 1990 г. у Віцебску і Оршы адбыліся ўрачыстасці з нагоды 60-гадовага юбілею пісьменніка У. Караткевіча.

У рэгіёне актывізавалася работа па ўвекавечанні памятных мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю вядомых дзеячаў нацыянальнай культуры, мастацтва і літаратуры. Так, у 1990 г. у Чашніцкім раёне былі адкрыты мемарыяльныя дошкі беларускаму кнігавыдаўцу В. Цяпінскаму, пісьменніку А. Жаўруку, у г. Віцебску – памятны знак П. Броўку, у Оршы – У. Караткевічу. Ва ўстановах культуры паспяхова прайшлі чытацкія канферэнцыі і прэзентацыі кніг вядомых беларускіх пісьменнікаў В. Быкава, І. Шамякіна, А. Адамовіча, У. Караткевіча, А. Жука. У культпрасветустановах Віцебшчыны былі створаны клубы па інтарэсах: гурткі і аматарскія аб'яднанні, накіраваныя на вывучэнне гісторыі роднага краю, народных звычаяў і традыцый. Сярод іх – народны ўніверсітэт «Роднае слова», клубы аматараў беларускай кнігі ў гарадскіх бібліятэках імя У. Маякоўскага і Я. Коласа г. Наваполацка, клуб «Крыніца» ў Расонскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме (далей – ЦБС), клубы «Светач» і «Сучаснік» у Мёрскай ЦБС, клуб «Спадчына» – у Віцебскай ЦБС, клуб аматараў беларускай паэзіі – у Докшыцкай ЦБС і інш. Віцебскія абласныя тэлебачанне і радыёвяшчанне пастаянна прапаноўвалі цыклы тэлеперадач «Гаворым па-беларуску», «Наша родная мова», «Нашы вытокі», штомесяц тэлечасопіс «Дзвіна», радыёпраграмы «Вывучаем беларускую мову», «Запрашаем на вячоркі». На старонках газеты «Віцебскі рабочы» штотыдзень выходзіла тэматычная паласа «Сябрына» [6, арк. 74].

Усё больш прыкметную ролю ў грамадскім жыцці ва ўмовах перабудовы адыгрываюць рэлігійныя аб'яднанні. Так, у пачатку 1991 г. у вобласці значылася 150 адзінак, з якіх 75 Рускай Праваслаўнай Царквы, рымска-каталіцкай – 40, стараверaў – 15, пратэстантаў – 10. У гэтым жа годзе заяўку на рэгістрацыю падалі каля 15–20 абшчын. Рэлігійныя аб'яднанні абслугоўваліся 155 служыцелямі культу. У каталіцкіх абшчынах праводзілі службу дзевяць ксяндзоў з Польскай Рэспублікі [5, арк. 22].

У Віцебску ў пачатку 1991 г. былі зарэгістраваны ў гарвыканкаме і дзейнічалі абшчына Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора і Яўрэйская рэлігійная абшчына. У стадыі рэгістрацыі знаходзіліся абшчыны Святой Барбары, евангельскіх хрысціян-баптыстаў, Праваслаўнай Свята-Успенскай царквы. Па запрашэнні абшчыны Евангельскіх хрысціян-баптыстаў з Паўднёвай Карэі наведалі горад 15 вернікаў з папулярным прапаведнікам Сан Хван Кімам [5, арк. 22].

У цэлым дзейнасць яўрэйскіх аб'яднанняў у вобласці была адасоблена ад грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі. Пры гэтым мелі месца факты распальвання прадстаўнікамі яўрэйскай нацыянальнасці антыяўрэйскіх настрояў. Так, у пачатку 1990 г. жыхар г. Віцебска А.Я. Гольдзін ад імя

арганізацыі «Белая Русь» накіраваў некалькі дзясяткаў зневажальных лістоў з пагрозамі фізічнага гвалту ў адносінах да яўрэяў, якія жывуць у г. Віцебску, і заклікаў іх тэрмінова з'язджаць «у свой Ізраіль». У рэшце рэшт А.Я. Гольдзін скончыў жыццё самагубствам, выкрыты пад ціскам доказаў, і крымінальная справа ў дачыненні да яго спынена ў сувязі са смерцю. Адзначаныя лісты выклікалі моцную трывогу сярод насельніцтва і маглі сур'ёзна ўскладніць міжнацыянальныя адносіны [5, арк. 58].

Органамі ўлады Віцебшчыны ажыццяўлялася вялікая праца па перадачы культавых будынкаў вернікам. Пры гэтым на тэрыторыі вобласці знаходзіліся будынкі, якія ў мінулым належалі розным рэлігійным абшчынам, таму на іх прэтэндавалі прадстаўнікі некалькіх канфесій, што стварала напружанасць і магло прывесці да абвастрэння міжрэлігійных і міжнацыянальных адносін.

У прыватнасці, у Верхнядзвінскім раёне ў в. Сар'я з-за будынка касцёла спрачаліся праваслаўная і каталіцкая абшчыны. Падобная сітуацыя склалася вакол Сафійскага сабора і Богаяўленскай царквы ў Полацку, касцёла Святой Барбары ў Віцебску. У асабістай гутарцы мітрапаліт Полацкі і Віцебскі Дзмітрый патлумачыў, што Праваслаўная царква спрабуе вырашыць спрэчныя пытанні, аднак органы ўлады не заўсёды своечасова прымаюць адпаведныя меры, звязаныя з перадачай культавых будынкаў, у тым ліку і вышэйадзначаных. Вернікі праваслаўнай канфесіі выказвалі намер заняць будынкі Сафійскага сабора і Богаяўленскай царквы і абвясціць калектыўную галадоўку, калі не будзе вырашана праблема з перадачай гэтых храмаў [5, арк. 22].

Такім чынам, у часы перабудовы для грамадска-палітычнага жыцця Віцебшчыны былі характэрны тыя ж працэсы, якія адбываліся ў рэспубліцы ў цэлым.

ЛІТАРАТУРА

1. **Гісторыя** беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – Кн. 2. – С. 338.

2. **Закон** Белорусской Советской Социалистической Республики «О выборах народных депутатов Белорусской ССР» : принят на двенадцатой сессии Верховного Совета БССР одиннадцатого созыва 27 окт. 1989 г. – Минск : Беларусь, 1989. – С. 3–4.

3. **Збор** законаў Беларускай ССР, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў Савета Міністраў Беларускай ССР. – 1990. – № 22. – Арт. 460.

4. **Збор** законаў Беларускай ССР, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў Савета Міністраў Беларускай ССР. – 1990. – № 22. – Арт. 467.

5. **Нацыянальны** архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 750. Воп. 5. Спр. 1990. Арк. 22.

6. **НАРБ.** – Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2266. Арк. 72.

7. **Півавар, М. В.** Гісторыка-культурныя грамадскія аб'яднанні Віцебшчыны канца XX ст. [Электронны рэсурс] / М. В. Півавар. – Рэжым доступу: https://kraeved.

ihb.by/index.php/ru/eto-interesno/51-pivovar-nikolaj-vasilevich/82-gistoryka-kulturnyya-gramadskiya-abyadnanni-vitsebshchyny-kan-khkh-st. – Дата доступу: 15.12.2021.

8. **Півавар, М. В.** Краязнаўчая дзейнасць клуба «Узгор'е» ў Віцебску ў канцы 1980 – пачатку 90-х гадоў / М. В. Півавар // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2004. – № 4. – С. 10–13.

Марціновіч С.В. *(г. Віцебск)*

ГІСТОРЫЯ ЖЫЛЫХ ДАМОЎ ВІЦЕБСКА НА СТАРОНКАХ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ 1930-х гг.

Гісторыя перадваеннага Віцебска, на жаль, да сённяшняга часу мае шмат белых плям. Іх існаванне выклікана, у першую чаргу, адноснай нешматлікасцю крыніц, што дасягнулі сучаснасці. Таму вялікую каштоўнасць маюць звесткі з газет і іншых сродкаў масавай інфармацыі, якія могуць праліць святло на гісторыю горада ў даваенныя дзесяцігоддзі.

Значную цікавасць уяўляюць жылыя дамы і іншыя будынкі, якія захаваліся ў Віцебску з 1920–1930-х гг. На жаль, па цяперашні час не высветлены нават дакладныя даты пабудовы таго ці іншага дома. Гэта перашкаджае прыняццю іх пад ахову як гістарычных ці архітэктурных помнікаў. У выніку некаторыя старыя віцебскія дамы былі знесены нядаўна, напрыклад, адзін з першых 3-павярховых будынкаў, які быў узведзены на вул. Калініна, 2/1 для працоўных горада ў гады савецкай улады (пабудаваны ў 1927–1928 гг.) [18].

Дзякуючы наяўнасці ў фондах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Нацыянальнай і Прэзідэнцкай бібліятэк у Мінску, а таксама ў Санкт-Пецярбургу даваенных газет аказалася магчымым вызначыць час пабудовы і высветліць шмат цікавых падрабязнасцей з гісторыі старых дамоў Віцебска. У горадзе такіх будынкаў захавалася даволі многа. Вось некаторыя з іх.

1. 5-ты камунальны дом (вул. Максіма Горкага, 36/25)

Самы знакаміты жылы дом Віцебска, пабудаваны перад вайной, – гэта, безумоўна, 5-ты камунальны (вядомы таксама як дом-камуна) на вул. Максіма Горкага, 36/25. Да нядаўняга часу не было звестак пра дакладную дату ўзнікнення будынка (тая, што доўгі час указвалася ў даведніках і энцыклапедыях, – памылковая). Няправільна называўся і архітэктар дома.

Нягледзячы на тое, што гісторыю 5-га камунальнага дома, які даў назву цэламу раёну Віцебска, даследаваў краязнавец Аркадзь Падліпскі ў кнізе «Дамы камунальнага тыпу» (2019), засталося шмат прабелаў [17].

5-ты камунальны дом быў спраектаваны архітэктарамі У. Ваейкавым і А. Самойлавым у 1927 г. па заказе Камітэта садзейнічання рабочаму жыллё-

ваму будаўніцтву РСФСР [21]. Праект быў рэалізаваны ў Віцебску з невялікімі змяненнямі.

Будаўніцтва пачалося ў 1930 г. і цягнулася вельмі марудна нават па мерках таго часу. На гэта былі аб'ектыўныя прычыны: пры закладцы фундамента ўскрыўся плывун. Акрамя таго, кіраўніцтва фабрыкі «КІМ» не забяспечвала будоўлю палівам у зімовы час, таму для ажыццяўлення ўнутраных работ на дровы ішоў каштоўны будаўнічы матэрыял [1].

5-ты камунальны дом планавалі засяліць да 17-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі 7 лістапада 1934 г. [5]. На чарзе стаялі ўдарнікі-кімаўцы, многія з якіх перасяляліся ў добраўпарадкаваныя пакоі з падвалаў і пераналеных трушчоб.

6–7 лістапада 1934 г. газета «Віцебскі пралетарый» апублікавала аповед адной з першых жыхарак новага дома Брайны Будняцкай [11]. Жанчына – удава ўдзельніка вайны з белапалякамі – жыла з дачкой і старой маці ў невялікім пакойчыку памерам у 4 м^2, які падчас дажджу залівала вадой. Зімой былі праблемы з дровамі.

Вось што аб новым жыллі гаварыла карэспандэнту газеты Брайна: «Вельмі я задаволена сваім новым пакоем. Цёпла і чыста. Зараз можна да сябе ў госці запрасіць таварышаў. Не будзе сорамна».

Пасля засялення яшчэ пэўны час у доме не было камунальных выгод. Пра гэта паведамляла газета «Віцебскі пралетарый» 5 чэрвеня 1937 г. [9]: «У раёне Пралетарскай Слабады ёсць вялікі шматпавярховы пяты камунальны дом. Насяляюць яго ў большасці рабочыя фабрыкі «КІМ»... Нягледзячы на тое, што ў кожнай кватэры ёсць водаправод, вада для кватэр не падаецца. Жыхары нават верхніх паверхаў вымушаны хадзіць за вадой на двор.

Калодзеж размешчаны ў антысанітарным месцы, ля самай прыбіральні. Ваду з яго нельга спажываць: яна мае дрэнныя пах і смак. Жыхароў шмат, ля калодзежа збіраецца вялікая чарга за вадой. Пры кожнай кватэры ёсць прыбіральня, але карыстацца ёю нельга».

Якасць будаўнічых работ на новабудоўлі была вельмі нізкай, таму ўжо праз чатыры гады пасля здачы дома яго фасад пачаў абсыпацца і патрабаваў рамонту [14].

Пры 5-м камунальным працавалі крамы – прамтаварная № 20 і хлебная № 8. Пакупнікі скардзіліся на іх працу. Напрыклад, у краме № 20 прадавалі ложак, у якім задняя ножка хісталася і была схавана за палатном [23]. У хлебнай краме гандлявалі праз фортку, таму людзі не бачылі, колькі хлеба ім адважвалі, а стаяць даводзілася пад дажджом [22].

Тым не менш 5-ты камунальны дом стаў адным з сімвалаў «новага Віцебска», пераўтворанага савецкай уладай. Здымкі дома часта змяшчаліся на старонках мясцовых і рэспубліканскіх газет, а сам дом нават трапіў у кінахроніку.

2. Жылы дом фабрыкі «КІМ» (вул. Максіма Горкага, 57)

Пра другі прыметны жылы дом у Маркаўшчыне, які быў пабудаваны на высокім узгорку каля былога Ленінскага праспекта (зараз – вул. Максіма Горкага), таксама шмат цікавага давялося адшукаць у даваеннай перыёдыцы.

Як сведчыць надпіс на франтоне, дом пабудавалі ў 1936 г. для работнікаў фабрыкі «КІМ». Першай аб ім напісала 17 ліпеня 1934 г. газета «Віцебскі пралетарый»: «У Пралетарскай Слабадзе 9 ліпеня закладзены фундамент новага 4-павярховага дома для рабочых фабрыкі "КІМ"» [4].

Цікава, што закладка фундамента была зроблена напярэдадні галоўнага дзяржаўнага свята перадваеннай Беларусі – Дня вызвалення ад белапалякаў, які штогод да 1939 г. адзначаўся 11 ліпеня.

Будаўнічыя работы ў доме скончыліся летам 1937 г., а ў сярэдзіне верасня таго ж года будынак быў заселены. Але здаваўся дом са шматлікімі грубымі недаробкамі, аб якіх група жыхароў напісала 20 снежня 1937 г. у шматтыражную газету «Кімавец» [8]: «Тры месяцы таму назад быў урачыста заселены жыхарамі новы 4-павярховы 6-ты камунальны дом. З радасцю атрымалі новыя кватэры дзясяткі рабочых. Але гэтая законная радасць хутка амрачылася некаторымі "непрыемнасцямі". Справа ў тым, што пушчаны ў эксплуатацыю дом ізабілуе многімі "недаробкамі". Гэтыя "недаробкі" інакш як шкодніцтвам назваць нельга. З-за дрэннай прыгонкі паміж аконнымі рамамі ўтварыліся вялікія шчыліны, тое ж самае і з дзвярамі. У многіх кватэрах няма пячных заслонак, у выніку чаго цяпло выходзіць з пакоя.

Да сяго часу дом не мае асвятлення. Раней дырэкцыя фабрыкі спасылалася, што няма провада. Зараз унутраная і знадворная праводка зроблена, але ж святла няма».

Верагодна, недаробкі былі ў хуткім часе ліквідаваны. 9 ліпеня 1938 г. фота жылога дома апублікавала газета «Віцебскі рабочы» [6]. А крыху раней, 14 мая 1938 г., камендант дома № 2 фабрыкі «КІМ» Г.Р. Мендэльсон пісаў у газеце аб жыхарах новабудоўлі [13]. Іх было 119 сем'яў – стаханаўцы, інжынеры, тэхнікі, вынаходнікі, рабочыя. Некаторых з гэтых людзей добра ведалі ў горадзе, і не толькі па месцы працы.

«Жывуць у нас Антаневіч, Францкевіч, Правалінская, Сабецкая і рад іншых выдатных стаханаўцаў. Жывуць вынаходнік Васільеў, прэміраваны экскурсіяй па цэнтральных гарадах СССР, вынаходнік Абрамаў, інжынер Кузняцова, механікі Давыдаў і Рэф».

Пры доме працавалі гурток мастацкай вышыўкі з жонак ІТР, работы якіх былі прадстаўлены на выставе на фабрыцы, а таксама гурток па вывучэнні Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Савет БССР.

У публікацыях (у тым ліку даваенных) жылы дом на вул. Максіма Горкага, 57 называюць 6-м камунальным. Гэта стварае блытаніну – гэткую ж назву мае і пабудова на сённяшняй вул. Жасткова, 15. Вызначыць, які з

двух будынкаў сапраўды шосты, наўрад ці магчыма. Але сярод тутэйшых Маркаўшчыны гара, на якой стаіць жылы дом кімаўцаў, завецца «шастухай».

3. Дом фабрыкі імя Кагановіча (вул. Залатагорская, 3)

На вул. Залатагорскай, 3 стаіць 4-павярховы жылы дом, які быў радыкальна пераўтвораны ў 1990-я гг. шляхам надбудовы новых паверхаў. Згодна з пашпартам, дом пабудавалі ў 1929 г. Старажылы называюць будынак «вар'яцкім домам» з-за таго, што ў ім жыла моладзь з дывановага камбіната. Да вайны гэта быў дом для работнікаў фабрыкі імя Кагановіча (былая «Дзвіна»).

Вось што пісала пра дом газета «Віцебскі пралетарый» 4 чэрвеня 1937 г.: «Дом фабрыкі імя Кагановіча (Пралетарская Слабада, Залатагорская вуліца) па віне адміністрацыі зусім запушчаны. Тры месяцы стаяць рыштаванні для тынкоўкі, тынкоўка не робіцца. Падлогі рабілі з сырых дошак, цяпер дошкі падсохлі, пакарабаціліся, нават хадзіць па падлозе нельга. У доме няма кухань. Прыбіральні не адрамантаваны, іх залівае вадой. Кватэрную плату бяруць высокую, а рамонту не робяць» [10].

4. Камунальныя дамы на вул. Жасткова

Перад вайной раён сучаснай вул. Жасткова (у 1930-я гг. – вул. Домбаля, Гогалеўскі зав., Нова-Смаленская вул.) быў адным з перспектыўных для масавай забудовы. Тут, на ўскраіне Віцебска, з'явіліся шматкватэрныя дамы ў два, тры і чатыры паверхі.

Першымі былі 4-павярховыя будынкі – зараз № 15 і 17. Абедзве аднолькавыя пабудовы без балконаў часам называюць 6-м і 7-м камунальнымі дамамі.

29 верасня 1934 г. газета «Віцебскі пралетарый» паведаміла аб здачы ў эксплуатацыю ў лістападзе новага, шостага па ліку, камунальнага дома на Смаленскай шашы (зараз – Маскоўскі праспект) [2].

Яшчэ адзін камунальны дом на 24 кватэры, узведзены побач, быў здадзены 10 ліпеня наступнага, 1935 г. да 15-годдзя вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Перад домам быў разбіты газон з добраўпарадкаванымі сцежкамі [15].

5. Дом у пасёлку фабрыкі «КІМ» (вул. Максіма Горкага, 29)

Перад вайной у пачатку вул. Максіма Горкага (да 1950 г. – Ленінскі праспект) быў спраектаваны жылы пасёлак для рабочых прадпрыемстваў, які ў розных крыніцах меў розныя назвы – Пралетарская Ветка, Пралетарская Слабада, Першая Пралетарская Слабада, Першая Маркаўшчына, пасёлак імя 1 Мая. У 1930-я гг. тут пабудавалі некалькі 3–4-павярховых жылых дамоў – 5-ты камунальны і 2 дамы ў раёне сучаснай вул. Смятаніна.

Аб адным з іх 2 лістапада 1940 г. пісала газета «Звязда»: «Рабочыя віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя КІМ атрымалі да

Кастрычніцкіх свят выдатны падарунак – новы 3-павярховы каменны дом, пабудаваны на тэрыторыі фабрычнага рабочага гарадка. Будаўніцтва дома абышлося ў 574 тыс. рублёў. Днямі пачнецца ўсяленне. 36 сем'яў стаханаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў будуць у новых кватэрах святкаваць XXIII гадавіну Вялікага Кастрычніка» [16].

Цяжка сказаць, які з двух дамоў-блізнят узгаданы ў артыкуле. Адзін з іх захаваўся па сённяшні час, яго адрас – вул. Максіма Горкага, 29. На месцы другога, знесенага ў 2000-я гг., зараз стаіць тыпавая дзевяціпавярхоўка № 3 па вул. Смятаніна.

6. Жылы дом на вул. Новы Быт, 4

Пра вялікі жылы 4-павярховы дом на вул. Новы Быт, 4, на жаль, вядома няшмат. Яго фотаздымак быў апублікаваны ў газеце «Віцебскі рабочы» 16 кастрычніка 1939 г. [7]. Пад фотаздымкам змешчаны подпіс: «Новы дом у пасёлку чыгуначнікаў – адзін з прыгажэйшых будынкаў прыгарада ў Віцебску. Дом заселены ў красавіку гэтага года».

Незвычайная назва вул. Новы Быт пайшла ад наймення створанага ў другой палове 1920-х гг. жыллёва-будаўнічага кааператыва, які ўзводзіў тут дамы [19].

7. «Белы дом» (вул. 2-я Садовая, 8–10)

Доўгі 4-павярховы будынак уздоўж 2-й Садовай вуліцы (да 1950 г. – 2-я Гутараўская) быў пабудаваны ў сярэдзіне 1930-х гг. для работнікаў фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі». Колер сцен абумовіў яго назву «белы».

Упершыню аб будынку напісала газета «Віцебскі пралетарый» 31 кастрычніка 1934 г.: «Максімальная механізацыя і рацыяналізацыя будаўнічых работ прыменена на будаўніцтве дома швейнікаў (2-я Гутараўская вул.). 13 каменшчыкаў на 4-м паверсе ўкладваюць па 14–15 тыс. штук цэглы. Укладка сцен і міжпавярховыя перакрыцці будуць гатовы да XVII гадавіны Кастрычніка» [3].

У другі раз дом швейнікаў узгадваўся на старонках газеты 17 красавіка 1937 г. Паведамлялася, што ўвосень 1936 г. фабрыка пракладвала каналізацыю ў будынак. Была прарыта 300-метровая канава, якая была пакінута незасыпанай, таму па вуліцы нельга было ні прайсці, ні праехаць. Ноччу ў роў падалі машыны і калечыліся людзі [12].

8. Жылыя дамы на вул. Рэвалюцыйнай

17 верасня 1939 г. газета «Звязда» апублікавала нататку аб жыллёвым будаўніцтве ў Віцебску, якое вяла акулярная фабрыка (зараз на яе месцы – завод электравымяральных прыбораў) [20].

«У гэтым годзе рабочыя-стаханаўцы і інжынерна-тэхнічныя работнікі фабрыкі атрымалі новы 18-кватэрны дом» (зараз, верагодна, дом на

вул. Рэвалюцыйнай, 31 ці на Ільінскага, 7, надбудаваны двума паверхамі ў 1990-я гг.). «Будуць пабудаваны яшчэ 3 новыя жылыя дамы на 66 кватэр і інтэрнат на 100 месцаў. Адзін 12-кватэрны дом здаецца ў эксплуатацыю да Кастрычніцкіх урачыстасцей» (у нашы дні, верагодна, 2-павярховы дом на вул. Рэвалюцыйнай, 9).

Разгледжаныя аб'екты – далёка не ўсе жылыя будынкі Віцебска, белыя плямы ў гісторыі якіх дапамаглі замаляваць перадваенныя газеты. Пошук матэрыялаў пра старыя дамы горада працягваецца.

ЛІТАРАТУРА

1. **Баскін.** Хто віноўнікі зрыву будаўніцтва дома для рабочых «КІМ»? / Баскін // Віцебскі пралетарый. – 1933. – 24 снеж. – С. 4.

2. **Віцебск** // Віцебскі пралетарый. – 1934. – 29 верас. – С. 4.

3. **Віцебск** // Віцебскі пралетарый. – 1934. – 31 кастр. – С. 4.

4. **Віцебскі** дзень // Віцебскі пралетарый. – 1934. – 17 ліп. – С. 4.

5. **Віцебскі** пралетарый. – 1934. – 9 кастр. – С. 4.

6. **Віцебскі** рабочы. – 1938. – 9 ліп. – С. 4.

7. **Віцебскі** рабочы. – 1939. – 16 кастр. – С. 2.

8. **Група** жыхароў. Засялілі дом ... і з плеч далоў / група жыхароў // Кімавец. – 1937. – 20 снеж. – С. 2.

9. **Дэяру.** Камунальнае абсугоўванне не наладжана / Дэяру // Віцебскі пралетарый. – 1937. – 5 чэрв. – С. 3.

10. **Запушчаны** дом / Кошнікаў [і інш.] // Віцебскі пралетарый. – 1937. – 4 чэрв. – С. 3.

11. **Клупт, С.** У новай кватэры / С. Клупт // Віцебскі пралетарый. – 1934. – 6–7 лістап. – С. 3.

12. **Марціновіч.** Ні праехаць, ні прайсці / Марціновіч // Віцебскі пралетарый. – 1937. – 17 крас. – С. 3.

13. **Мендэльсон, Г. Р.** Хто жыве ў нашым доме / Г. Р. Мендэльсон // Віцебскі рабочы. – 1938. – 14 мая. – С. 3.

14. **Новікава, А.** Аб дабрабыце горада / А. Новікава // Віцебскі рабочы. – 1938. – 4 ліп. – С. 3.

15. **Новы** камунальны дом // Віцебскі пралетарый. – 1935. – 9 ліп.

16. **Новыя** жылыя дамы для рабочых // Звязда. – 1940. – 2 лістап. – С. 4.

17. **Подлипский, А. М.** Дома коммунального типа / А. М. Подлипский. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2019. – С. 50–55. – (Биография витебского дома ; вып. X).

18. **Постройка** больших домов // Заря Запада. – 1927. – 8 июля. – С. 4.

19. **Трэба** прыцягнуць іх да парадку // Віцебскі пралетарый. – 1930. – 10 лістап. – С. 4.

20. **Фабрычныя** яслі // Звязда. – 1939. – 17 верас. – С. 4.

21. **Хан-Магомедов, С.** Архитектура советского авангарда [Электронный ресурс] : в 2 кн. / С. Хан-Магомедов. – Москва : Стройиздат, 2001. – Кн. 2 : Социальные проблемы. – Режим доступа: https://alyoshin.ru/Files/publika/khan_archi/khan_archi_2_066. – Дата доступа: 16.10.2021.

22. **Шамшура.** Не лічацца з пакупніком / Шамшура // Віцебскі пралетарый. – 1937. – 22 ліп. – С. 3.

23. **Шамшура, І.** Прадаюць бракаваны тавар / І. Шамшура // Віцебскі пралетарый. – 1937. – 23 снеж. – С. 3.

Монзуль В.Ю. *(г. Минск)*

ПРОЕКТЫ СТРОИТЕЛЬСТВА АТОМНЫХ ЭЛЕКТРОСТАНЦИЙ В ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ В 1960–1980-е гг. И ИХ МЕСТО В РАЗВИТИИ АТОМНОЙ ЭНЕРГЕТИКИ БЕЛОРУССКОЙ ССР

Начиная с 1960-х гг. Белорусская ССР рассматривалась как перспективный регион строительства атомных электростанций (АЭС) из-за небольших запасов органического топлива и развитой промышленности, потреблявшей большие объемы электроэнергии. Уже в 1968 г. эксперты Министерства энергетики и электрификации СССР отмечали в генеральной схеме электрификации СССР на 1971–1980 гг.: «*Районами первоочередного строительства АЭС по экономическим соображениям должны быть преимущественно районы Северо-Запада, Центра и Юга Европейской части СССР, дефицитные по топливу*». Именно по экономическим соображениям в генеральной схеме намечалось построить одну АЭС в Белорусской ССР или в соседних союзных республиках мощностью 3000 МВт (условное название в генеральной схеме – «Белорусская АЭС») [1, с. 63–65; 2, л. 70–76]. Руководство БССР было заинтересовано в строительстве этой станции, поскольку обеспечение потребностей развивавшейся промышленности и жилищно-коммунального хозяйства предусматривало быстрый рост потребления электроэнергии в республике. Предварительные расчеты Госплана БССР и белорусских энергетиков показывали, что потребление электроэнергии в БССР возрастет до 25,5 млрд кВт·ч к 1975 г. и до 40 млрд кВт·ч к 1980 г. (в 1965 г. потребление составило лишь 7,5 млрд кВт·ч) [2, л. 1–6]. Мощностей существующих и строившихся электростанций недоставало для обеспечения нужд экономики. В 1969–1970 гг. власти БССР и специалисты Ленинградского отделения института «Теплоэлектропроект» (ЛОТЭП) рассмотрели 18 (по другим данным, 17) возможных пунктов для размещения Белорусской АЭС, и больше всего возможных мест для размещения атомной электростанции было подобрано именно в Витебской области – в Браславском, Верхнедвинском, Миорском, Россонском районах, а также на границе Полоцкого и Ушачского районов [4, л. 334–336]. Причина, по которой Витебская область считалась приоритетным регионом для строительства АЭС, заключалась в обилии крупных источников пресной воды и водоемов. Четыре из пяти площадок были при-

вязаны к крупным озерам (Нещердо, Обстерно, Снуды, Яново), еще одна – к реке Западная Двина. Подобный выбор площадок был обусловлен стремлением сэкономить на системах охлаждения циркуляционной воды, поскольку крупные водоемы служили бесплатными охладителями огромных объемов горячей воды (альтернативной им были дорогостоящие башни-градирни). Аналогичным образом организовывалось и охлаждение крупных тепловых электростанций – в частности, Березовской и Лукомльской ГРЭС. После долгих обсуждений в БССР были отобраны две площадки – берег озера Снуды в Браславском районе Витебской области и площадка у поселка Брожа в Бобруйском районе Могилевской области (на границе с Гомельской областью). В 1970–1971 гг. в ЛОТЭП был проведен анализ трех площадок для размещения АЭС – Брожского и Снудского пунктов в БССР, а также Друкшайского пункта в Литовской ССР (на берегу оз. Дрисвяты/Друкшай). Ленинградские специалисты подсчитали, что строительство АЭС в Литве обойдется дешевле, и рекомендовали именно его. Впрочем, власти БССР были крайне заинтересованы в электростанции и в огромных капиталовложениях на ее строительство, и Госплан БССР привлек группу экспертов во главе с академиком А.К. Красиным. Экспертная группа подвергла обоснованной критике выводы ЛОТЭП с целью изменить вывод проектировщиков в пользу площадки на территории Беларуси [3, л. 30–41]. Министерство энергетики и электрификации СССР прислушалось к выводам экспертов и рекомендовало строить АЭС на берегу оз. Снуды [3, л. 224]. 16 сентября 1971 г. строительство АЭС на оз. Снуды было утверждено постановлением ЦК КПСС и Совета Министров СССР № 684-200 [4, л. 169–170]. Впрочем, в 1972 г. Минэнерго СССР и занимавшееся атомной промышленностью Министерство среднего машиностроения СССР настояли на изменении места возведения АЭС в пользу Литвы, основываясь «*на соображениях Минсредмаша о лучшем качестве грунтов в Друкшайском пункте по сравнению со Снудским пунктом и уменьшении капитальных вложений в строительство*» [4, л. 169–170, 341]. В результате началось строительство Игналинской АЭС в Литовской ССР, которая, впрочем, не решила проблемы нехватки электрических мощностей в БССР (обе союзные республики были связаны в объединенную энергосеть северо-запада СССР).

В конце 1970-х – 1980-х гг. Витебская область повторно рассматривалась как регион для размещения новых атомных станций в связи с новыми планами развития энергетики. 25 мая 1979 г. в республике была создана комиссия по развитию атомной энергетики для проработки различных вопросов, связанных со строительством АЭС. Комиссия наметила две площадки в Витебской области – к северу от г. Витебска, на берегу оз. Вымно в Городокском районе и Ореховскую в Оршанском районе в районе существующей БелГРЭС. Еще одна площадка располагалась у южного берега оз. Лукомльское на границе Витебской и Минской областей (впоследствии

место предлагаемого размещения АЭС на этой площадке перенесли южнее, к оз. Селява) [9, л. 1–5]. Витебская площадка виделась проектировщикам весьма перспективной, и был даже подготовлен примерный проект ее размещения на северо-западном берегу оз. Вымно. Предполагалось, в частности, увеличить площадь озера, перебросив воду из р. Западная Двина [8, л. 135]. Впрочем, в 1983 г. геологи дали отрицательное заключение о данном варианте размещения атомной станции из-за опасности образования пустот под станцией. *«Проведенные полевые, буровые и геофизические работы выявили зоны резкого изменения глубин залегания и электрического сопротивления доломитов, что с достаточной степенью достоверности свидетельствует о проявлении карстовых процессов в доломитах*», отмечала рабочая группа [8, л. 130–132; 9, л. 8–10, 31–35]. В 1984 г. Совет Министров БССР и ЦК КПБ согласовали площадку для строительства Белорусской АЭС на берегу оз. Селява в Крупском районе Витебской области, в нескольких километрах к югу от границ Витебской области. При этом жилье для размещения сотрудников АЭС намечалось строить в существующем городе Новолукомле Чашникского района Витебской области [1, с. 68–69].

Ореховская площадка в Оршанском районе Витебской области, которая не подошла для строительства полноценной АЭС, была рекомендована для строительства опытно-промышленной АЭС БРИГ-300 [9, л. 25–26]. Площадка возле БелГРЭС севернее г. п. Ореховск была привязана к Большому Ореховскому озеру, другим вариантом источника водоснабжения было строительство водохранилища на выработках торфопредприятия «Осинторф» [9, л. 3]. Проект БРИГ-300 был в значительной степени экспериментальным, его разрабатывал Институт ядерной энергетики АН БССР для изучения на практике новой технологии с использованием реактора на быстрых нейтронах и диссоциирующего газотеплоносителя [10, л. 1–83]. Этот проект не был реализован.

Наконец Витебск был выбран местом строительства еще одного экспериментального проекта – атомной станции теплоснабжения (АСТ). Появление этого проекта на повестке дня было связано с растущими потребностями крупных городов в тепловой энергии и ростом важности экспорта органического топлива для СССР. В Белорусской ССР началось строительство Минской атомной ТЭЦ (п. Руденск Пуховичского района Минской области), а возле Витебска, Гомеля и Могилева намечалось построить менее крупные АСТ. Ключевыми отличиями АСТ были упрощенная конструкция реактора и теплообменников и отказ от выработки электроэнергии. По задумкам проектировщиков, эти меры должны были удешевить строительство, снизить эксплуатационные риски и позволить разместить станцию всего в 3–5 км от границ городов, тем самым существенно сократив расходы на строительство станций и транспортировку тепловой энергии (в СССР остро недоставало труб большого диаметра). Первые две АСТ начали строить в конце 1970-х –

начале 1980-х гг. в Горьком (совр. Нижний Новгород) и Воронеже [7, л. 1–8]. Выбор в пользу Витебска был продиктован бурным промышленным и жилищным строительством в городе.

Летом 1984 г. началась подготовка проекта постановления ЦК КПСС и Совета Министров СССР о развитии атомной энергетики на ближайшие пятилетки, и 31 августа 1984 г. Совет Министров БССР попросил предусмотреть в числе прочего «*сооружение Витебской АСТ-1000 мощностью 860 Гкал·ч с вводом ее в действие в 1995 году*» [9, л. 45]. Энергетики высказывали большую заинтересованность в строительстве Витебской атомной станции теплоснабжения. Так, 21 января 1985 г. главный инженер Белглавэнерго Л.В. Черепко проинформировал Госплан БССР, что «*для обеспечения надежного теплоснабжения городов и значительного сокращения [потребления] органического топлива необходимо сооружать атомные станции теплоснабжения (АСТ) в первую очередь в гг. Витебске и Могилеве*». 1 февраля 1985 г. председатель Госплана БССР А.А. Реут писал в ЦК КПБ, что «*строительство атомной станции теплоснабжения (АСТ) наиболее реально в перспективе в г. Витебске*» [5, л. 41–47]. Проектированием трех АСТ, намечавшихся к строительству в БССР, занималось Ленинградское отделение института «Атомтеплоэлектропроект». Проектировщики подсчитали, что ввести Витебскую АСТ из двух блоков суммарной тепловой мощностью 860 Гкал·ч в эксплуатацию необходимо будет после 1995 г., когда возможности существующих источников тепловой энергии будут исчерпаны. Ленинградские специалисты предложили две площадки для размещения АСТ – у п. Старинки в 3 км южнее перспективной границы Витебска и у п. Октябрьский в 3 км юго-восточнее Витебска. Намечалось отвести для станции 80 га земли и задействовать 3 тыс. строителей, а от отдельного поселка атомщиков отказаться, разместив обслуживающий персонал в Витебске [11, л. 13–15]. Впрочем, эти две площадки были отвергнуты из-за близости аэропорта. Белорусское отделение института «ВНИПИэнергопром» предложило два дополнительных места размещения станции, одно из которых в итоге и утвердили. 21 ноября 1985 г. зам. председателя Витебского облисполкома В.К. Соболенко проинформировал Госплан БССР о согласовании площадки восточнее Витебска. Она располагалась в 2,5 км от перспективной границы города, на территории земель экспериментальной базы «Тулово» и леса. В 1 км к северу от намечаемой Витебской АСТ располагалась д. Сливовщина (Селивовщина), в 2 км к западу – д. Билево. 30 декабря 1985 г. Госплан направил в Совет Министров БССР полный пакет документов по АСТ в Витебске, Гомеле и Могилеве [11, л. 1–31].

После катастрофы на Чернобыльской АЭС в планы развития атомной энергетики БССР были внесены значительные коррективы. Геологи пришли к выводу о непригодности Селявской площадки для строительства Белорусской АЭС, а местные органы исполнительной власти начали выступать

против ее строительства. Из-за необходимости выполнять постановления союзного руководства был срочно начат поиск альтернативных площадок для строительства уже утвержденной Белорусской АЭС. Власти БССР предложили пять новых мест для размещения АЭС, включая три площадки в Витебской области – на озерах возле поселков Езерище, Освея и Россоны. Общим для всех новых площадок было пограничное расположение. 25 марта 1988 г. Бюро Совета Министров СССР по топливно-энергетическому комплексу официально утвердило резервным местом строительства АЭС Езерищенскую площадку [1, с. 70]. На этой площадке рассматривались различные варианты размещения АЭС – на оз. Езерище, а также южнее, на группах озер Вымно и Межа [12, л. 72–73]. В условиях гласности и перестройки строительство активно обсуждалось общественностью и СМИ. Жители Витебска выступали против строительства, высказывая свое мнение различными способами: написали письмо генеральному секретарю ЦК КПСС М.С. Горбачеву, озвучили наказ народному депутату СССР Г.И. Артеменко «*не допустить размещения и строительства в БССР и в Витебской области Белорусской АЭС*», приняли критические резолюции на нескольких местных партийных конференциях [6, л. 97–140]. В результате в конце 1988 г. ЦК КПБ и Совет Министров БССР отказались от строительства Белорусской АЭС [1, с. 70]. Аналогичная судьба постигла другие проекты и даже начатое строительство Минской АТЭЦ, которую перепрофилировали в ТЭЦ-5 на органическом топливе. Впрочем, не исключено, что проектные организации успели подготовить какие-либо чертежи для намечавшегося строительства атомных объектов на территории Витебской области.

В 1960-е – 1980-е гг. Витебская область считалась наиболее перспективной для строительства атомных электростанций в Беларуси благодаря географическим особенностям, а крупный промышленный центр Витебск рассматривался как место строительства в обозримом будущем атомной станции для теплоснабжения города. В СССР атомная энергетика рассматривалась как экономически выгодная, а до 1986 г. – еще и экологически безопасная. Экономическая эффективность атомных станций оценивалась как высокая, в связи с чем строительство новых АЭС на территории Витебской области было весьма вероятным. Впрочем, катастрофа на Чернобыльской АЭС заставила пересмотреть экологические риски возведения объектов атомной энергетики, что привело к замораживанию всех проектов в этой сфере и переоценке критериев выбора площадок для строительства АЭС.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Монзуль, В. Ю.** Мирный атом в БССР / В. Ю. Монзуль // Беларуская думка. – 2018. – № 1. – С. 63–70.

2. **Национальный** архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Оп. 5. Д. 2273.

3. **НАРБ.** – Ф. 7. Оп. 5. Д. 3327.

4. **НАРБ.** – Ф. 7. Оп. 5. Д. 3697.
5. **НАРБ.** – Ф. 7. Оп. 5. Д. 8577.
6. **НАРБ.** – Ф. 7. Оп. 10. Д. 1317.
7. **НАРБ.** – Ф. 31. Оп. 10. Д. 707.
8. **НАРБ.** – Ф. 31. Оп. 10. Д. 1083.
9. **НАРБ.** – Ф. 31. Оп. 15. Д. 185.
10. **НАРБ.** – Ф. 31. Оп. 15. Д. 485.
11. **НАРБ.** – Ф. 31. Оп. 15. Д. 880.
12. **НАРБ.** – Ф. 31. Оп. 15. Д. 1381.

Мясоедова С.Н. *(г. Витебск)*

ДОКТОР КАМУШЕР: У ИСТОКОВ ПРОТИВОТУБЕРКУЛЕЗНОЙ СЛУЖБЫ ВИТЕБЩИНЫ

22 сентября 1921 г. в Витебске открылся показательный диспансер (амбулатория для туберкулезных больных). Учреждение занимало 8 комнат в здании по адресу: ул. Гоголевская, д. 15/1 (совр. ул. Ленина, д. 18), в котором первоначально вели прием 2 педиатра, 2 терапевта и хирург [1, с. 619]. Одновременно при диспансере для решения финансовых вопросов был организован «комитет содействия» [7]. В качестве помощника заведующего диспансером и секретаря «комитета» на работу в диспансер пришел военный врач Григорий Абрамович Камушер, впоследствии организатор и руководитель Ростовского областного научного общества фтизиатров (с 1947 г.), заслуженный врач РСФСР (1955) [1, с. 619].

Биографическую справку о Г.Д. Камушере можно составить на основании материалов, собранных некоммерческими организациями JewishGen, FamilySearch (сайты требуют регистрации), а также документов из портала «Память народа» и Государственного архива Витебской области.

Григорий (Гирш) Абрамович Камушер родился в Вильно 12 (25) апреля 1891 г. в семье девянишского мещанина Ошмянского уезда (совр. местечко Девянишкес, Литва) Абрама-Израиля Геноховича (Абрама Евгеньевича) и его жены, мещанки Мины (Хаси-Мины) Семеновны (Симоновны), в девичестве Перельман [3, л. 329; 11] (Дадатак 6, фота 1). В семье кроме него было еще двое сыновей: Иосиф, 22 марта 1893 г. р. и Гершон, 15 октября 1897 г. р. [11].

Г.А. Камушер получил высшее медицинское образование, о наличии которого писал в одной из анкет [3, л. 329]. В 1913 г. он вступил в брак с Двейрой (Верой Константиновной) Фрадкиной [3, л. 329; 12], а уже с 1914 г. называл себя беженцем «по военным обстоятельствам из Вильно» [3, л. 327] (Дадатак 6, фота 2).

В 1918–1923 гг. Г.А. Камушер с небольшими перерывами находился в Витебске. В начале 1918 г. значился как вольнопрактикующий врач. 30 августа 1918 г. у Камушеров родилась дочь Эва (Ева, Эвелина) [3, л. 329; 13].

Во исполнение декрета СНК РСФСР от 29 августа 1918 г. «О призыве на военную службу медицинских, зубных и ветеринарных врачей, лекарских помощников, фармацевтов, медицинских и ветеринарных фельдшеров» в Витебске на 20 сентября 1918 г. была назначена регистрация и призыв на военную службу врачей 1883–1891 гг. р., фармацевтов 1888–1897 гг. р., фельдшеров 1888–1891 гг. р. и зубных врачей 1891–1897 гг. р. Приказом Витебского губернского военного комиссариата № 91 от 20 сентября 1918 г. вольнопрактикующий врач Г.А. Камушер был принят на военную службу и назначен с 11 сентября 1918 г. исполняющим обязанности старшего врача Первого латышского советского кавалерийского полка [8]. Он прошел освидетельствование, к военной службе оказался годен [9].

Вместе с полком врач Г. Камушер уехал на Южный фронт, где принимал участие в боях против генерала Краснова, «пользовался любовью и уважением, приложил много трудов, когда оказывал медицинскую помощь раненым. Он был на передовой линии, рисковал жизнью, когда под градом пуль делал перевязку раненым красноармейцем» [3, л. 336].

С 1919 г. Г.А. Камушер вновь в Витебске. Он «хлопотал» перед Витебским губисполкомом о признании его беженцем, поскольку хотел уехать в Вильно, где проживали родственники. Однако необходимых документов Григорий Абрамович не имел, получил отказ и далее подал заявление на оптацию (выбор гражданства) Литвы, получение которой давало возможность уехать в Вильно [3, л. 327].

В ожидании оптации доктор Камушер работал в сводных эвакуационных госпиталях Витебска, сначала ординатором 4-го, затем младшим ординатором 211-го – 229-го [10].

На высоком берегу Западной Двины во 2-й Марковщине для раненых были выстроены просторные деревянные бараки. В 4-м сводном эвакуационном госпитале, где с 1919 г. работал А.Г. Камушер, были большие палаты, много воздуха и хорошее оборудование. Однако не хватало белья, мыла, соды, постельных принадлежностей, вроде матрасов, одеял, простыней, полотенец, подушек, которые нечем было набивать из-за отсутствия соломы. Больные и раненые в одних палатах лежали совершенно голые, в других – на грязном белье, которое могли не менять и 16 суток из-за невозможности его стирать, «тяжелораненые в обе ноги, одержимые еще вдобавок столбняком, лежат в грязных окровавленных фронтовых рубашках. Излеченных от чесотки вновь одевают в то же грязное и рваное белье, бывали при этом случаи заболевания тифом от заражения и грязи».

Лечение больных характеризовалось как удовлетворительное за исключением венерического отделения, где со стороны медицинского персонала,

как старшего, так и младшего, наблюдалось пренебрежительное отношение к больным, их осматривали лишь по прибытии в госпиталь, а затем не обращали внимания. Начальник госпиталя отмечал, что эвакуационный госпиталь не должен долго задерживать больных, занимался приемкой раненых и направлением их для дальнейшего лечения в стационарные госпитали [10].

Доктор Камушер работал здесь ординатором, «пользовался доверием и уважением всего командного состава, политчасти и служащих госпиталя. В госпитале он пережил эпидемию сыпного тифа, одно время оставался один на громадный (600 мест!) госпиталь, так как весь остальной персонал был болен [3, л. 333 – 333 об].

211-й сводный эвакуационный госпиталь в составе четырех врачей, фармацевта, пяти чинов хозяйственного разряда, восьми сестер милосердия и пятидесяти санитаров прибыл в Витебск в конце 1918 г. для обслуживания витебского гарнизона [6], а затем, вероятно, объединился с 229-м госпиталем. Здесь доктор Г.А. Камушер работал младшим ординатором, военный комиссар госпиталя отмечал, что он «хорошо обращался с ранеными, чем заслужил уважение к себе» [3].

Подробности эвакуации медицинского и ветеринарного институтов не сохранились. А вот участница эвакуации педагогического института Б. Кичина сохранила в своем семейном архиве черновик «Докладной записки о работе Витебского государственного пединститута (за время с 22 июня по 4 июля) и об его эвакуации», составленный 22 сентября 1941 г. Вот отрывок из него: «5. Согласно распоряжению президиума облисполкома 2 июля была начала подготовка к эвакуации. Для эвакуации было собрано наиболее ценное оборудование, имущество общежития (постельное белье, одеяла) и документы. Много ценного было оставлено, так как для эвакуации имущества и сотрудников было предоставлено только три платформы. 6. Согласно указаний председателя президиума облисполкома и разрешения начальника Витебского гарнизона, 4 июля была произведена погрузка отобранного имущества института. 5 июля вместе с институтским имуществом эвакуировались из Витебска научные работники (по списку, утвержденному облисполкомом, с разрешения начальника гарнизона), члены семей мобилизованных в РККА сотрудников института – всего 61 человек. <…> 9. Имущество пединститута: вывезено простынь – 632, одеял – 101, наволочек – 295. Из них выдано во временное пользование сотрудникам института под расписку соответственно – 108 и 27. И передано по акту от 29 августа Кочкарскому райисполкому Челябинской области: простынь – 524, одеял – 74, наволочек – 295. Передана по акту от 27 августа с. г. Кочкарскому райисполкому во временное пользование одна пишущая машинка системы «Ленинград». 10. Лабораторное оборудование. В 37 ящиках (микроскопы, в том числе поляризационный микроскоп, много импортных микроскопов, лабораторное оборудование физического кабинета) – все большой ценности, и 5 кип с документами сданы на хранение на базу «Кочкарь-Золота» станции Нижне-Увельской. В каждом ящике имеется перечень содержимого, но ящики сданы общим счетом, без проверки и приема на хранение. Дальнейшее пребывание этого ценного имущества на указанном складе нецелесообразно. Крыша протекает, склад не отапливается, неизбежна порча». Как следует из этой же «Докладной записки», отправленной в адрес народного комиссара просвещения БССР и Всесоюзного комитета по делам высшей школы, эвакуированные ценности направлялись в г. Саратов, но в г. Ртищеве Саратовской области эвакуационная комиссия направила витеблян в г. Петропавловск, где их ожидали и

планировали использовать в качестве преподавателей своих вузов. Однако до Казахстана эвакуированные не доехали. На ст. Нижне-Увельская Челябинской области (ныне – г. Южноуральск) прибывших направили в г. Пласт Челябинской области. Имущество же осталось на станции и было направлено на склад "Кочкарь-Золота"» [18].

Об эвакуации Второго Белорусского государственного театра тоже сохранились воспоминания актеров этого театра. Вот что написал народный артист республики, лауреат Сталинской премии Т. Сергейчик: «Из города начали эвакуировать фабрики, заводы и государственные учреждения. Театр также предупредили, чтобы был в любое время готов для выезда. Однажды поздним вечером нас, несколько ведущих актеров и директора, вызвали в облисполком. Там мы узнали, что фашистские танки прорвались негде под Лепелем и Полоцком и что оставаться в Витебске опасно. Утром, пока не поздно, театр должен срочно эвакуироваться в Саратов. Никакого имущества брать с собой не советовали, ибо, может быть, доведется идти пешком. Вагоны для нас уже подготовлены. Сборы наши были короткие. Взяв чемоданчик с едой и одеждой для дочки и бабушки, мы пешком пошли на вокзал. Но никакого транспорта уже не было. Народа много. Все спешили быстрей покинуть город, пока не поздно. День был солнечный и горячий. Ожидая паровоза, мы разместились в тени деревьев около вокзала. Там просидели до полудня. Вместе с директором мы пошли к дежурному по вокзалу узнать, когда нас отправят. Им оказался наш бывший студиец. Он нам сказал, что боится отправить эшелон с людьми на Невель, ибо там немцы все время бомбят станцию и эшелон не пройдет.

– Что же делать? – спрашиваем.

– Надо ехать через Смоленск.

– А там как?

– Также бомбят, но ночью можно проскочить.

– Давайте на Смоленск.

– Подождем немного, еще раз хорошо выясню все обстоятельства.

Ждем. Над городом в воздухе идет горячий бой между нашими и фашистскими истребителями. Затаив дыхание, следим за ним, забыв про все на свете. Фашисты не выдержали и начали убегать, наши погнались на ними. Мы все, как один, ШАЛЁНА аплодируем и кричим "Ура!".

Вскоре подошел дежурный по вокзалу и сообщил, что на Марковщине нас ожидает эшелон, направляющийся на Смоленск. Надо идти туда. Отведя меня в сторону, он посоветовал сделать все возможное, чтобы приехать в Смоленск ночью и как можно быстрее оттуда выехать, иначе нас разбомбят там. Я искренне поблагодарил его, и мы расстались, пожелав один одному всего доброго.

Эшелон стоял далеко от города в поле: восемьдесят шесть больших вагонов для угля, без крыш. Театр разместился в четырех вагонах. Ехало нас

много, все с семьями. В быстром времени вагоны были переполнены до отказа жителями Витебска. Это были преимущественно женщины, дети и старики» [18]. А вот что рассказывала народная артистка республики З. Конопелько: «Эвакуировались из Витебска: художественный руководитель театра, народный артист А.К. Ильинский с женой А.И. Лаговской и двумя дочерьми, Кирой и Аллой; с ними ехала мать, отец не поехал, ибо был очень больной. Он остался в Витебске, один в квартире, сказал: “Я все равно умру, не хочу умереть в дороге”. Ехал также Т. Сергейчик с маленькой дочерью Зоей. Его жена, Галина Васильевна, перед самой войной повезла лечить в Москву 8-летнего сына, поэтому Тимофей Николаевич ехал без нее. Анатолий Шелег также отъезжал один, ибо жена с двумя дочерьми поехала отдыхать, а вернулась пешком только вечером 4 июля, когда эшелон ушел. Народный артист Молчанов ехал с женой, артисткой Л.И. Мозолевской, и 8-летней дочерью Валей. В.И. Куликовский вез семью Г.Ф. Ивановской с двумя детьми – Лидой 16 лет и Эдуардом 14. Ехали также директор Диненман с женой-доктором, дочкой и швагеркой с малолеткой; артистка Глебовская; работники бухгалтерии; актрисы Шура Буданова, Таня Заранок с двумя маленькими детками – дочкой и сыном (ее муж Леонид Волчецкий был в армии); актриса Мария Сергеевна Белинская и ее муж, заведующий литературной части Иосиф Львович Дорский; электрик Бляхман с семьей; актер Иосиф Иванович Тупик с семьей; заведующий музыкальной части, дирижер оркестра Леонид Алексеевич Маркевич с женой – концертмейстером Верой Васильевной Барщевской; администратор Долгицер с семьей и соседкой-бабушкой с двумя девочками-сиротками; Мира Львовна и Лиза Львовна Скобловы; актриса Любовь Владимировна Гепнер с сыном; актер Сергей Алексеевич Козлов с женой Броней Колкиной и двумя сынами-близнецами; главный бухгалтер с мужем и двумя детьми, артисты оркестра с семьями и многие другие работники театра: гримеры, электрики, художники-декораторы. Когда я с мужем, Ф. Шмаковым, собирала вещи в чемоданы и сели за прощальный стол с друзьями Я.Г. Бураковым и Е.П. Родзяловской, нас прервали, ибо принесли повестки из военкомата Шмакову и Буракову. Я начала вновь перебирать вещи, чтобы оставить ненужное, ибо к вокзалу надо было идти пешком, а у меня на руках маленький сын. Шмаков с Бураковым пошли в военкомат, чтобы попросить разрешения проводить семьи. Начальник взял их повестки и спросил: “А что, весь театр эвакуируется?”. Они ответили: “Да”. Тогда он сказал: “Отъезжайте вместе с театром, а на месте назначения сразу станьте на военный учет”. Так и остались Бураков и Шмаков с коллективом.

На вокзал мы должны были прибыть в 4 часа дня. Но неожиданно начался налет, объявили тревогу. После отбоя мы быстро двинулись по ул. Краснобригадной через мост к вокзалу. Около вокзала – вновь тревога, мы попали в подвал почтамта, присели там до отбоя и после направились в клуб железнодорожников “Субботник”, где собрались жители города, которые должны

были эвакуироваться. Театру в эшелоне было отдано две платформы и два вагона из-под угля без крыши. Но в тот день мы так и не поехали: просидели в клубе с четырех часов дня до четырех утра. За ночь было несколько налетов немецкой авиации, объявлялась тревога. И только на рассвете на грузовике нас перевезли на товарную станцию, где находился эшелон, собранный с остатков вагонов. Эшелон был длинный. Мы двигались медленно на рассвете 4 июля. Немцы уже были близко. Счастье, что еще уцелели мосты. Отъехавши 7–8 км, мы увидели, что высадился немецкий десант. Когда объявлялась тревога (пролетали немецкие самолеты), эшелон останавливался, все выходили и прятались в кустах.

Небо затянулось тучами, началась гроза, сильный дождь. В нашем вагоне без всякой крыши все вымокли. Я с маленьким сыном на руках, босая, в пальто, которым прикрывали ребенка, была вся перепачкана угольной пылью. Гроза кончилась. В этом эшелоне был пустой пассажирский вагон. Там ехали только два проводника. Шмаков на остановке подошел к ним, чтобы пустили меня с маленьким сыном в вагон. Проводники согласились, но попросили, чтобы никто не заметил, дескать, остальные женщины с детьми могут кинуться штурмовать этот вагон. Но когда я вошла в тамбур, сразу же выскочил человек в военной форме и, выхватив пистолет, закричал: “Куда? Нельзя!”. Видимо, у меня, еще совсем молодой матери (мне было тогда 21 год), перепачканной и промокшей, было такое в глазах, что он отступил и сказал: “Хорошо, постойте в коридоре”. И вот тут женщины, можно сказать, овладели этим купейным вагоном. Заняли купе: я с сыном, жена нашего актера Фадеева с маленьким ребенком, жена актера Вечерщинского с трехлетним малым и беременная жена актера Бориса Левина (она была на 9-м месяце). Другое купе занял Анатолий Трус с женой Соней и двумя дочерьми – трехлетней Лиина и годовалой Танечкой (ее называли Танька-пуд, она была толстенькая). Они заняли отдельное купе, ибо у ребенка был коклюш. Наши мужчины (Левин, Фадеев, Шмаков) и дальше ехали в вагоне из-под угля, приходили к нам, приносили поесть, попить. Ехать на Смоленск было небезопасно, ибо наш эшелон был большой, собранный из разных вагонов и платформ. Но ночью 4 июля мы все же добрались до Смоленска» [12].

Из Витебска были эвакуированы только два музея – Исторический и картинная галерея им. Пэна[2]. Картинную галерею им. Ю. Пэна вывозили ее директор Л. Эстрина (1900–1964) и научный сотрудник Е. Сумник (1911–1985). Ни одна, ни другая не оставили, к сожалению, подробностей того, как это происходило. Известно, что для картинной галереи им. Пэна был выделен крытый вагон, в который свозили холсты – и в небольших рамах, и вырезан-

[2] Не были вывезены государственный Антирелигиозный музей (отдел Исторического музея, биолого-зоологический, энтомологический и некоторые другие негосударственные музеи. Витебские музеи были единственные в республике, которые успели эвакуировать.

ные из них, скрученные, чтобы не повредить масленый слой. Уже в 1980-е гг. воспоминания о том, как проходила сама эвакуация, оставил сын Е. Сумник З. Вальшонок: «Вагон, в котором ехала наша семья, подцепили к эшелону, груженному станками каких-то предприятий, и состав ночью, под проливным дождем, отправился из Витебска. Едва мы доехали до станции Великие Луки, как эшелон разбомбили. Бомбы попали в переднюю и заднюю часть поезда. Центральная часть, где были мы, уцелела. К исходу следующего дня путь на восток был перерезан. На Великие Луки выходили прорвавшиеся немецкие части, и нам бы оттуда не выбраться, если бы не подошел эшелон из Прибалтики. Его тоже разбомбили, но железнодорожники из двух составов сделали один, и по запасным путям, под артиллерийским огнем, мы уходили из Великих Лук… Дальше наш путь с длительными стоянками продолжался к Саратову. Из Витебска мы выехали в первых числах июля, а когда прибыли в Саратов, уже падали листья, был конец августа или начало сентября 1941 года. К этому времени наплыв беженцев в Саратов был очень большой, и всем сотрудникам галереи предложили с семьями выехать в Аткарск, городок под Саратовом. Мы там находились примерно два месяца. Мама ездила в Саратов, чтобы узнать судьбу галереи. Вернулась удовлетворенная, что все в целости и сохранности» [16].

В Саратове фонды картинной галереи им. Пэна были переданы в Художественный музей им. Радищева. Точное число вывезенных из Витебска работ неизвестно. Возвращено из Саратова было около 200. Это значит, что примерно две третьих фонда галереи (около 400 единиц) было оставлено в Витебске и во время оккупации погибло. Правда, это были не самые лучшие работы художника, а также большое число эскизов и этюдов.

Эвакуированы из Витебска были часть Государственного архива, архивы советских и партийных органов, а также областного отделения Нацбанка и НКВД.

Накануне Великой Отечественной войны на хранении в Государственном архиве находилось 2085 фондов, насчитывающих 1 млн 14 тыс. 356 единиц хранения. В июле 1941 г. было эвакуировано в Йошкар-Олу Марийской АССР только 14,5 тыс. дел. Все годы войны они хранились в местном архиве, а после освобождения Витебска были возвращены владельцу [20]. Больше повезло по понятным причинам архиву обкома КП(б)Б. С началом войны его документы в сопровождении заведующей О. Стояковой были перевезены сначала в Уфу, а затем в Саратов. Они тоже вернулись после окончания войны [10].

* * *

В Витебске эвакуация была завершена 8 июля. Назавтра, 9 июля, в 11 часов утра из города ушел последний поезд с несколькими вагонами, в которых разместились железнодорожники и члены их семей. Они завершали

эвакуацию, проявив при этом чудеса героизма. Сколько ценностей (готовая продукция, сырье, оборудование) и людей вывезли витебские железнодорожники за эти шесть дней, посчитать очень трудно. Известно, что только металлообрабатывающих станков было вывезено более тысячи, а общее число вагонов доходило до двух тысяч. А количество людей наверняка исчисляется десятками тысяч. Большинству из них железнодорожники спасли жизнь.

Пунктами размещения эвакуированных витебских предприятий были самые различные города восточных районов СССР. Так, например, в Новосибирск была отправлена трикотажная фабрика им. К. Цеткин, Ульяновск – фабрика им. КИМ, Саратов – фабрика «Знамя индустриализации», завод им. Коминтерна, Уфу – фабрика «Прогресс» и молочный комбинат, Кунгур – фабрика «Красный Октябрь», Горький – кожевенный завод, Богородск Горьковской области – щеточный комбинат, Кострому и Бийск – фабрика им. Кагановича, Мичуринск – областное управление связи, Елец – завод им. Кирова, Вологду – очковая фабрика, Подольск Московской области – игольная фабрика, Чкаловск – мебельная фабрика, Свердловск – фабрика холодильников, на ст. Кинель-Черкасский Куйбышевской области – валяльно-войлочная фабрика, на ст. Барыш Куйбышевской области – фабрика «Профинтерн», на ст. Петровская Саратовской области – махорочная фабрика, в Татарскую АССР – фанерный завод и инструментальная фабрика, в Воронеж – маслобойный завод. Почти все предприятия были развернуты в направляемых населенных пунктах, хотя были и исключения. Например, 34 вагона фабрики им. К. Цеткин Наркомат переадресовал в Мелекес Куйбышевской области, а 12 вагонов – в Куйбышев. Оборудование очковой фабрики было переадресовано в Суксун тогдашней Молотовской области, где она была быстро восстановлена и стала давать продукцию, а завода им. Кирова – прибыло на место назначения полностью, но тоже было переадресовано. Игольная фабрика была перенаправлена в Тамбов.

Имущество фабрики им. КИМ было передано местному трикотажному предприятию, фабрики «Прогресс» – Уфимской обувной фабрике им. Ворошилова, мебельной фабрики – Чкаловскому такому же предприятию, маслобойного завода – Воронежскому жиркомбинату. Фабрика «Знамя индустриализации» тоже была восстановлена и работала в качестве самостоятельного предприятия. Практически все оборудование стало использоваться в самые кратчайшие сроки. Исключения – махорочная фабрика, которая прибыла к месту назначения (ст. Петровская Саратовской области), но не могла там быть использована. И только после того, как пять вагонов предприятия перевезли в г. Маркс той же области, к зиме оно уже стало выпускать продукцию.

Сохранилось немало документального материала и о деятельности витебских предприятий по новым адресам. Вот только несколько публикаций СМИ военного времени.

«Трикотажники работают на оборону»

Витебская трикотажная фабрика «Знамя индустриализации»[3] – одно из крупнейших трикотажных предприятий Союза – в начале июля прошлого года было эвакуировано вглубь нашей страны. Коллектив фабрики не оставил немецко-фашистским захватчикам ни оборудования, ни готовой продукции, ни сырья. Более 650 квалифицированных рабочих фабрики и основные кадры специалистов выехали на новое место, чтобы продолжить выпуск необходимой стране продукции. Теперь рабочие фабрики с большим производственным подъемом работают на пользу Красной армии, выполняют заказы фронта. Коллектив фабрики с успехом провел подписку на Государственный военный заем.

(Газета «Советская Белоруссия», 21 апреля 1942 г.)

«Помогаем фронту»

Рабочие эвакуированного Витебского игольного завода самоотверженно трудятся, выпуская боевую продукцию для фронта. Комсомолка-электросварщица В. Романовская имеет на личном счету 2308 процентов сверхплановой продукции; стахановка Романова – 1772 процента; бригада коммуниста Кушнеровой взяла обязательства дать 840 процентов сверх плана боевой продукции, а выдала 1084 процента. Все труженики работают так, как подобает настоящим патриотам, стахановцам военного времени. Слесарь-инструментальщик Родшец дает две нормы. Кроме того он обучил этой профессии еще двух товарищей. Конструктор-коммунист В. Климович, ликвидируя узкое место на производстве, своими силами сделал и смонтировал аппарат для точечной электросварки.

Я тоже даю в день не менее двух норм. Работаю за двоих, за троих. Также обучил двух товарищей профессии токаря, сейчас готовлю еще одного. Самоотверженным трудом, личной помощью фронту я мщу врагу за разрушенный милый Витебск, за мою любимую Беларусь, помогаю освобождать ее от фашистского плена.

И. Забелло, стахановец игольного завода

(Газета «Советская Белоруссия», 8 мая 1943 г.)

«Даем продукцию сверх плана»

Вести о героических подвигах нашей доблестной Красной армии и партизан вдохновляют коллектив эвакуированной из Витебска фабрики имени Клары Цеткин на еще большее усиление работы для фронта. Стахановцы фабрики систематически перевыполняют нормы выработки, дают много продукции сверх плана. Мы не пожалеем ни сил, ни времени для того, чтобы

[3] Фабрика «Знамя индустриализации» являлась швейной, а не трикотажной. Журналист, готовивший этот материал, явно ошибся.

дать Красной армии больше оружия и поможем выполнить приказ товарища Сталина – сделать 1942 год – годом окончательного разгрома немецко-фашистских войск и освобождения советской земли от гитлеровских поганцев.

Директор фабрики М. Аверин

(Газета «Советская Белоруссия», 30 мая 1942 г.)

«Продукция сверх плана – фронту»

Витебский игольный завод эвакуирован вглубь страны. Сейчас работает для фронта и с каждым днем увеличивает выпуск продукции. За июнь завод выполнил задание на 200 процентов. Самую высокую продуктивность дают стахановцы фронтовой бригады тов. Кушнеровой. На заводе ширится движение двухсотников[4]. Работницы Барсукова Н., Куранская, Калонда выполняют план на 200 процентов, Егоренко, Степанова, Петроченко, Забенко, Регешина с каждым днем увеличивают выпуск продукции фронту. Коллектив завода помогает Красной армии громить немецких оккупантов.

(Газета «Советская Белоруссия», 24 июля 1942 г.)

«Предоктябрьское соревнование»

Коллектив эвакуированного из Витебска завода № 17, вступив в предоктябрьское соревнование, увеличивает темпы труда, дает фронту продукцию сверх плана.

Смена мастера Богомоловой ежедневно перевыполняет производственную программу. Растут ряды стахановцев, новаторов производства. Хорошо работает работница тов. Томашева, которая систематически выполняет задание на 300–500 процентов. Самоотверженным трудом коллектив завода готовит достойную встречу 25-й годовщины Великого Октября.

Д.М. Давыдова

(Газета «Советская Белоруссия», 14 октября 1942 г.)

«Фабрика “Знамя индустриализации” – фронту»

Витебская фабрика «Знамя индустриализации» была гордостью нашей республики. В светлых, просторных корпусах работали тысячи рабочих. При фабрике был хорошо оборудованный профилакторий, детский сад, клуб. Это была одна из крупнейших швейных фабрик Советского Союза. Когда немецкие бандиты ворвались в Витебск, они не нашли на фабрике ни одной машины. Оборудование и рабочий коллектив были эвакуированы в советский тыл.

С исключительной энергией, не жалея сил и времени, коллектив фабрики с помощью местных организаций за короткое время смонтировал оборудование и начал давать продукцию фронту. Через месяц предприятие работало

[4] Двухсотники – лица, выполняющие план на 200 и более процентов.

уже на полную мощность и с того времени систематически перевыполняет производственные задания. За 1942 год фабрикой «Знамя индустриализации» выпущено продукции для фронта более чем на 50 миллионов рублей. Большая часть продукции изготовлена из сырья, эвакуированного вместе с предприятием.

На фабрике широко развернуто социалистическое соревнование за образцовое выполнение заказов фронта. За выдающиеся показатели продуктивности труда коллектив получил переходящее красное знамя горкома ВКП(б). Около 100 передовиков производства премированы.

(Газета «Советская Белоруссия», 10 марта 1943 г.)

«На эвакуированном предприятии»

Производственными победами встретили 1-е Мая рабочие, служащие, инженеры и техники эвакуированного витебского игольного завода. На заводе широко развернуто социалистическое соревнование за создание значительного вклада в особый фонд Главного Командования Красной армии, коллектив завода с успехом выполнил свои предмайские обязательства – перекрыть четырехмесячную производственную программу, сдать в фонд Главного Командования 3000 комплектов сверх плана боевой продукции.

В честь Первомайского праздника в цехах состоялись митинги, беседы. Помещения цехов украшены лозунгами, портретами руководителей партии и правительства и лучших людей предприятия. Праздник Первого мая прошел на заводе под знаком еще большего усиления труда на производстве, еще лучшей помощи Красной армии в разгроме гитлеровских бандитов.

(Газета «Советская Белоруссия», 5 мая 1943 г.)

«Производственный подъем на станкозаводе имени Кирова»

Успешное наступление Красной армии вызвало чрезвычайно большой трудовой подъем на эвакуированном из Витебска станкостроительном заводе имени Кирова. С особой радостью встретили витебляне радостные сообщения о начале освобождения родной белорусской земли, освобождения ряда районов Могилевской, Гомельской и Витебской областей. Коллектив станкозавода прилагает все усилия, чтобы помочь Красной армии в разгроме ненавистных немецко-фашистских оккупантов, которые топчут нашу землю, помогая освобожденным районам в восстановлении разрушенного хозяйства. Стахановцы кузнечного цеха, гвардейцы трудового фронта тт. Латышевский, Князин, Сетковский, Егоров, Блюмин являлись инициаторами большого патриотического дела. Они изготовили большое количество топоров, кувалд, молотков для освобожденных районов. Их инициативы поддержали во всех цехах завода. Для освобожденных районов выделено пять сверлильных и четыре токарных станков, 50 напильников, столько же резцов и ручных сверл и другой инструмент.

* * *

26 июня 1944 г. воины 39-й армии 1-го Белорусского и 43-й армии 3-го Прибалтийского фронтов при поддержке ряда авиационных подразделений воздушной армии, других воинских частей освободили Витебск. Начался нелегкий период восстановления города.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Государственный** архив Витебской области (ГАВО). – Ф. 1. Оп. 1-а. Д. 8. Л. 132–133.

2. **ГАВО.** – Ф. 102. Оп. 3. Д. 2. Л. 2–20.

3. **ГАВО.** – Ф. 1627. Оп. 8. Д. 1561. Л. 1.

4. **ГАВО.** – Ф. 1627. Оп. 8. Д. 1561. Л. 2.

5. **ГАВО.** – Ф. 1627. Оп. 8. Д. 1561. Л. 4.

6. **ГАВО.** – Ф. 1627. Оп. 8. Д. 1561. Л. 6.

7. **ГАВО.** – Ф. 1627. Оп. 8. Д. 1562. Л. 6.

8. **ГАВО.** – Ф. 1627. Оп. 8. Д. 1562. Л. 9.

9. **ГАВО.** – Ф. 10876. Оп. 1. Д. 1. Л. 165–166.

10. **Долгова, А.** История партийного архива Витебского областного комитета КПБ / А. Долгова // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX – XX в.). – Минск ; Витебск : БЕЛНИИДАД, 2002. – С. 42.

11. **Забелло, Л. А.** История витебского трамвая / Л. А. Забелло. – Витебск : ВТТУ, 1998. – 127, [1] с.

12. **Канапелька, З.** Эвакуацыя / Зінаіда Канапелька // Мастацтва. – 1998. – № 5. – С. 52–55.

13. **Кичина, Е. М.** Они расстались на перроне Оршанского вокзала : док. повесть / Е. М. Кичина. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2008. – 167 с.

14. **Митрофанова, А. В.** На новые базы. От Припяти – за Волгу / А. В. Митрофанова // Эшелоны идут на восток: из истории перебазирования производительных сил СССР в 1941–1942 гг. : сб. стат. и воспоминаний / редкол.: Ю. А. Поляков (отв. ред.) [и др.]. – Москва : Наука, 1966. – С. 54–71.

15. **Памяць** : Віцебск : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2002. – Кн. 1. – 648 с.

16. **Рывкин, М.** Судьба картинной галереи им. Ю. Пэна на фоне документов эпохи / М. Рывкин // Шагаловский международный ежегодник, 2005. – 2006. – С. 31–32.

17. **Скрытая** правда войны: 1941 год : неизвестные документы / сост.: П. Н. Кнышевский [и др.]. – Москва, 1992. – С. 115–121.

18. **Сяргейчык, Ц.** Нататкі акцёра : шлях жыцця і творчасці / Цімох Сяргейчык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1973. – 302 с.

19. **Центральный** архив Министерства Обороны Российской Федерации. – Ф. 208, Оп. 2524. Д. 2. Л. 8–12.

20. **Шарендо, В.** Становление архивного дела на Витебщине в 1918–1941 гг. / В. Шарендо // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX – XX в.). – Минск ; Витебск : БЕЛНИИДАД, 2002. – 213 с.

Пушкін І.А. *(г. Магілёў)*

ФАКТАРЫ І ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ КАДРАВАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР У 1970–1980-я гг. НА ПРЫКЛАДЗЕ ОРШЫ

У выніку працэсаў урбанізацыі ў гарадах Савецкай Беларусі павялічылася колькасць насельніцтва, дынамічна і паспяхова развівалася прамысловасць. Рост прамысловасці і мадэрнізацыя адукацыі ў гарадскіх школах прывялі да павышэння ўзроўню кваліфікацыі кадравага патэнцыялу рэспублікі. Але побач з гаспадарчымі поспехамі выразна прасочваліся негатыўныя тэндэнцыі ў развіцці грамадства. Павярхоўны падыход да вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем не дазваляў кіруючым колам Камуністычнай партыі Беларусі і гаспадарнікам знаходзіць аптымальныя рашэнні, каб ліквідаваць прычыны, якія спараджалі недахопы. Асаблівых мер цэнтральных і рэгіянальных улад патрабавала вырашэнне праблем, якія мелі непасрэднае дачыненне да стану і зместу кадравага патэнцыялу.

Разгледзім фактары і ўмовы фарміравання кадравага патэнцыялу прамысловасці ў 1970–1980-я гг. на прыкладзе г. Оршы – аднаго з буйных прамысловых цэнтраў усходняй часткі БССР. Па перапісах насельніцтва ў г. Оршы налічвалася: у 1970 г. – 100 642 чалавекі, у 1979 г. – 112 397 [12, арк. 32], у 1989 г. – 135 184 (Орша і Барань). У адпаведнасці з перапісам 1989 г. у Оршы пражывалі прадстаўнікі 65 нацыянальнасцей [13, арк. 40]. У пачатку 1970-х гг. на прамысловых прадпрыемствах было занята 26 660 чалавек прамысловавытворчага персаналу, з іх 2728 спецыялістаў, у тым ліку 591 чалавек з вышэйшай адукацыяй і 2137 – з сярэдняй спецыяльнай [11, арк. 17].

У пачатку 1970-х гг. у г. Оршы функцыянавала 27 прамысловых прадпрыемстваў з сярэдняспісачнай колькасцю рабочых 22 388 чалавек. Увесь час не хапала спецыялістаў, што значна ўплывала на якасць кадравага патэнцыялу. Стабільнай была праблема цякучасці кадраў, якая істотна парушала рытмічнасць вытворчасці, нараджала «штурмаўшчыну» і звышурочныя работы, замаруджвала рост прадукцыйнасці працы і пагаршала якасць тавараў. Цякучасць рабочай сілы прамыслова-вытворчых рабочых г. Оршы ў 1970 г. складала 15,9% [11, арк. 25], пры гэтым на некаторых прадпрыемствах яна была значна вышэй: хлебакамбінат – 28,3%, завод ЖБВ «Сельбуд» – 18,5%, піўзавод – 43,9%, драбільна-сартавальны завод – 39,8%, завод ЖБВіК – 36,2%, млынкамбінат – 22,7%. Цякучасць рабочых кадраў за 1974 г. складала 15,6% і ўзрасла на 10 прадпрыемствах: інструментальны завод – 29,8%, піваварны завод – 26,7%, камбінат хлебапрадуктаў – 23,6%, камбінат ЗЖБВіК – 20,8% [5, арк. 241, 36–37]. У 1984 г. гэты паказчык складаў 11,7%, але яго рост адзначаўся на заводзе плаўленых сыроў – 19,3%, фабрыцы мастацкіх вырабаў – 11,8%, камбінаце хлебапрадуктаў – 45%, піўзаводзе – 28%, тракта-

рарамонтным заводзе – 14,7%, аршанскай фабрыцы «Дынама» – 13%. Варта падкрэсліць, што на апошняй была самая нізкая заработная плата з прадпрыемстваў горада. Пакупнікі за год забракавалі 4700 адзінак трыкатажных вырабаў фабрыкі, паступіла 25 рэкламацый на нізкую якасць прадукцыі [8, арк. 170–171, 172, 178].

Асноўнай прычынай звальнення з прадпрыемстваў з'яўлялася недастатковасць жыллёвага фонду. Нягледзячы на тое, што за 1971–1975 гг. у г. Оршы быў пабудаваны і здадзены ў эксплуатацыю 61 шматпавярховы жылы дом на 4675 кватэр і за кошт індывідуальнага будаўніцтва ўзведзена 497 жылых дамоў [7, арк. 21], план падрадных работ будаўнічымі арганізацыямі стабільна не выконваўся. Па г. Оршы ў 1971 г. ён быў выкананы на 98%, у 1972 г. – 88%, у 1973 і 1974 гг. – 96% [5, арк. 39], у 1980 г. – 97% [12, арк. 29]. Асноўнай прычынай зрыву планаў з'яўляліся нізкі ўзровень арганізацыі працы, незабяспечанасць кадрамі і будаўнічымі матэрыяламі [5, арк. 10]. Часам будаўнікі дэманстравалі высокую арганізаванасць пры будаўніцтве ўласных дамоў, якія яны ўводзілі ў эксплуатацыю за 5–6 месяцаў замест 8 прадугледжаных. Што тычыцца іншых аб'ектаў, то яны здаваліся не ў тэрмін і са шматлікімі недаробкамі. 50% жылля адзначалася нізкай якасцю малярных і сталярных работ. Так, у 1974 г. з'явілася 14 новабудоўляў, але яны працяглы час не засяляліся з-за недахопаў: сантэхніка манціравалася пасля ўезду жыхароў, газ падключаўся праз 1,5–2 месяцы. Улетку 1974 г. быў здадзены ў эксплуатацыю і заселены 100-кватэрны дом у Задняпроўі, а ў студзені наступнага года ў ім ужо патрабаваўся капітальны рамонт, бо патрэскаліся перагародкі [5, арк. 40]. У 1976 г. увялі ў эксплуатацыю тры дамы, аднак у двух з іх не працавалі ліфты, не падключылі газ, жыхары не маглі карыстацца вадой [7, арк. 4]. Два жылыя дамы ў пачатку 1986 г. здалі з адзнакай «добра», але навасёлы вымушаны былі пачаць рамонт кватэр адразу пасля засялення. Чэргі жадаючых атрымаць добраўпарадкаванае жыллё не памяншаліся на працягу ўсяго перыяду 1970–1980-х гг., некаторыя грамадзяне значыліся ў спісах на паляпшэнне жыллёвых умоў па 15–20 гадоў [9, арк. 7].

За ўвесь час пабудовы сацыялізму і камунізму партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР і БССР не здолела вырашыць праблему рытмічнага забеспячэння насельніцтва харчовымі і спажывецкімі таварамі. Безумоўна, праводзілася пэўная работа па паляпшэнні гандлёвага абслугоўвання насельніцтва. Так, напрыклад, у 1971–1975 гг. у Оршы былі адкрыты 12 магазінаў, у тым ліку крамы «1000 дробязяў», «Спадарожнік», «Раніца» [5, арк. 153] і інш.

Пралікі ў арганізацыі забеспячэння насельніцтва таварамі спарадзілі дэфіцыт і такое паняцце, як «блат». Пра гэта выразна сведчаць недахопы ў працы крам Оршы і Барані. Са слоў дэпутатаў на сесіі Аршанскага гарадскога савета (1975), пакупнік у крамах не мог свабодна набыць муку вышэйшага гатунку, рыс, перац і шэраг іншых тавараў. Не хапала нават абгортачнай паперы. На вельмі нізкім узроўні знаходзілася культура абслугоўвання

пакупнікоў. Вельмі шмат скарг і нараканняў даводзілася выслухоўваць работнікам гандлю на недахопы ў забеспячэнні малочнай прадукцыяй, асабліва кефірам і бутэлькавым малаком. Практычна немагчыма было купіць напалову вэнджаныя і цвёрда вэнджаныя каўбасныя вырабы. У гандлёвую сетку, як правіла, паступалі каўбасы вараныя толькі 2–3 найменняў, якія імгненна знікалі з прылаўкаў. Часам жыхары Барані не маглі пачаставацца сухарамі, сушкамі, абаранкамі, наогул асартымент булачных вырабаў быў вельмі сціплы. Праблему дэфіцыту хавалі за зацверджаны мінімум асартыменту. Пры гэтым у крамы несвоечасова завозіліся тавары, якія меліся ў дастатку на базах [5, арк. 13, 14]. Так, не хапала ў продажы гародніны, якая ў час не дастаўлялася ў крамы і псавалася на складах. За 1984 г. спісалі і перадалі на корм жывёле 564,3 т бульбы, садавіны і гародніны [8, арк. 179]. На сесіі Аршанскага гарадскога савета дэпутатаў (1986) таксама ўзнімаліся праблемы асартыменту і якасці тавараў. У крамах адзначаліся парушэнні працоўнай дысцыпліны, правіл гандлю, пастаянна выяўляліся крадзяжы і нястачы, аблік пакупнікоў, грубасць з боку прадаўшчыкоў, продаж спіртных напояў ажыццяўляўся па завышаных цэнах, не на належным узроўні знаходзіўся санітарны стан аб'ектаў гандлю [9, арк. 8].

З пачатку 1970-х гг. у індустрыяльным комплексе Беларусі пачалі абвастрацца праблемы працоўнай дысцыпліны і злачыннасці. Так, у 1970 г. на прадпрыемствах г. Оршы прагулы здзейснілі 1619 чалавек, што ў 2,4 раза больш, чым у 1969 г. [11, арк. 20, 21]. На заводзе ЖБВіК у 1970 г. за сістэматычнае нез'яўленне на рабочым месцы былі звольнены 30 чалавек, ці 16,5% ад агульнай колькасці тых, хто пакінуў прадпрыемства; на драбільна-сартавальным заводзе гэты працэнт складаў 14,5%, на млынкамбінаце – 15,7%. У 1974 г. прагулы, няяўкі з дазволу адміністрацыі і ўнутрызменныя прастоі па прамысловых прадпрыемствах Оршы склалі звыш 24,7 тыс. чалавека-дзён. Гэта суадносна з тым, што на працягу года больш за 100 чалавек не працавалі. На мясакансервавым камбінаце, трыкатажнай і швейнай фабрыках 1388 рабочых здзейснілі 3577 дзён прагулаў [5, арк. 240]. На заводзе «Легмаш» прагулы дапусцілі 410 рабочых, у леспрамгасе – 134, на трактарарамонтным заводзе – 102, ЖБВіК – 106, заводзе «Чырвоны барацьбіт» – 93, мясакансервавым камбінаце – 59. Адначасова больш за 138 тыс. чалавека-гадзін на прадпрыемствах горада было адпрацавана звышурочна [5, арк. 37]. За 1976–1980 гг. у прамысловасці БССР страты працоўнага часу склалі амаль 5 млн, будаўніцтве – 1,7 млн чалавека-дзён [2, с. 392].

Крадзяжы і злоўжыванні ўладай закранулі практычна ўсе сферы дзейнасці ў Беларускай ССР. У 1970–1980-я гг. былі выяўлены факты арганізаванай і карумпаванай злачыннасці [1; 14; 15]. 4 студзеня 1973 г. Вярхоўны суд БССР разгледзеў справу па групе злачынцаў на чале з былым старшынёй Аршанскай райспажыўкааперацыі М. Барадой, якая займалася прысвойваннем грамадскай уласнасці ў асабліва буйных памерах. У выніку здзейсненых

злачынстваў абвінавачаныя нанеслі матэрыяльную шкоду ў памеры амаль 825 тыс. руб. Усяго ў крымінальнай справе названа больш за 20 уплывовых чыноўнікаў з Віцебскага аблвыканкама і Аршанскага райвыканкама, супрацоўнікаў міліцыі і пракуратуры, работнікаў АБКСМ (ОБХСС) і ДАІ [14, с. 32–34].

У Оршы і Барані было зарэгістравана злачынстваў (% раскрытых): у 1970 г. – 292 (93,2%), 1972 г. – 279 (95,7%). З іх здзейснена непаўналетнімі: у 1970 г. – 36, 1972 г. – 40. Назіраўся рост рабункаў: у 1970 г. – 17, 1972 г. – 20; крадзяжоў дзяржаўнай маёмасці: у 1970 г. – 32, 1972 г. – 45; крадзяжоў асабістай уласнасці: у 1970 г. – 68, 1972 г. – 86 [10, арк. 28–29]. У 1974 г. у г. Оршы колькасць крадзяжоў павялічылася на 55,3% [3, арк. 43–44]. Рост крадзяжоў адзначаўся на мясакансервавым і малочным камбінатах, а таксама быў характэрны і для прадпрыемстваў гандлю [5, арк. 255]. За 1975 г. і 9 месяцаў 1976 г. у Оршы было здзейснена па лініі крымінальнага вышуку 232 і 256 злачынстваў адпаведна (самыя высокія паказчыкі пасля Віцебска). 767 чалавек былі прыцягнуты да адказнасці за дробныя хуліганствы. Множыліся замахі на забойства, наўмысныя цяжкія пашкоджанні, гвалтаванні, крадзяжы, махлярствы. Назіраўся высокі ўзровень рэцыдыўнай злачыннасці. 55,1% злачынстваў здзейснены асобамі ў стане алкагольнага ап'янення, 12,3% – асобамі, якія не дасягнулі 18-годдзя. Былі ўзбуджаны 294 справы супраць раскрадальнікаў дзяржаўнай і грамадскай маёмасці [4, арк. 54–57]. На працягу 1985 г. колькасць «дробных» крадзяжоў узрасла на піўзаводзе на 45%, трактарарамонтным заводзе – на 90%, заводзе «Металіст» – у 2,5 раза, на мясакансервавым камбінаце за год зафіксавана 114 выпадкаў [9, арк. 54].

Раслі паказчыкі злачыннасці і сярод непаўналетніх Оршы і Барані: у 1973 г. імі здзейснена 35 злачынстваў, у 1974 г. – 56, у 1975 г. – 59. З ліку апошніх 66,6% адносіліся да навучэнцаў школ, ПТВ і іншых навучальных устаноў. Удзельная вага злачыннасці непаўналетніх у 1974 г. складала 11,2% да ўсёй злачыннасці ў г. Оршы, а ў 1975 г. яна ўжо ўзрасла да 12,6% [7, арк. 124–125]. Шматлікім быў шэраг юнакоў, дастаўленых у дзіцячыя пакоі міліцыі і аддзелы ўнутраных спраў за дробнае хуліганства і п'янства. Сярод іх былі навучэнцы школ і ПТВ, падлеткі-працаўнікі з такіх прадпрыемстваў, як «Легмаш», ільнокамбінат, «Чырвоны барацьбіт», «Чырвоны Кастрычнік», трактарарамонтны і інструметальны заводы і інш. [7, арк. 128–129]. Значная колькасць злачынстваў і правапарушэнняў належала камсамольцам. За студзень – сакавік 1976 г. да адміністрацыйнай адказнасці было прыцягнута 117 членаў УЛКСМ, 18 дастаўлены ў медвыцвярэзнік, супраць 16 узбуджаны крымінальныя справы [7, арк. 135]. 50% усіх злачынстваў падлеткі здзейснілі ў нецвярозым стане. У выніку былі зацверджаны «Правілы паводзін дзяцей і падлекаў у гарадах» [7, арк. 142]. Але сітуацыя не палепшылася і ў 1980-я гг. Аршанскія падлеткі ў 1984 г. учынілі на 22% больш крымінальных злачынстваў, чым у 1983 г. [6, арк. 20].

На пасяджэннях выканаўчыя структуры КПБ сістэматычна разглядалі эканамічныя і сацыяльныя праблемы. Прымаліся пастановы і прапановы па выпраўленні недахопаў, асабліва ў кадравай сферы. Для паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва і вырашэння сацыяльных праблем прыкладаліся намаганні па павелічэнні колькасці і якасці выпускаемай прадукцыі, выкараненні праблемы дэфіцыту спажывецкіх тавараў. Акрамя арганізацыйна-адміністрацыйных мер прымаліся і іншыя захады па ўздзеянні на кадравы патэнцыял прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў. Каб паменшыць узровень злачыннасці на прамысловых прадпрыемствах і ва ўстановах, спрабавалі далучаць грамадскасць і працоўных да дзейнасці розных структур кантролю. Вялікая ўвага надавалася правядзенню мерапрыемстваў па прадухіленні правапарушэнняў праз сродкі масавай інфармацыі. Так, напрыклад, толькі за 1972 г. у аршанскай газеце «Ленінскі прызыў» было апублікавана 17 матэрыялаў па пытаннях аховы дзяржаўнай уласнасці, аб барацьбе з п'янствам і г. д. Тэме аховы грамадскага парадку ў межах мясцовага радыёвяшчання было прысвечана 11 выступленняў [10, арк. 24].

Партыйна-савецкае кіраўніцтва звязвала негатыўныя тэндэнцыі ў прамысловасці і грамадстве не з вытворчымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі працы, а з недастатковым выкарыстаннем усяго арсенала выхаваўчых сродкаў для фарміравання ў шырокіх мас «здаровых» матэрыяльных патрэб. Перад працоўнымі калектывамі, партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі ставілася задача забяспечыць паляпшэнне работы па маральным выхаванні грамадзян, шырэй выкарыстоўваць патэнцыял культурна-асветных устаноў.

Аналіз пратаколаў пасяджэнняў партыйна-савецкага кіраўніцтва дазваляе зрабіць выснову, што ў 1970–1980-я гг. на фарміраванне кадравай палітыкі прамысловасці БССР значны ўплыў аказвалі негатыўныя ўмовы і фактары: нізкая працоўная дысцыпліна, цякучасць кадраў, незабяспечанасць насельніцтва харчовымі і спажывецкімі таварамі, ашуканства і прыпіскі, адсутнасць належных умоў пражывання і працы, дрэннае вырашэнне пытанняў сацыяльна-бытавога характару, крадзяжы дзяржаўных сродкаў, п'янства, высокі ўзровень злачыннасці і злоўжыванне ўладай. Агульнасаюзнае, рэспубліканскае і рэгіянальнае партыйна-савецкае кіраўніцтва спрабавала шляхам прапаганды і прыняцця адміністрацыйных мер вырашыць эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў грамадстве. Але гэта забяспечвала кароткачасовы эфект. Інструменты эканамічнага стымулявання не давалі належных вынікаў з-за абмежаванняў і сістэмы размеркавання, якія існавалі, а таксама дэфіцыту сацыяльных даброт і прадметаў шырокага спажывання. Дзейныя эканамічныя механізмы вырашэння праблем не былі знойдзены, ды і цяжка было іх шукаць ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіравання і размеркавання, што істотна ўплывала на фарміраванне кадравага патэнцыялу краіны.

ЛІТАРАТУРА

1. **Барвінок, К. І.** Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах XX ст. / К. І. Барвінок, І. А. Саракавік // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2005. – № 4. – С. 69–75.

2. **Гісторыя** Беларусі : у 6 т. / [рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 6 : Беларусь у 1946–2009 гг. / Н. Васілеўская [і інш.] ; рэд. тома У. Навіцкі. – 2011. – 728 с.

3. **Дзяржаўны** архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 169.

4. **ДАВВ.** – Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 176.

5. **Занальны** дзяржаўны архіў у г. Оршы (ЗДАОрш). – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406.

6. **ЗДАОрш.** – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 454.

7. **ЗДАОрш.** – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 457.

8. **ЗДАОрш.** – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 985.

9. **ЗДАОрш.** – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1043.

10. **ЗДАОрш.** – Ф. 27. Воп. 6а. Спр. 88.

11. **ЗДАОрш.** – Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23.

12. **ЗДАОрш.** – Ф. 86. Воп. 5. Спр. 348.

13. **ЗДАОрш.** – Ф. 86. Воп. 7. Спр. 120.

14. **Пушкін, І. А.** Злоўжыванні ўладаю і пралікі ў кадравай палітыцы БССР у 1970–1980-я гг. (на прыкладзе Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей) / І. А. Пушкін // Карупцыйныя рызыкі кадравага патэнцыялу Беларусі : зб. навук. арт. / уклад. Ю. М. Бубнаў, І. А. Пушкін ; рэдкал.: Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў, 2019. – С. 32–42.

15. **Пушкін, І. А.** Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей) / І. А. Пушкін // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та імя А. А. Куляшова. Сер. А, Гуманітар. навукі. – 2018. – № 2. – С. 25–30.

Пятрэнка Н.А. *(г. Віцебск)*

ДЭМАГРАФІЧНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ РАЗВІЦЦЯ ВІЦЕБСКА Ў 1945–1990 гг.

Сацыяльна-дэмаграфічная характарыстыка насельніцтва гарадоў пасляваеннага перыяду Савецкай Беларусі з'яўляецца адной з актуальных тэм сучаснай гістарычнай навукі. Мэта артыкула – прааналізаваць асаблівасці дэмаграфічнага развіцця г. Віцебска ў агульнай дынаміцы ўзнаўлення насельніцтва ў 1945–1990 гг. Пры напісанні артыкула аўтарам уведзены ў навуковы зварот комплекс дакументаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці па акрэсленай тэме. Даследаванне грунтуецца на прынцыпах аб'ектыўнасці і гістарызму, у аснову пакладзены гісторыка-параўнальны і гісторыка-сістэмны метады.

У даваенны перыяд Савецкай Беларусі ў г. Віцебску асноўным дэмаўтваральным фактарам з'яўлялася прамысловае развіццё. Згодна з данымі перапісу насельніцтва 1939 г., колькасць жыхароў г. Віцебска складала 168 тыс., а непасрэдна перад вайной дасягнула 180 тыс. чалавек [3, арк. 8]. У некаторых дакументах сустракаецца інфармацыя пра 207 тыс. жыхароў [4, арк. 194]. Аднак трэба патлумачыць, што непасрэдна ў горадзе сапраўды пражывала 180 тыс. чалавек, а на прыгарадскіх тэрыторыях яшчэ 27 тыс. Гэта была даволі вялікая колькасць насельніцтва для таго часу, што рабіла даваенны г. Віцебск адным з буйнанаселеных гарадоў Савецкай Беларусі.

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны закранулі ўсе сферы жыцця і нанеслі каласальныя страты сярод насельніцтва. На 26 чэрвеня 1944 г., згодна з данымі дакладной запіскі загадчыка Віцебскай абласной камісіі В. Кудраева, у горадзе засталося толькі 118 чалавек, што складала меней за 1% ад даваеннай колькасці насельніцтва. За перыяд акупацыі большая частка жыхароў была знішчана захопнікамі, а астатняя – уцягнута ў міграцыйныя працэсы ваеннага часу. Вяртанне ацалелых жыхароў горада адбывалася марудна, згодна са статыстычнымі данымі, праз паўгода (1 студзеня 1945 г.) колькасць жыхароў павялічылася толькі да 33 710 чалавек. Натуральны прырост за 1945 г. складаў 584 чалавекі (нарадзіліся – 1273, памерлі – 689) [1, арк. 18]. Механічны прырост складаў 25 393 чалавекі (прыбылі – 25 689, выбылі – 296). За 1945 г. зарэгістравалі 661 шлюб і толькі 1 развод [2, арк. 4]. Такім чынам, за 1945 г. колькасць насельніцтва, па аб'яднаных паказчыках натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 25 977 чалавек. У сувязі з завяршэннем ваенных дзеянняў насельніцтва горада стала павялічвацца і дасягнула наступнай колькасці на 1 студзеня: у 1946 г. – 57 222, у 1947 г. – 76 934, у 1948 г. – 82 576, у 1949 г. – 75 654 чалавекі [3, арк. 8]. Нельга не звярнуць увагу на тое, што нягледзячы на паступовае вяртанне насельніцтва ў г. Віцебск нават за пасляваеннае пяцігоддзе колькасць жыхароў горада дасягнула толькі трэцяй часткі ад даваенных паказчыкаў.

За 1945–1950 гг. агульны прырост жыхароў г. Віцебска складаў 47 240 чалавек. На 1 студзеня 1950 г. у горадзе налічвалася 80 950 чалавек. Натуральны прырост за 1950 г. склаў 1613 чалавек (нарадзіліся – 2316, памерлі – 703), механічны прырост складаў 5702 чалавекі (прыбылі – 13 805, выбылі – 8409). Такім чынам, за 1950 г. колькасць насельніцтва, згодна з данымі натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 7315 чалавек, было зарэгістравана 1550 шлюбаў і 46 разводаў [5, арк. 1–27].

Перыяд другой паловы 1940-х гг. для жыхароў г. Віцебска, як і ўсёй краіны, быў вельмі складаны. Дадзены час адзначаны пераадоленнем наступстваў вайны, спробай перайсці на мірны лад жыцця. Нягледзячы на паступовае павелічэнне насельніцтва адносна 1944 г., не атрымалася так хутка дасягнуць даваенных паказчыкаў. Асноўнымі праблемамі, з якімі сутыкнуліся жыхары горада, былі адсутнасць нармальных жыллёвых умоў, голад, захвор-

ванні і несвоечасовае медыцынскае абслугоўванне, а таксама рэпрэсіўная сістэма савецкага кіраўніцтва. У сувязі з гэтымі фактарамі ў горадзе назіраліся нізкая нараджальнасць і высокая смяротнасць, натуральны прырост быў утрая меншым за механічны. Станоўчым момантам з'яўлялася невялікая колькасць разводаў.

На 1 студзеня 1955 г. у горадзе налічвалася 114 716 жыхароў, за 5 гадоў (1950–1955) агульны прырост складаў 33 766 чалавек. Натуральны прырост за 1955 г. складаў 2389 чалавек (нарадзіліся – 3138, памерлі – 749), механічны прырост складаў 3324 чалавекі (прыбылі – 13 829, выбылі – 10 505). Такім чынам, за 1955 г. колькасць насельніцтва, згодна з данымі натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 5713 чалавек, зарэгістравалі 2200 шлюбаў і 130 разводаў [6, арк. 1–19].

За наступную пяцігодку (1955–1960) агульны прырост складаў 38 485 жыхароў, на 1 студзеня 1960 г. у горадзе налічваўся 153 201 чалавек. Натуральны прырост за 1960 г. складаў 2779 чалавек (нарадзілася – 3635, памерла – 856), механічны прырост складаў 5653 чалавекі (прыбылі – 12 313, выбылі – 6660). За 1960 г. колькасць насельніцтва, згодна з данымі натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 8432 чалавекі. За 1960 г. зарэгістравалі 2628 шлюбаў і 386 разводаў [7, арк. 1–10].

Такім чынам, для перыяду 1950-х гг. характэрна няўстойлівая дынаміка, звязаная з паступовым прыростам. Трэба адзначыць, што ў сувязі са складанасцямі першы пасляваенны перапіс насельніцтва адбыўся толькі ў 1959 г., згодна з якім у г. Віцебску пражывалі 148 300 чалавек. Нягледзячы на эканамічныя складанасці з сярэдзіны 1950-х гг. сталі назірацца пазітыўныя змены ў сацыяльна-палітычным жыцці, што станоўча паўплывала і на дэмаграфічную сітуацыю.

За 1960–1965 гг. агульны прырост складаў 34 199 чалавек і на 1 студзеня 1965 г. у горадзе налічвалася 187 400 жыхароў. Натуральны прырост за 1965 г. складаў 2182 чалавекі (нарадзіліся – 3172, памерлі – 990), механічны прырост складаў 4438 чалавек (прыбылі – 11 296, выбылі – 6858). Такім чынам, за 1965 г. колькасць насельніцтва, згодна з данымі натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 6620 чалавек, зарэгістравалі 1789 шлюбаў і 552 разводы [8, арк. 1–30].

За 1965–1970 гг. агульны прырост складаў 42 904 чалавекі, у пачатку 1970 г. у горадзе налічвалася 230 304 жыхары. Натуральны прырост за 1970 г. складаў 2657 чалавек (нарадзілася – 4012, памерла – 1355), механічны прырост складаў 6023 чалавекі (прыбылі – 18 377, выбылі – 12 357). Такім чынам, за 1970 г. колькасць насельніцтва, згодна з данымі натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 8680 чалавек, зарэгістравалі 1995 шлюбаў і 652 разводы [9, арк. 1–71].

Наступны перапіс насельніцтва быў праведены ў 1970 г., згодна з якім у г. Віцебску пражываў 230 801 чалавек [10, арк. 60]. Трэба адзначыць, што

за 1960-я гг. у горадзе быў дасягнуты і нават павялічаны даваенны ўзровень колькасці жыхароў. З сярэдзіны 1960-х гг. пачалося хуткае павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва, звязанае з узмацненнем урбанізацыйных працэсаў і масавым прытокам у горад вясковых жыхароў з усёй вобласці.

За пяцігоддзе (1970–1975) агульны прырост складаў 45 896 чалавек і на пачатак 1975 г. у горадзе налічвалася 276 тыс. жыхароў. Натуральны прырост за 1975 г. складаў 2843 чалавекі (нарадзіліся – 4626, памерлі – 1783), механічны прырост складаў 3972 чалавекі (прыбылі – 17 303, выбылі – 13 331). Такім чынам, за 1975 г. колькасць насельніцтва, згодна з данымі натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 6815 чалавек, зарэгістравалі 2909 шлюбаў і 1209 разводаў [11, арк. 1–115].

За 1975–1980 гг. агульны прырост складаў 31 137 чалавек і на 1 студзеня 1980 г. у горадзе налічвалася 307 337 жыхароў. Натуральны прырост за 1980 г. складаў 3430 чалавек (нарадзіліся – 5605, памерлі – 2175), механічны прырост складаў 4041 чалавек (прыбылі – 14 858, выбылі – 10 817). Такім чынам, за 1980 г. колькасць насельніцтва, згодна з данымі натуральнага і механічнага прыросту, павялічылася на 7471 чалавек, зарэгістравалі 3261 шлюб і 1480 разводаў [13, арк. 1–126]. Згодна з перапісам 1979 г., у горадзе налічвалася 300 786 жыхароў [12, арк. 35].

Падчас следства было высветлена, што падпіскі сялян Горсплянскай і Стаспольскай грамад былі насамрэч складзены пісарам В. Тэйхам без жадання і ведама саміх сялян, пра што засведчылі 93 праваслаўныя селяніны, 17 каталікоў, 7 сельскіх старастаў і ўласна пісар В. Тэйх, які ў паказаннях прызнаўся, што падрыхтаваў падпіскі напярэдадні сходу 19 снежня

[9, арк. 1 адв.]. Апрача таго, аказалася, што сяляне гэтых грамад у 1834 г. былі далучаны да праваслаўя з уніі, але падчас разбору (у адпаведнасці з Указам ад 17 красавіка 1842 г.) у 1844 г. яны былі прызнаны каталікамі [3, арк. 21 адв.].

У выніку за злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі пісар В. Тэйх быў звольнены, справа перададзена ў суд, а складзеныя запіскі было загадана знішчыць у прысутнасці сялян [3, арк. 24]. Апрача таго, В. Тэйх апынуўся замежнікам (пры гэтым ён сам прыняў праваслаўе толькі ў 1864 г.), не меў падданства Расійскай імперыі і таму не мог, паводле заканадаўства, займаць пасаду валаснога пісара [9, арк. 2 адв.].

Нягледзячы на тое, што ў Віцебскай губерні было менш ачагоў адкрытага супраціўлення, у параўнанні з Мінскай або Гродзенскай губернямі, там таксама мелі месца быць яскравыя праявы нежадання прызнаваць праваслаўе і выпадкі выказвання непаслушэнства прадстаўнікам царквы. У 1864 г. віцебскі ваенны губернатар У.М. Вяроўкін атрымаў рапарт ваеннага начальніка Себежскага павета аб здарэнні, якое адбылося ў Дзедзінскім прыходзе. Мясцовы святар скардзіўся на мяшчанку Юстыну Александровіч з в. Грошава. Жанчына фармальна адносілася да прадстаўніц праваслаўнай канфесіі, але была заўважана ў «спакушэнні» ў каталіцтва жыхароў суседніх вёсак. Ю. Александровіч пагаджалася толькі з тым, што чытала некаторыя малітвы па-польску, але пры гэтым заяўляла, што больш такога не практыкуе. У сваю чаргу грошаўскія сялянкі Варвара і Праскоўя сцвярджалі, што Ю. Александровіч сапраўды вучыла іх маліцца па-польску, але пры гэтым адзначалі, што малітваў на рускай мове яны не ведаюць з прычыны таго, што раней былі ўніятамі, і, наогул, амаль усе мясцовыя жыхары падчас малітвы выкарыстоўваюць польскую, а не рускую мову [2, арк. 1].

На думку расійскай адміністрацыі, самі сяляне не лічыліся здольнымі выказваць самастойна, па ўласнай ініцыятыве незадаволенасць па рэлігійных пытаннях. Улады меркавалі, што іх падбухторвалі прадстаўнікі вышэйшых колаў, нават у тых выпадках, калі назіраўся відавочны пратэст саміх сялян. 25 кастрычніка 1865 г. падчас закрыцця Шацілаўскага касцёла (Полацкі павет Віцебскай губерні) сабраліся некалькі сялян-каталікоў, якія выказвалі «пярэчанні» супраць перадачы будынка праваслаўным. Найбольш актыўных з іх нават арыштавалі, але затым адпусцілі. Адказнасць за гэты інцыдэнт спрабавалі ўскласці на памешчыцу Медуніцкую, якая жыла побач з касцёлам і быццам бы навучыла сялян казаць «дзёрзкасці», аднак такім абвінавачванням не было знойдзена доказаў [10, арк. 2 адв.].

Справа жыхара Віцебска дваранiна-каталіка Паўла Андраеўскага і яго жонкі, бешанковіцкай мяшчанкі Пелагеі Сцяпанаўны Кісель, якая фармальна належыла да праваслаўнай царквы, пачалася ў 1890 г. [8, арк. 1–3]. Жанчына хрысціла і выхоўвала сваіх дзяцей у каталіцтве. Характэрна, што да скасавання ўніяцкай царквы Пелагея Сцяпанаўна належыла да ўніяцтва, а

пасля была аўтаматычна залічана ў праваслаўныя. Але гэта не адбілася на яе канфесійным самаўспрыманні. Яшчэ да замужжа яна наведвала касцёл Святой Барбары ў Віцебску. Такім чынам, каталіцызм быў свядомым выбарам Пелагеі Андраеўскай, у адпаведнасці з якім яна выхоўвала ў каталіцкай традыцыі сваіх дзяцей. Каталіцкае веравызнанне мужа ў дадзеным выпадку не з'яўлялася асноўным фактарам.

Улады адмаўлялі жанчынам у актыўнай ролі і наяўнасці свядомай канфесійнай ідэнтычнасці і імкнуліся падкрэсліць залежнасць жанчын ад канфесійнай прыналежнасці мужа. У 1886 г. пры разглядзе справы пра таемны пераход у каталіцызм жонкі валаснога пісара Мішкаўскай воласці Віцебскага павета Адама Бінкевіча Алены (праваслаўнай) сцвярджалася, што яна наведвае касцёл, «каб дагадзіць мужу свайму каталіку». Але тое, што яна наведвала касцёл адкрыта, дазваляе меркаваць, што гэта быў яе самастойны выбар [4, арк. 1 – 2 адв.]. У лік людзей, якія ўплывалі на жанчын, улады перш за ўсё залічвалі каталіцкае духавенства і памешчыкаў.

Пасля выдання Указа «Аб асновах верацярпімасці» ад 17 красавіка 1905 г., які дазволіў пераходзіць з праваслаўя ў іншыя веравызнанні, у Віцебскай губерні (па стане на 1909 г.) у каталіцызм вярнуліся 3815 чалавек, з іх у беларускіх паветах 2692 чалавекі. Такім чынам, атрымліваецца, што па асобных паветах Віцебскай губерні за 1905–1909 гг. каталіцызм прыняла наступная колькасць асоб: Віцебскі павет – 118 чалавек, Гарадоцкі – 10 чалавек, Лепельскі – 49 чалавек, Полацкі – 122 чалавекі, Дрысенскі – 2393 чалавекі [7, арк. 29 адв.]. У сваю чаргу, паводле справаздач обер-пракурора Сінода, з 17 красавіка 1905 г. па снежань 1907 г. па Полацкай епархіі ў каталіцызм перайшлі 3952 чалавекі [1, с. 29].

Матэрыялы, якія назапашваліся ў канцылярыі віцебскага губернатара, дазваляюць вылучыць канкрэтныя мікрарэгіёны (перш за ўсё, воласці), дзе назіралася найбольшая колькасць жадаючых перайсці ў каталіцызм. У Дрысенскім павеце – гэта Асвейская, Замашанская, Каханавіцкая, Сар'янская, Сушкоўская, Таболкаўская і Юстыніянаўская воласці; у Полацкім павеце – Арцейкавіцкая і Петрапаўлаўская (а таксама ўласна ў Полацку); у Лепельскім павеце – Вароніцкая і Кубліцкая воласці [5; 6].

Прымусовы перавод у праваслаўе, які адбываўся ў беларускіх губернях (у тым ліку Віцебскай) у другой палове XIX ст., у істотнай колькасці выпадкаў выклікаў супраціўленне з боку асоб, якія падлягалі пераводу ў праваслаўе. Імкненне вярнуцца ў каталіцтва захоўвалася на ўсім працягу дадзенага перыяду. Таму пасля таго, як у 1905 г. было афіцыйна дазволена пакідаць праваслаўе на карысць іншых канфесій, частка былых каталікоў актыўна карысталася магчымасцю легальна вярнуцца ў пажаданае для іх веравызнанне.

ЛІТАРАТУРА

1. **Всеподданнейши**й отчет Обер-прокурора Святейшего синода по ведомству православного исповедания за 1905–1907 годы. – Санкт-Петербург ; Петроград : Синод. тип., 1886–1916. – 1910. – XII, 304, 268 с.

2**. Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31694. – Справа аб пераходзе з праваслаўя ў каталіцызм Юстыны Александровіч і Юзэфы Сцяпанавай. 1864 г.

3. **НГАБ.** – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31904. – Справа аб пераводзе ў праваслаўе 200 сялян у Полацкім павеце. 1865–1866 гг.

4. **НГАБ.** – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 38553. – Справа аб таемным вызнаванні каталіцызму жонкай пісара Мішкаўскай воласці Віцебскага павета праваслаўнай Аленай Бінкевіч. 1886–1887 гг.

5. **НГАБ.** – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 47296. – Справа аб пераходах з праваслаўя ў каталіцызм. 1907–1911 гг.

6. **НГАБ.** – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 47650. – Справа аб пераходах з праваслаўя ў каталіцызм. 1909 г.

7. **НГАБ.** – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 54191. – Справа аб прыняцці мер для спынення пераходу праваслаўных у каталіцызм. 1882–1914 гг.

8. **НГАБ.** – Ф. 1430. Воп. 2. Спр. 66. – Справа аб пераходзе з праваслаўя ў каталіцызм дваранкі Пелагеі Андраеўскай. 1890 г.

9. **Lietuvos** valstybės istorijos archyvas (LVIA). – F. 378. Ap. 156. B. 316. – Дело по обвинению волостного писаря Горсплянской волости Полоцкого уезда Василия Тейха в составлении подложных подписей об изъявлении желания присоединиться к православию. 1865 г.

10. **LVIA.** – F. 378. Ap. 156. B. 566. – Дело о беспорядках, возникших при передаче в православную юрисдикцию Шатиловского костела Полоцкого уезда. 1865 г.

Лаўрыненка К.В. *(г. Люблін, Польшча)*

ДЗЕЙНАСЦЬ МАНАСКІХ КАНГРЭГАЦЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ПОЛАЦКАЙ І МАЛАДЗЕЧАНСКАЙ АБЛАСЦЕЙ У 1944–1957 гг.

На момант вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Полацкай вобласці знаходзіліся два рымска-каталіцкія кляштары – абодва ў Друі: мужчынскі кляштар Кангрэгацыі Айцоў Марыянаў Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі і жаночы – Кангрэгацыі Сясцёр Служабніц Езуса ў Эўхарыстыі.

Полацкая вобласць БССР была ўтворана 20 верасня 1944 г. і складалася з 15 раёнаў. 8 студзеня 1954 г. гэта адміністрацыйная адзінка была ліквідавана; Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Мёрскі, Пліскі і Шаркаўшчынскі раёны былі перададзены Маладзечанскай вобласці.

Кангрэгацыя Айцоў Марыянаў Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі ўзнікла дзякуючы святому Станіславу ад Езуса і Марыі Папчыньскаму ў канцы XVII ст. у Польшчы. У 1910 г. Кангрэгацыя была адноўлена і рэфармавана бласлаўлёным Ежы Матулевічам, які ўступіў у абшчыну ў 1909 г.

У 1923 г. па ініцыятыве Ежы Матулевіча, на той час біскупа Віленскага і генерала Кангрэгацыі Айцоў Марыянаў, у Друі быў заснаваны кляштар марыянаў. Яго арганізацыя была даручана айцу Андрэю Цікоту MIC (цяпер – слуга Божы), які прыбыў сюды ў жніўні гэтага ж года. Новаўзвядзенне было размешчана ў будынку былога кляштара бернардзінцаў. У той жа час біскуп Матулевіч ініцыяваў заснаванне ў Друі і Кангрэгацыі Сясцёр Служабніц Езуса ў Эўхарыстыі, тут жа паўстаў і першы іх кляштар.

Пераломным пунктам у існаванні кляштараў у Друі стаў 1944 г.

Пасля таго, як некалькі святароў і манахаў з кляштара марыянаў у 1944 г. выехалі ў Польшчу [17, арк. 94, 95], у супольнасці айцоў марыянаў засталіся толькі трое братоў, што паходзілі з навакольных вёсак. Гэта былі Юзэф Скур'ят, 1880 г. нараджэння, які паходзіў з в. Шалцені, меў 2 класы адукацыі, у кляштары знаходзіўся з 1931 г., непрацаздольны; Пётр Дундар, 1922 г. нараджэння, з в. Кадаронкі, меў 4 класы адукацыі, у кляштары знаходзіўся з 1945 г., займаўся гаспадаркай; Геранім Ганчаронак, 1931 г. нараджэння, паходзіў з Дзісны, адукацыі меў 8 класаў, у кляштары знаходзіўся з 1943 г. і выконваў абавязкі закрыстыяніна [10, арк. 151]. Настаяцелем кляштара быў айцец Люцыян Паўлік MIC (21.12.1913–16.04.1944–10.04.2007).

Люцыян Паўлік нарадзіўся ў в. Вулька Вісьнеўска ў Польшчы. У 1923 г. быў прыняты ў 4-ты клас Ніжэйшай Духоўнай семінарыі ксяндзоў марыянаў у Скурцу, што каля г. Седльцэ. 14 жніўня 1929 г. распачаў навіцыят у Доме Кангрэгацыі ў Расне. 15 жніўня 1936 г. склаў вечныя абеты, пасля чаго на працягу двух гадоў быў выхавацелем хлопцаў у Калегіуме на Бялянах у Варшаве. У 1938 г. быў накіраваны на вучобу ў Вільню, дзе вывучаў тэалогію, а ў 1939 г. – у кляштар Марыямпаля. Адтуль яго адправілі ў Коўна, дзе ён працягнуў навучанне. У 1942–1944 гг. знаходзіўся ў Друйскім кляштары [5, арк. 16]. 16 красавіка 1944 г. прыняў прэсвітарскае пасвячэнне ў віленскай катэдры з рук біскупа Мечысловаса Рэйніса [22, s. 466–467]. 23 красавіка 1944 г. новапразбатар служыў прыміцыйную Імшу ў друйскім касцёле, пасля чаго распачаў служэнне ў Друі [7, с. 21].

Тым часам у суседняй парафіі Ідолта быў забіты яе пробашч – ксёндз Баляслаў Грамс. 8 чэрвеня 1944 г. па загадзе акупантаў ён быў арыштаваны як закладнік, пры гэтым быў жорстка збіты. Па дарозе ў Дрысу, калі яго канваіры спыніліся ў нейкай хаце, дзе пачалі піць гарэлку, святар спрабаваў уцячы, за што і быў забіты. 10 чэрвеня ксяндза Грамса пахавалі на касцёльных могілках. Пахавальную Імшу па забітым святары адслужыў ксёндз Люцыян Паўлік MIC, які і пачаў апекавацца асірацелай парафіяй [6, с. 23; 23].

Тым часам 4 ліпеня 1944 г. у выніку бамбардзіроўкі ў друйскіх касцёле і кляштары пачаўся пажар, што прывяло да вялікіх пашкоджанняў. Паколькі касцёл быў непрыдатны для адпраўлення службаў, яны праводзіліся ў калідоры кляштара, дзе захаваўся дах [20, арк. 225]. Разам з парафіянамі айцец Люцыян Паўлік узяўся за аднаўленне кляштара, што ў тых умовах было нялёгкай справай. У прыватнасці, у 1947 г. святар скардзіўся ўпаўнаважанаму Савета ў справах рэлігійных культаў на налічэнне яму завышанага падатку на кляштарныя будынкі, які вельмі цяжка было заплаціць, бо ўвесь даход ішоў на рамонтныя работы [9, арк. 127].

Ужо ў 1947 г. кляштар быў часткова адрамантаваны, акрамя гэтага быў даведзены да ладу цагляны дом для работнікаў. Штодзённа на адбудове кляштара і касцёла працавалі 20 чалавек. Кожны працаўнік атрымліваў 15 руб. у дзень і бясплатнае харчаванне [19, арк. 79].

У 1947 г. сітуацыя ў кляштары выглядала наступным чынам. Храму належалі касцёл у Друі і драўляная капліца ў в. Малькаўшчына, рэчы для служэння Імшы – адзін камплект (дзве кнігі, шэсць абразоў, адна статуя). Для жытла пробашча і іншых жыхароў кляштара выкарыстоўваліся пяць пакояў, якія былі ў дрэнным стане. Сам айцец Люцыян жыў у складаных умовах, у вільготным і брудным памяшканні [19, арк. 79].

З гаспадарчых пабудоў у кляштары меліся двор для жывёлы, хлеў, свіран. У наяўнасці былі павозка, калёсы і трое саней. Да ўласнасці адносіліся 7 га ворыва, 3 га сенакосаў, 2 га пашы, гектар зямлі выкарыстоўваўся пад гарод, 2 га няўдобіцы. Гаспадарка складалася з каня, каровы, пяці птушак і свінні з васьмю парасятамі. У 1947 г. даход кляштара ўключаў 100 пудоў хлеба, 115 пудоў бульбы, 55 пудоў гародніны, 3 тыс. 740 руб., атрыманых за выкананне рэлігійных абрадаў. У дадатак да немалога натуральнага падатку на карысць дзяржавы кляштару неабходна было заплаціць 150 руб. падатку з будынкаў і зямельнай рэнты, а таксама 67 тыс. 515 руб. страхоўкі за будынкі і 300 руб. займу [9, арк. 175, 175 адв.].

Апрача манахаў, у кляштары пражывалі і працавалі на будаўнічых і гаспадарчых работах 4 хлопцы 15–16 гадоў з навакольных вёсак, якіх праз беднасць бацькі аддалі на працу ў кляштар. Таксама пры манастыры жылі чатыры работніцы, якія займаліся гаспадарчымі справамі, – гаспадыня, працаўніца пры кузні, гародніца і скотніца [12, арк. 209; 17, арк. 94, 95].

15 жніўня 1947 г. айцец Люцыян Паўлік быў зарэгістраваны ў друйскай парафіі [5, арк. 21].

Тым часам разам з парафіянамі святар адбудаваў пашкоджаны касцёл. Асвячэнне адрамантаванай святыні адбылося 2 жніўня 1948 г. падчас фэсту ў гонар Маці Божай Анёльскай. Пасля гэтага ў мясцовай прэсе распачалося цкаванне «цемрашала» і ўсёй адноўленай дзейнасці друйскіх марыянаў. НКУС вырашыў выкарыстаць гэта і прапанаваў айцу Люцыяну супрацоўніцтва, аднак святар, хоць і ведаў, чым гэта пагражала, катэгарычна адмовіўся [7, с. 21].

Атрымаўшы папярэджанне пра пагрозу арышту, у ліпені 1949 г. айцец Люцыян Паўлік выехаў з парафіі. Каб ніхто нічога не западозрыў, святар паведаміў, што паехаў у Рыгу хаваць арганіста, які быў пасланы туды, каб набыць будаўнічыя матэрыялы для рамонту кляштара, але нечакана памёр [11, арк. 94]. Святар перайшоў на нелегальнае становішча і быў вымушаны хавацца на хутарах друйскай ды ідолтаўскай парафій.

У кляштары засталіся толькі тры браты. Было зразумела, што з таго часу існаванне святыні знаходзілася пад пагрозай, бо ўлады не разумелі сутнасці манаскага жыцця і сцвярджалі, што манахі займаюцца «эксплуатацыяй чужой працы», маючы наймітаў. Больш за тое, упаўнаважаны Савета ў справах рэлігійных культаў лічыў, што браты кляштара з'яўляюцца не манахамі, а наймітамі, і што пад прыкрыццём кляштара тут была «арганізавана кулацкая гаспадарка». У выніку ўпаўнаважаны Савета ў справах рэлігійных культаў па Полацкай вобласці даў указанне «праз мясцовыя органы прыняць меры да разліку ўсіх тых, хто працуе ў кляштарнай гаспадарцы, а намесніка гаспадаркай кляштара прыцягнуць да адказнасці за дапушчэнне эксплуатацыі ў кляштары». Маёмасць кляштара неабходна было прадаць на карысць дзяржавы [12, арк. 317, 317 адв.].

У верасні 1949 г. у друйскі касцёл было засыпана збожжа, а памяшканні кляштара, згодна з пастановай Савета Міністраў БССР ад 20 верасня 1949 г., былі перададзены будаўнічаму тэхнікуму Міністэрства сельскай гаспадаркі [12, арк. 366 адв.]. Пасля афіцыйнай ліквідацыі кляштара ўладамі адзін з манахаў вярнуўся да бацькі, а стары манах застаўся вартаўніком пры навучальнай установе [12, арк. 338].

Тым часам радыкальна змянілася і жыццё сясцёр эўхарыстак. Пасля 1944 г. кіраўніцтвам Кангрэгацыі сясцёр эўхарыстак было прынята рашэнне, што маладыя і працаздольныя манашкі пераедуць у Польшчу. Астатнія павінны былі застацца на месцы, бо пад іх апекай знаходзіліся дзве свецкія жанчыны і пяцёра хворых манашак, якія выехаць не маглі. У выніку ў 1945 г. з 49 паслушніц у Польшчу выехалі 26. У БССР засталіся 23 сястры [24, s. 11]. На той час функцыю Генеральнай настаяцельніцы Кангрэгацыі выконвала маці Апалонія Пяткун, яна ж была настаяцельніцай кляштара ў Друі. У 1945 г. на тэрыторыі Полацкай вобласці існавала пяць Дамоў Кангрэгацыі – у Друі, Браславе, Слабодцы, Ідолце і Іказні. Аднак ужо ў 1946 г. Дом у Браславе спыніў сваё функцыянаванне. Чатыры манашкі, якія раней пражывалі ў Браславе, пераехалі ў Літву [1, s. 1].

У друйскім кляштары знаходзіліся 16 манашак, палова з іх былі непрацаздольнымі. Да 1947 г. маёмасць кляштара складала два жылыя дамы, хлеў, дзве каровы, шэсць свіней, чатыры курыцы, 1 га зямлі, некалькі вуллёў з пчоламі [18, арк. 208]. Займаліся манашкі ў асноўным гародніцтвам, рукадзеллем і вязаннем, аднак працы было мала і зараблялі яны няшмат. Сямёра з іх дапамагалі ў гаспадарцы ксяндзам марыянам.

Тым часам улады ўсялякім чынам імкнуліся ліквідаваць кляштар сясцёр эўхарыстак у Друі. Вясной 1947 г. мясцовы гарадскі Савет у Друі забраў у паслушніц частку зямлі, пакінуўшы толькі 0,07 га, дзе яны пасадзілі бульбу. Ва ўмовах уціску матэрыяльнае становішча манашак усё больш пагаршалася. У 1947 г. яны трымалі толькі 1 карову на 13 чалавек. Насельніцы манастыра амаль не мелі адзення і нават абутку. Дровы трэба было цягнуць на сабе з лесу, пераадольваючы шлях у 3 км [8, арк. 304].

Пра гаротны стан Друйскага кляштара казаў у сваім дакладзе на пасяджэнні Савета ў справах рэлігійных культаў 19 лістапада 1947 г. упаўнаважаны Савета ў справах рэлігійных культаў: «...яны жывуць у невыносных умовах, усё у іх патрапанае, зношанае, зімой адскі холад, бо яны не ў стане абагрэць памяшканне. Плаціць патрэбныя падаткі яны не могуць». Пры гэтым прадстаўнік Савета абмінуў прычыну цяжкага матэрыяльнага становішча кляштара і скончыў сваё выступленне прапановай перадаваць кляштары ў «падобным стане органам сацыяльнага забеспячэння для адкрыцця там дамоў састарэлых» [8, арк. 304].

Аднак манашкі змагаліся за існаванне свайго кляштара. 5 верасня 1949 г. Генеральная настаяцельніца Кангрэгацыі маці Апалонія Пяткун даслала скаргу на імя пракурора, дзе пералічыла метады, якія выкарыстоўваліся супраць манашак: паўафіцыйныя загады пакінуць кляштар, налёты на памяшканні, дзе жылі паслушніцы, без прад'яўлення дакументаў і без складання пратакола аб вобыску, сістэматычныя пагрозы канфіскаваць маёмасць. «Мы маем на 20 чалавек гарод 0,8 га, 3 драўляныя хаткі, зношаныя на 60–80%, якія знаходзяцца на гэтым жа гародзе і складаюць адно домаўладанне. Крыніцай нашага існавання з'яўляецца ідэальная апрацоўка гэтага агарода і як дапамога – рукадзелле. За ўсё гэта мы плацім падаткі, якія прадугледжаны правам. Наша маёмасць з'яўляецца ўласнасцю калектыву 20 чалавек, і калі яго падзяліць на фактычных уладальнікаў, то ніхто паасобку існаваць не здолее. Разысціся мы не можам, паколькі жывём у гэтым месцы і ў гэтым калектыве 10 гадоў і страцілі сувязі з былымі побытавымі ўмовамі», – тлумачыла сутнасць жыцця супольнасці маці Апалонія Пяткун. У канцы яна прасіла спыніць цкаванне манашак і даць магчымасць ім і надалей жыць у кляштары ў Друі [13, арк. 215].

Аднак лёс святыні быў вырашаны, і 8 кастрычніка 1949 г. аблвыканкам Полацкага абласнога Савета дэпутатаў працоўных накіраваў да ўпаўнаважанага Савета ў справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР па БССР указанне: «Жаночы кляштар у г. п. Друя аблвыканкам лічыць неабходным распусціць...». Пры гэтым улады намерваліся ліквідаваць і мужчынскі кляштар ксяндзоў марыянаў у Друі, а ў памяшканне перавесці ўсіх паслушніц дзейных кляштараў БССР. Упаўнаважаны Савета ў справах рэлігійных культаў пісаў: «Правядзеннем гэтага мерапрыемства мы зможам зліквідаваць тры кляштары: 1) жаночы у г. п. Друя з перадачай памяшкання пад бальніцу;

2) жаночы ў г. Гродна з перадачай памяшкання пад Дом піянераў; 3) жаночы ў в. Грыбоўшчына са стварэннем базы для арганізацыі калгаса» [11, арк. 97].

У 1949 г. кляштар эўхарыстак у Друі быў афіцыйна ліквідаваны, а дамы сясцёр былі заняты пад бальніцу. Дзеля таго каб вярнуць хаця б частку маёмасці, сястра Магдалена Мароз прад'явіла іск друйскай бальніцы на свой уласны дом, а сёстры Моніка Скур'ят і Феліцыя Пяткун прэтэндавалі на другі дом, аддадзены друйскай бальніцы. У размове з упаўнаважаным сястра Моніка распавяла яму, што гэты дом яна перавезла з в. Шалтыны ў Друю і ўвесь час плаціла за яго ўсе патрэбныя падаткі [14, арк. 7]. Але вярнуць гэтыя дамы манашкі не здолелі. Адзінае, што ўдалося ўратаваць, – маленькі дамок, дзе засталіся пяцёра старых сясцёр. Маладзейшыя з паслушніц выехалі ў Браслаў, дзе аднавілі дзейнасць свайго Дома, ліквідаванага ў 1946 г. У тым жа 1949 г. сёстры эўхарысткі пакінулі Іказнь і Ідолту [1, s. 2].

18 кастрычніка 1950 г. на тэрыторыі парафіі Ідолта быў арыштаваны айцец Люцыян Паўлік МІС. 30 снежня 1950 г. пастановай суда «за варожую прапаганду супраць савецкай улады» па арт. 72 «б» і 76 КК БССР святар быў прыгавораны да смяротнай кары, якая была заменена на 25 гадоў пазбаўлення волі, 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў і канфіскацыю маёмасці. У камеры смяротнікаў айцец Люцыян Паўлік знаходзіўся да 25 сакавіка 1951 г. [22, s. 466–467].

Тым часам у 1952 г. адзін з братоў марыянаў, Пётр Дундар, быў вымушаны ўступіць у калгас [5, арк. 23]. Пасля таго як 16 сакавіка 1954 г. друйскі касцёл, нарэшце, быў вызвалены з-пад збожжа, Пётр Дундар даслаў заяву на адрас Друйскага сельскага савета з просьбай адкрыць касцёл у населеным пункце [5, арк. 23]. Аднак мясцовыя ўлады не лічылі гэта мэтазгодным. Больш за тое, неўзабаве кіраўніцтва калгаса імя Энгельса прасіла абласны Савет дэпутатаў працоўных перадаць яму касцёл для захоўвання калгаснага збожжа [5, арк. 24]. 15 красавіка 1956 г. прадстаўнікі касцёльнай «дваццаткі» зноў дамагаліся ад улады перадачы касцёла парафіі [5, арк. 25]. Аднак касцёл так і не быў вернуты парафіі.

17 мая 1956 г. айцец Люцыян Паўлік быў вызвалены з лагера і вярнуўся ў Друю, дзе жыў пэўны час без рэгістрацыі. Ён прапісаўся ў хаце, у якой таемна жылі манаскай абшчынай манахі з кляштара Юзэф Скур'ят і Пётр Дундар. У маленькім пакоі хаты была ўладкавана капліца, дзе служыў айцец Паўлік і куды прыходзілі на імшу мясцовыя вернікі [21, арк. 116].

Акрамя айца Люцыяна Паўліка недалёка ад Друі служылі яшчэ двое святароў марыянаў. Айцец Баляслаў Заёнц МІС (05.10.1913–28.10.1942–10.04.1984) распачаў сваё служэнне ў 1942 г. у якасці вікарыя парафіі Слабодка ў у некалькіх кіламетрах ад Друі.

Баляслаў Заёнц нарадзіўся ў в. Дзехцінец, што каля Варшавы, вучыўся ў Ніжэйшай Духоўнай семінарыі ксяндзоў марыянаў у Скурцу каля г. Седльцэ і ў 1930 г. уступіў у Кангрэгацыю. Атрымліваў адукацыю ў Ка-

легіуме Ксяндзоў Марыянаў на Бялянах у Варшаве. Пасля заканчэння курса філасофіі ў Духоўнай Семінарыі ў Варшаве два гады выконваў абавязкі выхаваўцы ў гімназіі ксяндзоў марыянаў. У г. Коўна скончыў семінарыю. 20 кастрычніка 1942 г. атрымаў святарскае пасвячэнне з рук віленскага арцыбіскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага [22, s. 661]. Пасля служэння ў парафіі Слабодка ў 1945 г. святар выконваў абавязкі вікарыя ў Іказні, адкуль 17 лістапада 1945 г. пераехаў у парафію Ідолта на служэнне пробашчам [2, арк. 19]. Калі пачаліся масавыя арышты святароў, з ліпеня 1950 г. айцец Баляслаў Заёнц хаваўся ў Браславе, пазней на тэрыторыі парафій Слабодка і Плюсы (в. Прэсвяцішкі, у Генавефы Укшы), пэўны час на літоўскім баку перадваеннай мяжы на Дзвіне. На нелегальным становішчы святар цэлебраваў святыя Імшы, а імшальныя стыпендыі аддаваў сёстрам эўхарысткам і тым вернікам, якія апекаваліся ім у гэты час [22, s. 661]. У дадзены перыяд улады забралі ў парафіянаў з Ідолты касцёл.

Айцец Баляслаў Заёнц выйшаў са схованкі 27 ліпеня 1953 г. і быў арыштаваны, але праз кароткі час вызвалены [2, арк. 16]. Пасля вяртання святара ў парафію касцёл у Ідолце быў перададзены вернікам, у сваю чаргу айцец Баляслаў Заёнц пасля пераадолення пэўных цяжкасцей зноў атрымаў дазвол на служэнне ў Ідолце.

У 1945 г. сваё служэнне пробашчам у парафіі Іказнь распачаў айцец Юзаф Францкевіч MIC (24.03.1912–26.01.1941–12.05.1985). Юзаф Францкевіч нарадзіўся ў в. Ельніца павета Радзынь Падляскі на тэрыторыі сучаснай Польшчы. У 1928 г. паступіў у Ніжэйшую Духоўную семінарыю ксяндзоў марыянаў у Скурцу каля г. Седльцэ, затым вучыўся ў гімназіі Кангрэгацыі ў Варшаве. Пасля вучобы ў варшаўскай семінарыі быў накіраваны ў семінарыю ў Вільню (1939), аднак па прычыне вайны духоўную ўстанову скончыў у Коўне, дзе прыняў святарскія пасвячэнні [22, s. 226], якія яму ўдзяліў біскуп Вінцас Брызгіс [4, арк. 24]. Да канца вайны святар знаходзіўся ў Коўне, потым у Вільні. 1 студзеня 1945 г. айцец Юзаф Францкевіч атрымаў прызначэнне пробашчам у парафію Іказнь, дзе 13 жніўня 1947 г. быў зарэгістраваны [3, арк. 17]. У 1949 г. святар перайшоў на нелегальнае становішча, хаваўся з-за пагрозы арышту. Аднак 18 кастрычніка 1950 г. ксёндз Юзаф Францкевіч быў схоплены ў Іказні і перавезены ў вязніцу ў Полацк. 30 снежня 1950 г. святар быў прыгавораны да смяротнага пакарання «за варожую прапаганду супраць савецкай улады». Пэўны час ён знаходзіўся ў камеры смяротнікаў у аршанскай вязніцы, але затым смяротнае пакаранне была заменена на 25 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў [22, s. 226–227]. Адразу пасля знікнення святара касцёл быў зачынены. Тым не менш сястра-эўхарыстка Аліна Рымовіч здолела выратаваць найкаштоўнейшае – Найсвяцейшы Сакрамант. Яна вынесла яго, калі ў парафію прыехалі прадстаўнікі ўлады, каб зачыніць касцёл. З уратаваным Найсвяцейшым Сакрамантам сястра накіравалася ў касцёл Слабодкі. Калі па дарозе манаш-

ка сустрэла прадстаўнікоў улады, якія вярталіся назад, яна сышла на поле і зрабіла выгляд, што займаецца праполкай бульбы. Калі пагроза выкрыцця мінула, сястра папрасіла аднаго чалавека падвезці яе да касцёла ў Слабодку, і такім чынам туды быў перавезены Найсвяцейшы Сакрамант. Вернікі, якія працавалі ў полі, убачыўшы пушку з Найсвяцейшым Сакрамантам, уклен-чылі.

Пасля закрыцця мясцовымі ўладамі касцёла ў Іказні яго маёмасць была прызнана «безгаспадарчай» і выстаўлена на продаж. Частка літургічнага посуду была здадзена як каляровыя металы, другая частка літургічных рэчаў, у тым ліку і арнаты, была здадзена як анучы [15, арк. 13–14]. У 1949–1950 гг. касцёл для мясцовага калгаса стаў збожжасховішчам. З мая 1950 г. святыня стаяла пустой, што выклікала ў вернікаў надзею на яе вяртанне [16, арк. 21]. З кастрычніка 1953 да лютага 1954 г. яны даслалі чатыры заявы ў розныя інстанцыі з просьбай аб вяртанні ім храма [16, арк. 18]. Аднак касцёл парафіі не вярнулі, у далейшым яго выкарыстоўвалі як склад будаўнічых матэрыялаў, у выніку чаго рэлігійны будынак атрымаў сур'ёзныя пашкоджанні.

18 жніўня 1956 г. айцец Юзаф Францкевіч быў вызвалены з лагера і вярнуўся ў Друю [4, арк. 24]. Тут ужо знаходзіўся айцец Люцыян Паўлік, вызвалены раней. Аднак улады не дазволілі застацца святарам у Друі. Айцец Люцыян Паўлік у 1957 г. быў вымушаны пераехаць у в. Задарожжа, дзе 13 лютага атрымаў рэгістрацыю ў парафіі [16, арк. 37]. Айцец Юзаф Францкевіч 10 красавіка 1957 г. распачаў сваё служэнне ў парафіі Далёкія [4, арк. 30].

У 1956 г. сёстры эўхарысткі пачалі служэнне пры парафіі ў Задарожжы і вярнуліся ў парафію ў Ідолце [1, s. 2].

Такім чынам, на пачатку 1957 г. на тэрыторыі Маладзечанскай вобласці (былых раёнаў Полацкай вобласці) працягвала сваю дзейнасць як Кангрэгацыя Айцоў Марыянаў Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі, так і Кангрэгацыі Сясцёр Служабніц Езуса ў Эўхарыстыі. Паколькі кляштар марыянаў у Друі быў ліквідаваны, айцы марыяне служылі на парафіях у якасці пробашчаў, не маючы магчымасці на супольнае манаскае жыццё. Нягледзячы на шматлікія перашкоды сваё служэнне нелегальна працягвалі і манашкі-эўхарысткі. На пачатку 1957 г. яны ажыццяўлялі апостальскую дзейнасць у Друі, Слабодцы, Браславе, Задарожжы і Ідолце.

ЛІТАРАТУРА

1. **Архіў** Кангрэгацыі Сясцёр Служабніц Езуса ў Еўхарыстыі (Прушкаў). Акты IV Генеральнага Капітула Кангрэгацыі Сясцёр Служабніц Езуса ў Еўхарыстыі (SJE). 1969 г. B-1a-V.

2. **Дзяржаўны** архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 89.

3. **ДАВВ.** – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 105.

4. **ДАВВ.** – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 123.

5. **ДАВВ.** – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 106.

6. **Жарнасек, І.** Ксёндз Баляслаў Грамс / І. Жарнасек // Наша вера. – 1996. – № 1 (2). – С. 21–23.

7. **Жарнасек, І.** Славіў Пана да канца сваіх дзён / І. Жарнасек // Ave Maria. – 2007. – № 5. – С. 21–22.

8. **Нацыянальны** архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 7.

9. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 8.

10. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 13.

11. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 16.

12. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 17.

13. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 18.

14. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 19.

15. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 25.

16. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 39.

17. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 40.

18. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 2.

19. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 9.

20. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 10.

21. **НАРБ.** – Ф. 952. Воп. 3. Спр. 18.

22. **Dzwonkowski, R.** Leksykon duchowieństwa polskiego represionowowanego w ZSRS 1939–1988 / R. Dzwonkowski. – Lublin : Towarzystwo Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego, 2003. – 856 s.

23. **Krahel, T.**, ks. Ksiądz Bolesław Gramz / ks. T. Krahel // Czas miłosierdzia. – 1999. – № 8. – S. 14.

24. **Srzelecka, H.** Służebnicy Jezusa w Eucharystii na terenach Związku Radzieckiego w latach 1945–1991 / H. Srzelecka SJE. – Warszawa, 1994. – 226 s.

Орлова А.Г. *(аг. Бочейково, Бешенковичский район)*

ПРАВОСЛАВНЫЕ ХРАМЫ БЕШЕНКОВИЧСКОГО РАЙОНА

История Беларуси, а значит и своей малой родины, немыслима без истории каждого местного храма, прихода. Сегодня это элемент культурного наследия, который историческая наука долгое время обходила стороной.

Кратко о храмах Бешенковичского района можно прочитать в справочнике «Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы» [4], в энциклопедиях. Но самый интересный материал можно отыскать в архивах. «Статистические сведения о церквах и притчах Полоцкой епархии» [5] свидетельствуют о том, что церкви современного Бешенковичского района относились к благочинию II округа Полоцкой епархии. Здесь описано более 20 церквей и часовен, которые находились в крупных населенных пунктах, но до нашего времени от 10 из них не осталось и следа. После событий 1917 г. начались гонения на Православную Церковь. В 1918 г. был издан декрет советской вла-

сти «Об отделении церкви от государства и школы от церкви». После этого некоторые передавались местным властям, некоторые разрушались.

Сегодня на территории района осуществляют деятельность 11 православных общин, которым принадлежит 10 культовых объектов. Из них действует только 7. Три культовых объекта – это полуразрушенные храмы. Четыре культовых объекта включены в список историко-культурного наследия Республики Беларусь – храм Святителя Николая Чудотворца в д. Слободка, храм Святой Живоначальной Троицы в аг. Островно, храм Святого пророка Илии в г. п. Бешенковичи, храм Святителя Николая Чудотворца в д. Добригоры.

Храм Святого Пророка Илии в Бешенковичах – историко-культурное наследие Республики Беларусь (Дадатак 13, фота 1). Архивы рассказывают, что возникновение Ильинской церкви связано с польским королем и великим князем литовским Казимиром IV, который в память о спасении своей супруги от утопления в день памяти пророка Илии велел основать в Беларуси шесть православных храмов. Один из них был построен в 1447 г. в Бешенковичах, но в городских инвентарях 1552 и 1618 гг. этот храм не упоминается. В ведомостях 1863 г. указывается, что деревянную Ильинскую церковь построили витебские купцы Запольские в 1746 г. Но на дверях храма в XIX в. существовала надпись «1643», и многие историки отнесли его постройку именно к этому году. А в 1766 г. церковь, по их мнению, могла быть перестроена.

В 1866–1870 гг. на месте деревянной была построена каменная церковь на казенные средства. Настоятелем храма в то время был протоиерей Иосиф Никонович, его помощником – священник Клементий Оконович. Прихожан мужского и женского пола числилось около 5000 душ. Член Витебской ученой архивной комиссии М.В. Анцев, который в 1911 г. побывал на экскурсии в местечке Бешенковичи, посетил эту церковь. Он пишет: «В этой церкви сохранились старинные иконы пророка Илии и Божией Матери, относящиеся к началу XVIII или к концу XVII столетия» [1].

В 1935 г. люди встали на защиту церкви, в которой тогда хранили зерно. Жители написали письмо от имени 7000 прихожан председателю Всероссийского центрального исполнительного комитета М.И. Калинину с просьбой вернуть им храм.

В годы Великой Отечественной войны церковь использовалась оккупантами под склад. На колокольне было устроено пулеметное гнездо, которое разбили вместе с колокольней в 1944 г. И только после войны церковь была восстановлена.

На сегодняшний день храм отреставрирован и представляет собой памятник архитектуры ретроспективно-русского стиля. Церковь является трехпрестольной. Центральный престол установлен во имя святого пророка Илии, правый – во имя святого благоверного князя Александра Невского,

левый – во имя святых апостолов Петра и Павла. Крестово-купольный храм увенчан пятью восьмигранными световыми барабанами с шатровыми завершениями и маковками-луковицами. В архитектурном декоре использованы элементы древнерусского зодчества – килеподобные закомары, кокошники, трехлопастные арки. Для ремонта крыши использована черепица. Внутри установлен новый деревянный иконостас ручной работы, расписан алтарь. Все окна новые, на пол положена плитка с подогревом. Приход зарегистрирован 21 июля 1992 г. Службу ведут Н.В. Кисель и В.Н. Кисель.

Храм Святителя Николая Чудотворца в д. Добригоры также включен в список историко-культурного наследия Республики Беларусь и является памятником ретроспективно-русского стиля (Дадатак 13, фота 2). Николаевская церковь – памятник деревянного зодчества. Построена она в 1846 г. В «Статистических сведениях» за 1884 г. отмечается, что церковь требует починки, что постройки ветхие. На протяжении многих лет церковь ремонтировалась несколько раз, но только в 1999 г. она была возрождена и освящена.

Теперь храм имеет следующее архитектурное строение: стоит на каменном фундаменте, к основному квадратному в плане объему примыкают двухъярусная притвор-колокольня с шатром и маковкой в завершении и низкая прямоугольная в плане апсида под двускатным покрытием. Основной объем накрыт четырехскатной крышей с маковкой на низком шатровом восьмигранном барабане. Грани шатра колокольни у основания завершены треугольными фронтонами. Боковые фасады горизонтально обшиты досками, прорезаны высокими арочными и прямоугольными оконными проемами.

Община Николаевской церкви малочисленна, поэтому службы проводятся только по праздникам иереем Николаем Витальевичем Киселём.

Интересна история **церкви Святой Живоначальной Троицы** в аг. Островно (Дадатак 13, фота 3). Изначально здесь был костел, основателем которого историки называют короля Жигимонта I Августа. Он приказал возвести его в честь разгрома войсками Великого княжества Литовского армии Московского государства под Чашниками и Оршей во время Ливонской войны в 1546 г. В ходе дальнейших войн здание сильно пострадало, возможно, было разрушено до основания. Но по приказу витебского воеводы Михаила Патея костел был восстановлен на прежнем фундаменте. Около 1620 г. Александр Сапега, воевода Мстиславльский, построил при костеле монастырь и пригласил монахов доминиканского ордена. После восстания 1863–1864 гг. святыня была отдана православной церкви и снова перестроена. Храм «повернули» на 180 градусов: алтарь перенесли на восток, появилась башня звонницы и типичные для этого стиля луковицы.

Во времена Советского Союза церковь не действовала, пустующее здание начало разрушаться. С 1930 г. в ней был склад. Новая жизнь началась лишь в 2006 г.

Настоятель храма Андрей Дорощенко пытается восстанавливать святыню своими силами. Сделано много, но предстоит сделать еще больше. На сегодняшний день здание уже находится под крышей и имеет красивый вид. Храм относится к историко-культурному наследию Республики Беларусь. Уже четыре раза в аг. Островно проходил районный праздник духовной культуры и народного творчества «Троицкий фестиваль», который всегда начинался с Божественной литургии в храме Святой Живоначальной Троицы.

Храм Святителя Николая Чудотворца находится в д. Слободка (Дадатак 13, фота 4). Статистические сведения [5] дают такую информацию: «Церковь во имя Святителя и Чудотворца Николая построена в 1858 году, штатная, каменная, холодная, прочная». Псаломщик Алексей Ковановский при этой церкви с самого открытия, с 1858 г., а священник Иоанн Фащевский с 1865 г. Прихожан в 1884 г., как мы видим из записей, было предостаточно: мужского пола – 1131 и женского – 1285. На сегодняшний день в Слободке проживает всего 26 человек.

Храм в д. Слободка пришел в упадок после Великой Отечественной войны, хотя закрыли его в 1935 г. Уже несколько десятков лет здание разрушается. Оно стоит на берегу озера Святое. Местные жители часто видят здесь паломников из России и Беларуси, которые часами молятся, стоя на коленях, невзирая на погодные условия. Храм Святителя Николая Чудотворца – памятник архитектуры XIX – начала XX в. Зданию присвоена 3-я категория. Николаевская церковь выполнена из кирпича в псевдорусском стиле (псевдорусский стиль имеет элементы древнерусского зодчества, народного искусства и византийской архитектуры). Фасады оштукатурены, декорированы рустом, полуколоннами, многопрофильными карнизами и поясками, кокошниками, украшены наличниками арочных оконных проемов. Здание является примером крестово-купольного храма, доминантой которого является шатровая колокольня с луковицеобразной главкой. Рядом с храмом расположены два каменных креста, выступающих из-под земли.

Как отметил архитектор Г. Орловский, на сегодняшний день в целостности сохранились стены, кирпичные своды. Проседания фундамента не наблюдается. Также до нашего времени дошли многочисленные участки штукатурного декора фасадов, деревянная главка башни, деревянные элементы шатровой кровли, оригинальные кованые крепления водосточных труб, кровельное железо главки и кровли башни.

В 2 км от Слободки в д. Свеча находится полуразрушенный **храм Рождества Пресвятой Богородицы**. В 1793 г. была построена деревянная церковь, которая к 1884 г. совсем обветшала. Поэтому 27 декабря 1895 г. состоялось освящение и празднование открытия нового приходского храма в д. Свеча. Церковь построили каменную, с железной крышей и двумя куполами, на которых установили железные позолоченные кресты. На строительство храма из казны было отпущено 11 456 рублей 2 коп. За эту сумму на торгах, про-

ходивших в духовной консистории, никто не согласился строить. К счастью, явился благотворитель – священник Стрижевской церкви отец Иосиф Хруцкий, который решил вопрос с кирпичом: его стали изготавливать из местной глины. На открытие храма собралось несколько тысяч богомольцев. После окончания богослужения во время целования креста народу раздавались крестики. В числе подходивших к кресту было несколько католиков. Принимая от священника крестики, они целовали его руку.

В настоящее время храм не отреставрирован, но в нем соблюдается чистота и порядок. А богослужения совершаются в церкви, расположенной рядом с восстанавливаемой.

Через многие испытания прошла и **церковь Преображения Господня** в аг. Бочейково и до наших дней не достояла. Согласно архивам [5], построена она была в 1675 г. Церковь была деревянная. В 1876 г. после окончания Витебской духовной семинарии в Бочейковской церкви три года служил псаломщиком Федор Никонович, в будущем видный подвижник Православия в Полоцко-Витебской епархии. Одновременно он исполнял обязанности законоучителя в Бочейковском народном училище.

Церковь стояла на самом высоком месте – на левом берегу р. Уллы. Со временем здание стало ветхим. Было решено построить новую церковь. В архиве имеется проект каменной Бочейковской церкви архитектора В.Ф. Коршикова (1858–1920), который занимался проектированием церквей и церковно-приходских школ. К сожалению, осуществлению проекта помешала революция 1917 г.

Когда в 1918 г. немцы покинули нашу территорию, начались гонения на церковь и священнослужителей. Их арестовали и сослали в исправительные лагеря. В 1933 г. церковь была отдана под клуб. Когда там обвалился потолок, ее закрыли на замок. Во время Великой Отечественной войны 4 июля 1941 г. фашисты сожгли здание церкви. На ее месте после войны был построен клуб, который сгорел в 1980-е гг. Потом здесь выстроили здание сельского совета. И только в 1990-е гг. начинается духовное возрождение в связи с новой политикой государства по отношению к верующим. Население обращается к властям с просьбой предоставить здание под церковь. Сначала служба проходила в вагончике-церквушке, а потом под церковь было продано пустующее здание. Много сил было потрачено на строительство храма. Теперь над ним возвышается три купола с позолоченными крестами, построена колокольня, пристроена воскресная школа. Много сил вложил сюда иерей Сергей Денищиц. В строительстве материально помогали жители агрогородка, руководители местных предприятий. Таким образом, храм Преображения Господня сегодня живет, служит людям и является святым местом для православных.

Храм Святой Живоначальной Троицы находится в аг. Улла. Церковь построена в 1896 г. В ее архитектуре воплотились черты классицизма и рет-

роспективно-русского стиля. Храм крестовый в плане, состоит из центрального объема, двух приделов, алтарной апсиды и бабинца (бабинец – одна из трех частей тридильного храма, к торцу которого пристроена колокольня). Но так было не всегда. Время и особенно Вторая мировая война не пощадили эту церковь. К концу 1990-х гг. от нее остался один полуразрушенный остов. К счастью, храм строили из добротного кирпича. Это позволило начать планомерную и тщательную реконструкцию церкви. Почти каждый житель Уллы внес в это благое дело личный вклад в виде пожертвований. Сейчас храм превратился в самое красивое здание аг. Улла. Шатровая крыша представляет собой каскад кокошников, по углам которой разместились украшения в виде четырех башенок, барабан с купольным верхом, двухъярусная колокольня, что возвышается над главным входом. При храме работает воскресная школа. Настоятелем храма является Николай Николаевич Радевич. В сентябре 2011 г. с участием прихожан храма была проведена республиканская научно-просветительская экспедиция «Дарога да святыняў» с участием видных деятелей культуры и искусства Республики Беларусь.

Не все храмы в Бешенковичском районе возродились. **Храм Благоверного князя Александра Невского** в полуразрушенном состоянии находится в д. Мартиново. Но все равно туристы и паломники не обходят его стороной. Храм был построен в XIX в. из кирпича на месте униатской церкви на площадке старого языческого капища. Храм имеет черты классицизма и псевдорусского стиля. В 1935 г. он был закрыт. Приход зарегистрирован в 1992 г., но культовый объект стоит как напоминание о тяжелых испытаниях, через которые прошла Православная Церковь.

В аг. Верховье **церковь Святой Живоначальной Троицы** была построена около 1863 г., а когда утрачена, неизвестно. Поэтому богослужения совершаются в передвижном храме-вагончике.

Церковь Казанской иконы Божией Матери стояла на восточной окраине д. Дорогокупово (Придвинье) возле шоссейной дороги Витебск – Бешенковичи. Была построена из дерева в 1780 г., реконструирована в 1902 г. Совмещала в своей архитектуре традиции народного зодчества и отдельные черты неорусского стиля. Долгое время находилась в запустении. В 1992 г. сгорела. Остались фундамент храма и кованая ограда. Здесь также под церковь приспособлен передвижной вагончик.

В д. Павловичи приход храма Святого Пророка Илии есть, сам храм разрушен.

Каждый сохраненный и отреставрированный храм уникален и неповторим. Но история любого храма будет неполной без материалов о его священнослужителях, судьбы которых сложились трагически. Все они были арестованы за антисоветскую деятельность, сосланы в исправительные лагеря, некоторые расстреляны. В многочисленных списках «Витебского мартиролога» числится 19 фамилий репрессированных священнослужите-

лей Бешенковичского района [2]: В.С. Базыленко, В.С. Бекаревич (п. Улла), Г.С. Базилевский (д. Слободка), Ф.А. Бакметов, А.Н. Шелег, И.А. Кухто (г. п. Бешенковичи), В.А. Войткевич, М.М. Магер, Е.К. Магер, Ф.И. Дятловский, В.И. Толстой (д. Бочейково), И.П. Курневич, А.А. Скромнов (д. Павловичи), П.К. Кабышко (д. Бикложа), А.В. Пароменский (д. Верховье), Д.Г. Тарарин, А.П. Трусс, И.Т. Тихонов (д. Островно), Е.Г. Иванов (д. Дорогокупово). Пятеро из них были расстреляны, судьбы остальных неизвестны. В 1988 г. все пострадавшие были реабилитированы Президиумом Витебского областного суда. Их подвиг остается высоким примером христианской жертвенности.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Анцев, М.** Экскурсия Витебской Учёной Архивной Комиссии 14 мая 1911 года в местечко Бешенковичи / М. Анцев. – Витебские Губернские Ведомости. – 1911. – № 112. – 16 с.

2. **Горидовец, В.** Витебский мартиролог (1918–1952) / В. Горидовец. – Витебск, 2008.

3. **Государственный** архив Витебской области. – Ф. 251. В. 1. Д. 76.

4. **Матвеев, А.** Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы : справочник / А. Матвеев. – Минск : Белорусская Православная Церковь, 2009. – 156 с.

5. **Статистические** сведения о церквах и притчах Полоцкой епархии. – Витебск : Типо-Литография Г. А. Малкина, 1884. – С. 43–47.

Слисская А.А. *(д. Богатырская, Полоцкий район)*

ПОЛОЦКОЕ ЕПАРХИАЛЬНОЕ УЧИЛИЩЕ КАК ЦЕНТР ДУХОВНОГО ЖЕНСКОГО ВОСПИТАНИЯ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в. НА ПОЛОТЧИНЕ

Середина XIX в. характеризуется изменением положения женского духовного образования. И если в целом по Российской империи этот процесс совпал с реформированием всего образования, улучшением всеобщей грамотности и социализацией женщины, то на белорусских землях он был связан с другими событиями и протекал несколько иначе.

В 1839 г. произошло воссоединение униатской церкви с православной. Для успешного и окончательного обращения униатов и укрепления православия требовалась правильная организация женского образования «в духе православия и русской народности» на территории Беларуси.

В Полоцкой епархии, как и в целом в Российской империи, впервые заговорили о женском училище как учебном заведении в 40-е гг. XIX в. В 1845 г. высокопреосвященный Василий (Лужинский) ходатайствует перед Святей-

шим Синодом об открытии в Полоцком Спасо-Евфросиниевском монастыре училища для девочек-сирот из духовного сословия. Как благотворительное заведение училище уже существовало с 1841 г., когда император Николай I, давая свое согласие на восстановление Полоцкого Свято-Ефросиниевского женского монастыря, поставил непременным условием, чтобы при нем было устроено епархиальное училище для девиц духовного звания [5]. После прошения высокопреосвященного Василия оно было открыто в 1844 г. на 21 воспитанницу. Отдельного здания учебное заведение не имело. Размещалось оно в особых комнатах в монастыре. Образование давалось ученицам простое: монахини обучали их Закону Божию, священной истории, краткой всеобщей истории и географии, церковному пению и рукоделию. Духовник обители преподавал русское и славянское чтение, начала арифметики и краткую русскую грамматику. Также воспитанницы учились полезным работам у монахинь: готовили еду, доили коров, делали масло, работали в саду и огороде, приучались распознавать качество пахотной земли, занимались ее удобрением и обработкой, наблюдали время посева и уборки хлеба [1, с. 34].

Число учащихся на первых порах существования училища едва достигало 30 человек, что, впрочем, было вполне естественным при слабом запросе на образование, особенно для девочек, какой был к исходу 60-х гг. XIX в.

Несколько лет спустя качество преподавания стало заметно улучшаться: преподавателями назначались учителя Полоцкой духовной семинарии, законоучителем стал ректор семинарии. Улучшение состояния учебного процесса способствовало увеличению количества желающих получить в них образование [4, с. 256].

Одновременно с теоретическим изучением предметов воспитанницы всех классов в течение года упражнялись в письменных работах – писали сочинения, размышления, описания.

Значительное время отводилось изучению русской литературы и словесности. Большое внимание уделялось в училище внеклассному чтению, которое по уставу являлось обязательным. Воспитательницы наблюдали за тем, чтобы в свободное время учащиеся занимались чтением, делали конспекты книг в своих дневниках и излагали свои впечатления о прочитанном. В конце месяца эти записи представлялись преподавателям [5].

С целью расширения общеобразовательных познаний воспитанниц вводились необязательные дисциплины по французскому и немецкому языкам. Девушки в духовном училище обучались игре на фортепиано, фисгармонии, скрипке. Нередко воспитанницы организовывали музыкальные вечера, на которых присутствовала интеллигенция города во главе с архиепископом и начальником губернии. На таких праздниках юные музыкантши исполняли гимны, училищные песни, мелодии из опер. Репертуар музыкальных вечеров, которые устраивались специально для детей, соответствовал возрасту

слушателей: «Красная шапочка», «Летнее утро», «Табличка умножения», «Нива знанья и науки» и многое другое [5].

Устраивались в училищах также и открытые литературные вечера с хоровыми выступлениями и чтением стихотворений религиозно-нравственного содержания. Такие мероприятия снискали хорошую репутацию и высокую оценку женскому духовному училищу, сделав его интеллектуальным центром города.

Воспитанницы всех классов обучались технически и практически рукоделию, особое внимание обращалось на изучение кройки и шитья столового и спального белья, а также платьев. С 1888 г. по распоряжению Святейшего Синода ученицы должны были овладеть искусством шитья церковных облачений и других принадлежностей церковной ризницы.

С гравийного карьера д. Дыманово в музей поступил зуб молодой особи мамонта (1950) [15, л. 86 об.].

В д. Шапечино фрагмент бивня был поднят с глубины 28 м. Его нашли возле животноводческой фермы в гравийно-галечных отложениях при бурении скважины для воды в 1959 г. [8, л. 267 об.].

В д. Княжица на левом берегу р. Западная Двина в 1947 г. был найден фрагмент костей таза мамонта [2, л. 201 об.].

Аналогичный обломок кости передал в музей шофер завода им. Коминтерна (Витебск) в 1975 г., обнаруживший находку в песке, привезенном на территорию завода с берега р. Западная Двина д. Старое Село [8, л. 2 об.].

В 1989 г. зуб мамонта был обнаружен в глине, привезенной в д. Куковячино из карьера, расположенного в окрестностях деревни [13, л. 37 об.].

За период с 1946 по 2017 г. в фонды ВОКМ поступило 9 зубов, 18 бивней и 26 костей мамонтов из разных районов Витебска и его окрестностей.

Самое большое количество поступлений было из карьера «Гралево» ВПО «Доломит» (ОАО «Доломит»). При проведении вскрышных работ с глубины 15–17 м на поверхность были подняты 17 бивней и 19 костей разной сохранности: нижняя челюсть, 5 обломков ребер, 6 позвонков, с сохранившимися на некоторых из них остистыми отростками, лопатка и 6 костей передних и задних конечностей. Из них молодой особи мамонта принадлежали 2 кости передних конечностей (плечевая и лучевая), а также нижняя челюсть с сохранившейся сменой зубов [10, л. 228 об. – 229 об.; 15, л. 86 об.].

Кроме карьера «Гралево» костные останки мамонтов были найдены на территории микрорайонов Орехово, Тарный, ДСК, Марковщина, Мишково, ул. Бебеля и ул. Велижской, на берегах р. Западная Двина в районе парка им. Советской Армии и ул. Чехова.

С территории юго-западной части Витебска – микрорайонов Орехово, Тарный, ДСК и Марковщина – в фонды музея поступило 6 зубов, 1 позвонок, фрагменты бивня и нижней челюсти.

Основными местами находок были карьеры ДСК. В песчаных отложениях этих карьеров на глубине от 2 до 12 м были найдены 4 зуба разной сохранности (1956, 1957) [3, л. 258 об., 263 об.; 4, л. 23 об., 228 об.] и резцовая часть нижней челюсти мамонта (1956) [3, л. 265 об.].

Еще один зуб мамонта был найден в микрорайоне Орехово в карьере по добыче песка и гравия завода Треста «Индустрой № 2» (1955) [15, л. 86 об.].

Одна из крупных находок на территории города была сделана в 1955 г. в районе ул. Бебеля. Здесь в песчаном карьере сосонника на глубине 15 м была найдена локтевая кость мамонта длиной около 70 см [3, л. 197 об.].

Остальные находки костных останков мамонтов в этой части города в разные годы были обнаружены на берегах р. Западная Двина – фрагмент бивня (микрорайон Марковщина, 1952) [3, л. 281 об.], зуб (микрорайон Тарный, 1970 г.) [6, л. 6 об.], первый шейный позвонок (микрорайон ДСК, 1996) [11, л. 73 об.].

В начале 1970-х гг. костные останки мамонтов находили на берегах р. Западная Двина и в других частях города – в районе парка им. Советской Армии и ул. Чехова. В 1970 г. в фонды музея были переданы локтевая кость и хвостовой позвонок мамонта [5, л. 190 об.], поднятые при помощи гравий-добывающей установки со дна реки в районе парка им. Советской Армии (парка «Мазурино»). Эти кости находились на глубине 5 м в 4 м от берега. Еще одна находка – верхняя челюсть мамонта с сохранившимися коренными зубами [7, л. 73 об.] – была найдена в реке (на глубине 5 м) в окрестностях этого парка в 1972 г.

В 1973 г. жителем города был передан в музей небольшой фрагмент бедренной кости мамонта, найденный на берегу р. Западная Двина в районе ул. Чехова [7, л. 149 об.].

В 1993 г. с окрестностей бывшей д. Мишково (микрорайон. Мишково) в фонды музея поступил зуб [14, л. 101 об.]. Он был обнаружен в куче песка, привезенного на строительство моста.

В 1956 и 1972 гг. в музей были переданы 2 зуба мамонта, найденные на территории города при проведении строительно-ремонтных работ. Один из них – при закладке фундамента жилого дома на правом берегу р. Западная Двина (точное место находки неизвестно) [3, л. 238 об.], второй – во время ремонта фундамента одного из частных домов по ул. Велижской (район Песковатика) в песке на глубине 0,5 м [7, л. 90 об.].

Кроме 87 костных останков мамонтов, поступивших в фонды ВОКМ в 1946–2017 гг. в остеологической коллекции ископаемых хоботных имеется один зуб мамонта, найденный в июне 1953 г. на р. Перекатун (приток Мамонтовой реки) на о. Врангеля [3, л. 23 об.] – территории, где 3500–4000 лет назад вымерли последние представители островной популяции карликовых шерстистых мамонтов Mammuthus primigenius.

Большая часть костных останков мамонтов коллекции представлена на экспозиции «Природа Витебского края».

ЛИТЕРАТУРА

1. **Витебский** областной краеведческий музей (ВОКМ). Книга поступлений предметов основного фонда № 1.

2. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 2.

3. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 4.
4. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 5.
5. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 8.
6. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 9.
7. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 10.
8. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 12.
9. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 13.
10. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 14.
11. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда № 21.
12. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов основного фонда за 2019 г. КП 27047–27195.
13. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов научно-вспомогательного фонда № 10.
14. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов научно-вспомогательного фонда № 11.
15. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов научно-вспомогательного фонда № 13.
16. **ВОКМ.** Книга поступлений предметов научно-вспомогательного фонда за 2017 г. Н/В 11395–11556.
17. **ВОКМ.** Научный архив. – Ф. 9. Д. 1.

Гаўрылава С.В. *(г. Полацк)*

ДА ПЫТАННЯ ПРА ФАРМІРАВАННЕ МАДЭЛІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ РЭЧАІСНАСЦІ Ў КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯХ БЕЛАРУСІ

Правобразам сучасных краязнаўчых музеяў былі так званыя мясцовыя музеі, якія атрымалі шырокае распаўсюджанне ў другой палове XIX ст. як вынік грамадска-палітычных пераўтварэнняў, што прывялі да змены поглядаў на захаванне помнікаў старажытнасці. Першапачаткова такія музеі задумваліся як «комплексные центры сосредоточения материалов и информации местного характера» [4, с. 142]. Яны ўяўлялі сабой установы змешанага характару, якія былі прызваны збіраць, захоўваць і рэпрэзентаваць інфармацыю пра канкрэтную губерню. Акрамя таго, музеі станавіліся навуковымі цэнтрамі рэгіёнаў і сховішчамі дакументаў па іх гісторыі. Такім чынам, адна з асноўных задач правінцыйных музеяў заключалася ў спрыянні ўсведамленню чалавекам сябе як часткі свайго краю і вялікай дзяржавы.

У пачатку XX ст. ішла выпрацоўка асноўных прынцыпаў пабудовы экспазіцыі краязнаўчага музея, які яшчэ вызначалі як «мясцовы» музей ці «музей мясцовага краю». Тагачасныя музеі на месцах разглядаліся ў якасці асяродкаў па захаванні і прэзентацыі сведчанняў мясцовай духоўнай творчасці. У першыя паслярэвалюцыйныя гады такі падыход на некаторы час захаваўся. Аўтар нарыса «Местные музеи и как их устраивать» М.І. Раманаў пісаў, што «мысль, лежащая в основе местного музея, всегда одна и та

же – дать наглядную и всестороннюю картину данной местности», «так как полнота этой картины может быть достигнута только в том случае, если в ней будет выражена тесная связь местного духовного творчества с людьми, бытом и природой, среди которых развивалось это творчество, то ясно, что главная часть местного музея должна объединить в себе все наиболее характерное для природы, быта, населения и творчества данной местности или края» [5, с. 12–13].

Ідэолагі новага савецкага ладу адразу ж паставілі на мэце зламаць бар'ер, які аддзяляў музей ад жыцця, надаць яму сацыяльную функцыю, інтэграваць у сацыяльнае асяроддзе [1, с. 140]. Тэрмін «краязнаўчы музей» увайшоў ва ўжытак пасля II Усесаюзнай канферэнцыі краязнаўцаў, што адбылася ў снежні 1924 г. Тады, акрамя новага вызначэння былых мясцовых музеяў, была вызначана і іх структура: прырода, гісторыя, мастацтва, якія адлюстроўваюць здабыткі таго ці іншага краю.

Адной з задач дзейнасці краязнаўчых музеяў было навуковае апісанне сваёй тэрыторыі, чым павінны былі займацца раённыя музеі пасродкам адлюстравання ў экспазіцыях прыроды, гаспадаркі і побыту свайго раёна. Таму ў большасці музеяў меліся тры галоўныя аддзелы: прыродазнаўчы, культурна-гістарычны і грамадска-эканамічны.

Узмацненне сувязі музея і тагачаснага сацыякультурнага развіцця краіны было замацавана ў 1928 г., калі на пасяджэнні Усесаюзнага ЦВК былі вызначаны задачы музеяў: «а) магчымы ўдзел музеяў у агульным развіцці навукова-даследчай работы; б) больш шырокае і паглыбленае абслугоўванне музеямі культурна-асветніцкіх патрабаванняў працоўных мас; в) паглыбленне метадаў выяўлення калекцый для навукова-папулярызацыйных мэт у напрамку найбольшага набліжэння музеяў да патрабаванняў школьнага і прафтэхнічнага выхавання і масавага асветніцтва; г) удзел музеяў у вывучэнні прыродных і вытворчых сіл краіны; д) узмацненне музейнай работы ў культурна-гістарычнай галіне ў напрамку вывучэння рэвалюцыі, рабочага руху і побыту працоўных; е) удзел музеяў у індустрыялізацыі краіны, развіцці сельскай гаспадаркі, саматужных промыслаў; ж) удзел музеяў ва ўздыме культурнага і гаспадарчага ўзроўню адсталых народнасцей і нацыянальных меншасцей; з) удзел музеяў у рабоце па ўмацаванні абароны краіны і ажыццяўленні іншых найважнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва» [1, с. 116].

У снежні 1930 г. адбыўся I Усерасійскі музейны з'езд, на якім былі сфармуляваны асноўныя ідэалагічныя задачы тагачасных музеяў. У адным з агучаных на з'ездзе дакладаў (у прыватнасці, у дакладзе прафесара філасофіі І.К. Лупалы «Диалектический материализм и музейное строительство») дыялектычны матэрыялізм быў абвешчаны як адзіны навуковы метад. Рэзалюцыя з'езда замацавала задачу «не только отражения настоящего и прошлого, но и строительство будущего на основе линии коммунистической

партии», «активизировать посетителя, поставить его перед основными задачами современности и четко указать ему общий лозунг» [3, с. 665].

Судакладчыкам І.К. Лупалы выступіў музеязнаўца Н.А. Шнеерсон, які быў ініцыятарам таго, каб аддзел сацыялістычнага будаўніцтва стаў абавязковым завяршальным аддзелам экспазіцыі краязнаўчага музея, а яго задачай – «грандиозность происходящего переустройства народного хозяйства» [3, с. 701]. Пазней, у 1936 г., ён пісаў: «В истории нашего музейно-краеведческого строительства одно время (1930–1933) был весьма популярен лозунг: “С историей мы истории не сделаем”, когда от краеведческого музея требовали только показа советского строительства. В результате – богатейшие исторические коллекции выкидывались...» [3, с. 702].

На ІІІ Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі ў 1930 г. была агучана прапанова фарміравання новага тыпу краязнаўчага музея як «кафедры сацыялістычнага будаўніцтва». У новых раздзелах экспазіцый, якія рэпрэзентавалі сучаснасць (класавую барацьбу, узмацненне абароназдольнасці краіны, вытворча-тэхнічную прапаганду і г. д.), акцэнт быў зроблены на ілюстрацыйным і тэкставым матэрыяле, а не на аўтэнтычных прадметах. Прынятая ўслед на Усебеларускай нарадзе музейных работнікаў, што адбылася ў Мінску ў 1932 г., рэзалюцыя патрабавала перабудовы экспазіцый у адпаведнасці са зместам пастановы ЦК УКП(б) «Аб выкладанні грамадзянскай гісторыі ў школах СССР». Краязнаўчыя музеі ў максімальна кароткія тэрміны павінны былі стварыць новыя марксісцкія экспазіцыі, а ў хуткай перспектыве – перабудаваць сваю работу ў адпаведнасці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Аўтар аднаго з артыкулаў, які выйшаў у друк з назвай «За новы музей», сцвярджаў, што «музэй, як сховішча, як крама старажытных рэчаў павінен знікнуць, уступіць месца музэю-школе, масаваму універсітэту, дзе ў ногу з усёй савецкай грамадскасцю пачнецца змаганне за новае жыцьце, за новага чалавека» [1, с. 102]. А неўзабаве краязнаўчыя музеі сталі разглядацца толькі як сродак дзіцячага выхавання, своеасаблівы жывы наглядны дапаможнік, які спрашчае засваенне школьнай праграмы, і ўсё больш набывалі ілюстрацыйны характар. У тыпавым палажэнні аб краязнаўчым музеі 1939 г. ён вызначаўся як «навукова-даследчая і палітыка-асветная ўстанова, якая дае паказ у рэчах, дакументах і мастацкіх адлюстраваннях гістарычнага працэсу, развіцця прыроды і гістарычнага грамадства» [1, с. 142–143]. У канцы 1930-х гг. музейныя супрацоўнікі павінны былі не толькі вывучаць падзеі рэвалюцыі, працоўны рух і гэтак далей, але і садзейнічаць індустрыялізацыі краіны, што выяўлялася ў адпаведнасці структуры і зместу сацыяльна-эканамічных аддзелаў краязнаўчых музеяў плану пяцігодкі.

Праблема змястоўнасці экспазіцый краязнаўчых музеяў з моманту пераўтварэння іх у інструмент прапаганды знаходзіўся пад пільным наглядам улад, якія праз адпаведныя дакументы (пастановы, загады, інструк-

цыі і г. д.) рэгламентавалі, што, як і праз што адлюстроўваць у музеі. Вызначэнне методыкі пабудовы гістарычных экспазіцый пачалося ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Пасля Вялікай Айчыннай вайны краязнаўчыя музеі з вялікімі цяжкасцямі аднаўлялі свае экспазіцыі, пераадольваючы адсутнасць экспазіцыйных плошчаў і часта – фондавых збораў. У першыя пасляваенныя гады яны арганізоўвалі выстаўкі, прысвечаныя гераічнаму мінуламу беларускага народа, яго культуры, дзяржаўным і грамадскім дзеячам, стваралі, абнаўлялі і пашыралі аддзелы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У нейкай ступені музейнаму будаўніцтву ў той перыяд садзейнічала выканаўчая ўлада БССР, якая звяртала ўвагу толькі на неабходнасць паляпшэння экспазіцыйнай інтэрпрэтацыі падзей савецкай гісторыі. Нізкая якасць музейных экспазіцый, у першую чаргу прысвечаных гісторыі савецкага грамадства, якое «паказана ўбога і сумна, на плоскасным матэрыяле, у сувязі з чым значна прайграе ў параўнанні з папярэднімі грамадска-эканамічнымі фармацыямі» [2, с. 19–20], вымусіла вышэйшую выканаўчую ўладу БССР звярнуць увагу на неабходнасць паляпшэння экспазіцыйнай інтэрпрэтацыі падзей савецкай гісторыі.

У 1948 г. адбылася пашыраная сесія вучонага савета Навукова-даследчага інстытута краязнаўчай і музейнай работы, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі БССР. На сесіі было прынята «Палажэнне аб абласным, краёвым, рэспубліканскім (АССР) краязнаўчым музеі», у якім была замацавана аднолькавая для ўсіх музеяў структура. Асноўнымі былі аб'яўлены тры аддзелы – прыроды, дарэвалюцыйнага мінулага і савецкага перыяду. У апошнім выдзяляліся раздзелы гісторыі, сацыялістычнай гаспадаркі і культуры. Як бачна, адбылася канчатковая ўніфікацыя экспазіцыйнай структуры краязнаўчых музеяў. Галоўнай мэтай экспазіцыі тагачаснага музея была дэманстрацыя перавагі савецкага строю над капіталістычным. Побач з жыццём калгаса, вёскі, раёна, горада ўсебакова паказваліся дасягненні ў развіцці гаспадаркі вобласці, дзейнасць знакамітых людзей рэгіёна, іх стан да рэвалюцыі і пры савецкай уладзе.

У перыяд «адлігі» з яго дэмакратызацыяй жыцця ў краіне, новымі ідэалагічнымі задачамі і працэсам рэабілітацыі ахвяр рэпрэсій краязнаўчым музеям былі прад'яўлены новыя патрабаванні да зместу экспазіцый. На першы план у інтэрпрэтацыі гістарычных падзей, з'яў і працэсаў пачалі выходзіць народныя масы, таму ў экспазіцыях пачалі з'яўляцца тэмы, якія асвячалі не толькі ролю мас, але і значэнне асобы ў гісторыі, у сувязі з чым з небыцця пачалі вяртацца імёны ўдзельнікаў многіх падзей, а экспазіцыі дапоўнілі комплексы матэрыялаў аб іх.

У той жа час нягледзячы на вышэйадзначаныя паслабленні ідэйная скіраванасць тлумачэння гістарычных фактаў засталася. Краязнаўчыя музеі паранейшаму займаліся вывучэннем і рэпрэзентацыяй сучаснага этапу камуні-

стычнага будаўніцтва, кіруючай ролі КПСС, а таксама прапагандай пераваг сацыялізму, дасягненняў ва ўсіх галінах грамадскага жыцця з мэтай выхавання савецкіх людзей у духу савецкага патрыятызму і нацыянальнай годнасці.

Уся музейная дзейнасць і ў першую чаргу практыка экспазіцыйнага паказу кантралявалася зверху, адкуль прыходзілі нарматыўныя дакументы, якія рэгламентавалі, як будаваць экспазіцыі і што ў іх дэманстраваць. Аднойчы набыўшы гэты статус, краязнаўчыя музеі працягвалі быць важным інструментам ідэалагічнай работы: у іх экспазіцыях пераважала рэпрэзентацыя перыяду савецкага грамадства з усімі яго дасягненнямі і перавагамі, а вось паказ негатыўных з'яў тагачаснага жыцця не ўваходзіў у задачу музея. Уніфікацыя экспазіцый прывяла да сцірання рэгіянальных рыс і асаблівасцей.

Агульнае ўяўленне пра чалавека як пра «творцу гісторыі» і так званы «антрапалагічны паварот» 1980-х гг. актуалізавалі тэндэнцыю паказу ў музейных экспазіцыях матэрыялаў пра рэальных удзельнікаў гістарычных падзей, сучаснікаў тагачаснага грамадства, іх удзел у падзеях і ўчынкі, якія здатныя быць прыкладам. Гэта ўласцівасць экспазіцыйнага матэрыялу заключала ў сабе вялікі выхаваўчы патэнцыял. У экспанаванні выкарыстоўвалася некалькі прыёмаў: дэманстрацыя партрэта/фотапартрэта (самы распаўсюджаны), персанальнага экспазіцыйнага комплексу (комплекс асабістых рэчаў, дакументаў і/або прадметаў, якія характарызуюць яго грамадскую значнасць).

Такім чынам, у выпрацоўцы падыходаў да інтэрпрэтацыі і фарміраванні мадэлі рэпрэзентацыі рэчаіснасці ў айчынных краязнаўчых музеях можна вылучыць некалькі этапаў, абумоўленых тагачаснай сацыякультурнай сітуацыяй:

– на пачатковым этапе (канец XIX ст. – 1920-я гг.) музеі імкнуліся не толькі захаваць спадчыну продкаў, але і паказаць духоўнае багацце свайго краю і нават карэнныя змены, выкліканыя ўсталяваннем савецкай улады, трактаваліся як заканамерная перамога і станаўленне новага грамадства;

– 1930-я гг. вызначаюцца актывізацыяй ідэалагічнага ўціску; у тагачаснай мадэлі этап будаўніцтва сучаснага грамадства стаў значна пераўзыходзіць стагоддзі гістарычнага станаўлення рэгіёнаў;

– канец 1940-х – канец 1980-х гг. характарызуюцца ўзбуйненнем аб'екта экспазіцыйнай рэпрэзентацыі: на першы план выходзіць паказ дасягненняў народа-пераможца – ад хуткага пераадолення наступстваў вайны да дасягненняў у розных абласцях народнай гаспадаркі і развіцця тэхналогій, у тым ліку касмічных; такі абагулены падыход прывёў да сцірання рэгіянальных рыс у адлюстраванні развіцця тэрыторый і ўніфікацыі музейных экспазіцый.

У выніку гэтага ў традыцыйнай экспазіцыі краязнаўчага музея, што склалася гістарычна пад уплывам сацыякультурнай сітуацыі, час, які ахопліваў вялікі прамежак ад старажытнасці да пачатку XX ст., быў моцна сціснуты: рэпрэзентацыйны матэрыял па дасавецкай гісторыі займаў значна мен-

шую экспазіцыйную плошчу, чым адводзілася на размяшчэнне экспанатаў па сучаснай гісторыі. У паказе класавай барацьбы і рэвалюцый падзейны пласт пашыраўся, а музейны час расцягваўся, дасягаючы максімуму ў раздзеле пасляваеннага сацыялістычнага будаўніцтва. Нягледзячы на гэта гістарычны час уяўляўся як аднанакіраваная паслядоўная змена падзей і з'яў, а экспазіцыя краязнаўчага музея – як ілюстрацыя падручніка па гісторыі. Такую мадэль рэчаіснасці, якая характарызуецца лінейнасцю часу і дэтэрмінаванай ім паслядоўнасцю структурных элементаў музейнай прасторы (тэматычных комплексаў), аўтар вызначае як «наратыўна-ілюстрацыйную» мадэль. Яна была характэрна для ўсіх краязнаўчых музеяў, структуры экспазіцый, тэматычная скіраванасць якіх была ўніфікаваная. Праблема зместу экспазіцый гістарычных аддзелаў у краязнаўчых музеях стала ўвайшла ў музеязнаўчы дыскурс ужо ў сярэдзіне 1980-х гг. Дэтэрмінаваная зменамі ў сацыякультурнай сітуацыі ў краіне, у музейнай рэпрэзентацыі рэчаіснасці абазначылася новая тэндэнцыя, што стала падмуркам прынцыпова адрознай мадэлі, якой краязнаўчыя музеі Беларусі прытрымліваюцца і сёння.

ЛІТАРАТУРА

1. **Гужалоўскі, А. А.** Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 176 с.

2. **Гужалоўскі, А. А.** Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004. – 218 с.

3. **Музееведческая** мысль в России XVIII–XX веков : сб. документов и материалов / отв. ред. Э. А. Шулепова. – Москва : Этерна, 2010. – 960 с.

4. **Размустова, Т. О.** Местный музей: Эволюция взглядов и динамика моделей / Т. О. Размустова // Российская провинция XVIII–XX веков : реалии культурной жизни : материалы III Всероссийской научной конференции, Пенза, 25–29 июля 1995 г. – Пенза : [б. и.], 1996. – С. 140–145.

5. **Романов, Н. И.** Местные музеи и как их устраивать / Н. И. Романов. – Москва : [Ком. по охране художественных сокровищ], 1919. – 110 с.

Давидовская О.Н. *(г. Витебск)*

ВИТЕБСК В ИЮНЕ 1944 г. НА ФОТОГРАФИЯХ МИХАИЛА САВИНА (по материалам Витебского областного краеведческого музея)

26 июня 1944 г. в ходе Витебско-Оршанской операции Витебск был освобожден от немецко-фашистских захватчиков войсками 43-й и 6-й гвардейских армий 1-го Прибалтийского фронта и 39-й и 5-й армий 3-го Белорусско-

го фронта. Особенно отличилась в ходе боев 158-я стрелковая дивизия 84-го корпуса 39-й армии.

Непосредственно бои за город шли около полутора суток: начались на исходе дня 24 июня на восточной окраине Витебска, а утром 26 июня населенный пункт был освобожден.

В составе воинских частей, освобождавших Витебск, были и военные фотокорреспонденты, снимавшие город в день освобождения и в первые дни после окончания немецко-фашистской оккупации. Авторы снимков – Леонид Великжанин, Яков Рюмкин, Анатолий Григорьев, Михаил Савин и др. Часть выполненных ими фотографий хранится в фондах Витебского областного краеведческого музея (ВОКМ).

Михаил Иванович Савин (1915–2006) находился на фронте с июня 1941 г. и до конца войны. Он родился в селе Сасово Тамбовской губернии (ныне город в Рязанской области). После окончания школы переехал в Москву, работал токарем на заводе. В 1937–1939 гг. служил в рядах Красной армии. В это время заочно окончил двухгодичные курсы фотокорреспондентов при «Фотохронике ТАСС». В 1940 г. был направлен в Минск собственным фотокорреспондентом ТАСС по Беларуси.

В годы Великой Отечественной войны Савин был фотокорреспондентом «Красноармейской правды» – газеты Белорусского военного округа (позднее – Западного фронта, 3-го Белорусского фронта). После войны почти полвека работал фотографом в журнале «Огонек», жил в Москве.

В музейной коллекции на сегодняшний день хранится 48 фотографий и 17 негативов М. Савина с видами Витебска в июне 1944 г. Они поступили в музей в разное время. 19 фотографий и негативы были приобретены у фотографа в 1962 г., 26 снимков – в 1990 г. Три снимка М. Савина передал в музей в 1964 г. другой военный корреспондент Василий Аркашев.

Формат снимков разный: наименьший размер – 11,5х17,5 см, наибольший – 40х60 см. В комплекс входят портретные, пейзажные и жанровые снимки.

Все фотографии сделаны с оригинальных негативов автора. Условно их можно разделить на три группы в соответствии с тематикой и хронологией: 1) окончание боевых действий по освобождению Витебска; 2) город в день освобождения 26 июня 1944 г.; 3) Витебск в первые дни мирной жизни (конец июня 1944 г.).

К ***первой группе*** можно отнести три фотографии с изображением советских воинов, запечатленных бегущими по улицам города во время наступления. Присутствующие на снимках полуразрушенные каменные и деревянные здания не позволяют определить место фотографирования. Можно предположить, что эти кадры сделаны где-то на окраине Витебска.

Вторая группа снимков – самая многочисленная. Большинство их автор сделал 26 июня в центре города – на улицах Замковой и Калинина, на пл. Свободы, в начале современного пр-та Фрунзе, в районе современной

пл. Тысячелетия, на территории бывшего Могилевского рынка (район современного парка Победителей ближе к пл. Победы). Освобожденный Витебск мало чем отличался от других белорусских городов, оккупированных немецко-фашистскими захватчиками. Разрушенные каменные дома, груды кирпичей, обломки сооружений, храмы без башен и куполов, заграждения с колючей проволокой, указатели и вывески на немецком языке… Эти кадры дополняют и иллюстрируют данные официальной статистики о 93% разрушенного жилого фонда. Символично в этом плане выглядит снимок с изображением полностью разрушенного здания, от которого осталась только лестница («Лестница в рай») (Дадатак 15, фота 1).

В объектив фотоаппарата попали некоторые витебские храмы. На двух снимках запечатлена Духовская церковь (вид со стороны оврага; храм не сохранился). На нескольких фотографиях с разных ракурсов видна Благовещенская церковь в общей панораме застройки. М. Савин запечатлел и крупнейший православный храм Витебска – Николаевский собор, находившийся на пл. Свободы. Он попал в кадр с изображением военнослужащих Красной армии, передвигающихся по ул. Замковой.

На пл. Свободы фотограф сделал снимок, опубликованный во многих научно-популярных изданиях и являющийся на сегодняшний день хрестоматийным, – «Фотокорреспонденты “Красноармейской правды”»: Н.А. Баканов, А.А. Зеленцов и А.Т. Твардовский». Коллеги М. Савина стоят на фоне здания бывшего окружного суда (ныне Художественный музей) возле столба с немецкими указателями (Дадатак 15, фота 2).

На нескольких фотографиях запечатлены важные стратегические городские объекты – Двинский и Новый мосты (современные Кировский мост и мост им. Блохина). Первый был полностью разрушен в ходе наступательной операции 1944 г., восстановлен в 1955 г. Второй был заминирован немцами при отступлении, но спасен от взрыва группой бойцов саперного взвода 875-го стрелкового полка 158-й дивизии под командованием ст. сержанта Ф.Т. Блохина, что сыграло большую роль в организации стремительного захвата города наступающими частями Красной армии.

В ***третью группу*** можно объединить фотографии, сделанные в Витебске и окрестностях в последних числах июня. В те дни через город прошло большое количество войск Красной армии, направлявшихся на запад. Сориентироваться на перекрестках, улицах города им помогали регулировщики. Первым из них, судя по аннотации на одном из снимков М. Савина, был рядовой Быков. Фотография с его изображением сделана в начале ул. Фрунзе.

Еще один известный снимок – «Начальник гарнизона Колосов знакомит жителей освобожденного Витебска с последними новостями на фронте» – сделан в районе нынешней пл. Тысячелетия недалеко от здания педагогического института (разрушенного в начале 1970-х гг.). По информации газеты «Віцебскі рабочы», в день освобождения в Витебске насчитывалось 118 че-

ловек. В последующие дни, недели количество жителей увеличивалось. Они активно включались в работы по восстановлению города, участвовали в расчистке руин, строительных работах, разминированию зданий, сооружений, улиц, площадей города. Большую помощь в этом оказали военнослужащие. На нескольких снимках М. Савина запечатлены саперы, работающие в начале совр. проспекта Фрунзе и в районе современной пл. Победы. Благодаря аннотациям на фотографиях мы знаем имя одного из них. Это кавалер ордена Славы Н. Маралов. В кадр с его участием попала разрушенная водонапорная башня – техническое сооружение довоенного Витебска, не восстановленное после освобождения (Дадатак 15, фота 3).

М. Савин, как и другие военные корреспонденты, запечатлел колонны военнослужащих немецкой армии, взятых в плен под Витебском, а также разбитую немецкую технику. На одном из снимков – группа военнопленных, идущая по проселочной дороге под Витебском (?), на другом – выведенный из строя немецкий танк.

Фотографии М. Савина имеют историческую, культурную, краеведческую ценность, постоянно используются в экспозиционной, научно-исследовательской, просветительской работе музея.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Витебский** областной краеведческий музей (ВОКМ). – КП 013793/01 – 19.
2. **ВОКМ.** – КП 014523 – 014525.
3. **ВОКМ.** – НВ 009116/01 – 26.
4. **ВОКМ.** – НВ 007711. Дневник восстановления города Витебска.
5. **Подлипский, А. М.** Партизанский парад в Витебске / А. М. Подлипский. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2013. – 64 с.

Ерашэвіч А.У. *(г. Мінск)*

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКА Ў 1840–1850-я гг.: АРГАНІЗАЦЫЙНА-ФІНАНСАВЫЯ АСПЕКТЫ

З 1840 г. тэатр размяшчаўся ў асобным флігелі пры губернатарскім доме. Але сістэматычныя тэатральныя пастаноўкі ў Віцебску пачаліся пасля адкрыцця ў ім 23.12.1845 г. пастаяннага драўлянага прасторавага адстроенага будынка гарадскога тэатра (архітэктар П. Чарвінскі) на месцы падворка мужчынскай гімназіі. Спецыяльна пабудаваны трох'ярусны будынак з залай прызначаўся для паказу драматычных спектакляў і балетаў. Для размяшчэння гледачоў на ніжнім паверсе (бенуары) было 12 ложаў (кожная на 5 асоб), на сярэднім (бельэтажы) – 13 ложаў, на верхнім – прасторная га-

лерэя і партэр на 100 крэслаў і лавак [9, с. 20, 136]. Глядзельная зала тэатра была разлічана на 250 чал. [1, с. 60]. У 1846 г. у парку (з 1849 г. пад назвай «Тиволи») быў пастаўлены так званы ваксал. У гэтым драўляным будынку летам арганізоўвалі відовішчы мясцовыя аматары і гастрольныя тэатральныя трупы.

Прыход тэатра ў Віцебску за дадзены на працягу 8 тыдняў з 23.12.1845 г. да 18.02.1846 г. 21 паказ п'ес і балетаў склаў, пасля выплаты выдаткаў за кожны спектакль, суму ў 2671,25 руб., выдатак – 858,73 руб. (32,2%), рэштак – 1812,51 руб. (67,8%) [3, арк. 2–5]. Дадаткова 90 руб. было выдаткавана вознiку за перавоз рэквізіту з Магілёва ў Віцебск, 200 руб. было адпушчана для найму тэатра і 50 руб. пайшло для пастаноўкі новага балета. Прыбыткі з розных вечароў былі розныя: большы ў 150,54 руб. у дзень адкрыцця тэатра, калі гледачы цалкам запоўнілі памяшканне, ад 154,17 руб. 3.01.1846 г. да 16,35 руб. 14.02.1846 г. [3, арк. 2–5; 1, с. 61]. Акрамя таго, на тэатральныя пабудовы віцебскі паліцмайстар узяў у пазыку з доўгу 637,11 руб., з якіх было выплачана 255,6 руб., а засталося 381,51 руб. [3, арк. 13, 14].

Снежаньскі цыркуляр 1846 г. віцебскага генерал-губернатара на імя віцебскага паліцмайстра прадпісваў апошняму даносіць аб кожнай прыбыўшай у горад трупе акцёраў, «вольтежеров» ці іншых артыстаў з дадаткам звестак аб паказах за кожны тыдзень і далучэннем у двух экзэмплярах выпушчаных імі друкаваных ці рукапісных афішак і пасведчанняў, што ўсе п'есы ўхвалены цэнзурай. Драматычныя творы, якія не былі разгледжаныя цэнзурай, павінны былі дастаўляцца да генерал-губернатара для наступнай перасылкі ў 3-е аддзяленне ўласнай я. і. в. канцылярыі, адпаведна цыркулярнага прадпісання міністра ўнутраных спраў начальнікам губерняў ад 9.11.1842 г. [4, арк. 1].

Са зместу тэатральных афіш 1847 г. магчыма скласці ўяўленне аб кошце розных месцаў для гледачоў у тэатры. За пастаноўку В. фон Шмідкофам 04.01.1847 г. камічнай оперы Эжэна Скрыба «Акцыон ці сіцыліянская зайздрасць» і оперы-буфа «Гусар Чараўнік» за магчымасць сядзець у верхняй ложы плацілі па 5 руб., у ніжняй ложы – па 4 руб., у крэсле першых 4 радоў – па 1,5 руб., у іншых – па 1 руб., у амфітэатры – па 40 кап., у галерэі – па 30 кап. (розніца коштаў больш чым у 16 разоў). За дадзеную 12.01.1847 г. артыстамі В. фон Шмідкофа оперу «Фра-Дыявола ці гасцініца ў Тэрачыне» наведвальнікі плацілі тыя ж стаўкі збораў за месцы: за верхнюю ложу 5 руб., за ніжнюю – 4 руб., за крэсла першых 4 радоў – 1,5 руб., іншых радоў – 1 руб., за партэр – 75 кап., за амфітэатр – 40 кап., за галерэю – 30 кап. (розніца коштаў больш чым у 16 разоў). 30.03.1847 г. адбыўся паказ оперы «Марскі разбойнік ці мармуровая нявеста», за прагляд якой размешчаныя ў верхняй ложы гледачы плацілі па 4 руб., у ніжняй ложы – па 3 руб., у крэслах першых 12 радоў – па 1,5 руб., у іншых радах – па 1 руб., у партэры – па 75 кап., у амфітэатры – па 30 кап., у галерэі – па 15 кап. (розніца коштаў больш чым у

26 разоў). Тыя ж аклады збіралі з месцаў за паказ 10.01.1847 г. рамантычнакамічнай оперы «Царства духаў альпійскіх і вораг людзей», за відовішча вялікай оперы-буфа Скрыба «Любоўны напой», за дэманстрацыю 13.01.1847 г. оперы «Аліна царыца Галконды». У 19 гадзін 15.01.1847 г. пачалася пастаноўка оперы-буфа Бамаршэ «Севільскі цырульнік», а 18.01.1847 г. – оперы «Фрэйшыц – чароўны стралок» за тыя ж вышэйназваныя нормы збораў за розныя тыпы месцаў для гледачоў. Паказ 13.04.1847 г. камічнай п'есы «Барын на скорую руку ці ігрок і магільшчык», а 20.04.1847 г. трагедыі У. Шэкспіра «Атэла і венецыянскі маўр» суправаджаліся тым, што за наведванне ложы бельэтажа бралі 3 руб., бенуара – 2 руб., за крэсла першых радоў – 1 руб., іншых радоў – 75 кап., амфітэатра – 20 кап., галерэі – 15 кап. (розніца коштаў у 20 разоў). Кошт абанементаў за розныя месцы таксама значна вагаўся, але ўсё ж такі быў значна адносна меншым за квіткі: за паказ 15 публічных відовішчаў гледачы плацілі за наведванне ложы бельэтажа ад 4 руб. да 60 кап., бенуара – ад 3 руб. да 45 кап., за крэсла першых 4 радоў – ад 1 руб. да 15 кап. (розніца коштаў 6,6 раза) [4, арк. 11, 12, 13, 14, 19, 20, 21, 22, 33, 35, 73–76, 92–93, 94–95, 231, 232].

Тэатральныя даходы ў Віцебску наўпрост залежалі ад папулярнасці ў гледачоў паказаных акцёрамі п'ес, часу іх дэманстрацыі (прэм'еры былі, як правіла, больш прыбытковымі). Наведвальнасць спектакляў пасля прэм'ерных паказаў, як правіла, змяншалася. Пасля першага паказу 18.01.1847 г. «Вольнага стралка» прыбытак ад «Першага кахання» Скрыбы і «Марскога закону» Кацэбу, якія былі паказаныя 31.01.1847 г., дасягнулі толькі 15,9 руб. [4, арк. 46, 71 адв.]. У асноўным за відовішча збіралі больш за 100, але менш за 200 руб. За паказ 29.12.1846 г. «Фра-Дыявола» сабралі 169,4 руб., за дэманстрацыю 2.01.1847 г. «Севільскага цырульніка» – 167 руб. (15.01.1847 г. – 115,15 руб., 3.02.1847 г. – ужо 67,45 руб.), за арганізацыю 16.02.1847 г. канцэрта – 90,9 руб. Разам з 29.12.1846 па 16.02.1847 г. ад 18 спектакляў і канцэртаў мелі 1869,6 руб. выручкі, з улікам 3 бенефісаў – 2207,6 руб., за кошт абанемента – 900 руб., разам 3107,6 руб. [4, арк. 46].

Збор з кожнага спектакля складаў 3 руб. [6, арк. 3]. Віцебскі паліцмайстар пісаў 14.12.1851 г. віцебскаму генерал-губернатару, што ў мясцовым тэатры за 13 спектакляў з дырэктара тэатра К.В. Фядзецкага было спагнана 39 руб. Ён жа даносіў 24.04.1853 г., што ў чацвер 21.04.1853 г., у панядзелак – сераду 20–22.04.1853 г. тэатральныя відовішчы далі 32 руб. грашовага збору [6, арк. 4, 9]. Прафесар фізікі і механікі Тобіас Квальярдзі, які прыбыў з Рыма, а да гэтага выступаў у Маскве, Пецярбургу і іншых еўрапейскіх сталіцах, даў відовішча па прыкладзе «пінеці» альбо вопыту натуральнай магіі. За ўваход у ложу бельэтажа трэба было заплаціць 4 руб., у ложу партэра – 3 руб., за крэсла першых радоў – 1 руб, апошніх – 75 кап., за партэр – 50 кап., галёрку – 25 кап. [6, арк. 10, 11]. З гэтых даных відаць, што кошт месцаў прагляду адрозніваўся ў 16 разоў.

Увагу гледачоў Віцебска ў 1846–1847 гг. прыцягнулі пастаноўкі трупы прускага падданага Вільгельма фон Шмідтгофа (Шмідкофа, Шмідгофа). Віцебскі паліцмайстар дакладваў 10.12.1846 г. віцебскаму генерал-губернатару, што аматары тэатра пажадалі «абаніраваць» па падпісцы на суму ў 765 руб. ложы і крэслы для оперных відовішчаў пад дырэкцыяй гэтага трымальніка [2, арк. 1]. Не маючы магчымасці пакінуць Магілёў з-за таго, што антрэпрэнёр не выплаціў сваіх даўгоў купцу Меяровічу, паручыцель выдаў яму 350 руб. ад магілёўскага грамадзянскага губернатара Гамалеі [2, арк. 4, 10, 11, 13]. Прыбытак ад спектакля 29.12.1846 г. трупы В. фон Шмідкофа склаў 169,4 руб., не ўлічваючы сумы за абанемент [4, арк. 46]. Арганізаваны ім бенефіс 7.01.1847 г. даў 117,73 руб. даходу, 24.01.1847 г. – 200,55 руб., а 29.01.1847 г. – толькі 19,72 руб. [4, арк. 40, 46]. Агульны даход антрэпрызы В. фон Шмідкофа склаў каля 3500 руб., у тым ліку 900 руб. ад продажу абанементаў.

Сфарміраваная Якавам Чаховічам трупа драматычных акцёраў з 6 мужчын і 5 жанчын [5, арк. 5] мела 13.04.1847 г. даход ад 2 відовішчаў у памеры 80 руб., за паказаныя ў пачатку 19-й гадзіны 16.01.1849 г. 2 п'ес – 70 руб. (польская камедыя Каржанеўскага «Стары муж» і камедыя-вадэвіль на рускай мове ў перакладзе з французскай «Дзве жанчыны супраць аднаго мужчыны» [4, арк. 91, 94]. За пастаноўку 23.01.1849 г. камедыі-вадэвіля на польскай мове «Бедны рыбак» і камедыі на рускай мове «Дачка яго благароддзя», камедыі-оперы «Перерезанные ассигнации или актеры в провинции» за ложу бельэтажа давалі 3 руб., за бенуар – 2 руб., за крэсла першых радоў – 1 руб., апошніх радоў – 75 кап., за амфітэатр – 30 кап., за галерэю – 20 кап. (розніца коштаў у 15 разоў). За 09–14.10.1849 г. Я. Чаховіч меў ад 2 спектакляў 65 руб. даходу. За пастаноўку відовішчаў з 25.01. па 01.02.1849 г. Я. Чаховіч атрымаў увогуле 339 руб. [5, арк. 1, 1а, 1б, 6, 12 адв. – 17].

З дазволу віцебскага генерал-губернатара ў чэрвені 1849 г. з Магілёва ў Віцебск пераехала трупа рускіх акцёраў М. Дудчанкова, якая гастралявала ў горадзе да сакавіка 1850 г. Агульны даход ад 11 паказаў з 9.01. па 14.02.1849 г. склаў 921,9 руб., выдаткі – 356,56 руб., чысты прыбытак – 565,34 руб. (61,3%), з якога паводле дамовы 10% сумы пералічвалі на карысць тэатра [5, арк. 16 – 16 адв.]. За дэманстрацыю спектаклей 04.12.1849 г. яна мела 48 руб. даходу, 08.12.1849 г. – 74 руб., 11.12.1849 г. – 28 руб. (пастаноўка на рускай і маларасійскай (украінскай) мовах), 15.12.1849 г. – 27 руб., 18.12.1849 г. – 30 руб., 21.12.1849 г. – 35 руб. [5, арк. 121–122, 123, 124–126, 127, 140, 142]. 14.07.1849 г. трупа М. Дудчанкова паставіла меладраму ў 3 аддзяленнях «Людміла ці Смаляне ў 1812 г.». Кошт месцаў складаў: за ложу бельэтажа – 3 руб., за бенуар – 2 руб., за крэсла першых 3-х радоў – 1 руб., астатніх радоў – 75 кап., за партэр – 50 кап., за галерэю – 20 кап. (розніца коштаў у 15 разоў). Яна ж упершыню ў жніўні 1849 г. паказала чароўна-камічную оперу «Дняпроўская русалка». За яе прагляд у ложы бельэтажа трэба было выкласць 4 руб., у бенуары – 3 руб., у крэслах першых 3-х радоў – 1,5 руб., астатніх радоў –

1 руб., у партэры – 50 кап., у галерэі – 30 кап. (розніца коштаў больш чым у 13 разоў) [7, арк. 193 адв. – 194, 229 адв. – 229 а]. Згодна са справаздачай віцебскага паліцмайстара ад 15.10.1853 г. відовішча рускай драматычнай трупы дало 20 руб. грашовага збору, з якіх было атрымана на карысць тэатра 10%, альбо 2 руб. [6, арк. 14].

Заўважым, што ў цэлым п'есы рускіх акцёраў не карысталіся асаблівай папулярнасцю сярод віцебскай публікі. Генерал-губернатар А. Галіцын тлумачыў няўдачу рускіх п'ес тым, што амаль усе мясцовыя памешчыкі польскага паходжання ў большасці прыхільна ставіліся да польскай тэатральнай культуры. У Віцебску не было пастаяннай тэатральнай трупы, а прыезджыя артысты ставілі ў асноўным толькі польскія п'есы, таму што мала ведалі рускую мову. Для распаўсюджвання ўжывання рускай мовы ўлады планавалі ў 1847 г. па прыкладзе Кіева і Вільні заснаваць у Віцебску пастаянны рускі гарадскі тэатр з асігнаваннем на гэтую патрэбу сумы ад урада. Але паведамленне міністра ўнутраных спраў Л.А. Пяроўскага засведчыла немагчымасць выдзялення казённай сумы. Па ўзоры Вільні і Кіева раілі скарыстацца крыніцай фінансавання за кошт гарадскіх даходаў і выдачай пасведчанняў з боку генерал-губернатара аб палітычнай добранадзейнасці трымальнікаў труп. Для ўтрымання пастаяннай рускай трупы і дзеля арганізацыі спектакляў у Віцебску віцебскі грамадзянскі губернатар А. Радзішчаў паабяцаў віцебскаму генерал-губернатару А. Галіцыну накіроўваць каля 3 тыс. руб. у год з агульнага земскага збору Віцебскай губерні, але сума выплочвалася не адразу [8, арк. 1–2, 4].

Розныя грамадскія забавы ў Віцебску падтрымлівала жонка віцебскага генерал-губернатара. Так, вядома, што княгіня С. П. Галіцына ўручала білет на дабрачынны канцэрт, спектакль, латэрэю з платай за ложу ад 25 да 100 руб., а за крэсла ў партэры – 25 руб. [9, с. 22]. 30.07.1849 г. В. фон Шмідкоф разам з дзецьмі Максімам і Саламеяй і з сям'ёй цірольцаў Фішараў у зале «Цівалі» арганізаваў вялікую забаву (divertissement) з музыкай, спевамі і танцамі ў касцюмах. Кошт за першае месца ў крэслах складаў 50 кап., за другое – 25 кап., а з дзяцей бралі палову сумы дарослых [7, арк. 219].

За кошт асноўных даходаў ад публічных відовішчаў утрымліваліся акцёры. Але пэўная частка прыбыткаў адпускалася і на розныя гаспадарчыя аднаразовыя патрэбы. Так, за ачыстку прыбіральняў і комінаў у тэатральным доме з 1850 па 01.06.1852 г. было выдаткавана 50 руб. Рахунак ад 20.10.1851 г. засведчыў, што паслугі губернскага архітэктара, накіраванага для выпраўлення тэатра, каштавалі 55,75 руб. Дырэктар трупы акцёраў К.В. Фядзецкі ў запісцы ад 03.12.1851 г. да віцебскага генерал-губернатара падкрэсліў, што часовы тэатральны буфет не задавальняў жаданне публікі. Харчовыя прадукты ў ім былі надзвычай дарагія і не для ўсіх даступныя. З прычыны гэтага многія асобы зусім не жадалі наведваць тэатр. Панесеныя страты падвялі яго да думкі аб дазволе здаць буфет у арэнду іншаму трымальніку. За

гэтую ўмову ён абавязваўся плаціць на карысць тэатра штомесячна 15 руб. [6, арк. 1, 2, 13]. У 1860 г. у Віцебску частка даходаў пайшла на аднаўленне памяшкання і прыналежнасцей гарадскога тэатра, але большая частка выдаткоўвалася на карысць немаёмных.

Такім чынам, вандруючыя камерцыйныя тэатральныя трупы ў Віцебску ў 1840–1850-я гг. фінансаваліся ў асноўным за кошт збораў з наведвальнікаў. Кошт білетаў за магчымыя месцы прагляду тэатральных відовішчаў быў значным, адрозніваўся ад 13 да 26 разоў і быў разлічаны на розныя катэгорыі гледачоў. Наведвальнасць спектакляў залежала ад іх папулярнасці сярод гледачоў, прыярытэтнасці і часу паказу. Прафесіяналізм акцёраў забяспечваў вандруючым тэатральным трупам атрыманне 61–68% чыстага прыбытку ад агульнага даходу за дэманстрацыю публічных відовішчаў.

ЛІТАРАТУРА

1. **Ендрыхоўскі, З.** Тэатральнае жыццё Віцебска ў 1845–1849 гг. / З. Ендрыхоўскі ; пер. з польск. Л. Хмяльніцкай // Віцебскі сшытак. – 1997. – № 3. – С. 60–70.

2. **Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 16793.

3. **НГАБ.** – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 17104.

4. **НГАБ.** – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 17415.

5. **НГАБ.** – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 20432.

6. **НГАБ.** – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 22948.

7. **НГАБ.** – Ф. 1416. Воп. 6. Спр. 61.

8. **НГАБ.** – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 13132.

9. **Никифоровский, Н. Я.** Странички из недавней старины города Витебска. Воспоминания старожила / Н. Я. Никифоровский. – Минск : Полымя, 1995. – 149 с.

Жуковский В.В. *(г. Орша)*

ОРШЕВЕДЕНИЕ В УЧЕБНО-ВОСПИТАТЕЛЬНОМ ПРОЦЕССЕ

Краеведение как народное знание о своих родных местах зародилось в далеком прошлом.

У всех народов мира, во все времена были люди, хорошо знавшие окружающую их местность, ее природу, прошлое и современную жизнь. Свои знания устно или в различных документах они передавали последующим поколениям.

В процессе развития краеведение, направленное на всестороннее изучение различных территорий страны, расширялось и углублялось вместе с развитием науки. Оно опирается на массовое самодеятельное движение краеведов-любителей.

Важную роль в развитии школьного краеведения сыграл знаменитый русский педагог К.Д. Ушинский, который в ряде своих работ теоретически обосновал «родиноведческий принцип» в обучении, показал большое воспитательное и образовательное значение изучения своего края.

Формы краеведческой работы разнообразны: объединения по интересам и факультативы, экскурсии и туристские походы, встречи с местными краеведами, конкурсы, олимпиады и т. д. Все большее значение приобретает поисковая и исследовательская деятельность.

Школьное краеведение – важный фактор идейно-политического, нравственного, трудового, эстетического, экологического и физического воспитания учащихся, оно способствует патриотическому воспитанию, общему и политехническому образованию, расширяет кругозор и развивает познавательные интересы учащихся, приобщает к творческой деятельности, формирует практические и интеллектуальные умения, помогает в выборе профессии.

Объектами краеведения является природа, население и хозяйство, историческое прошлое, искусство и культура. Все это объекты разных наук, и, следовательно, при их изучении используются разные методы, присущие соответствующим областям знания. У всех направлений краеведческой деятельности имеется общий предмет изучения – край. Понятие «край» – условное и зависит от того, кто и с какой целью его изучает. Для школы край, как правило, район, сведения о котором могут быть использованы как местный материал. Это может быть окрестность школы или город и даже целый район и область.

Для учащихся города Орши и Оршанского района таким объектом изучения является Оршанщина в пределах своего административного района. Имеется и специальный курс «Оршеведение», который школьники изучают с 1999 г.

Благодаря оршанским краеведам, издано учебное пособие «Мой родны край – Аршаншчына», которое используется в настоящее время как хрестоматия. Два издания выдержало учебное пособие «Оршеведение», которое есть во всех оршанских школах в достаточном количестве. Оно уже требует переиздания, так как многие цифры за 12 лет со времени издания устарели, а кроме того, открылись новые факты, которые необходимо добавить. Наличие учебника обеспечивает усвоение знаний и организует самостоятельную учебную деятельность учащихся. Он помогает учителю организовать разнообразную познавательную деятельность учащихся, ориентирует их на самостоятельное добывание знаний, развитие творчества и приобретение навыков самостоятельного учебного труда, сочетая при этом общеучебные умения с оршеведческими, нацеливает их на практическое применение полученных оршеведческих знаний и умений. В учебнике представлены разнообразные задания, которые можно использовать не только для контроля за усвоением оршеведческих знаний, но и для обобщения их, а также в качестве

познавательной задачи при изучении нового материала. Проверить понимание содержания текста позволяют многочисленные вопросы и задания учебника различного уровня сложности.

Символическими тиражами изданы контурные карты, тетрадь для практических и индивидуальных работ, тесты, кроссворды, ребусы, материалы видных оршанских краеведов с полным списком их работ и многое другое. Не забыты и межпредметные связи. Изданы диктанты на оршеведческие темы по русскому и белорусскому языках, отдельные темы курса «Оршеведение» на английском и немецком языках, рыбы реки Днепр и виды деревьев Оршанщины. Готовятся к изданию и другие пособия.

ГУДО «Оршанский районный центр физической культуры, туризма и краеведения детей и молодежи» располагает электронными носителями всех этих изданий и многими другими разработками, а также материалами многочисленных оршеведческих конкурсов, которые могут брать все учителя и даже все желающие для практической работы и просто для ознакомления.

Однако существует одно препятствие, которое уже много лет невозможно решить. Занятия по интересам и факультативы по курсу «Оршеведение» посещает ограниченное количество школьников и никак не получается охватить, например, всю параллель 6-го или 7-го классов. Назрела необходимость преподавать курс «Оршеведение» в качестве равноправного школьного предмета, но из-за якобы перегрузки школьников достичь этого никак не получается.

Тем временем в Москве «Московедение» уже десятки лет преподается в качестве предмета и все нормально.

В настоящее время в нашей стране повышенное внимание уделяется патриотической работе. В связи с этим хочется надеяться, что и курс «Оршеведение» будет внесен в школьное расписание и будет преподаваться как школьный предмет, а аналогичные краеведческие курсы по всей стране станут востребованными.

Короткевич А.В. *(г. Гомель)*

АКТУАЛЬНОСТЬ ПРОДВИЖЕНИЯ КРАЕВЕДЧЕСКОЙ ИНФОРМАЦИИ: НА ПРИМЕРЕ СОЗДАНИЯ ЭЛЕКТРОННОЙ БАЗЫ ДАННЫХ «ГОМЕЛЬСКИЙ РЕГИОН: ИСТОРИЯ ГАЗЕТНОЙ СТРОКОЙ»

Краеведческие информационные ресурсы заключают в себе огромный потенциал для развития региона, обеспечивая информационную основу научной, производственной, образовательной и других видов деятельности, так или иначе связанных с данным краем; позволяют сохранять и передавать

из поколения в поколение богатое культурное наследие отдельных регионов: научные достижения, произведения художественного творчества, традиции, обычаи, обряды; способствуют производству новых культурных ресурсов; обеспечивают устойчивость и продвижение региона в сообществе. Данные ресурсы являются своеобразным генетическим кодом национальной среды и сохраняют ее идентичность. Их использование – неотъемлемый атрибут любой деятельности на региональном уровне, поэтому они выступают не только продуктом духовно-практической деятельности, но и одним из определяющих факторов формирования региональных брендов [4].

Особо важная роль в их формировании принадлежит главным держателям информации – местным библиотекам, архивам и музеям, которые обладают уникальными сведениями и являются центрами сосредоточения знаний о крае, главными территориальными хранилищами документного культурно-исторического наследия.

Обеспечение доступности, оперативности и полноты информационных краеведческих ресурсов в своем регионе и за его пределами – одна из важнейших задач этих учреждений. Таким образом, данные культурно-информационные центры вносят огромный вклад в формирование региональных брендов [1].

Деятельность современной библиотеки, в том числе и в области библиотечного краеведения, уже немыслима без использования новых информационных систем, позволяющих облегчить доступ читателей к необходимой им краеведческой информации. Компьютерные технологии позволяют большему числу абонентов иметь доступ к краеведческой информации, использовать данные ресурсы с наибольшей полнотой и удобством. Продуктом взаимодействия информационных технологий и краеведческой деятельности библиотек стало создание электронных краеведческих ресурсов [3]. Гомельская областная библиотека следует мировым тенденциям и формирует собственные уникальные краеведческие полнотекстовые базы данных.

У чэрвені 1939 г. тэатр упершыню выехаў на гастролі ва Украіну: спачатку ў Днепрапятроўск, а потым у Кіеў; у 1940 г. трупа адпраўляецца ў горад Беласток, а ў маі 1940 г. працягвае гастролі ў Мінску. Выступы ва ўсіх гарадах прайшлі паспяхова. У чэрвені 1940 г. у Маскве адбылася дэкада беларускага мастацтва і літаратуры, на якую ў якасці гасцей была запрошана група стваральнікаў Другога беларускага дзяржаўнага тэатра, у складзе якой быў і Ц.М. Сяргейчык [2, л. 71, 74, 79].

У 1941 г. у БДТ-2 адбыўся закрыты паказ «Несцеркі», пасля чаго тэатр накіраваўся ў вялікае чатырохмесячнае падарожжа. Планавалася наведаць Карэла-Фінскую рэспубліку, адтуль паехаць ва Украіну, а потым працягнуць гастролі ў Беларусі. Аднак шырокі глядач г. Віцебска так і не ўбачыў прэм'еры «Несцеркі», бо 4 ліпеня 1941 г. тэатр разам з акцёрамі быў эвакуіраваны ў г. Уральск, а потым у Арэхава-Зуева. За гады вайны калектыў тэатра даў больш за 600 канцэртаў для воінаў Савецкай арміі [2, л.105; 4, л. 4].

У 1944 г. тэатр вярнуўся ў разрабаваны і спустошаны Віцебск: «…замест вакзала – пустое месца. Ад чыгункі да самай Дзвіны – груды бітай цэглы. Не разбярэш, дзе была якая вуліца, нібы мы тут ніколі і не жылі». Былы будынак тэатра быў разбураны. Калектыў тэатра чакала вялікая праца па аднаўленні культурнага жыцця ў горадзе [3, л. 6].

За выдатныя заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 7 студзеня 1944 г. Цімафею Мікалаевічу Сяргейчыку было прысвоена званне народнага артыста БССР [7, л. 3].

28 лістапада трупа тэатра паказала віцяблянам у памяшканні кінатэатра «Спартак» спектакль «Несцерка» В. Вольскага. Роль шкаляра Самахвальскага ў п'есе стала знакавай для Сяргейчыка. Аднак адразу ні рэжысёр Навум Лойтар, ні члены мастацкай рады, на якой адбывалася размеркаванне роляў будучай пастаноўкі, зусім не бачылі Цімафея Мікалаевіча ў гэтай ролі. Але ён аказаўся ўпартым і заявіў, што будзе самастойна працаваць над вобразам і пераканае ўсіх. Так яно і атрымалася. Урачыстае адкрыццё тэатра адбылося 31 снежня 1944 г. спектаклем «Заложнікі» [4, л. 3; 11].

У 1946 г. спектакль «Несцерка» быў вылучаны на артыманне Дзяржаўнай прэміі СССР. Для прагляду спектакля з Масквы ў Віцебск прыехала камісія: рэжысёр МХАТ І.Я. Судакоў і кампазітар І.В. Дунаеўскі. За гэты спектакль Ц.М. Сяргейчыку была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР 1-й ступені [4, л. 7].

Пераканаўчы вобраз Лявона Зябліка стварыў Цімафей Мікалаевіч у п'есе Янкі Купалы «Раскіданае гняздо», пастаўленай у 1951 г. А. Скібнеўскім. Поспеху ў стварэнні гэтага вобраза дапамаглі асабістыя сустрэчы з класікам беларускай літаратуры. Падчас аднаго з іх Янка Купала адзначыў: «Ты, Цімашок, калі-небудзь успомніш мае словы. Я памру, але «Раскіданае гняздо» зойме яшчэ на сцэне сваё пачэснае месца і загаворыць на поўны голас. Я ўклаў у гэту п'есу лепшае, што было ў маёй паэзіі і драме» [11]. Сапраўды, «Раскіданае гняздо» дагэтуль ідзе на вядучых сцэнах беларускіх тэатраў.

«За асаблівыя заслугі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных і ў сувязі з 70-годдзем з дня народзінаў» рашэннем выканкама Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных ад 11 лістапада 1969 г. Ц.М. Сяргейчыку было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін г. Віцебска» [8, л. 3].

За час бесперапыннай працы ў тэатры Цімафей Мікалаевіч Сяргейчык выканаў больш за 250 вялікіх і малых роляў; у якасці рэжысёра паставіў 17 спектакляў, акрамя таго, быў сурэжысёрам у шмат якіх беларускіх п'есах. Адначасова з акцёрскай і рэжысёрскай работай шмат часу аддаваў педагагічнай дзейнасці: быў мастацкім кіраўніком студыі пры тэатры. Многія з яго вучняў сталі заслужанымі і народнымі артыстамі БССР: А.Р. Шэлег, А.М. Трус, І.А. Матусевіч, З.І. Канапелька і інш.

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларускі** дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛІМ). – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 154.

2. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 155.

3. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 156.

4. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 161.
5. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 186.
6. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 190.
7. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 192.
8. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 196.
9. **БДАМЛІМ**. – Ф. 212. Воп. 1. Спр. 198.
10. **Гісторыя** Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Сучасн. шк. : Экаперспектыва, 2005. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. В. Біч [і інш.]. – 519 с.
11. **Цімох** Сяргейчык – выдатны дзеяч коласаўскай сцэны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://kolastheatre.by/be/news/cimoh-syargeychyk-vydatny-dzeyach-kolasauskay-sceny. – Дата доступу: 07.09.2021.

Фаміна Г.С. *(г. Полацк)*

ВУЧЫЦЬ І ВЫХОЎВАЦЬ СЛОВАМ

У сучаснай метадычнай і педагагічнай літаратуры агульныя патрабаванні да ўрока падзяляюцца на чатыры групы: выхаваўчыя, дыдактычныя, псіхалагічныя, гігіенічныя. Умоўнасць такога падзелу заключаецца ў тым, што ў рэальным вучэбна-выхаваўчым працэсе гэтыя патрабаванні цесна ўзаемазвязаны, узаемапранікаюць і ўплываюць адзін на другі.

Выхаваўчыя патрабаванні з'яўляюцца запытам грамадства на фарміраванне грамадзяніна краіны. Для ўрокаў беларускай мовы і літаратуры выхаваўчы аспект работы прасочваецца па некалькіх напрамках. Гэта перш за ўсё скрупулёзны падбор дыдактычнага матэрыялу да кожнага ўрока, які служыў бы не толькі ілюстрацыяй, сродкам для назірання і аналізу пэўных правілаў, граматычных формаў, сінтаксічных канструкцый, але даваў бы магчымасць пазнаваць новыя факты, падзеі з жыцця, вучыў бы разважаць, гутарыць на палітычныя, сацыяльныя, ідэалагічныя, маральныя тэмы, ацэньваць і выказваць свае адносіны. Мэтанакіраванае выкарыстанне дыдактычнага матэрыялу дазволіць выхоўваць нацыянальную самасвядомасць вучняў. Як вядома, мова народа становіцца асноўным дыдактычным сродкам фарміравання менталітэту асобы навучэнца, яна сама па сабе з'яўляецца культурна-гістарычным асяроддзем, якое фарміруе духоўнасць і ўплывае на стан матэрыяльнай культуры наступных пакаленняў. Вось чаму мову народа патрэбна вывучаць з мэтай пазнаць сам народ у яго тэрытарыяльнай, гістарычнай і сацыяльнай акрэсленасці. Так, адным з лінгвадыдактычных прынцыпаў навучання беларускай мове з'яўляецца прынцып апоры на этнакультуру, што азначае арыентацыю настаўніка, выкладчыка пры адборы дыдактычнага матэрыялу да заняткаў па беларускай мове на тэксты з этнакультуразнаўчай тэматыкай

(гісторыя Беларусі, характар, звычаі, традыцыі, асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, прыродных умоў і інш.). Беларусы павінны выхоўваць у сабе беларусаў, ідэнтыфікаваць сябе з беларускай культурай. Незалежна ад таго, з якой культурай навучэнцы сярэдняй школы сябе атаясамляюць, на занятках па беларускай мове і літаратуры патрэбна ўлічваць этнакультурны фактар, ствараць умовы для пазнання культуры беларускага і іншых народаў і выхавання талерантных адносін паміж людзьмі, якія належаць да розных этнасаў, канфесій, рас, падкрэсліваць культурную адметнасць беларусаў [3, с. 38].

Агульнавядома, што мастацкая літаратура – выключны сродак прывіцця любові да чалавека, грамадства, роднага краю, мовы, культуры. Першачарговымі задачамі настаўніка з'яўляюцца перадача сваіх уменняў і навыкаў вучням, навучанне іх, паводле выказвання Якуба Коласа, чытанню ў шырокім значэнні. Гэту задачу вялікі пісьменнік і метадыст разумеў так: «Чытаць – значыць разумець тое, што чытаецца. І школа перш за ўсё павінна навучыць чытаць дзяцей самастойна. Трэба лічыцца, з аднаго боку, з тым, што па скончэнні школы чытанне будзе адзіным сродкам самаадукацыі для вучня. З другога боку, трэба мець на ўвазе тое вялікае значэнне, якое мае кніга і наогул друкаванае слова ў сэнсе пашырэння і развіцця нашых ведаў. Вось чаму школа і павінна даць вучню ўсе тыя спосабы, каторымі вучань мог бы папаўняць свае веды незалежна ад дапамогі настаўніка, мог бы сам разабрацца ў тым матэрыяле, што дае кніга. Школа павінна таксама прышчапіць вучню любасць да кнігі, зацікавіць ёю» [1, с. 112].

Урокі беларускай мовы і літаратуры могуць і павінны выхоўваць эстэтычны густ сродкамі самой мовы. Культура мовы – адзін з важнейшых элементаў чалавечай культуры. У маўленні, слове чалавек сцвярджае сябе як асоба. Ступень валодання мовай, шырыня і свабода карыстання моўнымі сродкамі ў іх вуснай і пісьмовай формах шмат у чым вызначаюць месца чалавека ў грамадскім жыцці. Таму праблема развіцця вуснага маўлення заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі пры школьным навучанні.

Выхаваўчы аспект урока мовы забяспечваецца цэлым комплексам мер і сродкаў: нагляднасці, слыхавых, асабліва музычных, сродкаў мовы і паводзін самога настаўніка.

У пазакласнай рабоце па мове і літаратуры найбольш яскрава і асабліва натуральна выступае адзінства адукацыйнай і выхаваўчай функцый гэтых прадметаў. Зразумела, што работа настаўніка-славесніка не абмяжоўваецца рамкамі ўрока. Яна ўяўляе сабой бесперапыннае ўзаемадзеянне педагога і вучня, пастаянныя зносіны (не ў часе, а ў адчуванні патрэбы ў іх) па перадачы ўменняў рэагаваць на слова. Што датычыцца дыдактычных прынцыпаў пазакласнай работы, то яна мае сваю спецыфіку: на пазаўрочных занятках удзельнічаюць галоўным чынам тыя вучні, якія жадаюць пашырыць свае веды па мове, удасканаліць іх. Толькі пры такой умове пазакласная работа

стане па-сапраўднаму дзейснай. Можна прымусіць вучня наведваць гурток, прымаць удзел у канферэнцыі, але, калі ў яго не будзе жадання рабіць гэта, не будзе і ніякай карысці ад такой працы [2, с. 231].

Метадысты вылучаюць розныя віды пазакласнай работы, але асноўнымі лічаць наступныя: пастаянна дзеючыя мерапрыемствы (праца гуртка, выпуск тэматычнай газеты і інш), эпізадычныя мерапрыемствы (віктарыны, алімпіяды, вечары, конкурсы ды інш.). Гульні, спаборніцтвы найбольш цікавяць непаседлівых. Яны нават не заўважаюць, што займаюцца сур'ёзнай справай: падборам слоў з пэўнымі фанетычнымі заканамернасцямі, прыгадваннем сінонімаў, прыказак, загадак. Гэта садзейнічае развіццю звязнага маўлення гурткоўцаў, бо ў шмат якіх гульнёвых сітуацыях трэба свядома, уважліва ставіцца да беларускага слова, дакладна яго вымаўляць, мэтанакіравана ўжываць у моўных зносінах. З вялікім захапленнем складаюць вучні вершы-каламбуры. Такая работа фарміруе ў іх кемлівасць, выхоўвае ўважлівае стаўленне да моўных фактаў. Сярод уражанняў, што застаюцца ў вучняў на ўсё жыццё, нярэдка важнае месца належыць успамінам пра школьныя літаратурныя вечарыны. І невыпадкова: гэтая форма пазакласнай працы тоіць вялікія магчымасці ўздзеяння на розум і пачуцці школьнікаў, на развіццё іх творчых здольнасцей. Многія настаўнікі з адказнасцю і шчырай зацікаўленасцю ставяцца да арганізацыі і правядзення літаратурных вечарын, дбаюць не проста аб тым, каб уключыць у іх праграму як мага больш разнастайнага інфармацыйнага матэрыялу, а каб з дапамогай мастацкага слова дзейсна ўплываць на думкі, пачуцці, памкненні вучняў, фарміраванне іх нацыянальнай самасвядомасці і эстэтычнага густу.

З усяго сказанага вышэй вынікае, што беларуская мова і створаная на ёй беларуская літаратура як вучэбныя дысцыпліны з'яўляюцца аднымі з асноўных у школе; настаўнік беларускай мовы і літаратуры пры дапамозе роднага слова фарміруе вучнёўскі светапогляд і ўменне правільна думаць і перадаваць (выражаць) думкі, ажыццяўляе ідэйна-палітычнае, маральнае і эстэтычнае выхаванне.

ЛІТАРАТУРА

1. **Абабурка, М. В.** Культура беларускай мовы / М. В. Абабурка. – Мінск : Вышэйшая школа, 1994. – 120 с.

2. **Варановіч, З. Б.** Методыка выкладання беларускай мовы / З. Б. Варановіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 247 с.

3. **Ляшчынская, В. А.** Методыка выкладання беларускай мовы : лекцыі для студэнтаў філалагічнага і завочнага факультэтаў / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава. – Гомель : Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны, 1985. – 171 с.

Філімонава В.А. *(г. Полацк)*

ДРУКАВАНАЯ ПРАДУКЦЫЯ ВЫДАВЕЦКАГА ДОМА ЗАВАДСКІХ У ФОНДАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОЛАЦКАГА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА

У 2021 г. спаўняецца 240 год з дня нараджэння славутага віленскага выдаўца Юзафа Завадскага (1781–1838). Цяжка пераацаніць той унёсак, які зрабіў ён і яго нашчадкі ў развіццё кнігавыдавецкай і кнігагандлёвай справы на беларускіх землях у XIX – пачатку XX ст. Выдавецкае прадпрыемства, заснаванае Ю. Завадскім у 1804 г., праіснавала больш за стагоддзе. Гэта, бадай, найбуйнейшае і самае актыўнае прыватнае выдавецтва гэтага часу на тэрыторыі былога ВКЛ, прадукцыя якога карысталася вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва беларускіх зямель. У фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (НПГКМЗ) захоўваецца сем выданняў розных гадоў, звязаных з выдавецкім домам Завадскіх.

Ураджэнец Вялікай Польшчы, Ю. Завадскі набываў практычны вопыт кнігадрукавання ў польскіх Вроцлаве і Познані, нямецкім Лейпцыгу. Уласную кнігавыдавецкую дзейнасць ён распачаў у Вільні ў 1804 г., калі адкрыў у горадзе невялічкую друкарню. Сапраўдным магутным штуршком для актыўнай яго дзейнасці ў сферы кнігавыдання стала арэнда ў 1805 г. друкарні Віленскага ўніверсітэта і дзякуючы таму права называць сябе ўніверсітэцкім тыпографам. Дамова аб арэндзе была заключана на 10 гадоў і некалькі разоў падаўжалася аж да 1828 г. Апека Адама Чартарыйскага, а таксама пазыка ў 1000 рублёў дазволіла пераабсталяваць друкарню, павялічыць колькасць друкарскіх варштатаў да 12 і пашырыць штат працаўнікоў да 35 чалавек [1; 2, с. 71]. Да 1828 г. прадпрыемства мела выключнае права друкаваць (а да 1825 г. – і прадаваць) падручнікі і навуковыя працы Віленскага ўніверсітэта [9]. Да гэтага перыяду дзейнасці друкарні адносіцца выданне «Zoologia krotko zebrana» Станіслава Баніфацыя Юндзіла. С.Б. Юндзіл – вядомы прафесар батанікі і заалогіі, загадчык кафедры прыродазнаўчых навук Віленскага ўніверсітэта – з'яўляўся аўтарам першых навучальных дапаможнікаў па прыродазнаўчых дысцыплінах для студэнтаў, да якіх і адносіцца праца «Zoologia krotko zebrana» («Кароткі курс заалогіі»). Упершыню падручнік у 3-х тамах выйшаў з друкарні Завадскага ў 1807 г., а пасля двойчы перавыдаваўся ў 1825 і 1827 гг. [3, s. 306]. Першы том яе быў прысвечаны апісанню млекакормячых жывёлін, другі – класу птушак, трэці – паўзунам і рыбам. У фондах НПГКМЗ захоўваецца том I 1-га выдання гэтага падручніка. Асобнік мае ўладальніцкі штамп з тэкстам «Сія книга принадлежить / Зенону Іосифовичу / Олехновичу».

З ростам прыбыткаў Ю. Завадскі стаў пашыраць сваю справу і адкрыў філіялы свайго прадпрыемства ў Варшаве, а пасля і ў Кіеве (дзе арандаваў

друкарню ўніверсітэта св. Уладзіміра). Так пачаўся паспяховы захоп кніжнага рынку былога ВКЛ. Значна спрыяў гэтаму і ўніверсальны па тэматыцы рэпертуар друкаванай тут прадукцыі, а таксама яе шматмоўнасць. Тэматычна выданні Завадскага ахоплівалі ўсе сферы жыцця: тут друкавалася мастацкая і грамадска-палітычная літаратура, рэлігійныя, сельскагаспадарчыя і медыцынскія выданні, а таксама навуковыя творы, што прадстаўлялі розныя галіны навукі. Друкарня валодала лацінскімі, кірылічнымі, грэчаскімі, арабскімі і яўрэйскімі шрыфтамі. Пераважная большасць выданняў друкавалася на польскай мове, аднак былі прадстаўлены таксама ўсе асноўныя еўрапейскія мовы, літоўская, латышская, арабская і інш.

Фірма Завадскага з'яўлялася галоўным пастаўшчыком кніжнай прадукцыі на тэрыторыю Беларусі ў XIX ст. Дзякуючы Ю. Завадскаму ў розных гарадах Віленскай навучальнай акругі (у тым ліку ў Віцебску, Брэсце, Гродне, Мінску, Нясвіжы і інш.) была разгорнута кнігагандлёвая сетка з невялікімі кніжнымі складамі, дзе прымаліся таксама тэксты для друку. Ю. Завадскі, у першую чаргу прадпрымальнік, разглядаў аўтарскія рукапісы з пункту гледжання іх магчымага камерцыйнага поспеху. Таму, напрыклад, ён не рызыкнуў укладваць уласныя грошы ў выданне вершаў Адама Міцкевіча, бо не разумеў яго творчыя пачынанні. У выніку вершы выйшлі дзякуючы аб'яўленай падпісцы на выданне [7].

Актыўная і ўдалая прадпрымальніцкая дзейнасць, распачатая Ю. Завадскім, паспяхова развівалася і спрыяла росту тэмпаў распаўсюджання кнігавыдання і кніжнага гандлю на тэрыторыі былога ВКЛ і пасля яго смерці ў 1838 г. Сямейную справу працягвалі спадкаемцы Завадскага: жонка (да 1851 г.), сыны Адам (да 1875 г.) і Фелікс (да 1891 г.), выкарыстоўваючы ў назве фірмы імя бацькі. У пачатку XX ст. кіраванне друкарняй пераймае сын Фелікса, таксама Фелікс Завадскі [9].

Вядучая роля ў арганізацыі кніжнага гандлю і выдавецкай справы належала Адаму Завадскаму, які працягваў забяспечваць літаратурай жыхароў беларускіх губерняў, задавальняючы адпаведныя замовы шляхам рассылкі выданняў праз пошту. Кнігарня Завадскага ў Вільні ператварылася ў асяродак збору і абмену думкамі адукаванай інтэлігенцыі. Тут сустракаліся прафесары, настаўнікі, літаратары, выдаўцы, урачы і г. д. [2, с. 74]. Завітваў сюды і Ігнат Ходзька (1794–1861) – беларускі польскамоўны паэт родам з Вілейшчыны. Ён актыўна друкаваўся ў заснаваным Ю. Завадскім перыядычным выданні «Dziennik Wilenski», а ў 1842–1863 гг. тут выйшла літаратурна-мастацкая серыя «Obrazy Litewskie» («Літоўскія замалёўкі») – збор аповесцей пісьменніка [4, s. 145]. У фондах НПГКМЗ захоўваецца том 1 пятай часткі, што ўтрымлівае твор «Dworki na Antokolu» («Дворыкі на Антаколі», 1850). Месцам бытавання кнігі быў Львоў. Пра гэта сведчыць і ўладальніцкі надпіс «Ex libris / Ant. Dzieduszycki / a Leopol», і штамп Бібліятэкі Народнага казіно ў Львове (працавала з 1918 да 1939 г.). Пазней кніга трапіла

ў абменна-рэзервовы фонд Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У.І. Леніна (зараз Расійская дзяржаўная бібліятэка), адкуль была перададзена ў Полацк для будучага Музея беларускага кнігадрукавання ў 1989 г.

Тым не менш пасля смерці Ю. Завадскага значна запавольваюцца тэмпы развіцця яго выдавецкага прадпрыемства, зачыняюцца філіялы ў іншых, апроч Вільні, гарадах, зніжаюцца прыбыткі. Фірма пераўтвараецца ў лакальнае выдавецтва і пачынае звяртаць больш увагі на патрэбы мясцовага грамадства, напрыклад, друкуе брашуры, псалтыры і малітоўнікі на літоўскай мове. Менавіта Завадскія спрычыніліся да выдання некаторых знакавых беларускіх твораў. Напрыклад, тут у 1846 г. выйшла славутая «Сялянка» («Ідылія») В. Дуніна-Марцінкевіча [1; 2, с. 75]. Сапраўдным ударам па працы выдавецтва стаў шэраг рэакцыйных змен у заканадаўстве аб друку і цэнзуры пасля паўстання 1863–1864 гг.

Да гэтага ж перыяду дзейнасці друкарні адносяцца некаторыя рэлігійныя выданні з фондаў НПГКМЗ. Адным з іх з'яўляецца вядомы твор аднаго з айцоў хрысціянскай царквы Аўгусціна Аўрэлія «Wyznania Świętego Augustyna» («Споведзі святога Аўгусціна», 1844). Пераклад твора з лацінскай на польскую мову ажыццявіў Міхал Богуш-Шышка (1811–1877), славуты беларускі перакладчык і архівіст, што выконваў абавязкі радзівілаўскага архіварыуса ў Нясвіжы. Твор падзелены на два тамы: першы ўласна біяграфічны, другі ўтрымлівае рэлігійна-філасофскія погляды св. Аўгусціна, яго інтэрпрэтацыі Кнігі Быцця. У фондах НПГКМЗ захоўваецца 2-гі том. У 1884 г. там жа пабачыла свет кніга «Zasady wiary katolickiej [...] czyli Katechizm Historyczny» («Асновы каталіцкай веры [...], альбо катэхізіс гістарычны») Ёгана Шміда (Johann Schmid) у перакладзе з нямецкай мовы Леана Рагальскага. Кніга змяшчала выклад асноўных ісцін хрысціянскай веры і маралі ў простай форме і прызначалася для пачатковай рэлігійнай адукацыі.

XIX ст. характарызуецца павышэннем цікавасці грамадства да навуковых асноў сельскагаспадарчай дзейнасці, таму ў гэты час расце запыт на сельскагаспадарчую літаратуру. М. Нікалаеў называе сельскагаспадарчую тэматыку адной з самых папулярных (пасля мастацкай, грамадска-палітычнай і рэлігійнай) у рэпертуары кніг, што выходзілі і распаўсюджваліся на Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. [2, с. 93]. І тут трэба адзначыць двухтомную працу Юзафа Струмілы «Ogrody północne» («Паўночныя сады»). Ю. Струміла – вядомы ў Вільні вучоны-садоўнік, пчаляр, навуковы пісьменнік, сталы аўтар часопіса «Dziennik Wilenski». Ён стаў заснавальнікам так званага «саду Струмілы» ў віленскіх прадмесцях, дзе вырошчваў, між іншым, і лекавыя расліны. Ён імкнуўся распаўсюджваць сярод грамадства навуковыя веды ў галіне сельскай гаспадаркі і стварыў некалькі падручнікаў і навуковых прац у дапамогу жадаючым займацца садоўніцтвам, кветкаводствам і пчалярствам [8]. Галоўная яго праца – «Ogrody północne», – дзе Ю. Струміла выкладае прынцыпы стварэння саду і асновы догляду за

раслінамі, упершыню выйшла ў Вільні ў 1820 г. і пасля вытрымала яшчэ 6 перавыданняў [5, s. 395]. У 1880 г. у друкарні Завадскага выйшла сёмае і апошняе яе выданне [6, s. 181–182]. У фондах НПГКМЗ захоўваецца 1-шы том гэтай працы.

Да канца XIX ст., калі сапраўды масавымі сталі выданні для прыватнага набажэнства – кішэнныя малітоўнікі, – з друкарні Завадскага выходзяць такія кнігі, як «Chwała na wysokości Bogu» («Хвала на вышынях Богу», 1888) і «Gwiazda zbawienia» («Зорка вызвалення», 1898). Абедзве яны захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ. Малітоўнікі маюць тыповы для такога віду выданняў склад: малітвы дзённага, тыднёвага і месячнага цыклаў, малітвы, што чыталіся падчас святой імшы ў касцёле, падрыхтоўка да споведзі і камуніі, малітвы падчас найгалоўных хрысціянскіх свят, а таксама малітвы на розныя выпадкі і патрэбы. Выданне «Chwała na wysokości Bogu» (складальнік Адам Пласкавіцкі) з'яўлялася сумесным выдавецкім праектам прадпрыемства Завадскага і варшаўскіх выдаўцоў Г. Гебетнера і А. Вольфа. Адметным з'яўляецца пераплёт кнігі: аснову яго складаюць пласціны са слановай косці, інкруставаныя перламутрам і ўпрыгожаныя металічнымі накладкамі.

Выданні выдавецкай фірмы «Юзаф Завадскі» актыўна выкарыстоўваюцца Музеем беларускага кнігадрукавання ў экспазіцыйнай дзейнасці. Заслугоўвае ўвагі сама дзейнасць выдавецтва як буйнейшага прадпрыемства ў сферы кнігавыдання ў Вільні – «гістарычнай сталіцы Беларусі» [2, с. 93] – і пашырэння кнігі на беларускіх землях, а таксама значэнне гэтай дзейнасці. Раннія выданні, такія як «Zoologia krotko zebrana» С.Б. Юндзіла (1807), ілюструюць пераемнасць выдавецкіх традыцый ад Віленскай езуіцкай друкарні да друкарні Віленскага ўніверсітэта. Некаторыя выданні, такія як «Obrazy Litewskie» І. Ходзькі (1850), дапаўняюць раздзел экспазіцыі «Тыпы і віды друкаванай прадукцыі», прысвечаны беларускаму кнігавыданню пасля 1825 г. Незвычайная вокладка кнігі «Chwała na wysokości Bogu» (1888) арганічна ўпісана ў раздзел экспазіцыі, які распавядае пра пераплётнае майстэрства. Абмежаванні на магчымасці экспанавання прадметаў калекцыі накладаюць яе нешматлікасць і фізічны стан некаторых выданняў. Таму для Музея беларускага кнігадрукавання камплектаванне калекцыі выданняў выдавецкага прадпрыемства Ю. Завадскага з'яўляецца адным з асноўных кірункаў камплектавання.

ЛІТАРАТУРА

1. **Выдаўцы** Завадскія // Роднае слова. – 2006. – № 8. – С. 123.

2. **Гісторыя** беларускай кнігі : у 2 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.) / М. В. Нікалаеў [і інш.] ; навук. рэд.: В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў. – 436 с.

3. **Estreicher, K.** Bibliografia Polska XIX stólecia / K. Estreicher. – Kraków : czcionkami drukarni Uniwersytetu Jagellońskiego, 1874. – T. II. – 634 s.

4. **Estreicher, K.** Bibliografia Polska XIX stólecia / K. Estreicher. – Wydanie drugie. T. III. – Kraków : Państwowe wydawnictwo naukowe, 1962. – 558 s.

5. **Estreicher, K.** Bibliografia Polska XIX stólecia / K. Estreicher. – Kraków : czcionkami drukarni Uniwersytetu Jagellońskiego, 1878. – T. IV. – 629 s.

6. **Estreicher, K.** Bibliografia Polska XIX stólecia / K. Estreicher. – Kraków : czcionkami drukarni Uniwersytetu Jagellońskiego, 1882. – T. VII. – 292 s.

7. **Niemojewska, A.** Józef Zawadzki: Drukarz obojga narodów [Electronic resourse] / A. Niemojewska // Rzecz Pospolita. – Mode of access: https://www.rp.pl/historia/art10426191-jozef-zawadzki-drukarz-obojga-narodow. – Date of access: 12.10.2021.

8. **Zasztowt, L.** Strumiłło Józef / L. Zasztowt // Polski Słownik Biograficzny. – Warszawa ; Kraków, 2006–2007. – T. 44. – S. 433–435.

9. **Zawadzkio** spaustuvė [Electronic resourse] // Visuotinė lietuvių enciklopedija. – Mokslo ir enciklopedijų leidybos centras, 2021. – Mode of access: https://www.vle.lt/straipsnis/zawadzkio-spaustuve/. – Date of access: 12.10.2021.

Шарковская Н.Ю. *(г. Витебск)*

Л.В. АЛЕКСЕЕВ И ВИТЕБСК (по материалам личного архива ученого в фондах Витебского областного краеведческого музея)

Цель публикации: познакомить специалистов и общественность с «витебскими» материалами личного архива Л.В. Алексеева, подаренного музею в 2013 г. родственниками ученого.

Они представлены следующими комплексами:

I. Печатные издания

II. Фотографии и негативы

III. Рукописи и документы (переписка личная и деловая)

IV. Вещевой материал

Перечисленные выше комплексы материалов в совокупности отражают сотрудничество Алексеева с различными юридическими и физическими лицами Витебска – с ВОКМ в целом и его сотрудниками в частности, городскими и областными органами власти, местными изданиями, а также с конкретными людьми – довольно известными и неизвестными, простыми горожанами. В материалах нашли отражение этапы знакомства и изучения Леонидом Васильевичем нашего города, его истории, памятников и культурно-исторических объектов вместе с теми людьми, которые внесли свой вклад в их изучение и сохранение.

I. Печатные издания: публикации Л.В. Алексеева, связанные с Витебском. Это его работы по археологии и интерпретации археологических находок, публицистика и популяризация истории.

Первой научной публикацией ученого, увидевший свет, стала статья в журнале «Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института истории материальной культуры АН СССР», посвященная открытому им в фондах Витебского музея шиферному пряслицу с надписью «Бабино пряслене». Оттиски этой статьи [10] с дарственной надписью были подарены автором музею и его директору еще в 1955 г., а ныне они дополнились экземпляром из архива исследователя. Благодаря этому открытию и публикации пряслице получило мировую известность и вошло в школьные учебники.

Статья Алексеева «К истории и топографии древнейшего Витебска» [6] – эта первая научная публикация по древней истории Витебска стала отправной точкой, от которой отталкивались все последующие поколения исследователей нашего города. В ней было опубликовано впервые выявленное Леонидом Васильевичем в ленинградских архивах дело о срытии Замковой горы в Витебске и неизвестный ранее ее рисунок, а также находки, сопутствующие витебской берестяной грамоте.

Разделы о Витебске содержатся в его фундаментальных монографиях «Полоцкая земля» [8, с. 161–169], «Западные земли домонгольской Руси» [4, с. 60–63, 122–131; 5, с. 86–87], популярном издании «По Западной Двине в Белоруссии» [7, с. 12–24], в материалах к археологической карте Витебской области [1, с. 288–289], а также статьях и заметках о древнем Витебске в местных периодических изданиях. Все эти публикации, поступившие в фонды музея, имеют автографы и дарственные надписи, исполненные глубокой признательностью и благодарностью с тонким философским контекстом[1]. Часть из них была подарена музею при жизни, вторая часть поступила с архивом ученого после его смерти.

Отдельно следует отметить популярные статьи и зарисовки о местной губернской жизни в XIX в. под общей рубрикой «Витебск гоголевских времен». Они публиковались в журналах «Полымя», «Неман», «Маладосць», изредка на страницах областной газеты «Віцебскі рабочы» [3; 9; 11; 12]. Именно Алексеев впервые рассказал советскому читателю в начале 1970-х гг. о витебском «горячем до неимоверности» губернаторе И.С. Жиркевиче и других личностях и событиях [11; 12]. В это же время увидели свет его статьи о декабристе из Витебска И. Горбачевском [3].

[1] «Витебскому музею, с которым связаны лучшие дни моей научной жизни в юности и в старости – разведки 1950–1951 гг., раскопки Друцка (1956–1967 гг.), а теперь помощь в издании этой книги. Не забыть тепла, участия, поддержки, которые я встречал в его стенах всю жизнь. Спасибо вам, витебские дорогие музейщики!» – дарственная надпись на титульном листе монографии «Археология и краеведение Беларуси…» [2].

«Во всегда дорогой мне Витебский областной музей. Приветствую всех его сотрудников! Надеюсь, что у вас все ещё живет моя тень» – дарственная надпись на форзаце первого тома издания «Западные земли домонгольской Руси» [4].

В научной библиотеке Алексеева оказались публикации и научные статьи других авторов о Витебске. Например, ставший раритетом местный журнал «Двина» № 1 за 1956 г. Как выяснилось из писем М.С. Ривкина, журнал был приобретен им с большим трудом специально для Леонида Васильевича. На титульном листе сохранилась дарственная надпись витебского краеведа. Ныне этот экземпляр вернулся в Витебск. Значительное место занимают публикации археологов, изучавших Витебск – Л.В. Колединского, О.Н. Левко, Г.В. Штыхова с автографами и дарственными надписями московскому коллеге.

II. Фотографии и негативы. В богатейшей коллекции негативов[2] имеется комплекс витебских материалов в хронологическом диапазоне от конца 1940-х до начала 1970-х гг. Он представлен снимками самого города конца 1940-х начала 1950-х гг. (Дадатак 17, фота 1), сотрудников Витебского областного краеведческого музея, а также горожан – друзей и знакомых. Особо следует отметить панораму пл. Свободы с траншеей (1959), где была найдена берестяная грамота (Дадатак 17, фота 2, 2а), а также панорамные комплексы фотографий церкви Благовещения до разрушения и после него (1959 – начало 1960 гг.). Алексееву удалось запечатлеть развалины храма со всех сторон, снаружи и изнутри, что особенно важно для исследователей.

Благодаря Алексееву мы располагаем фотографиями сотрудников музея конца 1940-х – начала 1950-х гг. – Т. Каганской (поддерживал переписку вплоть до 1970-х гг.), художника И. Саперсона; второй половины 1950–1960-х гг. – Н.Л. Логойко, К.И. Хомко, И.А. Новицкой, Г. Фролова, а также групповые фотографии коллектива музея (Дадатак 17, фота 3).

Особо следует отметить чудом сохранившуюся фотографию инспектора по охране памятников Витебской области О.П. Сухомлиновой-Морозовой (Дадатак 17, фота 4), оказавшей огромную помощь Алексееву в составлении археологической карты. Она предоставила молодому ученому собранную ею богатейшую картотеку памятников Витебщины, среди которых были памятники, впервые выявленные именно ею.

Снимки совместной поездки с Н.И. Дорофеенко по местам расположения бывшего имения А.П. Сапунова – Каховка.

Сохранились негативы посещения раскопок в Друцке секретарем Витебского обкома КПБ Н.И. Пахомовым и группы витебских учителей, организованной и привезенной туда на экскурсию М.С. Ривкиным. Момент проведения Л. Алексеевым экскурсии для учителей запечатлен на нем (Дадатак 17, фота 5).

[2] Подробнее о коллекции фотонегативов Л.В. Алексеева говорилось в докладах на конференциях, публикациях [14, с. 198–203], а также на выставках в Ратуше – «Увлечение длиною в жизнь» (март – апрель 2018 г.) и «Первый исследователь Полоцкой земли» (ноябрь 2021 – январь 2022 г.).

III. Рукописи и документы (переписка деловая и личная)

III.1. *Переписка деловая и документы*

• деловая переписка с Управлением культуры (Г. Чайковский), Витебским горкомом КПБ (И.А. Наумчик), директорами музея (А.Н. Шванштейн, К.И. Хомко, В.А. Салек) по поводу обоснования 974 года как даты основания города и празднования его 1000-летия в 1974 г.;

• переписка с руководством (К.И. Хомко) и сотрудниками (И.А. Новицка, Н.Л. Логойко) ВОКМ по музейным делам (определение предметов, работа над экспозицией, передача материалов археологических раскопок и др.);

• переписка с редакцией газеты «Віцебскі рабочы» в основном по поводу предложения к изданию статей[3] и его заявках на публикации, пересылке гонораров, квитанция о пересылке в подарок редакции монографии «Полоцкая земля» и др.;

• рукопись (машинопись) развернутого структурного плана книги Л.В. Алексеева «Витебск»;

• рукопись (машинопись) Л.В. Алексеева совместно с Б.А. Рыбаковым заключения о дате основания Витебска;

• копия письма Д. Василевского Витебскому областному краеведческому музею от 10.08.1959 г. по поводу желания поделиться с музеем своими научными наработками и наблюдениями. В свое время, в 1920-е гг., Данила Минович Василевский тесно сотрудничал с музеем и много сделал для пополнения его фондов [15]. Письмо в музей было написано в августе 1959 г., надо полагать, под впечатлением от находок в Новгороде берестяных грамот. Василевский сообщал о своем участии в раскопках курганов на р. Полоте, выше Спасо-Ефросиниевского монастыря, в Бельчицах. Раскопки проводила археологическая экспедиция Инбелкульта. Со слов Данилы Миновича, его поразили квадратики бересты с черточками, найденные там, которые они оставили в курганах. Одновременно Василевский напомнил о своих гипотезах по поводу авторства поэмы «Тарас на Парнасе», изложенных в публикации в середине 1920-х гг. в журнале «Полымя». Судя по всему, ответа на письмо не последовало, а копия письма была передана Л.В. Алексееву;

• Среди материалов архива Алексеева сохранился второй экземпляр письма Ираклия Андроникова от 20 ноября 1982 г. на имя Иосифа Адамовича Наумчика с просьбой отметить в Витебске 3 декабря 80-летие, а затем увековечить память уроженца Витебска И.И. Соллертинского (ВОКМ, КП 27713/105).

III. 2. *Переписка личная*

• переписка с С.М. Рывкиным. Леонида Васильевича с Михаилом Степановичем связывала давняя дружба, берущая начало еще с 1950-х гг. На сегод-

[3] Алексеев несколько раз предлагал редакции опубликовать статьи о И.С. Жиркевиче, А.П. Сапунове, В.Г. Краснянском и тому подобное, но их публикации откладывались и судьбы некоторых оставались неизвестны.

няшний день выявлено порядка 30 их писем и поздравительных открыток. В них поднимались вопросы истории, краеведения, работы над диссертацией и ее защитой; обсуждались городские новости, музейные дела и насущные проблемы, а также семейные новости. Переписка очень содержательная и хорошо отражает процессы, происходившие в городе и стране. Эти письма вместе с комплексом материалов, хранящимся в Государственном архиве Витебской области, являются темой отдельного изучения и ждут своего исследователя.

• Представляют интерес письма сотрудников музея И.А. Новицкой и Н.Л. Логойко, из которых видно, как деловая переписка по музейным делам постепенно приобретает личный дружеский характер.

• Сохранилось одно письмо Давида Симановича от 22 июня 1967 г. делового характера об организации телепередачи с участием Л.В. Алексеева (ВОКМ, КП 27687/17).

• Среди взрослой переписки обращает на себя внимание письмо от 11 августа 1961 г. витебского школьника Миши Горелика – участника раскопок в Друцке. Из детского письма видно, что работа на раскопе в 1961 г. под руководством Алексеева вызвала у Миши интерес к истории и археологии. Он специально просит Леонида Алексеевича дать список книг, которые ему стоит прочитать. Интересуется, как идут дела на раскопе после его отъезда.

Особо следует остановиться на письмах Нины Вячеславовны Хруцкой – внучки Владимира Гавриловича Краснянского.

Письма очень содержательные и представляют большой интерес для историков и краеведов. Сохранилось два письма от 16 апреля 1985 г. и 15 июля 1988 г. (Дадатак 17, Приложение 1, 2). Оба они написаны на почтовой бумаге формата А-5. Первое на 7 листах (14 страниц), второе – на 3 листах (6 страниц).

Письма дают ценную информацию из первых уст о витебских краеведах В.Г. Краснянском, П.М. Красавицком, а также содержат штрихи к истории семьи уроженца Витебска В.П. Даркевича[4]. Именно благодаря ему завязалась переписка Л.В. Алексеева с Н.В. Хруцкой. Владислав Петрович Даркевич – археолог, коллега Л.В. Алексеева по Институту археологии АН СССР. Он образно считал Л.В. Алексеева «витеблянином по призванию», а себя «витеблянином по рождению».

Из письма Хруцкой стало известно, что семьи Даркевичей и Краснянских связывало давнее знакомство как минимум с 1920-х гг. и продолжав-

[4] Даркевич, Владислав Петрович (01.09.1934, Витебск, БССР – 20.05.2016, Москва, РФ) – советский и российский археолог, доктор исторических наук, ведущий научный сотрудник Отдела средневековой археологии Института археологи и РАН, академик Российской академии естественных наук. Крупный специалист по истории и культуре Древней Руси, народной культуре Средних веков, связям Руси с Западной Европой, Византией и арабским миром, автор более 180 трудов.

шееся, судя по переписке их младших представителей, еще и в 1980-х гг. Мать Вячеслава Петровича, Ирина Ярославовна, подарила семье Краснянских книгу Алексеева. Из письма видно, как любили и свято чтили память В.Г. Краснянского в семье, как тяжело переживали его забвение. Поэтому книга Алексеева стала радостным событием для двух дочерей и внучки[5].

Алексеева интересовала информация о потомках В.А. Кадыгробова, но Н.В. Хруцкая таковой не располагала. Сообщила лишь краткие сведения о Лии Борисовне Шалыт, у которой учился в Витебском пединституте М.С. Рывкин и сохранил с ней хорошие отношения. Спрашивая о Лие Борисовне, Алексеев не предполагал, что в Друцке она была среди тех учителей, которым он проводил экскурсию, и они вместе были запечатлены на одной фотографии (Дадатак 17, фота 5).

Публикация этих писем в первоисточнике (Дадатак 17) позволяет ввести в научный оборот новый источник по истории Витебска и его ярких представителях.

Письма Н.В. Хруцкой стали сенсационной находкой и в значительной степени обогатили копилку нашей памяти и помогли получить дополнительную ценную информацию по истории некоторых музейных предметов.

Например, в ВОКМ хранится издание Краснянского «“Чарцёж” места Віцебску» (ВОКМ, КП 20469) с дарственной надписью: «Глубокоуважаемому Петру Матвеевичу Красавицкому на его строгий и беспристрастный судъ от автора 8 января 1929 г.»[6] (ВОКМ, КП 20469). Сегодня благодаря письмам мы знаем историю этого экземпляра последнего прижизненного труда Владимира Гавриловича. «Чарцёж» находился в числе других пяти книг, подаренных Краснянским своему другу Красавицкому, переселившемуся в Москву, после смерти которого издания были возвращены его вдовой семье Владимира Гавриловича в Витебск к их огромной радости.

IV. Вещевой материал

В ходе музейной инвентаризации и сверки фондов удалось выявить предметы, обнаруженные, судя по всему, Л.В. Алексеевым в траншее, где была найдена берестяная грамота. В молодые годы Л.В. Алексеев сам скрупулезно шифровал свои находки бисерным почерком. На выявленных двух предметах – литейной формочке и пряслице – рукой Леонида Васильевича выведено: «1959 пл. Свободы» (ВОКМ, КП 25667). Прорисовка части этих предметов была опубликована [6, с. 107, рис. 5: 1; 8, с. 165, рис. 39: 1, 3, 4], а сами они впервые были представлены для обозрения и знакомства на открывшейся 11 ноября 2021 г. выставке в Ратуше, приуроченной к 100-летнему

[5] В своей популярной книжке «По Западной Двине и Днепру в Белоруссии», описывая Мстиславль, Л.В. Алексеев вспоминает и цитирует историка В.Г. Краснянского [7, с. 121–122].

[6] Сохранена орфография оригинала.

юбилею ученого и научно-практической конференции «Витебские древности – VII».

С уверенностью можно сказать, что ВОКМ повезло получить в дар материалы части личного архива Л.В. Алексеева. Витебские материалы, как и весь комплекс этого архива, представляют большую ценность и являются весомым вкладом в копилку культурно-исторического наследия. Работа по обработке архива продолжается и, без сомнения, принесет новые открытия.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Алексеев, Л. В.** Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины / Л. В. Алексеев // Вопросы этнической истории народов Прибалтики: по данным археологии, этнографии и антропологии / под ред. С. А. Тарановой и Л. Н. Терентьевой. – Москва : Изд-во Акад. наук СССР, 1959. – С. 273–315. Труды Прибалт. объедин. комплексной экспедиции / под общ. ред. Х.А. Моора [и др.] ; Акад. наук СССР, Акад. наук Эстон. ССР, Акад. наук Латв. ССР, Акад. наук БССР ; Т. 1).

2. **Алексеев, Л. В.** Археология и краеведение Беларуси: XVI в. – 30-е гг. XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларус. навука, 1996. – 206 с.

3. **Алексеев, Л. В.** Витебский декабрист / Л. В. Алексеев // Неман. – 1970. – № 7. – С. 191–192.

4. **Алексеев, Л. В.** Западные земли домонгольской Руси. Очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л. В. Алексеев. – Москва : Наука, 2006. – Кн. 1. – 289 с.

5. **Алексеев, Л. В.** Западные земли домонгольской Руси. Очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л. В. Алексеев. – Москва : Наука, 2006. – Кн. 2. – 167 с.

6. **Алексеев, Л. В.** К истории и топографии древнейшего Витебска / Л. В. Алексеев // Советская археология. – 1964. – № 1. – С. 99–111.

7. **Алексеев, Л. В.** По Западной Двине и Днепру в Белоруссии / Л. В. Алексеев. – Москва : Искусство, 1974. – 141 с. – (Дороги к прекрасному).

8. **Алексеев, Л. В.** Полоцкая земля / Л. В. Алексеев. – Москва : Наука, 1966. – 296 с.

9. **Алексеев, Л. В.** Семеновская история / Л. В. Алексеев // Неман. – 1970. – № 4. – С. 190–191.

10. **Алексеев, Л. В.** Три пряслица с надписями из Белоруссии / Л. В. Алексеев // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института истории материальной культуры АН СССР. – 1955. – Вып. 57. – С. 129–132.

11. **Аляксееў, Л. В.** Віцебская даўніна / Л. В. Аляксееў // Маладосць. – 1972. – № 12. – С. 143–149.

12. **Аляксееў, Л. В.** Гогалеўская Беларусь Па забытых неапублікаваных матэрыялах / Л. В. Аляксееў // Полымя. – 1971. – № 12. – С. 203–214.

13. **Красьнянскі, В.** «Чарцёж» места Віцебску 1664 года як докумэнтальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва / В. Красьнянскі. – Мінск : [б. в.], 1928. – 55 с.

14. **Шарковская, Н. Ю.** Коллекция негативов личного архива Л. В. Алексеева в собрании УК «ВОКМ» / Н. Ю. Шарковская // Охрана и популяризация культурного наследия: мировой и отечественный опыт : материалы междунар. науч.-практ. конф., Витебск 22–23 октября 2021 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2021. – С. 198–203.

15. **Шарковская, Н. Ю.** О комплектовании фондов в первые годы работы Витебского отделения Белгосмузея (по материалам книг поступлений 1925–1927) // Материалы научно-практической конференции, посвященной 100-летию ВОКМ, Витебск, 14 дек. 2018 г. (в печати).

Шуминова И.О. *(г. Астрахань, Россия)*

«НАРОДНЫЕ ИСТОРИИ» В СОБРАНИЯХ АСТРАХАНСКИХ СЕЛЬСКИХ БИБЛИОТЕК

Тренд краеведческой работы общедоступных библиотек Астраханской области – сохранение локальной истории и культуры. Изучая историю своих сел, библиотекари собирают и устные рассказы, и воспоминания, и письменные документы – все то, что является словесным компонентом традиционной культуры, ее духовной областью.

Камызякская центральная межпоселенческая библиотека собрала современные «неотесанные» народные истории – поэтические и повествовательные, рассказанные жителями района. Современная народная мудрость и народные истории камызякцев были представлены в электронном сборнике от 98 рассказчиков, в нем стихи, песни, сказки, повествования… Их прислали в библиотеку жители практически из всех сел района. «Народные истории» транслировали и люди старшего поколения, и совсем юные камызякцы.

Виктория Габачиева родилась в 1942 г. и с тех пор проживает в родном городе Камызяк. Всю жизнь проработала врачом и в свободное время сочиняла сказки. В сборник вошли такие сказки, как «Снежная дева», «Пролеска», «Лелюшка-Березка»… Герои сказок, как и принято в сказочном жанре, – Мороз, Зима, бабушка, внуки, животные, растения…

«У, какая нынче непогода, снег так и сыпет клочьями, да и света нет, придется свечу засветить. Что-то неспроста осердилась Зимовеюшка, не жалеет шуб своих, вон как рвет клочьями. Ну да она богата, ей не жалко, – тихо приговаривала бабушка Агафья, вытаскивая ухватом из русской печки горшок с картошкой. – Ну, внучатки, к столу. Пора вечерять, сейчас вот свечу зажгу, да будем кушать картошечку с молоком. Ты, Васятка, садись на лавку поближе к окошку. Поглянь, как Зимовея бесится, видать, поругалась со своим братцем Морозом, вот он и спустил на нее своих собак Пургу да Бурана. Они-то злые у него, вот и рвут ее шубы. Настенька, а ты чего? Давай-ка за стол. Оставь кукол-то.

– Бабаня, – окликнул Васятка бабку Агафью, – вечер долгий, спать мы не хотим. Расскажи нам лучше, почему Зиму люди зовут то Зимовеей, то Зимовеюшкой?

– Бабуль, – спросила Настенька, – а правда, что у Зимовеи тоже есть внучка, и Зовут ее Пролеска? Только прячет ее Зимовея от всех», – так начинается сказка «Пролеска» [3, с. 82].

Вячеслав Кренделев проживает в с. Комаровка. Сочиняет песни о своем родном селе, своей малой родине (здесь и далее тексты даны в оригинале. – *Ред.):*

Ах, Комаровка, ты красавица.
Проходит речка над селом
Здесь все родное, все мне нравиться
И от того поем.
Вокруг в цветах поляны чистые,
А дышишь свежестью, какой!
Повсюду ветелки ветвистые
Склонились над рекой.
Здесь мы росли, здесь будем стариться,
Здесь время юности прошло,
Но в сердце навсегда останется
Любимое село! [3, с. 85].

И сегодня, в XXI в., не забывает Вячеслав о гармошке, с болью переживая ее страдания – невостребованность, объясняясь ей в любви и преданности:

Шевелит ветер лист березы,
Звучит гармошка на реке,
Ее скупые отголоски
Слышны порою вдалеке.
На ней так ласково играют
То торопясь, то не спеша,
Услышишь, сердце замирает
И бьется трепетно душа... [3, с. 85].

В собранных библиотекой материалах ценно то, что люди старшего поколения повествуют о событиях и нравах своего поколения, тем самым характеризуя эпоху и настроение уже исторического советского времени. Вот Александр Мотин из поселка Кировский рассказывает незамысловатую, но трогательную по своей искренности и наивной простоте историю:

«Это случилось, когда мне шел 45-й год. Работал я инженером в отделе техники безопасности одного из больших судостроительных заводов Астраханской области. Пришла ко мне сдавать вступительный экзамен по крановому хозяйству одна женщина. По ее ответам на мои вопросы я понял, что она – человек серьезный и к делу относится со всей отдачей и энергией. Как-то раз, проходя по цеху с контрольной проверкой, я заметил, что она машет мне рукой из кабины крана. Я поднялся к ней в кабину. Ее интересовали вопросы по бригадному подряду. Я начал ей отвечать. В это время кто-то

свистнул, что нужен кран. Она потянулась к открытому окошку и крикнула, чтобы пару минут подождали. В ее прогибе тела в платье из «шотландки» (помню это уже более 22 лет) было что-то особенное. Я понял, что погиб. Вернувшись к себе в кабинет, тут же написал ей стихотворение «Зачем ты родилась на старый новый год?». К концу смены отнес ей и подарил. Так зародилась любовь. С женой в это время у меня были напряженные отношения. Возможно, этот домашний дискомфорт еще больше усилил мое влечение к новой знакомой. За 4–5 месяцев я ей написал около ста стихов. Раньше я писал стихи, но очень редко. А тут будто душу мою прорвало!

И вот я решился сказать ей, что ухожу из семьи. Жена, когда я ей признался, что полюбил другую женщину, пришла в ярость и хотела даже меня зарезать, а потом упала в обморок. Успокоившись, сказала, что могу забрать, что хочу. Только мне ничего не надо было.

Но на следующий день моя избранница ответила, что дала добро другому человеку, который добивался ее уже давно. Я был в шоке, я решил покончить жизнь самоубийством, спрыгнув с самого высокого крана на бетонный пол цеха. Но в тот момент у этого крана не было работы, крановщица сидела внизу. Тащить ее вверх из-за моих проблем у меня не было желания. Могли бы потом и ее обвинить в моей гибели.

Бессонной ночью задумался: кому моя смерть нужна? Моей семье? Нет, здесь меня все любят. Моему начальнику? Нет. Ведь его же и затаскают из-за меня. Ей, этой моей любви? Нет. И я оставил все так, как было до нашего знакомства.

Впоследствии эта женщина призналась мне, что вынуждена была солгать о своем замужестве, не хотела разрушать мою семью. "Хороший ты человек, – сказала она, – но я никогда не смогу идти с тобой под руку на работу, если мне в спину будут глядеть печальные глаза твоего сына!".

Вот такова эта история. Прошло 22 года, а я все помню ее, хотя между нами никогда ничего не было» [3, с. 90].

Татьяна Старкова из села Образцово-Травино рассказывает историю войны 1941–1945 гг.:

«...О начале войны в Травино по телефону позвонили председателю сельсовета Матвею Воронину. Он и объявил об этом, когда всех жителей собрали на площади у колхоза. Всю жизнь он помнил крики и плач женщин. Отца с другими односельчанами увезли в Камызяк в военкомат, но через три дня он вернулся. В районе была установлена бронь на какое-то количество мужчин для работы в море, и он рассказывал, что оказался последним из этого списка. После этого его, вместе с другими односельчанами, отправили на заготовку леса в Ульяновскую область. Когда они в конце 1942 года вернулись, многие умерли от истощения и разных болезней. А в апреле 1943 года прабабушка Нюся вместе с отцом поехала в море ловить рыбу, в которой так нуждались бойцы советской армии. Наравне с мужчинами таскали мешки с

солью, носилки с рыбой, работали на «ставных» (ставили снасти), обрабатывали рыбу и в холод, и в ветер, и дождь. В море была рыба, соль и мука. Но девчонки, приготавливая еду, старались ее разнообразить. Лепили пирожки рыбные и варили их в котлах. С тех пор эти "рыбацкие пирожки" в нашей семье обязательное блюдо на всех застольях.

У Дзмітрыя Прышчэпава склаліся асаблівыя сяброўскія адносіны з класікам беларускай літаратуры Янкам Купалам. Нават знаходзячыся ў зняволенні, Д. Прышчэпаў станоўча характарызаваў беларускага песняра: *«Его авторитет был очень велик, как среди беспартийной интеллигенции, для которой являлся «властителем дум», так и среди партийцев. Для меня лично он являлся очень большим авторитетом и я его считал барометром белорусской интеллигенции, которая его считала своим кумиром»* [9, арк. 31].

Народнага камісара земляробства БССР і народнага паэта БССР аб'ядноўвала тое, што кожны паасобку ў свой час працаваў на Сенненшчыне. У канцы 1903 – пачатку 1904 г. малады Янка Купала служыў у канторы маёнтка Беліца, які належаў Карлу Свяцкаму. Там была створана інтэнсіўная гаспадарка, уводзіўся шматпольны севазварот, удасканальваліся прылады працы, разводзілася племянная жывёла [3]. Маёнтак Беліца і Сенненшчына ў цэлым неаднаразова станавіліся прадметам размовы Д. Прышчэпава і Янкі Купалы.

Дзмітрый Філімонавіч меў добрыя стасункі з братамі Гарэцкімі. З Гаўрылам ён сябраваў з часоў Інстытута беларускай культуры. Потым яны разам узначальвалі Беларускі навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя У.І. Леніна. Гаўрыла Гарэцкі пазнаёміў Дзмітрыя Прышчэпава са сваім братам Максімам, які быў пісьменнікам і фальклярыстам. М. Гарэцкі і Д. Прышчэпаў неаднаразова сустракаліся ў пісьменніцкім асяроддзі. Максім Гарэцкі быў у захапленні ад апавяданняў наркама пра Сенненшчыну, што нават вырашыў сам пабываць у тых краях. Падчас будаўніцтва чыгункі Орша – Лепель ён наведаў Сенненскі раён. Сустракаўся з сялянамі, школьнікамі і настаўнікамі. Запісваў народныя песні і абрады [10].

Па ўспамінах сваякоў, пяру наркама земляробства БССР належалі не толькі навуковыя артыкулы па сельскай гаспадарцы, але і мастацкія творы [1, с. 90–91, 93]. На жаль, апошнія, у адрозненне ад першых, не захаваліся. Д. Прышчэпаў быў арыштаваны разам са сваімі рукапісамі, якія пазней былі знішчаны.

Не толькі пісьменніцкае асяроддзе аказвала ўплыў на Дзмітрыя Прышчэпава, але і яго асоба накладвала адбітак на лёс творцаў літаратуры, на жаль, не заўсёды станоўчы. У другой палове 1920-х гг. жанр падарожных мастацкіх твораў быў вельмі папулярным. Да яго ў 1928 г. звярнуўся Міхась Зарэцкі. Склаўшы кампанію наркаму земляробства БССР, ён у кастрычніку 1928 г. паехаў у Любанскі раён на Мар'інскія балоты, каб паглядзець, як сяляне пераўтвараюць балотны край [6]. У Дзмітрыя Прышчэпава і Міхася Зарэцкага было шмат агульнага: абодва ўраджэнцы Сенненскага павета, абодва працавалі ў Віцебску, а затым у сталіцы БССР. За час падарожжа землякі яшчэ больш зблізіліся, больш даведаліся адзін пра аднаго. Ніхто з удзельнікаў паездкі тады не мог уявіць, што яна стане ракавой.

З 21 кастрычніка 1928 г. на старонках газеты «Савецкая Беларусь» пачалі друкавацца ўражанні Міхася Зарэцкага ад паездкі ў Любанскі раён [4]. У 1929 г. яны выйшлі асобнай кніжкай пад назвай «Падарожжа на Новую Зямлю» [5]. На першых старонках нарыса М. Зарэцкі паведамляў: *«склад нашай экспедыцыі такі: Змітро Халімонавіч Прышчэпаў і я»*. Неўзабаве пасля выхаду кнігі Д. Прышчэпава арыштавалі. Дамоклаў меч навіс і над пісьменнікам, бо атрымалася, што ён праслаўляў ворага народа. 6 снежня 1929 г. бюро ячэйкі КП(б)Б Белдзяржвыдавецтва прыняло пастанову аб выключэнні Міхася Зарэцкага з шэрагаў КП(б)Б. Дадзены дакумент быў пацверджаны рашэннем аб'яднанага сходу партячэек Белдзяржвыдавецтва, рэдакцый газет, Акадэміі навук, наркамата асветы [7], а таксама пастановай бюро Фрунзенскага райкама КП(б)Б г. Мінска [8]. Прычына выключэння канкрэтна абазначалася ў шматлікіх пастановах ячэек: «*М. Зарецкий (Косенков) использовал книгу «Падарожжа на новую зямлю» как средство для замаскированного нападения на генеральную линию Коммунистической партии. Эта книжка является сгустком кулацких взглядов на путь переустройства сельского хозяйства, является продолжением пропаганды национал-демократических и шовинистических взглядов, в частности, продолжает так называемую «театральную дискуссию» и является попыткой ревизии соответствующих партийных решений*» [7]. Міхасю Зарэцкаму ў адрозненне ад Дзмітрыя Прышчэпава пашанцавала болей – пісьменніка толькі выключылі з партыі.

Такім чынам, пісьменніцкае асяроддзе аказала вялікі ўплыў на Д.Ф. Прышчэпава. Ён пачаў пісаць і размаўляць па-беларуску. Гэта не з'яўлялася данінай модзе, не было звязана з палітыкай беларусізацыі, а ішло ад яго сэрца. Нават у зняволенні Д. Прышчэпаў пісаў родным лісты на беларускай мове.

ЛІТАРАТУРА

1. **Акшевский, И.** Он любил эту землю: повесть о наркоме, неправедно осужденном, сосланном и, вероятно, расстрелянном, не получившем после своей смерти пяди родной земли на могилу / И. Акшевский. – Минск : Беларусь, 1991. – 125 с.

2. **Бараноўскі, А. В.** «В буре»: часопіс Сенненскага павятовага выканкама / А. В. Бараноўскі // Актуальные проблемы источниковедения : материалы VI Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 23–24 апр. 2021 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2021. – С. 276–278.

3. **Бараноўскі, А. В.** Полымя (Беліца): гісторыя маёнтка і вёскі / А. В. Бараноўскі. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2015. – 41 с.

4. **Зарэцкі, М.** Падарожжа на Новую Зямлю / М. Зарэцкі // Савецкая Беларусь. – 1928. – 21 кастр. – С. 3 ; 23 кастр. – С. 5 ; 24 кастр. – С. 3 ; 25 кастр. – С. 3 ; 27 кастр. – С. 2 ; 28 кастр. – С. 2.

5. **Зарэцкі, М.** Падарожжа на Новую Зямлю / М. Зарэцкі. – Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – 67 с.

6. **Карніловіч, Э.** За што цкавалі Зарэцкага? / Э. Карніловіч // Маладосць. – 1991. – № 2. – С. 120–124.

7. **Лазутчик** класавага ворага // Рабочий. – 1929. – 8 сн. – С. 4.

8. **На крутым** павароце: ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929–1931 гг. : дакументы, матэрыялы, аналіз / Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і архіўнай справы. – Мінск : БелНДІДАС, 1999. – 384 с.

9. **Нацыянальны** архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 15п. Воп. 28. Спр. 7.

10. **Памяць** : гіст.-дакум. хроніка Сенненскага р-на / уклад. С. В. Шайко ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 2003. – С. 557.

11. **Чарот, М.** Суровы прыгавор падпісваю першым … / М. Чарот // Маладняк. – 1930. – № 12. – С. 10–12.

Бароўка В.Ю. *(г. Віцебск)*

МАСТАЦКАЯ АКСІЯСФЕРА УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Мастацкая аксіясфера пісьменніка – сістэма мастацкіх каштоўнасцей, прадстаўленых у выглядзе меркаванняў, вобразаў, ідэй як праяў каштоўнаснай свядомасці, што матывуюць дзейнасць пісьменніка і адбіваюцца ў яго творчасці. Мастацкая аксіясфера залежная ад сацыякультурных абставін, жыццёвых варункаў і эстэтычных імператываў канкрэтнага аўтара канкрэтнага часу.

Мастацкая аксіясфера Уладзіміра Караткевіча знайшла выяўленне ў розных жанрах, але найбольш поўна яна адбілася ў вершах, асабліва прысвечаных знакамітым дзеячам і творам сусветнага і айчыннага мастацтва, і ў літаратурна-крытычных працах. Бадай, самая каштоўная крыніца асэнсавання Караткевічам крытэрыяў эстэтычнай вартасці твораў, – яго вершы літаратурна-герменеўтычнага плана, дзе вобразнасць дэтэрмінуе полісемантычнасць. Увагу Уладзіміра Караткевіча выклікалі творы жывапісу, музыкі, архітэктуры, скульптуры, літаратуры. Бясспрэчна, выдатныя помнікі

мастацтва акумулююць багаты эстэтычны і жыццёвы вопыт, валодаюць вялікай сілай уздзеяння на чалавека. Беларускі паэт у многім салідарызаваўся з думкай Льва Талстога пра магутную аб'яднальную сілу мастацтва. Менавіта гэтай ідэяй прасякнута большасць яго твораў, дзе інтэрпрэтуюцца мастацкія шэдэўры розных эпох і народаў. Уладзімір Караткевіч спрабаваў шляхам аналізу сродкамі літаратуры вядомых помнікаў культуры раскрыць сваё разуменне каштоўнасці зробленага выбітнымі талентамі. Відаць, не выпадкова, што лінія мастацкага даследавання культурнай спадчыны была магістральнай на пачатку яго літаратурнага шляху, калі пісьменнік апынуўся перад выбарам творчых арыенціраў. Так, у прыватнасці, праз фрагментарнае асэнсаванне ў вершаванай форме твораў італьянскага мастацтва эпохі Рэнесансу знайшлі выяўленне раннія аксіялагічныя прыярытэты Уладзіміра Караткевіча. На першае месца паэт ставіў жыццёвасць, пераканаўчасць і майстэрства адлюстравання. Адзін з ранніх вершаў Уладзіміра Караткевіча – «Нараджэнне Венеры» (1957). Вядомае жывапіснае палатно Сандра Бацічэлі для лірычнага героя паэта – апалогія жаночай красы, кахання. Сюжэт карціны Бацічэлі становіцца мікрасюжэтам адчування лірычнага героя У. Караткевіча: «За вокнамі дзень дагарае, / Знікае агнёў ракой. / І ты з карціны сплываеш / У змрочны, ціхі пакой. / Чужая, зусім чужая, / Ніколі не будзеш маёй. / Вочы твае і цела / Стварыў калісь Бацічэлі / Шмат стагоддзяў таму / На муку маю, / На муку. / На вечную ў сэрцы зіму» [2, с. 358]. У ранні ж перыяд творчасці Караткевічам быў таксама напісаны невялікі верш «Мастакам» (1957), у цэнтры якога разважанне пра лёс твораў мастацтва, яго функцыі мадэлявання і мемарыялізавання. У трактоўцы паэта сапраўднае, высокае мастацтва, угрунтаванае на майстэрстве, забяспечвае бессмяротнасць аўтару, дзяржаве і народу, да якога належаў аўтар. Малады беларускі паэт недвухсэнсоўна падкрэсліваў: «Рым загінуў ад дзіды вандалаў, – / Рым жыве ў Ювенала радках!» [2, с. 349]. Старажытнарымскі паэт Ювенал увайшоў у гісторыю літаратуры як аўтар бліскучых сатыр і як выдатны дэкламатар. Пафас вершаваных радкоў Караткевіча зводзіўся да ўзвелічэння паэта з вялікай літары, што праславіў сябе, свой час, зрабіў важкі ўнёсак у культуру Старажытнага Рыма. Мастацтва, на думку беларускага паэта, павінна абагульняць з'явы. Гэта ідэя раскрываецца У. Караткевічам у гумарыстычным вершы «Medusa ludovisi ў Рыме»: «Спіць Эрынія. Ў грозных веях / Цень прароцтва вялікага лёг. / Помста спіць. Касмылёў змеі / У спакоі тояць скачок. / Спіць яна бяздумна і глуха. / Сны аб праўдзе і роўнасці сніць…» [2, с. 236–237]. Статуя «Medusa ludovisi» Джавані Ларэнца Бярніні – помнік барочнага стылю. Эрыніі – багіні помсты і нянавісці. «Medusa ludovisi» Бярніні часта атэстуецца як помнік жаночай зайздрасці. Дарэчы, у другой палове XX ст. гэта галава мядузы Бярніні стала эмблемай сусветнавядомай фірмы Вярсачэ. У вершы Караткевіча канцэптуальна-іранічна згадваецца багіня помсты і нянавісці, узноўленая Бярніні: адпачынак лечыць,

разам са сном чалавека пакідае злосць: «Ціхі гук: / Будзільнік над вухам / Папярэдзіў, што зазвініць» [2, с. 237].

Ядро мастацкай аксіясферы Караткевіча ўключала паняцце цікавасці. Твор абавязаны, паводле пісьменніка, быць цікавым. Цікавасць можа выклікаць або змест (тэмы, праблемы, ідэі), або форма, у прыватнасці, плённыя прыёмы, прадуктыўныя спосабы ўвасаблення чалавека і рэчаіснасці. Мастацкі твор каштоўны сваім уздзеяннем на чалавека, уменнем закрануць струны яго душы. Творы класікі – яскравае таму сведчанне. Арыгінальнай інтэрпрэтацыяй музычнага шэдэўра Франца Шуберта можна назваць ранні верш У. Караткевіча «Зімняя элегія» (1958), дзе аўтар выкарыстоўвае класічную літаратурную форму элегіі і як рамантык па светаадчуванні згадвае пра рамантыкаў у галіне музыкі Пятра Чайкоўскага і Франца Шуберта. Чайкоўскі, стваральнік яркіх дынамічных музычных вобразаў, – любімы кампазітар каханай лірычнага героя і яго самога. Караткевічава «Зімняя элегія» прасякнута настальгічным настроем. Сум лірычнага героя па няспраўджаным каханні выліваецца ў роздум пра жыццё: «Як лёгка размінуцца з той, адзінай, / Якой чакаеш, можа, сотні год!» [2, с. 49]. Зімовым вечарам лірычны герой згадвае каханую, слухае музыку Шуберта, адчувае гаючае ўдзеянне гукаў яго «Зімовага шляху»: «Шыпіць пласцінка. Ў сэрцы многа дум. / Кручу «Над домам флюгер ёсць у любай». / І Шуберт падзяляе ціхі сум» [2, с. 49]. Вобраз зімняга шляху ў вершы Караткевіча полісемантычны: гэта і ўвасабленне нешчаслівага кахання, і чалавечага лёсу, і рэальны малюнак зімовай дарогі, аднак для лірычнага героя паэта музыка Шуберта – найперш выяўленне яго ўзрушанага душэўнага стану: «О «Зімні шлях»! Забытыя будынкі, / Забыты водар ад каханых губ» [2, с. 49]. Рамантычны па стылі песенны цыкл Шуберта, як вядома, быў заснаваны на антытэзах святла і ценю, мары і рэчаіснасці, чаргаванні мажорных і мінорных частак. «Зімні шлях» з 24 песень – разважанне кампазітара пра чалавечае жыццё. У трактоўцы Франца Шуберта зімні шлях ёсць шлях па спіралі, безвыніковы па сваёй сутнасці шлях, шлях у нікуды. Магчыма, на такое разуменне жыцця кампазітара падштурхнулі абставіны асабістага жыцця, бо «Зімні шлях» быў створаны фактычна за год да смерці вялікага кампазітара. Вакальны цыкл Шуберта пераканаўча занатоўваў настрой чалавека, які перажыў жыццёвую драму і страціў надзею на лепшае. Лірычны герой Караткевіча, што перажыў драму кахання, выступае своеасаблівым апанентам кампазітара, жыццё не бачыцца яму марным, безвыніковым, асабістая драма не расчаравала ў жыцці і людзях, не пазбавіла высакародства, ён удзячны сваёй каханай: «Я дзякую табе. Няхай чужая, / Няхай твой твар для іншага жыве, / Ты ёсць, ты недзе ёсць, і ты жывая, / Ты ходзіш веснім ранкам па траве!» [2, с. 49].

Прыгажосць, дасканаласць, арганічнасць – істотныя складнікі каштоўнасці мастацкага твора. У вершах «Дзіва на Нерлі» (1958) і «Каложа» (1967) паэт занатоўвае ўражанні ад убачаных помнікаў архітэктуры. Царква

Пакрава на р. Нерлі – выдатны помнік старажытнарускага дойлідства: «Белая песня ў лугах залацістых, / Кліч адзвінеўшых стагоддзяў зямлі, / Кволая-кволая, чыстая-чыстая, / Быццам дзяўчына, царква на Нерлі» [2, с. 82]. Паводле лірычнага героя, прыгажосць мае ахоўную сілу, яна дапамагла захавацца культаваму будынку, яна назаўсёды занатавалася ў людской памяці: «Ўсім, хто навек адыходзіў к ценям, / Снілася ты на райскіх лугах, / З яснай журбою па убіенным, / З ценем усмешкі ў мокрых вачах» [2, с. 82]. «Маленькая цэркаўка ў шатах векавых дрэў», «адзін з найвялікшых шэдэўраў дойлідства старажытных славян» [3, с. 483] XII стагоддзя таксама апеты Караткевічам як увасабленне прыгажосці, што артыкулюе непаўторнасць роднай зямлі, бо Барысаглебская царква з'яўляецца арганічнай часткай яе ландшафту: «Ўся адзіная, ўся са святла, / З небам, з Нёмнам, з зямлёю злітая, / З сэрцам нашым – Каложа ўзрасла» [2, с. 227]. Выгляд помніка старажытнай царкоўнай архітэктуры ў лірычнага героя адначасова нараджае сум і радасць: «Каложа, туга мая светлая!.. / Ў чорны Нёман на чорным шкле / Сіняй кропляй спадае ракета, / Быццам зорка ў ціхі Бетлем» [2, с. 226]. Каложа для лірычнага героя – сімвалічны вобраз роднага краю: «Ўся – крышталь невыказна сіні, / Ўся як край наш, як сон, як вясна» [2, с. 227]. М.М. Бахцін слушна заўважыў: «Аўтар у сваёй творчасці кіруе тымі каштоўнасцямі, якімі жыве яго герой» [1, с. 151]. Лірычны герой вершаў Караткевіча пра мастацтва і яго творцаў – асоба аўтабіяграфічная і аўтапсіхалагічная, духоўны двайнік аўтара, які акцэнтуе яго настроі і высновы.

Ядро мастацкай аксіясферы Караткевіча ўключае наяўнасць абагульнення і прадказання, нават прароцтва, у творы і, бясспрэчна, праўдзівасць. У вершы «Прарок Геронім Босх» (1958) нагадваецца, што славуты нідэрландскі мастак канца XV – пачатку XVI ст., які стварaў свае палотны ў трагічны для сваёй радзімы перыяд акупацыі іспанцамі, прарочыў: «Вы, васковыя душы, / З ланцугоў кашмары спусцілі, / Вы над роснай зямлёю / Смерці грыбы ўзрасцілі…» [2, с. 90]. Геронім Босх не цураўся паказу жудасных момантаў і надзвычайных прадметаў кшталту машын, падобных да танкаў XX ст. Босх быў з ліку тых творцаў, «што з праўдай дружыў» [2, с. 89]. Мастака трывожылі паводзіны суайчыннікаў: «Ён бачыў, што душы прыгнечаных / Не сталь, а бязвольны воск, / І прарочыў дрэнным людзям / Геній Геронім Босх. / Сваёй неўтаймоўнай фантазіяй / Выклікаў ён пачварныя здані» [2, с. 90]. У вершы «Трызненне мужыцкага Брэйгеля» (1958) творца прадстае прарокам і адначасова аналітыкам, філосафам. Славуты нідэрландскі мастак XVI ст. Пітэр Брэйгель Старэйшы, празваны «мужыцкім», аўтар палотнаў «Сляпыя», «Краіна гультаёў», «Падзенне Ікара», «Сялянскі танец» і іншых, рэпрэзентаваны чалавекам уважлівым і цікаўным: «У чалавека вочы мудраца / І з'едлівая сумная ўсмешка, / І каб схаваць яе ад крамароў, / Ён нізка капялюх на твар насунуў. / Ён ходзіць цэлы дзень. Ідзе ў трушчобы, / Ў багатыя кварталы, ў крамы, ў гавань. / Адценні фарбаў, твары і ўсмешкі – / Ўсё застаецца ў

памяці яго» [2, с. 92]. «Мужыцкі Брэйгель» не проста назірае, ён шукае характарныя вобразы сваіх суайчыннікаў, што рэпрэзентуюць месца і гістарычны час, прадказваюць будучыню: «Ён бачыць тоўстых бюргераў за півам, / Сляпога, што пяшчотна гладзіць скрыпку, / Сталы, што цяжка крэкчуць ад жратвы, / Настаўленай на іх. На нізкім ганку / Стаіць шынкарка і глядзіць на плошчу» [2, с. 92]. Палотны Пітэра Брэйгеля Старэйшага правакавалі шукаць адказы на пытанні: «Хто вы такія, як назваць вас, людзі? / Куды краіна з вамі забрыдзе? / Сляпыя! Мёртвыя! Яны ідуць, / Паклаўшы рукі на плячо пярэдніх, / І іх вядзе сляпы. І проста ў яму / Ён падае. / А заднія не бачаць, / І, як раней, застыў на іх тварах / Самаздаволены па-свінску гонар» [2, с. 92].

Каштоўнасныя крытэрыі аўтара занатаваліся і ў вершах пра літаратараў. У. Караткевіч прызнаваўся, што ў студэнцкія часы больш наведваў бібліятэку, чым лекцыі выкладчыкаў, бо «там мне грымелі, шапацелі, спявалі Дастаеўскі і Сафокл, Шаўчэнка і ўсе старыя ўкраінскія, беларускія і іншыя гісторыкі, там былі Катул, Антоніч, Рыльке, паэты «Млодай Польскі», Бунін, Ясенін і Грын, стаптаны тады Важдаевым з зямлёю, невядомы мне да таго (ды, па-мойму, і на радзіме тады не сярод усіх папулярны) Норвід» [4, с. 121]. Мастацкая спадчына класікаў прыводзіла Караткевіча да нетрывіяльных высноў. Своеасаблівае прачытанне творчасці двух вядомых беларускіх пісьменнікаў ён рэпрэзентаваў у вершах «Паўлюк Багрым» (1958) і «Багдановічу» (1966). Для Караткевіча Паўлюк Багрым (апошнім часам некаторыя літаратуразнаўцы лічаць асобу Паўлюка Багрыма літаратурным міфам, а аўтарства вершаў прыпісваюць былому адвакату Яцкоўскаму, аўтару мемуараў пра 1820-я гг.) – змагар за праўду, сацыяльную роўнасць, нацыянальныя інтарэсы суайчыннікаў, а не чалавек, што скардзіцца на лёс і просіць у яго літасці. Гісторыкі беларускай літаратуры нярэдка проціпастаўляюць Янку Купалу і Максіма Багдановіча як родапачынальнікаў двух вектараў развіцця айчыннай паэзіі – сацыяльна арыентаванага і эстэцкага (у манаграфіі Яна Чыквіна падрабязна разглядаецца хроніка гэтай антыноміі) [5]. У. Караткевіч здолеў вызначыць нечаканы, але надзвычай важны складнік каштоўнасці багдановічаўскай спадчыны. Веліч Максіма Багдановіча ў вершы-прысвячэнні «Багдановічу», паводле паэта другой паловы XX ст., у майстэрстве, уменні прадбачыць перспектыўныя лініі развіцця літаратуры: «Ты прыйшоў / І гарачым словам / Рунь узняў на роднай зямлі» [2, с. 228]. Вартае асобнага захаплення паэтава слова: «Нізка голаў схіляю, юнача, перад вечным глаголам тваім» [2, с. 228]. Багдановіч вялікі і тым, што ён абуджаў нацыянальны гонар беларусаў: «Ты сказаў нам: / Унукі Скарыны, / Дзе ваш гонар, моц і краса? – / Ёсць і ў вас, як у іншых, святыня. / Не давайце святыню псам!» [2, с. 228–229]. Дарэчы, у артыкуле «Летапісец», напісаным, як і верш, у 1966 г., Караткевіч адзначыў, што Максім Багдановіч «быў наскрозь гістарычным паэтам, у тым сэнсе, што абуджаў у народзе гістарычнае мысленне, а значыць, гонар» [4, с. 305], «даў у рукі арыядніну ніць, каб не заблукаў у

цёмных лабірынтах беларускага мінулага [4, с. 307]. Максім Багдановіч даў нам першы ўрок гісторыі. Даў яго, нарадзіўшы ў нашых людзях гонар за сваё мінулае, і гістарычнае мысленне, і веру ў будучае» [4, с. 310]. Трапна, ярка, метафарычна У. Караткевіч заўважыў пра Максіма Багдановіча: «знічка, якая прарэзала на імгненне неба, а апаўшы на зямлю, запаліла зніч» [2, с. 572].

Мастацкая аксіясфера Уладзіміра Караткевіча складвалася пад уплывам жыццёвага і мастацкага вопыту. У ёй вылучаюцца цэнтр і перыферыя. Цэнтр аксіясферы – гэта сукупнасць найбольш значных з пункту гледжання творцы якасцей, што вызначаюць вартасці твора і аўтара, перыферыя – сукупнасць якасцей так званага другога і трэцяга парадку. Праўда жыцця, глыбіня яго спасціжэння, значнасць мастацкіх абагульненняў, майстэрства ўвасаблення мастацкай думкі, арыгінальнасць складалі ядро мастацкай аксіясферы Уладзіміра Караткевіча. Надзённасць, публіцыстычнасць, акцэнтаваная эксперыментальнасць, як сведчыць літаратурная спадчына пісьменніка, знаходзіліся на перыферыі яго мастацкай аксіясферы.

ЛІТАРАТУРА

1. **Бахтин, М. М.** Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – Москва : Искусство, 1979. – 480 с.

2. **Караткевіч, У.** Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987–1991. – Т. 1 : Вершы, паэмы. – 1987. – 431 с.

3. **Караткевіч, У.** Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987–1991. – Т. 8, кн. 1 : П'есы. Нарыс. – 1990. – 591 с.

4. **Караткевіч, У.** Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987–1991. – Т. 8, кн. 2 : З жыццяпісу. Нарысы. Эсэ. Публіцыстыка. Постаці. Крытыка. Інтэрв'ю. Летапіс жыцця і творчасці. – 1991. – 495 с.

5. **Чыквін, Я.** Ідэя. Вобраз. Інтэрпрэтацыя / Ян Чыквін. – Беласток : Белавежа, 2014. – 168 с.

Бут-Гусаім С.Ф. *(г. Брэст)*

ВОБРАЗНА-ВЫЯЎЛЕНЧАЯ РОЛЯ АНТРАПОНІМАЎ У КАНТЭКСЦЕ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ АЛЕСЯ АСІПЕНКІ

Творы ўраджэнца Віцебшчыны Алеся Асіпенкі – яскравы і таленавіты летапіс нядаўняй беларускай гісторыі. Для раманаў і аповесцей пісьменніка характэрны надзённасць праблематыкі і вастрыня пастаўленых сацыяльных пытанняў, якія спалучаюцца з добрым веданнем псіхалогіі і ўнутранага свету персанажаў, а таксама з уменнем перадаць тонкія нюансы людскіх адносін. Аналіз антрапанімікона рамана «Лабірынты страху», а таксама аповес-

цей «Цыркачка і маёр», «Клетка для берасцянак» і апавяданняў А. Асіпенкі паказаў, што пісьменнік умела выкарыстоўвае вобразна-выяўленчыя магчымасці асабовых імён, прозвішч, мянушак.

Антрапанімікон твораў Алеся Асіпенкі быў ахарактарызаваны намі з пункту гледжання такога крытэрыю, як ступень ***значымасці*** (інфарматыўнасці, сэнсавай актыўнасці).

Мінімальная ступень значымасці ў так званых ***нейтральных імён***, значэнне асновы якіх, іх этымалогія не нясуць інфармацыі пра асаблівасці характару персанажа, не выражаюць ацэнкі літаратурнага героя. Яны выконваюць выключна ***намінатыўна-ідэнтыфікуючую*** функцыю. Так, большасць асабовых імён персанажаў твораў Алеся Асіпенкі адносіцца да ліку нейтральных онімаў. Гэта словы ***Геранім, Пракоп, Улляна, Язэп, Серафім, Тэкля, Фруза, Аўдакім, Піліп, Васіліса*** і інш. Гэтыя лексемы запазычаныя з грэчаскай, лацінскай, старажытнаяўрэйскай і іншых моў. Такія онімы прыйшлі на Беларусь з прыняццем хрысціянства. Нейтральнае імя можа стаць характарыстычным для таго ці іншага чытача. Э. Магазанік адзначае: «Часам аўтар не імкнуўся надаць таму ці іншаму ўласнаму імені ні рэчыўнага, ні эмацыянальнага “сэнсу”, чытач жа “значэнне” ў імені бачыць. Але калі для такога чытацкага ўспрымання ёсць нейкія – няхай і слабыя – падставы, пры ўмове, што чытацкае “асэнсаванне” імені не пярэчыць сутнасці створанага вобраза, то з такім чытацкім “самавольствам можна згадзіцца”» [2, с. 51]. Напрыклад, адзін з герояў рамана А. Асіпенкі «Лабірынты страху» носіць, на першы погляд, нейтральнае імя ***Серафім***, якое паходзіць ад яўрэйскіх слоў «палымяны, гарачы, уладарны» [5, с. 31]. Імя адпавядае сутнасці носьбіта – чалавека, надзеленага ўладай. ***Серафім*** Недасейка займае высокую пасаду старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гэта чалавек з гарачым сэрцам, чуллівай душой, неабыякавы да людзей. З дзяцінства Серафім задумваецца над вечным пытаннем прызначэння чалавека ў жыцці. Герой вымушаны рабіць цяжкі выбар паміж прывітымі маці і цёткай Дар’яй ідэаламі жыцця з Богам у душы і прапанаванымі айчымам Маркам Удоевым ідэямі класавай барацьбы. Пакутліва ўпісаўся ***Серафім*** у непрымальную ўдоеўскую мараль. Дасягнуўшы кар’ерных вяршынь, ***Серафім*** Недасейка не страціў чалавечых якасцей, не ачарсцвеў. Сэрца і душа яго не вытрывалі нечалавечай нагрузкі, і пісьменнік памірае, пакінуўшы нашчадкам шчымлівапраўдзівы твор «Жніво пад чорным сонцам» пра лёс чалавека і пакалення, атручанага глабальнай хлуснёй і нечалавечым страхам.

Максімальнай ступенню семантычнай актыўнасці характарызуюцца ***прамагаваркія антрапонімы***. Гэтыя імёны маюць празрыстую семантыку, яны характарызуюць прама, непасрэдна, з’яўляючыся свайго роду ярлыкамі, якія прадвызначаюць характар успрымання і ацэнкі героя. В. Фанякова адзначае: «Гэтыя імёны падобныя да масак героя ці злачынцы ў сярэдневяковым тэатры, па якіх глядач адразу ведаў: хто перад ім» [4, с. 44]. Да ліку ***прама-***

гаваркіх антрапонімаў адносяцца найперш ***мянушкі***. Яны характарызуюцца найбольш яркай і празрыстай унутранай формай. Найперш, гэта празванні, якія характарызуюць знешняе аблічча персанажа. Яны нагадваюць партрэт, а дакладней карыкатуру на героя, у якой на першы план выносіцца самая кідкая рыса чалавека. Прэзентаваць знешнасць можна праз мянушку-метафару, пабудаваную на аснове падабенства персанажа з пэўным прадметам або жывой істотай, напрыклад: *«У іхняй кампаніі верхаводзіў Баранаў, якога за вочы звалі* ***Бараном****. Ён і праўда нагадваў* ***барана****: светлыя валасы віліся колцамі, сінія вочы заўсёды бессэнсоўна глядзелі як бы ў нікуды, а да ўсяго ён быў тупы, але меў сілу і падтрымку Хана»* [1, с. 308]; *«Ігар нахабна смяяўся, ягоны шырокі твар нагадваў піражок, памазаны яечным жаўтком. “А ты* ***Піражок****, во!” – крыкнуў Серафім і шыбануў па вінтавой лесвіцы ўніз»* [1, с. 309]. Самую кідкую рысу знешнасці *«залатушнага белабрысага падлетка»* [1, с. 309] Яшкі акрэслівае яго мянушка ***Альбінос***, а дзюбаносага Вальку можна намаляваць праз яркую рысу яго аблічча, занатаваную ў мянушцы ***Лыч***. Камплекцыю падлетка абмалёўвае характарыстычнае празванне ***Бык***. Згаданыя мянушкі належаць героям рамана «Лабірынты страху». Знешнасць персанажа апавядання «Школьная фатаграфія», чысцюлі і пухлячка Федзі, перадае мянушка ***Пончык***.

Ускоснагаваркія імёны пазбаўлены зададзенасці і прасталінейнасці прамагаваркіх онімаў. Антрапонімы гэтага тыпу маюць «зацемненую» ўнутраную форму, для высвятлення якой патрэбны кантэкст, часам асэнсаванне зместу ўсяго твора. Э.Б. Магазанік адзначаў: «Такія імёны – не шыльда, якая загадзя тлумачыць чытачу тое, з кім ён мае справу, а акампанемент, які гучыць толькі для чулага вуха. Спасцігнуўшы падтэкст такога прозвішча, расшыфраваўшы тайныя знакі аўтарскай характарыстыкі героя, мы ўзбагацім сваё ўспрыманне мастацкага твора» [2, с. 30].

Прозвішча галоўных персанажаў аповесці «Клетка для берасцянак» нясе важную сэнсавую нагрузку. Паэтонім ***Церпілоўскія*** можна назваць прадказальнікам лёсу герояў – прадстаўнікоў шляхетнага роду. Кожны з ***Церпілоўскіх*** перажывае нялёгкія, часам трагічныя выпрабаванні ў жыцці. Старэйшы прадстаўнік сям’і, святар, быў рэпрэсаваны і загінуў. Перажыў ён і асабістую, сямейную трагедыю. Сын яго, Канстанцін, захапіўшыся ідэямі ваяўнічага матэрыялізму, адмовіўся ад шляху служэння Богу і стаў урачом. На долю Канстанціна выпалі цяжкія выпрабаванні ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Годна вытрываўшы іх, герой перажывае здраду найбліжэйшага члена сям’і, зяця Карпа Хіжняка, па даносе якога ***Церпілоўскі*** трапляе ў турму. Унук Канстанціна Вячаслававіча вырашыў вярнуцца на шлях, накрэслены продкамі-святарамі, стаўшы служыцелем царквы. Бацька-камуніст адракаецца ад сына, і па змесце твора мы можам здагадацца, што айца Уладзіміра, які стаў бацюшкам у савецкай дзяржаве, чакаюць нялёгкія выпрабаванні. Характарыстычнае прозвішча ***Церпілоўскія*** – свайго роду прадказанне тра-

гічнага лёсу не толькі адной сям'і, але і цэлага пакалення, абпаленага рэвалюцыяй, калектывізацыяй, вайной.

Трагічны лёс творча адорных асоб, якія не могуць жыць, як усе, перадае гаваркое прозвішча персанажаў апавядання «Лаўрэат мясцовага конкурсу» ***Адзінец***. Кантэкст спрыяе раскрыццю ўнутранай формы паэтоніма: *«Мікалая* ***Адзінца*** *зусім за чалавека не лічылі. Ён быў не тое што дурнаваты, але дужа дзіўны. Усё нечага шукаў, бадзяючыся па свеце, але навучыўся толькі аднаму – добра іграць на скрыпцы»* [1, с. 408]. Пагардліва, здзекліва ставіліся вяскоўцы і да дачкі Мікалая Ганны: *«Які ж гэта чалавек, што толькі і ўмее іграць на скрыпцы ды цымбалах»* [1, с. 409]. Вяскоўцы і нават муж, які кахаў Ганну, так і не паверылі, што яна ў часы вайны служыла немцам па заданні партызан. Адзінота, адасобленасць гераіні ад людзей падкрэсліваецца як у наступных аўтарскіх заўвагах: *«Ганна так і жыве.* ***Адна****, як* ***ваўчыца»*** [1, с. 409], так і ў словах самой Ганны: *«Усё даўно перабалела. Я адна,* ***ваўчыца****, а не чалавек»* [1, с. 409].

Да ўскоснагаваркіх онімаў адносіцца прозвішча аднаго з галоўных персанажаў аповесці «Цыркачка і маёр» – ***Зяблік***. Матывацыя кантэкстам дазваляе вызначыць унутраную форму характарыстычнага найменння. Маёр-франтавік ***Зяблік*** марыў аб прыгожым пасляваенным жыцці. Смелы і рашучы на вайне, сем разоў ардэнаносец, Зяблік аказаўся непрыстасаваным да мірнага жыцця, да скрытай подласці, прыхаванай пад абліччам прыстойнасці. Ён так і не не здолеў пабудаваць сямейнага гнязда: жонка ***Зябліка*** становіцца каханкай Цанавы, а сын трапляе ў дзіцячы дом. Сам ***Зяблік*** на доўгія дванаццаць гадоў апынуўся ў лагеры. Характар і лёс слабага безабароннага чалавека, які не змог знайсці чалавечай цеплыні ў жыцці, пабудаваць свайго гнязда-прытулку, перадае гаваркое прозвішча ***Зяблік***.

У аснове прозвішча ***Кротаў***, якое маюць героі рамана «Лабірынты страху», ляжыць назва жывёлы, што жыве пад зямлёй і ўпотай прыносіць шкоду чалавеку. У народнай свядомасці захавалася ўяўленне пра тое, што крот – жывёла, якая адарвалася ад Бога і служыць нячысціку. Героі рамана – Панкрацій і Глеб ***Кротавы*** – бесчалавечныя, бязлітасныя вінцікі карнай савецкай сістэмы, для якіх *«турэмны наглядчык – работа плёвая, а зарплата добрая, паёк, абмудзірванне, дзве пары парцянак»* [1, с. 326]. Паводле ***Кротавых***, *«усе людзі дзеляцца на тых, хто сядзіць, і на тых, хто іх вартуе»* [1, с. 326]. Дзеля таго, каб палепшыць жыллёвыя ўмовы і пераехаць з падвальных памяшканняў камунальнай кватэры ў пакоі на верхніх паверхах, Кротаў-старэйшы піша данос на суседзяў па кватэры. Ахвярамі Кротава-малодшага становяцца сябры і іх сем'і. Такім чынам, прозвішча цалкам адпавядае асобам сваіх носьбітаў, выяўляючы сутнасць герояў.

Прозвішча галоўнага героя рамана «Лабірынты страху» Серафіма ***Недасейкі*** суадносіцца са значэннем словазлучэння '*не дасеяць*' *(не завяршыць сяўбу)*. Герой рамана, таленавіты, адораны чалавек, творца, так і не здолеў

выканаць свайго пісьменніцкага і чалавечага абавязку. ***Недасейка*** губляе на дарогах вайны каханую жанчыну – першую жонку Любу, а ў час пахавання Сталіна і сына-першынца Лёніка, які, адарваўшыся ад сям'і, становіцца паэтам ***Грышам Няпомняшчым.*** Адораны пісьменнік, *«жывучы пад каўпаком прыгнётлівага страху»* [1, с. 328], ***Недасейка*** на працягу ўсяго жыцця далучаўся да ўсеагульнай хлусні пра шчаслівае жыццё ў савецкай краіне, дзе нібыта не было крывавых рэпрэсій і трагічных наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Шукаючы на працягу ўсяго жыцця выйсця з лабірынтаў страху, творца ўрэшце прыходзіць да апошняга і самага трагічнага рамана *«Жніво пад чорным сонцам»*, які так і застаецца незакончаным і ненадрукаваным. Невядомымі чытачам застаюцца творы адкрытага ***Недасейкам*** таленавітага пісьменніка Алега Максімава. Вярнуўшыся ў канцы жыцця да неўміручых маральных запаведзей, герой твора памірае, так і не вырашыўшы канчаткова пастаўленых перад самім сабой маральных і мастацкіх задач.

Ужыванне ***імён-рэмінісцэнцый*** заснавана на «перанясенні пэўных рыс асобы, названай іменем-арыгіналам, на іншы персанаж, у адносінах да якога наўмысна выкарыстоўваецца імя вобраза-"першакрыніцы"» [3, с. 11]. У найменні аднаго з найвышэйшых партыйных дзеячаў Беларусі, героя рамана «Лабірынты страху» ***Мікіты Леанідавіча***, невыпадкова спалучаюцца імёны самых вядомых савецкіх кіраўнікоў – ***Леаніда*** Брэжнева і ***Мікіты*** Хрушчова. ***Мікіта Леанідавіч*** з'яўляецца прадаўжальнікам традыцый савецкай партыйнай эліты, замоўчваючы страшныя наступствы Чарнобыльскай катастрофы. Працягваюцца ***Мікітам Леанідавічам*** найгоршыя савецкія традыцыі і ў адносінах да творцаў: *«**Мікіта Леанідавіч** зацята не любіць творчую інтэлігенцыю, пагарджае ёю, абзываючы нядобрымі словамі. Ён амаль нічога не чытаў. Калі і ведаў пэўныя творы, дык толькі па падрыхтаваных памочнікамі даведках, у якіх пераказваўся змест і даваліся рэкамендацыі, на што трэба звярнуць увагу – пахваліць ці, наадварот, пакрытыкаваць нейкія мясціны*» [1, с. 330].

Паэтонімы-вобразы ілюструюць магчымасць развіцця ў імёнах рэальных гістарычных асоб і персанажаў літаратурных твораў ***пераносных (метафарычных) значэнняў***. У аснове антрапанімічнай метафары – спрадвечнае імкненне творцы да супастаўлення з мэтай больш дакладнай фармулёўкі сэнсу. А. Асіпенка трапна выражае характарыстыку персанажа, параўнаўшы яго з вядомым гістарычным дзеячам або літаратурным героем, якія сталі ўвасабленнем пэўных чалавечых якасцей. Так, Карпа Хіжняка, які дзеля кар'еры і камфорту ва ўласным жыцці даносіць на цесця і сам удзельнічае ў ягоным арышце, можна прадставіць праз супастаўленне з ***Брутам*** – адным з паплечнікаў Цэзара, які быў актыўным удзельнікам змовы супраць палкаводца: *«"І ты, **Брут**, прыйшоў з імі!" – Канстанцін Вячаслававіч насмешліва паглядзеў на Карпа»* [1, с. 206]. А героя апавядання «Лаўрэат мясцовага конкурсу», першага ў вёсцы лётчыка Андрэя, характарызуюць праз параўнан-

не са славутым савецкім лётчыкам: *«Пасля аднаго выпадку Андрэй стаў нашым дзежынскім* ***Чкалавым****. Было гэта ў дзень яго самастойнага вылету на самалёце. Андрэй паявіўся над Дзежынам і перад здзіўленымі аднавяскоўцамі выкруціў усе фігуры вышэйшага пілатажу»* [1, с. 420].

Антрапонімы з'яўляюцца неад'емнай часткай мастацкіх твораў Алеся Асіпенкі. Паэтонімы ствараюць запамінальныя мастацкія вобразы і перадаюць каштоўную інфармацыю пра гісторыю Беларусі XX ст.

ЛІТАРАТУРА

1. **Асіпенка, А. Х.** Лабірынты страху : раман, аповесці, апавяданні / А. Х. Асіпенка. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 447 с.

2. **Магазаник, Э. Б.** Ономапоэтика, или «говорящие имена» в литературе / Э. Б. Магазаник. – Ташкент : Фан, 1978. – 148 с.

3. **Петрачкова, И. М.** Значимость имени собственного в художественном тексте (на материале современной русской прозы) : автореф. дис. … канд. филолог. наук : 10.02.02 / И. М. Петрачкова ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2003. – 21 с.

4. **Фонякова, О. И.** Имя собственное в художественном тексте / О. И. Фонякова. – Ленинград : Изд-во ЛГУ, 1990. – 104 с.

5. **Чыж, А.** Беларускі іменьнік / А. Чыж. – Гомель : Collegium sarmacum, 1998. – 60 с.

Вакар Л.У. *(г. Віцебск)*

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ВОБРАЗЫ І ТЭХНАЛОГІЯ ВЫРАБУ ГЛІНЯНЫХ НАРОДНЫХ ЦАЦАК АРШАНСКАГА ПАДНЯПРОЎЯ І ВІЦЕБСКАГА ПАДЗВІННЯ

Традыцыйная керамічная цацка Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння з'яўляецца старажытным відам народнай культуры, які звязаны з міфалагічнымі ўяўленнямі крывічоў, засяляўшых вярхоўе р. Днепр і Заходняя Дзвіна. Па тэрыторыі праходзіў гандлёвы шлях «з вараг у грэкі». У познія часы праз дадзены рэгіён праходзілі водныя транзітныя шляхі, з сярэдзіны XIX ст. – чыгуначныя дарогі, што абумовіла сувязь з гарадамі Расіі і Балтыі, блізасць традыцыйных форм і вобразаў керамічных цацак, а таксама рапаўсюджванне па-за межамі лакальных цэнтраў.

У гарадах і мястэчках керамічная вытворчасць дасягнула росквіту ў XVI–XVII стст. і паспяхова развівалася да пачатку XX ст., на вёсцы ганчарнае рамяство і выраб глінянай цацкі было найбольш распаўсюджана ў другой палове XIX – першай палове XX ст. [6; 8; 9]. У старажытныя часы свісцёлкі і бразготкі мелі рытуальнае значэнне: гукам і свістам выклікалі вецер і дождж, адганялі злых духаў. Найбольш сцісла яны былі звязаны з вясновы-

мі святамі, якімі пачыналіся земляробчыя рытуалы і праца [1]. У гарадской культуры гліняная цацка мае характар рамеснага прадукту, дзіцячай забавы, звязана з культурай гарадскіх кірмашоў і народнай смехавай культурай. У XIX ст. гарадская і мяшчанская цацка папаўняецца вобразамі-тыпамі гарадскога мяшчанства.

У гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна керамічная цацка адыгрывае значную ролю, бо выступае сродкам захавання культурнай памяці, гісторыка-культурнай ідэнтычнасці і сродкам выхавання дзяцей. Як і раней, гліняныя цацкі паспяхова выкарыстоўваюцца ў правядзенні каляндарных абрадаў веснавога – летняга цыклаў, а таксама для гульнёвых забаў і развіцця крэатыўных здольнасцей дзяцей. Традыцыйная гліняная цацка сінтэзуе ў сабе вобраз краю і яго гісторыю, з'яўляецца адметным сувенірам і спрыяе развіццю экскурсійна-турыстычнай справы [2; 3]. Традыцыйная гліняная цацка ў сацыяльна-культурнай прасторы выконвае комплекс універсальных функцый: выхаваўчую, камунікатыўную, пазнавальную, псіхатэрапеўтычную – якія ёсць ва ўсёй культурнай практыцы і таксама ўласцівы для яе. Апроч таго, гліняная цацка выконвае спецыяльныя функцыі: гульнёвая функцыя звязана з рытуальна-сімвалічнай і гульнёвай практыкай, кумулятыўная – з фальклорна-рамесніцкай і музейна-калекцыйнай, этнадыферэнцыруючая функцыя прысутнічае пры міжэтнічным узаемадзеянні.

Рашэннем Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 14.10.2020 (№ 04-01-02/8) элементу «Традыцыйныя вобразы і тэхналогія вырабу гліняных народных цацак Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння» быў нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Захавалася 16 тыпаў (вобразаў) традыцыйнай дубровенскай цацкі. Найбольш архаічнымі з'яўляюцца гетэраморфная свістулька птушкі (існуюць тры варыянты: птушка/гусь, птушка/певень; птушка/конь – спалучэнне галавы птушкі і тулава каня. Цацка «вершнік» мае чатыры варыянты архаічнай формы: вершнік на кані; вершнік у выглядзе абагуленай цыліндрычнай постаці на кані, вершнік на птушцы і вершнік на птушцы/кані. Свістулькі: «конік», «баран», «карова», «сабака», «жаўранак», «качка», «салавей» таксама маюць абагуленыя лаканічныя формы і належаць да вясковай традыцыі. Антрапаморфныя цацкі «баба з дзіцяці», «дзед з унукам», «лялька» («дубровенка»), «лялька з немаўляці», «гарманіст», «хлопец», «гаспадар з птушкай» і сюжэтная цацка «пара» (кавалер і пані) не маюць свісткоў. Яны адносяцца да позняга этапу развіцця дробнай народнай пластыкі местачковага характару мяжы XIX–XX стст. Сваёй лакальнай назвай гэтыя цацкі абавязаны майстру Ганне Стэфаўне Марачовай (1887–1976), якая данесла да нас традыцыйныя вобразы і тэхналогію вырабу [7; 8]. Адраджэннем Дубровенскай цацкі займаюцца майстры Л.Ф. Чэрвінская, В.С. Аляксеева [2].

Аршанская цацка (7 вобразаў) адноўлена паводле археалагічных артэфактаў: фрагмента цацкі/гаршчэчка «салавей» (раскоп XIII ст.), фрагментаў цацкі «конь/птушка», конь – фрагмент «вершніка», «баранчык», а таксама паводле этнаграфічных цацак канца XIX – пачатку XX ст.: «козлік», «дзяўчына ў шляпе» з в. Берасценава Аршанскага раёна. Цацка «вершнік на птушцы» адноўлена паводле цацкі Н.А. Камінскай з в. Дрыбін, якая знаходзіцца недалёка ад Аршанскага раёна. Пошукам і рэканструкцыяй традыцыйнай глінянай цацкі займаецца Т.У. Шынкарова [2].

Бабінавіцкія цацкі (9 вобразаў), якія вырабляюцца на Лёзненшчыне, дэманструюць найбольш познія ўзоры развіцця ганчарнай традыцыі, якая трымалася да 1980-х гг. Вылучае бабінавіцкі паліваны посуд і цацкі ангобны роспіс, які рабіўся з дапамогай каровінага рога з дзіркай на канцы. Ганчарны посуд і цацкі М.Ю. Арэхава (1928–1982) і М.М. Траяноўскага (1927–1990) [8; 9] атрымалі прызнанне на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставах народнай творчасці. Асабліва папулярнымі былі графіны, бочачкі-барылкі з мядзведзямі ў якасці пластычнага дэкору. Арына Рыжкова (1893–1945) ляпіла зааморфную свістульку: конікаў, птушак, свісцёлак са змеямі і птушкамі, гаршчочкі «салаўі», якія напаўняліся вадой і імітавалі птушыныя гукі. М.Ю. Арэхаў і М.М. Траяноўскі надалі традыцыйнай свістульцы «вершнік» новую вобразнасць – пачалі ляпіць вайскоўцаў у пілотках, цыганоў і партызан з аўтаматамі за плячыма. Бабінавіцкія свістулькі адрозніваюцца наіўнарэалістычным характарам вобраза, аднак формы засталіся традыцыйнымі: гэта вершнікі, птушкі на адной ножцы або без апоры, сычы з апорай на дзве нагі і хвост-свісток, свісцёлкі з вужамі, мядзведзямі, птушкамі. Усе згаданыя формы аднавіла і працягвае вырабляць І.А. Варона.

Да традыцыйных вобразаў сенненскай цацкі адносяцца сем свістулек: конік (два варыянты з апорай тулава на тры і чатыры кропкі), баран, сабака, парсюк, жаўранак і паўлін. Сенненскія цацкі адрозніваюцца сваім архаічным выглядам, лаканічным выразным сілуэтам і спосабам загладжвання паверхні свістулек палатніком (тканінай) пасля яе лепкі. Жаўранак вылучаецца сціплай каронай-грабеньчыкам на галаве, паўлін мае каронку на галавае і крыху большую карону – хвост на тулаве. Арыгінальным з'яўляецца архаічны вобраз коніка на трох апорах тулава, а таксама вобраз свінкі са свістком у лычыку. Дадзеныя вобразы ўласцівы для старажытнай сялянскай глінянай цацкі, звязаны з земляробчымі культамі славян. Сваёй мясцовай назвай гэтыя цацкі абавязаны апошняму носьбіту традыцыі, майстру Г.П. Глухараву (1932–1990) [2; 3], які нарадзіўся, жыў і працаваў у в. Папоўка Сенненскага раёна. Усе сем вобразаў зараз прысутнічаюць у асартыменце вырабаў У.І. Квашко [2].

Узоры адноўленых гліняных цацак (6 вобразаў) Бешанковіцкага раёна адпавядаюць археалагічнай цаццы сярэдзіны XVI ст. і этнаграфічным цацкам, якія былі шырока распаўсюджаны ў другой палове XIX – першай пало-

ве XX ст. [5]. У параўнанні са свістулькамі ішых рэгіёнаў яны вылучаюцца сваім ангобным дэкорам у выглядзе кропак і маленькіх плям, нанесеных метадам распырскванне альбо выбельваннем асобных дэталей. Унікальная антрапаморфная свісцёлка-бразготка з берага р. Заходняя Дзвіна аг. Ула Бешанковіцкага раёна датуецца сярэдзінай XVI ст. [2]. У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі захоўваецца фрагмент падобнай цацкі XVII ст. – пяць традыцыйных цацак: «вершнік» і зааморфныя свісцёлкі канца XIX – пачатку XX ст. («баранчык», «конік», «конік з сядлом», «вершнік») знойдзены на сядзібах ганчароў у Бешанковічах. Гэтыя формы рэканструявала і шырока практыкуе кераміст А.І. Аўчыннікава [2]. На іх аснове зроблены стылізаваныя цацкі, якія пашыраюць тэматыку адпаведна літаратурным апісанням і ўспамінам старажылаў Бешанковіцкага раёна.

Пяць віцебскіх цацак (антрапаморфная цацка, вершнік, сабака, конь з сядлом, качка – XVII ст.) адноўлены паводле археалагічных артэфактаў, знойдзеных падчас раскопаў Ніжняга замка (арх. Т. Бубенька) і раёна Задунаўя (арх. В. Ляўко). Сярод іх унікальная цацка, якая атрымала ўмоўную назву «малец» (мясцовая гаворка). Яна адметна лаканічнай пластыкай сваёй постаці, абрысы якой набліжаны да формы пентаграмы. Паказальнай з'яўляецца свістулька «конь з сядлом», які апіраецца на дзве пярэднія нагі, а тулава пераходзіць у свісток. Свістулька «вершнік» адноўлена паводле знойдзенага артэфакта ў 2018 г. на беразе р. Вымнянка ў г. п. Янавічы Віцебскага раёна. Тут ганчарнае рамяство існавала да 1940–1950-х гг., калі яшчэ працавала вядомая ганчарная дынастыя майстроў Разважных. Усе вытворчыя працэсы – ад нарыхтоўкі сыравіны да абпалу посуду – засноўваліся на сямейнай працы. Аднаўленнем віцебскіх традыцыйных цацак займаецца А.Л. Сарбаш [2].

Полацкія цацкі (8 вобразаў) таксама адноўлены паводле музейных артэфактаў і археалагічных знаходак. Агульная колькасць знаходак – 93 адзінкі [4]. Усе яны выяўлены на тэрыторыі Полацка: у цэнтральнай частцы горада, у Запалоцці і Задзвінні, тэрыторыі былога езуіцкага калегіума. Найбольш яркімі вобразамі з'яўляюцца свістулькі «конік» у двух варыянтах: са спаранымі пярэднімі нагамі і на расстаўленых нагах з выцягнутай дугой шыяй. Рэдкім узорам народнай смехавай культуры з'яўляецца цацка «камедыянт». Колькасць знаходак увесь час павялічваецца. Калекцыю адноўленых цацак складаюць: «вершнік», «камедыянт», «баранчык», «конік», «конік з сядлом», «качка», «салавей», свісцёлка-дудачка з птушкай. Характэрнай асаблівасцю полацкіх цацак з'яўляецца ангобны роспіс, які мае канструктыўна-дэкаратыўны характар. Рэканструкцыяй полацкай цацкі займаецца К.У. Зяленская.

Выраб глінянай свістулькі ажыццяўляецца праз ручную лепку. Працэс лепкі свістулькі традыцыйна робіцца «на палец» альбо «на палачку». Таксама ўжываецца больш позні і шырока распаўсюджаны ў сучаснай практыцы спосаб лепкі «пельмень». Традыцыйная свістулька робіцца з аднаго кавалка гліны, з якога выцягваюцца дробныя дэталі вобраза. Практыкуец-

ца і прылеп дадатковых дэталей, у вершніку – гэта само тулава вершніка. В.С. Аляксеева робіць цацку «вершнік» з аднаго кавалка гліны, гэта забяспечвае большую трываласць свістульцы. Найбольш значным этапам лепкі з'яўляецца выраб свістка. Ён складаецца з трох элементаў: паветранай камеры, паветранага канала (па якім выдуваюць паветра) і язычка.

Спосаб лепкі «на палачцы». Спачатку з аднаго кавалка гліны выцягваецца ўся форма і дэталі цацкі. Паветраная камера (унутраная пустэча) атрымліваецца ўціскананнем ў зроблену форму палачкі. Для прабівання паветранага канала і фармавання язычка выкарыстоўваюць плоскія авальныя або паўавальныя палачкі (стэкі). Нажом роўненька адразаецца канец і палачкай кап'явіднай формы пратыкаецца хвост некалькі разоў зверху ўніз так, што яна амаль выходзіць вонкі пад брушкам жывёлы. Гэта будучы канал паветранага патоку. Потым пальцам намацваецца ў гліне край стэкі і тут жа другой палачкай-стэкай перпендыкулярна насустрэч робіцца адтуліна ў паветранай камеры.

Спосаб лепкі «на пальцы». З цэлага кавалка пластычнай гліны лепіцца вакол вялікага пальца пустацелая загатоўка, метадам выцягвання фармуюцца суцэльныя ножкі, потым цалкам уся постаць, выключаючы дробныя дэталі. Раўнамерная таўшчыня сценак фігуркі дае больш якасны гук і вялікую гарантыю ад парэпання пры наступнай сушцы і абпале. Потым зробленае тулава здымаецца з пальца, адкрытая камера праз закатванне і загладжванне фармуецца ў свісток. На наступным этапе спецыяльным мыслікам прабіваецца паветраны канал прамавугольнага сячэння, які неабходны для ўдування ў свістульку паветра. Далей на шляху паветранага патоку фармуецца востры выступ. Ён уяўляе сабой пласцінку таўшчынёй 2,5–3 мм з завостраным тарцом. Па памерах яна павінна быць большая за адтуліну. Далей неабходна дамагчыся максімальна якаснага гучання. Патрэбна замацаваць разак-выступ пасярэдзіне паветранага патоку, які падзяляе на паловы струмень паветра, і свістулька пачынае спяваць. Каб мелодыя пералівалася рознымі гукамі, з бакоў фігуркі робяць адтуліны круглымі палачкамі з лазы і пры свісце папераменна закрываюць іх пальцамі.

Спосаб лепкі «пельмень». Кавалак гліны расцягваецца ў тонкую аладку, краі якой абмазваюцца шлікерам, спалучаюцца ў форму «пельменя» і загладжваюцца. Фармуецца тулава звера альбо птушкі. Да яго прылепліваюцца неабходныя дэталі формы, з якіх выцягваюцца меншыя, усе разам загладжваюцца. Далей робіцца свісток.

Адметныя рысы кожнага рамеснага цэнтра вызначаюцца якасцю мясцовай гліны, тэхнікай абпалу, культурна-гістарычнымі і мастацка-стылёвымі традыцыямі рэгіёна. Гліняная цацка Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння, як і іншыя цацкі Беларусі, у параўнанні з цацкамі суседніх народаў вылучаецца сваёй архаікай, дамінаваннем пластычнага пачатку над дэкаратыўна-жывапісным [8; 9]. Выразная пластыка і лаканічны сілуэт пад-

крэслівае сціслую сувязь глінянай цацкі з ганчарствам, надае ёй манументальнасць. Захоўваюцца тэхналогіі вырабу тэракотавай, абварной, задымленай і паліванай керамічнай пластыкі. Размалёўка ангобам прысутнічае ў Бабінавіцкай, Бешанковіцкай, Лёзненскай і Полацкай свістульках, колеравая афарбоўка гуашшу па белым фоне адноўлена ў Дуброўне.

Можна вызначыць падабенства архаічнай Дубровінскай і Аршанскай цацкі з цацкамі суседніх гарадоў Магілёўскай і Смаленскай абласцей (Дзямідаў, Хіславічы, Дрыбін). Арыгінальная форма птушкі з каронай на галаве Сенненскага раёна мае паралель са смаленскай птушкай і раманаўскай цацкай Ліпецкай вобласці Расіі, якая ўзнікла ў XVII ст. і, верагодна, у выніку міграцыі насельніцтва з Беларусі. Аднак у смаленскай і раманаўскай птушак прысутнічае толькі вобраз «жаўранка» (птушка з каронай, але без раскрытага хваста-кароны), адсутнічае вобраз «паўліна» (птушка з каронай і раскрытым хвастом-каронай).

Цацкі местачкова-гарадской традыцыі Дуброўна і Бешанковіч суадносяцца з цацкамі ў Ракаве, дзе прысутнічаюць вобразы «пара», «паненка», «вершніца», «кавалер», «музыка». Узмацненне дэкаратывізму цацак, пашырэнне іх вобразнага зместу ў другой палове XIX – першай палове XX ст. адпавядае агульнай тэндэнцыі развіцця глінянай цацкі еўрапейскіх народаў. У гэты час выраб цацак набывае характар самастойнага промыслу, разлічанага на продаж у буйных гарадах, дзе быў попыт на яркія і забаўляльныя вобразы.

Унікальнымі формамі падняпроўска-падзвінскай керамічнай пластыкі з'яўляюцца антрапаморфныя цацкі «волат/асілак», «малец» і «скамарох», якія адноўлены паводле археалагічных знаходак. Падобных форм нідзе не выяўлена.

На асэнсаванне значнасці і аднаўленне лакальнай своеасаблівасці гліняных народных цацак Аршанскага Падняпроўя і Віцебскага Падзвіння скіравана дзейнасць устаноў культуры дадзенага рэгіёна, што мела вынік у рашэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь па наданні дадзенаму элементу статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. **Басько, В. І.** Вясновыя звычаі і абрады / В. І. Басько, Т. Б. Варфаламеева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева [і інш.] ; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. навука, 2004. – С. 81–83.

2. «**Забава**: народныя цацка і лялька Віцебшчыны» / уклад., аўт. тэксту Людміла Вакар. – Мінск : БудМедыаПраект, 2018. – С. 8–41.

3. **Каталог** І абласной выставы керамікі «Ганчарны круг – 89». Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. Віцебскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. – Віцебск, 1989. – 27 с.

4. **Каталог** калекцыі керамічных цацак з археалагічнага збору НПГКМЗ / склад. Н. Г. Лунгіна. – Полацк : НПГКМЗ, 2007. – 101 с.

5. **Крачкоўскі, А. В.** З гісторыі развіцця народных промыслаў і рамёстваў у Бешанковіцкім раёне / Народная культура Віцебшчыны: вывучэнне. захаванне, папулярызацыя : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 165-годдзю М. Нікіфароўскага, Віцебск, 21 мая 2010 г. / ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» ; рэдкал.: Л. Вакар [і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2012. – С. 66–67.

6. **Милюченков С. А.** Белорусское народное гончарство / С. А. Милюченков. – Минск : Наука и техника, 1982. – С. 133.

7. **Ржавуцкі, М.** Беларуская гліняная цацка / Міхась Ржавуцкі. – Мінск : Полымя, 1991. – С. 31.

8. **Сахута, Я. М.** Беларуская народная гліняная цацка / Я. М. Сахута. – Мінск : Полымя, 1982. – С. 14.

9. **Сахута, Я. М.** Беларуская народная кераміка / Я. М. Сахута. – Мінск : Полымя, 1987. – С. 106.

Гладкова Г.А. *(г. Віцебск)*

ПОЛАЦКАЯ ГІСТОРЫЯ XVI ст. У ПРОЗЕ ЯНА КАНТРЫМОВІЧА-АГІНСКАГА

Мастацкая літаратура – своеасаблівае люстэрка гісторыі народа. Трансляцыя гістарычных фактаў праз мастацкі вобраз дазваляе пісьменніку асэнсаваць падзеі з улікам каштоўнасных арыенціраў нацыі, эстэтычных катэгорый, запатрабаванняў пэўнай эпохі. Мастацкі тэкст можа лічыцца крыніцай гістарычнай інфармацыі, гэта слушна падкрэсліў А.Р. Балербух, сцвярджаючы, што *«сейчас можно считать доказанным тезис о том, что художественная литература имеет определенное значение для исторической науки как своеобразный источник, в котором отразились такие грани реальной действительности, которые не могли быть зафиксированными в источниках других типов»* [1, с. 9]. Безумоўна, мастацкі тэкст суб'ектыўны, ён не заўсёды адпавядае строгаму крытэрыю праўдзівасці, аднак каштоўнасць мастацкага твора як гістарычнай крыніцы заключана, у першую чаргу, у здольнасці адлюстраваць ментальнасць нацыі, спрыяць рэканструкцыі пэўных тыпаў паводзін чалавека ў розных гістарычных абставінах, перадаць агульную атмасферу палітычнага і культурнага жыцця краіны.

Раман польскага пісьменніка другой паловы XIX – пачатку XX ст. Яна Кантрымовіча-Агінскага «Полацк» з'яўляецца другой часткай гістарычнай трылогіі «У промнях славы». У цэнтры падзей – вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй і, у прыватнасці, аблога Полацка і штурм горада войскам С. Баторыя ў 1579 г.

Адзначым, што ўзяццю Полацка, праслаўленню новага караля і вялікага князя С. Баторыя (а таксама яго падначаленых) былі прысвечаны мастацкія творы, напісаныя адразу пасля славутай падзеі: маецца на ўвазе лацінамоўная паэма Базеля Гіяцынта, выдадзеная ў Падуі ў 1580 г., і «Песні» Яна Каханоўскага, надрукаваныя ў тым жа годзе ў Варшаве [4; 5]. Дапаўняе шэраг мастацкіх тэкстаў, у якіх асэнсоўваецца штурм Полацка, згаданы раман Я. Кантрымовіча-Агінскага.

Як паведамляе пісьменнік, здабыць Полацк, які ўжо некалькі гадоў быў далучаны да Масквы, для С. Баторыя было справай гонару. Падзеі пачынаюцца з апісання нялёгкага шляху войскаў караля Рэчы Паспалітай праз Вільню на Полацк. Я. Кантрымовіч-Агінскі перадаў агульны настрой кіраўніка федэрацыі адносна Літвы выразам *«tajemnicza kraina – kraina ciemna jak jej puszcze – surowa i niezgiкbiona w swoich zagajnikach, jak charaktery jej mieszkaccyw»* («таямнічая краіна – краіна цёмная, як яе пушчы – суровая і нязведаная ў сваіх пералесках, як характары яе жыхароў»), які дэманструе не толькі невядомасць усходніх тэрыторый Баторыю, але і нявызначанасць будучыні, далейшага лёсу ваеннай кампаніі [3, с. 25].

У мастацкім творы адчуваецца сімпатыя аўтара да герояў-палякаў, што разумеецца як праява суб'ектыўнага бачання падзей і дапаўняе шэраг імагалагічных даследаванняў па праблеме «свой-чужы» ў мастацкай інтэрпрэтацыі пісьменніка. Так, польская шляхта дэманструе гарачы патрыятычны настрой, ахвяруе грошы на ваенныя справы, нават звычайны жаўнер Ян Вонсік прывозіць з сабой грошы на вайсковыя патрэбы. Кантрастам да такіх з'яў выступае прагнасць маскавітаў атрымаць грошы на ваеннай службе (подкуп Рыгорам Осцікам двух маскалёў для замаху на жыццё Баторыя). У сувязі з гэтым адзначым, што пры стварэнні вобразаў захопнікаў Я. Кантрымовіч-Агінскі выкарыстаў традыцыйны прыём гаваркіх прозвішчаў, якія нясуць адмоўную канатацыю (напрыклад, Сцерваедаў, Сукін).

Ідэалізацыя С. Баторыя праяўляецца праз знешняе апісанне героя (стрыманасць у адзенні, выдатную зброю), паважную манеру гаварыць, выказаныя меркаванні (незадаволенасць багатым выглядам ваяроў, справядлівыя рашэнні).

Пісьменнік дэталёва апісаў склад войска Рэчы Паспалітай, пералічыў не толькі польскія роды, літвінскія дынастыі, але таксама назваў запарожскіх казакоў, саюзнікаў з Курляндыі і Семігаліі. Супольная дзейнасць прадстаўнікоў розных народнасцей паказана згуртаванай, падкрэслена роля венгерскай артылерыі падчас штурму горада.

Пры падыходзе да Полацка стала вядома, што Іван Жахлівы загадаў спаліць Запалоцце. Пісьменнік з пазіцыі сучасніка XIX ст. даў каментарый гэтай падзеі, заўважыўшы, што такі спосаб абароны характэрны для рускіх, дастаткова прыгадаць пажар Масквы 1812 г., калі Напалеон вымушаны быў пакінуць спалены горад.

Адзначым, што сціслае апісанне замкаў Полацка пададзена згодна з гісторыяграфічнымі выкладамі Рэйнгальда Гейдэнштэйна, на што ўказвае выкарыстанне пісьменнікам услед за польскім гісторыкам недакладных назваў умацаванняў Полацка (так, Верхні замак названы Сярэднім, што разыходзіцца з гістарычным фактам).

Параўнальны аналіз дазволіў сцвердзіць, што менавіта «Запіскі пра Маскоўскую вайну» Р. Гейдэнштэйна сталі асновай для мастацкага пераўтварэння гістарычных падзей. Пры гэтым пісьменнік дакладна перадаў з дапамогай мастацкага ўвасаблення дыслакацыю польскага войска, характар штурму, апісаў паводзіны гістарычных асоб у вызначальны гістарычны момант.

Мастацкі тэкст рамана дазваляе сцвярджаць, што С. Баторый паказаны не толькі як прадбачлівы палітык, вызваліцель захопленага горада, але і як міласэрны хрысціянін, які клапоціцца пра пахаванне закатаваных расійскай уладай палякаў, называе варварствам спаленне Запалоцця, даруе права выбару палонным падданым маскоўскага цара Івана вярнуцца ў Масковію ці застацца ў Рэчы Паспалітай.

Неаднаразова ў рамане падкрэслена справядліваць штурму з боку польскага войска, яна агучана С. Баторыем: *«Nie przyszediem tu zdobywaж cudzej wiaњpoњsi [...] ale [...] szediem uczyniж sprawiedliwoњж, ukaraж zuchwaioњж despoty i odebraж to, co zostaio wydarte Rzeczypospolitej»* («Я не прыйшоў сюды здабыць чужую ўласнасць […], але […] ішоў вярнуць справядлівасць, пакараць нахабнасць дэспата і ўзяць тое, што было адабрана ў Рэчы Паспалітай») [3, с. 99].

Вядома, што мастацкі твор валодае большай ступенню эмацыянальнасці ў адрозненне ад іншых крыніц. Я. Кантрымовіч-Агінскі надаў значную ўвагу апісанню Полацка, пакінутага ворагам: калісьці багаты горад быў спустошаны, завалены трупамі знявечаных палонных, асабліва немцаў і палякаў, аслепленых, з садранай скурай, абвараных кіпенем, з адрэзанымі часткамі цела.

Завяршае раман аповед пра справы Баторыя ў Полацку пасля вызвалення. Па-першае, падкрэслена рэлігійная талерантнасць караля: праваслаўнаму духавенству былі пакінуты ўсе цэрквы, пабудаваныя ў горадзе за час знаходжання пад уладай Масковіі. Па-другое, езуітам вызначана тэрыторыя для пабудовы касцёла і заснавання акадэміі. Па-трэцяе, Баторый вярнуў пасаду полацкага ваяводы Станіславу Давойне, як тое было да захопу горада Іванам IV.

Згодна з «Запіскамі…» Гейдэнштэйна Кантрымовіч-Агінскі паведаміў пра велізарныя кніжныя каштоўнасці Полацка: старажытныя славянскія хронікі, пераклады з Мяфодзія і Канстанціна, пісьмёны грэчаскіх аўтараў на старых пергаментах, працу Дыянісія Арыяпагіта пра іерархію нябесную і касцёльную (відавочна, маецца на ўвазе трактат «Пра нябесную іерархію»

з захаванага «Corpus Areopagiticum»). Кароль даў распараджэнне перавезці гэтыя каштоўнасці ў Кракаў.

Наступнай згаданай у рамане падзеяй стала ўзяцце крэпасці Сокал. Апісанне сціслае, аднак на гэты раз паказана жорсткасць пераможцаў да ворагаў. Думаецца, пісьменнік імкнуўся захаваць максімальную адпаведнасць фактам, стварыць уяўленне праўдападобнасці, паказаць, што вайна не бывае літасцівай да яе ўдзельнікаў.

Данінай былому рыцарству выглядае прапанова С. Баторыя Івану IV вырашыць вайну двубоем, аднак адказу рускага цара не было. Пасля полацкай кампаніі кароль Рэчы Паспалітай накіраваўся ў Варшаву, аўтар сімвалічна зазначыў, што на спакутаваную зямлю «ляглі снягі», што можа быць успрынята як своеасаблівае ачышчэнне, пачатак новага этапу, абнаўленне і суцяшэнне для полацкіх зямель пасля крывавага ваеннага жніва.

Падзеі 30 жніўня 1579 г., якія мелі вынікам вызваленне Полацка з-пад улады маскоўскага цара Івана паказалі значны ваенны патэнцыял Рэчы Паспалітай, які ўдала выкарыстаў С. Баторый. У хуткім часе прыйдзе да завяршэння вызваленне ўсіх беларускіх зямель Вялікага Княства Літоўскага.

У сувязі з гэтай перамогай польскай зброі Я. Замойскі адзначыў, што Іван IV цяпер быў пазбаўлены славы ўсіх мінулых перамог: *«Мы одержали столь славную победу над неприятелем, которого все страшились вследствие высокого мнения о его могуществе и о его воинской доблести, о его победах над другими народами [...] неприятель не только побежден, но лишен Полоцка, который будет служить вечным памятником этой победы, лишен славы своих прежних побед; все его трофеи [...] с него сняты этой победою»* [2, с. 87–88].

Рэканструкцыя і мастацкае асэнсаванне мінулага, адлюстраванае ў рамане Я. Кантрымовіча-Агінскага, мае шэраг асаблівасцей, сярод якіх вылучым апору пісьменніка на польскія гісторыяграфічныя крыніцы, у прыватнасці, на выклад падзей XVI ст. Р. Гейдэнштэйнам, суб'ектыўнасць апісанняў паводзін «сваіх» (палякаў) і «чужых» (маскавітаў), мастацкую апрацоўку эмацыянальна значных эпізодаў ваенных падзей, ідэалізацыю вобраза караля і вялікага князя С. Баторыя, гістарычных асоб, прыбліжаных да яго.

Кампазіцыйнай адметнасцю кнігі стала перапляценне дзвюх сюжэтных ліній: адна ўяўляе выклад гісторыі сумна вядомага Рыгора Осціка, які пакінуў у гісторыі след авантурыста і злодзея, другая – непасрэдны аповед пра паход польскага войска на Полацк, страчаны ў 1563 г., з мэтай вярнуць горад пад уладу Вялікага Княства Літоўскага.

Раман выдатна перадае атмасферу XVI ст., пісьменнік імкнецца да дакладнасці ў апісанні зброі і адзення, абставін паходу, вайсковага быту. Кніга можа быць карыснай у якасці дадатковай крыніцы інфармацыі адносна польска-маскоўскай вайны XVI ст. і ўзяцця Полацка войскам Баторыя.

ЛІТАРАТУРА

1. **Болербух, А. Г.** Художественная литература в историческом аспекте / А. Г. Болербух // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны / рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.)[і інш.]. – Мінск : БДУ, 2005. – Вып. 2. – С. 8–17.

2. **Гейденштейн, Р.** Записки о Московской войне (1578–1582). Издание археографической комиссии ; пер. с латинского / Р. Гейденштейн. – Санкт-Петербург : Типография министерства внутренних дел, 1889. – 309 с.

3. **Kontrymowicz-Ogicski, J.** W promieniach siawy: powieњж historyczna z XVI wieku : w 3 t. / J. Kontrymowicz-Ogicski. – Chicago, 1909. – T. 2 : Poiock. – 111 s.

4. **Panegyricus** in Exidivm Polocense atq[ue] in memorabilem Victoriam Stefani invictissimi Poloniarum Regis magniq[ue] Ducis Lituaniae ex potentissimo Moschorum Principe III. Cal. Septemb. MDLXXIX. Reportatam. – Padwa, 1580.

5. **Piesni** trzy Jana Kochanowskiego. – Warszawa : Druk. M. Szarfenbergera, 1580.

Лаўрык Т.А. *(г. Мінск)*

МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ВОБРАЗА ЛЬВА САПЕГІ Ў РАМАНЕ ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ «ПРА ЛІСОЎЧЫКА, ЗЛОГА ХЛОПЧЫКА»

Леў Сапега (1557–1633) – дзяржаўны дзеяч, канцлер і гетман Вялікага Княства Літоўскага, віленскі ваявода, адзін са стваральнікаў «Статута Вялікага Княства Літоўскага» (1588), які нарадзіўся 4 красавіка 1557 г. у мястэчку Астроўна Віцебскага павета.

Жыццёвы шлях, дзяржаўная і палітычная дзейнасць канцлера шырока прадстаўлены ў працах даследчыкаў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. У Лепелі і Слоніме памяць пра Льва Сапегу ўвекавечана ў помніках. З 1586 г. ён быў прызначаны старастам Слоніма, што вельмі паўплывала на станаўленне горада. Пры канцлеры ў Слоніме пачалі ладзіцца соймікі Вялікага Княства Літоўскага, у хуткім часе горад набыў свой герб, зацверджаны каралём Жыгімонтам Вазам у 1591 г., які ўтрымліваў рысы герба Сапегаў «Ліс» (страла з падвойным крыжам). Пры Сапегу ў горадзе было адноўлена магдэбургскае права.

У 1995 г. Белпоштай была надрукавана адмысловая марка, прысвечаная Льву Сапегу, а ў 2010 г. Нацыянальным банкам Беларусі выпушчана памятная манета «Леў Сапега» (дызайн – С. Заскевіч (Беларусь)). Ушаноўваецца памяць Сапегі ў назвах вуліц, пляцаў, але ў першую чаргу мы яго згадваем у сувязі з выхадам 3-га Статута Вялікага Княства Літоўскага (1588).

Разам з тым вобраз канцлера недастаткова прадстаўлены ў працах літаратараў. Упершыню да яго адлюстравання звярнуўся Гальяш Пельгрымоўскі, вядомы дзяржаўны дзеяч, дыпламат і пісьменнік, што ўваходзіў ў склад

дэлегацыі Вялікага Княства Літоўскага пад кіраўніцтвам Льва Сапегі, якая вяла перамовы з прадстаўнікамі Маскоўскай дзяржавы ў 1600–1601 гг. Уражанні ад гэтай паездкі паслужылі асновай да стварэння «Пасольства Льва Сапегі да вялікага князя маскоўскага» (1603). У творы аўтарам паказана хада дыпламатычнай місіі. У заключнай гутарцы вялікага князя Барыса Гадунова з Львом Сапегам адлюстраваны іх адносіны:

Князь да Канцлера цёплай любасцю праняўся
(Сябраваў з ім калісьці, таварышыў, знаўся):
«Можа, помніш, мой дружа, як служыў я пану
Швагру Фёдару? Быў ты, сябра мой каханы,
Сэрцам цэлым любіў я, Леў, цябе душою;
І цяпер справы пойдуць сцежкаю старою» [3, с. 513].

Пачынальнік жанру раманаў у польскай літаратуры Юзаф Крашэўскі звярнуўся да падзей 1599–1600 гг. беларускай гісторыі ў аповесці «Апошняя са слуцкіх князёў» (2009; перакл. на беларус. мову), дзе пададзены вобраз канцлера Льва Сапегі – міратворцы, чалавека скупога на пачуцці, якога паважалі і пабойваліся магнаты [2, с. 201, 202]. У нямецкага паэта Фрыдрыха Шылера ў нясканчанай драме «Дзмітрый» (1805) Л. Сапега прадстаўлены як мудры і разважлівы палітык, сапраўдны інтэлектуал сваёй эпохі [6, с. 58].

У XXI ст. да асобы канцлера звярнуўся аўтар гістарычнай прозы Леанід Дайнека, яго вобраз адлюстраваны ў рамане «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» (2010). Твор падзелены на дзве часткі, якія звязаны прыгодамі галоўных герояў. Першая яго частка паказвае пачатак XXI ст., час сусветнага фінансавага крызісу, які закрануў і Беларусь. Згадка пісьменнікам перамогі Аляксандра Рыбака на Еўрабачанні ў 2009 г. паказвае, што падзеі адбываюцца ў пачатку XXI ст. У другой частцы героі фантастычным чынам пераносяцца ў Смутныя часы (пачатак XVII ст.), а менавіта ў час авантур Лжэдзмітрыя I і Лжэдзімітрыя II. Змены ў Маскоўскай дзяржаве ўплывалі на знешнюю палітыку Вялікага Княства Літоўскага: пачаліся войны, спачатку са Швецыяй, потым войскі ліцвінаў падтрымалі паход Лжэдзімітрыя II на Маскву з мэтай атрымання пасады.

Для адлюстравання перыяду праўлення Жыгімонта Вазы III вобраз Льва Сапегі ў рамане займае выключна важнае значэнне. Л. Дайнека апісвае асобныя рысы знешнасці канцлера: «Леў Сапега падцягнуты і хударлявы, з вострымі вусамі пад даўгаватым пародзістым носам, з лысінай, што выскубла з галавы валоссе, адкрыўшы высокі прыгожы лоб. <…> Чэпкі канцлераў позірк далёка не ўсе маглі вытрымаць» [1, № 2, с. 44]. Яны даюць магчымасць скласці ўражанне пра героя і стаўленне да яго іншых.

Пісьменнік стварае сваё бачанне фарміравання ідэалаў маладога Льва, таму звяртаецца да яго дзіцячых гадоў. Адно здарэнне ў дзяцінстве вельмі яго ўразіла: ліс трапіў у сіло, але не захацеў памерці ў палоне, перагрыз сваю лапу і вызваліўся. «Я буду мудрым і хітрым, як ліс. <…> Колькі буду жыць,

буду адстойваць сваю волю, чаго б гэта ні каштавала» [1, № 2, с. 43], – вырашыў Леў Сапега яшчэ ў зялёным малалецтве. Такім чынам, пісьменнік спрабуе правесці аналогіі з гэтым выпадкам і гербам «Ліс», якім карыстаўся род Сапегаў з часоў Гарадзельскай уніі 1413 г. У рамане назва герба ўплывала на станаўленне характару канцлера.

Леў Сапега з'яўляецца адным са стваральнікаў 3-га Статута Вялікага Княства Літоўскага (1588), некаторыя палажэнні якога ўваходзілі ў супярэчнасць з пэўнымі соймавымі пастановамі Рэчы Паспалітай і з'яўляліся пунктамі сутыкнення паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім Княствам Літоўскім. Ён добра разумеў небяспеку перавагі ў Рэчы Паспалітай Польшчы, вымушаны быў лічыцца з такім становішчам. У Статуце абмяжоўваліся многія правы польскай шляхты, што захавала тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага ад іх наплыву, у адрозненне ад Украіны, якая ўваходзіла ў склад Польшчы з 1569 г. [4, с. 6].

Яскрава пра становішча дзяржавы ў XVII ст. адзначана ў рамане Л. Дайнекі, дзе Сапега такім чынам яго тлумачыць: «Мы пастаянна мяняем свае веры і мовы. <…> Таму што пасяліў нас Пан Бог паміж ляхам і маскалём. І мы, наш народ як бы разрываемся паміж імі. <…> Вось чаму ў віленскай друкарні Мамонічаў я фінансаваў і распарадзіўся надрукаваць Статут Вялікага Княства Літоўскага нашай прыроднай мовай, каб паказаць усім і кожнаму, хто мы ёсць на гэтай зямлі» [1, № 2, с. 68]. У пісьме Льва Сапегі да Крыштофа Радзівіла ад 15 ліпеня 1588 г. Сапега пісаў: «Статут новы загадаў ужо друкаваць па-руску; хацеў бы яго выдаць і па-польску, аднак калі б прыйшлося de verbo ad verbum яго перакладаць паводле рускіх слоў і сэнтэнцый, выйшла б вельмі «niegryecynie», а інакш ня сьмею» [5, с. 12]. «Руская» мова Літоўскіх Статутаў – мова ўсходняй часткі насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага, беларуская пісьмовая мова старажытнага перыяду, тэрмін «беларуская» мова стаў пашырацца толькі ў XVII ст. Сапега патрабаваў абавязковага выкарыстання роднай мовы ва ўсіх земскіх урадах дзяржавы, што падкрэслівала яго жаданне захаваць родную мову, а выкарыстанне ва ўсіх службовых дакументах замацоўвала становішча ў якасці дзяржаўнай мовы.

Канцлер – барацьбіт за незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай, які дбаў пра палітычнае і эканамічнае ўмацаванне дзяржавы, што пацвярджаецца ў рамане Л. Дайнекі, дзе Сапега прамаўляе: «Да зямнога скону свайго я – найміт маёй дарагой Айчыны, Вялікага Княства Літоўскага. Я яму служу і буду служыць у меру сіл маіх» [1, № 2, с. 45].

Пісьменнік падкрэсліў патрыятызм і любоў да радзімы Льва Сапегі: «Канцлер Вялікага Княства Літоўскага з сямейных паданняў ведаў, што Сапегі, гэтак жа сама, як Радзівілы, як Пацы, паходзяць ад самога рымскага сенатара Палямона, які, ратуючыся ці то ад Нерона, ці ад крыважэрных бязлітасных гунаў, прыплыў некалі ў гэты край і стварыў між лясоў і азёраў но-

вую дзяржаву. І мэтаю свайго жыцця малады Леў Сапега зрабіў вернае служэнне гэтай дзяржаве, захаванне і ўмацаванне яе, гарманічнае і ўсебаковае развіццё законаў, па якіх яна павінна развівацца» [1, № 2, с. 43]. Безумоўна, тут сувязь «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» з папярэднім творам – «Назаві сына Канстанцінам», дзе пісьменнік расказвае пра стварэнне Ордэна Святога Палемона і яго дзейнасць з мэтай барацьбы за незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага.

У рамане адлюстравана палітычная дзейнасць Льва Сапегі. У 1584 г. пасольства ў Маскву воляю Стэфана Баторыя ўзначальваў малады Леў Сапега. Тады ён упершыню пабачыў новага маскоўскага цара, сына Івана Жахлівага – Фёдара Іванавіча. Было падпісана перамір'е з Маскоўскай дзяржавай, за ўдалую місію ён атрымаў пасаду падканцлера Вялікага Княства Літоўскага і Слонімскае староства ў пажыццёвае валоданне. У час яго аўдыенцыі склалася ўражанне пра маладога цара – «клёку ў ягонай галаве мала <…> ціхмяненькі і палахлівенькі» [1, № 2, с. 43]. Пасля місіі Леў Сапега рашуча паведаміў Стэфану Баторыю, што прыйшоў час скарыць ворага, далучыць да Рэчы Паспалітай Северскае і Смаленскае княствы, пакуль у Маскоўскай дзяржаве назіраўся заняпад і нязгода паміж знатнымі асобамі. Але яго не падтрымала ліцвінская шляхта, у першую чаргу Радзівілы. Тут неабходна падкрэсліць такія рысы характару Сапегі, як мудрасць і палітычную стратэгію, якая аднак не атрымала водгуку з боку караля.

Жыгімонт Ваза III пасля смерці бацькі ў 1593 г. пачаў дамагацца шведскай кароны, бо з'яўляўся сынам шведскага караля, у 1594 г. ён быў абраны каралём Рэчы Паспалітай. Падтрымкі ад іншых краін ён не атрымаў, да таго ж гэта прынесла Літве доўгую вайну са Швецыяй. Маскоўскай дзяржаве не ўдалося заключыць дамовы са Швецыяй, якая прэтэндавала і на гэтыя землі. У выніку пасля доўгіх перамоў у 1601 г. Льву Сапегу ўдалося рэалізаваць ідэю доўгатэрміновага міру на 20 гадоў.

Новы кароль Рэчы Паспалітай пачаў умешвацца ва ўнутраныя справы Маскоўскага царства, якое магло б дапамагчы яму ў антышведскай кааліцыі. Пасля раптоўнай смерці цара Барыса Гадунова ён падтрымаў царэвіча Дзмітрыя – сына Івана IV, які лічыўся забітым у 1591 г. Так пачаўся перыяд «самазванства» на Маскоўскіх землях, мірны дагавор быў парушаны. У гістарычных даследаваннях сустракаецца меркаванне, што Лжэдзмітрый з'явіўся дзякуючы Сапегу. Леанід Дайнека адвяргае гэту думку, што пацвярджаецца словамі Льва Сапегі ў рамане: «Я ўсё спадзяваўся на федэрацыю Польшчы, Літвы і Масквы, хацеў вечнага міру з Масковіяй. Але ж, як бачна сёння, маскавітам непатрэбна ні такая федэрацыя, ні мір. Яны скрозь і заўсёды хочуць быць галоўнымі, першымі, хоць не маюць ніякіх падстаў для гэтага» [1, № 2, с. 45–46]. Аднак самазванца падтрымалі кароль і вялікі князь Жыгімонт III Ваза, арцыбіскуп гнезненскі, шляхта на сойме ў Кракаве. Са слоў Сапегі, складваецца наступнае ўражанне пра царэвіча: распусціў казацкае войска,

каб спыніць рабункі; кіруе добра, але не на карысць ляхаў, бо не аддаў ім абяцаных зямель за падтрымку. Зыходзячы з гэтага, канцлер упэўнены, што гэта сапраўдны самазванец, бо ён зусім не падобны на яго бацьку – Івана Жахлівага, таму Сапега прадбачыць будучыя змены, якія яшчэ закрануць Маскоўскую дзяржаву.

Лжэдзмітрый I быў забіты, на маскоўскі пасад узышоў Васіль Шуйскі. Супраць яго кіравання пачаліся хваляванні ў народзе, што выкарыстала Рэч Паспалітая, якая мела на мэту пасадзіць на пасад Лжэдзімітрыя II. Пацвярджэнне гэтаму знаходзім у рамане: «І магнаты, і засцянковая шляхта, і Жыгімонт III Ваза, і Мікалай Крыштоф Радзівіл, і канцлер Леў Сапега былі адзінадушныя: нельга марудзіць, нельга каб умацаваўся, набраў сілу Васіль Шуйскі» [1, № 3, с. 19].

Леанід Дайнека ў рамане «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» адлюстраваў вобраз Льва Сапегі, звярнуўся да яго дзіцячых гадоў, спрабуючы перадаць уласнае бачанне фарміравання яго характару. Дзяржаўны дзеяч, канцлер Вялікага Княства Літоўскага, ён меў вялікую вагу і аказваў уплыў на знешнюю і ўнутраную палітыку Вялікага Княства Літоўскага, якое ў Смутныя часы (пачатак XVII ст.) знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай. У гэтым вобразе пісьменнік паказаў патрыёта, барацьбіта за свабоду і незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага.

ЛІТАРАТУРА

1. **Дайнека, Л.** Пра лісоўчыка, злога хлопчыка : раман / Л. Дайнека // Дзеяслоў. – 2010.– № 1.– С. 15–75 ; № 2. – С. 13–76 ; № 3. – С. 13–66.

2. **Крашэўскі, Ю.** Апошняя са слуцкіх князёў : гіст. аповесць / Ю. Крашэўскі // Кароль у Нясвіжы. 1784. Апошняя са слуцкіх князёў / Ю. Крашэўскі. – Мінск, 2009. – С. 135–328.

3. **Пельгрымоўскі, Г.** Пасольства Льва Сапегі да вялікага князя Маскоўскага / Г. Пельгрымоўскі // Анталогія даўняй беларускай літаратуры, XI – першая палова XVIII ст. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; [падрыхт.: А. І. Богдан і інш. ; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі]. – Мінск, 2003. – С. 507–514.

4. **Тарас, А.** Леў Сапега / А. Тарас // Вялікі беларус Леў Сапега : зб. арт. / уклад. А. Тарас. – Мінск, 2017. – С. 3–19.

5. **Шкялёнак, М.** У трохсотныя ўгодкі смерці вялікага канцлера Льва Сапегі / М. Шкялёнак. – Вільня : [б. м.], 1933. – 30 с.

6. **Шылер, Ф.** Дзмітрый / Ф. Шылер // Спадчына. – 1995. – № 3. – С. 60–71.

Мишин П.И. *(г. Новополоцк)*

КОНЦЕПТ УДАЛЕНИЯ ОТ ЭТАЛОНА ЧЕЛОВЕЧЕСКОГО В НЕКОТОРЫХ ТРАДИЦИОННЫХ ПРЕДСТАВЛЕНИЯХ О ДЕТЯХ И БЕРЕМЕННЫХ
(по материалам Н.Я. Никифоровского)

Для традиционной культуры характерно наделение предметов и явлений окружающего мира характеристиками, относящимися к сфере религиозно-мифологического (целебность, вредоносность, связь с потусторонним миром и т. п.). В данной работе, основываясь на этнографических материалах белорусского Подвинья, опубликованных в известном сборнике Н.Я. Никифоровского «Простонародные приметы и поверья…» [2], мы рассмотрим одну из таких характеристик. Речь пойдет о свойстве, приписываемом традиционным мировоззрением каждому объекту, которое можно назвать «удаленностью от эталона человеческого[1]».

С определенной долей уверенности можно сказать, что для носителя традиционной культуры эта характеристика объекта была одной из важнейших. Именно ее значение указывало на то, чего ждать от вещи, человека или явления, можно ли вообще воспользоваться ею (чем ближе к эталону человеческого, тем благоприятней будет результат взаимодействия и наоборот). Можно сказать, что все, что существует вокруг представителя традиционной культуры, он подвергает постоянной оценке и переоценке именно с этой точки зрения. Постоянной – потому что это свойство объекта, человека или явления не является статичным, его значение может меняться в зависимости от самых разных вещей – от собственно объекта, от времени суточного или годового цикла, от результатов направленных на него магических актов вследствие собственного поведения (для человека). Поскольку эта характеристика объекта указывает представителю традиционной культуры на то, как ему с этим объектом следует взаимодействовать и, до известной степени, предвосхищает результаты этого взаимодействия, она, безусловно, является для него чрезвычайно важной, актуальной.

Удаление, отступление объекта от эталона человеческого означает приближение к не-человеческому, к иному, к сфере мироздания исполненной таинственной силы, магии, населенной могущественными и опасными существами. Само отступление означает, что объект не соответствует в своем бытии представлениям людей о том, как он должен существовать. Для

[1] Под «эталоном человеческого» мы в данном случае понимаем имеющееся в каждой культуре представление о правильном, должном, соответствующем норме состоянии всех и всяких вещей и ходе всех событий. Содержание этого представления определяется господствующими в социуме идеями и концепциями. Фиксируется же оно в различных проявлениях общесоциального дискурса (мифы, фольклор).

предмета это может означать пребывание в несвойственном ему месте или качестве, для человека – совершение неподобающих поступков. В некоторых случаях достаточно и контакта с тем, что соотносится с потусторонним, иным, чужим.

Следствием сближения объекта с не-человеческим, контакта с иным, будет «открытость» данного объекта потусторонним силам. С одной стороны, это проявляется в наделенности магией (в формах сознательного колдовского воздействия или же воздействия неосознанного, вроде сглаза для человека; в форме магического свойства – для объекта). С другой же стороны, это означает повышенную уязвимость к магическому и потустороннему влиянию для всего и всякого, удаленного от эталона человеческого.

Материалы, собранные Н.Я. Никифоровским, представляют собой отличную иллюстрацию этих мировоззренческих установок. В них, среди прочего, мы обнаруживаем список людей, которые уязвимы перед вредоносным воздействием – сглазом («суроками»). В эту группу попадают следующие категории людей – дети и животные «у дяциным» возрасте, женщины, когда у них «ёсь ны бялизни, цижарни, дяциныхи», молодые люди выдающейся красоты, новобрачные и беспомощные старики [2, с. 33–34]. Отталкиваясь от изложенных выше соображений об эталоне «человеческого», можно констатировать, что все они удалились от него в силу своих отличий от нормы, от имеющихся представлений о том, каким должен быть человек. Представители всех этих групп обладают, таким образом, усиленной связью с иным миром. И представления о наличии этой связи проявляется в различных поверьях, относящихся к этим категориям людей. Рассмотрим в качестве примера те из них, которые связаны с образами будущей матери и ребенка.

Итак, для беременной женщины характерна достаточно высокая степень удаленности от эталона «человеческого» вследствие того, что ребенок, которого она вынашивает, приходит именно оттуда, из области потустороннего. На уровне верований это проявляется в представлении о том, что домашние животные становятся более ласковыми к беременной, дикие – не причиняют ей вреда, в том числе и волк, и медведь [2, с. 2]. Животные (даже домашние) принадлежат к области не-человеческого, поэтому изменившийся космологический статус беременной улучшает ее взаимодействие с представителями этой области мироздания, способствует установлению с ними более доверительных контактов.

В представлениях о сближении будущей матери с иным миром свои истоки имеет и поверье, согласно которому та вещь, которую беременная попросила в долг, попользоваться, должна быть отдана ей обязательно. В противном случае она потеряется, сломается, сгорит и т. п. [2, с. 5]. То есть беременная выступает здесь как «агент» иного мира: то, что она называет своим, должно перейти к ней. В противном случае, оно исчезнет из мира людей – сломается, потеряется и т. д. Некоторое подобие мы можем видеть

в текстах, согласно которым животное, обещанное в подарок молодым во время свадьбы, обязательно должно быть отдано, иначе его съедят волки [1, с. 75; 3, с. 214]. В данном случае переданное в дар молодым – а они во время свадебного ритуала некоторое время находятся вне пределов «человеческого» – также удаляется от эталона «человеческого» и, если не будет передано по назначению, будет потеряно для людей (находящихся в пределах человеческого).

В суточных и в годовых циклах выделяются динамические меняющиеся периоды, когда общее значение удаленности от эталона «человеческого» становится большим или меньшим. В рамках суток днем уровень «человеческого» становится выше, чем ночью (полдень и полночь составляют исключения, это время соединения двух половин суток, промежуточный, пограничный период, в пределах которого значение «человеческого» стремится к нулю). Это объясняет, почему для беременной устанавливаются ограничения на прием пищи – ей нельзя есть и пить ночью или слишком рано утром [2, с. 6]. Согласно представлениям, бытующим в традиционной культуре, вместе с принимаемой пищей можно поглотить и нечто, связанное с иным миром. Для обычных людей это опасно только в периоды времени, когда общий уровень «человеческого» снижается – праздники, посты. Для беременной, которая ввиду удаления от эталона «человеческого» уже имеет связь с потусторонним, это соображение актуально всегда.

Однако сближение с потусторонним для женщины, ожидающей ребенка, является сравнительно небольшим. Куда более ярко проявляются признаки удаленности от эталона «человеческого» у самого ребенка. В традиционной картине мира родившееся (то есть пришедшее в этот мир из мира потустороннего) дитя изначально принадлежит к области «не-человеческого». Только будучи проведенным через последовательность ритуалов (крещение является, пожалуй, самым важным из них) ребенок приобщается к эталону «человеческого», обретает свой статус одного из людей.

Именно исходя из представлений об удаленности некрещеного ребенка от эталона человеческого, то есть о его усиленной связи с потусторонним миром, можно объяснить ряд весьма интересных традиционных поверий Подвинья. Так, наши современные взгляды о «невинном младенце» оказываются прямо противоположными традиционным. По словам Н.Я. Никифоровского, «у некрещеного дитяти столько грехов, что их “уряд” повезти на одной лошади», а кумовья сознательно выбирают самую длинную дорогу и стараются “медлить”, плутать, делать лишние объезды, чтобы… растерять и растрясти побольше детских грехов» [2, с. 21]. Поскольку всякий грех есть отступление от эталона человеческого, то ребенка, следовательно, можно назвать переполненным грехами, абсолютным грешником.

Сам процесс крещения является церковным ритуалом, поэтому традиционная магия вмешаться в него не может. Однако «перед крещением ребенка

заворачивают (не одевают! – *Прим. авт.*) в рубаху, в рукава которой кладут хлеб и соль» [2, с. 18]. Одеть ребенка в рубаху нельзя, поскольку одежда – это атрибут человека, которым, как было указано выше, ребенок пока не является. О таком запрете упоминает Н.Я. Никифоровский [2, с. 14]. Вместе с тем перед ритуалом приобщения можно и нужно окружить его предметами с высоким уровнем «человеческого», свойственного только людям: одежда, хлеб и соль. Это однозначно промаркирует ребенка как будущего человека и будет способствовать успеху ритуала.

В отличие от взглядов собственно церкви, крещение не рассматривалось носителями традиционной культуры как событие-триггер, однозначно меняющий статус окрещенного. Для них это было скорее воздействие, обладающее определенной силой, определенным уровнем. Именно этот аспект ритуала и старались усилить, разместив рядом с ребенком символы, связанные с эталоном человеческого (хлеб, соль). В контексте этих представлений становится понятным и логичным следующее верование, приведенное Н.Я. Никифоровским: «То дитя не получило полного и надлежащего креста, под которым пристала (то есть устала. – *Прим. авт.*) лошадь. Такие дети делаются впоследствии, по большей части, чаровниками» [2, с. 21]. То есть представители традиционной культуры вполне логично предполагали, что в некоторых случаях силы ритуала крещения могло не хватить, и на ребенке оставались грехи. В тексте, рассмотренном нами выше, говорилось, что у некрещеного их так много, что его вряд ли может увезти одна лошадь. Соответственно, если конь, который везет назад уже крещенного ребенка устает, это значит – грехов на нем было так много, что крещение не справилось с ними. Ребенок не был полностью приведен к эталону «человеческого», у него осталась связь с потусторонним миром. А это, ввиду озвученных выше причин, означает, что перед нами будущий колдун.

Также связь некрещеного ребенка с потусторонним миром делает его особенно уязвимым для воздействий нечистой силы – до крещения, после него опасность резко падает. Как сообщает Н.Я. Никифоровский, нечистик не может подступиться к крещеному ребенку [2, с. 24]. Но до крещения опасность очень велика – поэтому ребенка везут крестить, путая следы и всячески скрываясь [2, с. 21]. Поскольку в традиционной культуре церковное крещение является лишь частью ритуала, который завершается уже дома, ребенка из церкви следует везти с максимальной скоростью [2, с. 21].

Таким образом, традиционной культуре свойственны представления о выделении в пространстве области «своего», «человеческого» и «чужого», «иного». Эти представления соотносились не только с пространственными локусами как таковыми, но и с отдельными вещами, животными, людьми. Всякий объект наделялся специфической мифологической характеристикой, которую можно назвать «удаленностью от эталона человеческого». Она показывала, насколько животное, вещь или человек соответствовали в своем

бытии представлениям людей о том, каким **должно** быть их бытие. Всякое отклонение от заданной представлениями нормы, от созданного культурой эталона означало наличие связи с «иным», «чужим», «потусторонним», тем более сильной, чем сильнее было это отклонение. В приведенных нами примерах показано, как эта закономерность проявлялась в представлениях и ритуальных действиях в отношении беременных женщин и новорожденных младенцев, обладавших очевидной для представителей традиционной культуры связью с иным миром, и, следовательно, в определенной степени удаленных от эталона «человеческого».

ЛИТЕРАТУРА

1. **Крачковский, Ю.** Быт западно-русского селянина / Ю. Крачковский. – Москва : Издание императорского общества истории и Древностей Росссийских при Московском университете, 1874. – 212 с.

2. **Никифоровский, М. Е.** Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Собраны в Витебской губернии / М. Е. Никифоровский. – Витебск, 1897. – 336 с.

3. **Фальклор** у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 342 с.

Мішына В.І. *(г. Полацк)*

ПРАЦОЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў СІСТЭМЕ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ ВІЦЕБСКАГА ПАДЗВІННЯ[1]

Народная педагогіка беларусаў уяўляе сабой разгалінаваную сістэму сродкаў і метадаў выхавання, якая «з'явілася і развілася як вынік неабходнасці перадаваць ад пакалення да пакалення пэўныя працоўныя веды, умельствы і навыкі, а таксама правілы і нормы грамадскіх паводзін, без якіх была б немагчыма жыццядзейнасць чалавека» [1, с. 5].

Даследчыкі народнай педагогікі адзначаюць, што адным з самых старажытных і эфектыўных сродкаў выхавання была праца. Улічваючы, што вытворчая дзейнасць традыцыйнай сям'і з'яўлялася асноўным спосабам яе існавання, ранняе далучэнне падрастаючага пакалення да працы было жыццёвай неабходнасцю.

Фактычна з першых гадоў жыцця дзіця атрымлівала магчымасць назіраць за працоўнымі працэсамі, а затым пакрысе далучацца да іх. Асноўным

[1] Работа падрыхтавана ў межах праекта БРФФД-РФФД «Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX – начала XXI века», дамова № Г20Р-095.

і найбольш арганічным сродкам фарміравання працоўных навыкаў было навучанне на прыкладзе бацькоў ці старэйшых членаў сям'і [1, с. 24]. Далучэнне дзяцей да працы, па сведчаннях этнографаў XIX ст., пачыналася досыць рана. З 4–5 гадоў дзецям даручалі выконваць пэўныя працоўныя дзеянні, а па меры сталення яны асвойвалі ўсё больш складаныя працоўныя аперацыі. Вельмі паказальным у гэтым плане з'яўляецца сведчанне М.В. Доўнар-Запольскага: «Дзеці з ранніх год выконваюць тыя ці іншыя гаспадарчыя абавязкі, і чым сям'я меней, тым раней сялянскі падлетак знаёміцца з суровай працай. З 5 год дзіця няньчыць сваіх маленькіх братоў і сясцёр, з 7–8 яно ўжо пастух, ідзе за возам і пад, з 12 год для хлопчыка пачынаюцца першыя практыкаванні ў земляробстве: ён зграбае сена, барануе, з 15 год бярэцца за цэп, касу, а яшчэ гады праз 2 і за саху, так што да 20 год ён ужо хлебароб, што прайшоў усе акадэмічныя курсы сялянскай гаспадаркі. Дзяўчына да 16–17 год ведае жаночыя работы» [2, с. 17]. Пры гэтым у перыяд існавання прыгоннага права дзеці былі задзейнічаны ў выкананні павіннасцей і іншых формах феадальнай рэнты: «На малалетак ускладаўся прыгонны збор ягад, грыбоў, арэхаў, дзікіх яблыкаў, жалудоў; яны пасвілі птушку, цялят; дралі лыкі, лазу, пер'е, воўну, а пры палявым, лугавым і кустарным паляванні служылі загоншчыкамі зайцоў, цецерукоў, перапёлак і бакасаў» [3, с. 113–114]. Падлеткі задзейнічаліся таксама ў найме, як правіла, у якасці пастухоў: «на пастухоўскую службу наймаюцца дзеці абодвух палоў ад 10–15 год, прычым хлопчыкі служаць толькі пастухоўскія тэрміны (ад "Вялікыдня" да "Змітрыўкі"), у той час як дзяўчаты, асабліва падлеткі, бываюць і гадавымі… Зімоваю парою яны нясуць пасільна батрацкія абавязкі: прадуць, мыюць бялізну, дапамагаюць гатаваць ежу, носяць ваду, дровы, поюць жывёлу, даглядаюць дзяцей і інш.» [3, с. 87].

Палявыя матэрыялы сведчаць, што разнастайная працоўная дзейнасць дзяцей заставалася актуальнай і ў рэаліях першай паловы – сярэдзіны XX ст.: *«Ну а што вот дзеці робілі?* – І сена касілі, і бульбу садзілі, гэта ж цяпер прыехала сажалка, бульбу пасадзіла, а патом выкапала, а тады ж нада было плуг, ну і сабіралі. А малацілі, калхоз патом ужо нейкі камбаін быў, а первае врэмя ж жалі жыта, а снапы гэтыя білі, а то слалі ня які ток, ці доскі нейкія і цапамі білі»[2]; «І па хазяйству, і кароў даіла <…> сабірала, траву. <…> Парасёнка ж гадавалі, кажды раз. <…> Малочніку якого назбіраеш, макрыцы назбіраеш»[3]; «Ну, што магла, у гародзе палола, курэй пасвіла, курэй жа ўжо сваіх садзілі ўжо после, як з вайны сталі зажывацца, і да вайны, пакуль вайна была і карова, і куры былі і ахрап нада было збіраць ўсё»[4]. У Заход-

[2] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ) : зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Тумчонак М. А., 1939 г. н., в. Празарокі Глыбоцкага раёна.

[3] ФА ПДУ : зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Жахоўскай Н. І., 1941 г. н., в. Парадні Міёрскага раёна.

[4] ФА ПДУ : зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Жаваранак К. С., 1931 г. н., в. Лажані Ушацкага раёна.

няй Беларусі ў 1920–1930-я гг. дзеці і моладзь выконвалі функцыі наёмных работнікаў: «Я за панскай Польшчай служыў, пашоў я служыць у трыццаць васьмым гаду. А я сам дваццаць васьмога. Мне было дзесяць гадоў. Дык пасціў я там тры каровы і там мусі стада была авец. Гараваць я ні гараваў. Лапці быстра наўчыўся сам сабе з ліпы робіць»[5]; «У парабкі ішла маладзёж, хто бяднейшы быў. Дзеўкі, бываець, у слугі шлі. Пан, у яго кароў многа ці свінней, ці гусей, глядзець нада было, выводзіць, дык ішлі дзяўчаты, бабы маладыя. А хлопцы ўжо ішлі на пасту кароў пасціць, і ўжо плацілі зярном»[6].

У пасляваенны час, як і ў наступныя дзесяцігоддзі, дзяцей і падлеткаў прыцягвалі і да работ у калгасе: «Зразу ў калхоз пайшла работаць. Закончыла чатыры класы і пайшла. – *А какую Вы работу выполняли?* – Обшчую. У брыгадзе былі. І касіць хадзіла, навучылася, і грабіць і грузіць сена»[7]; «А тады ужо сталі падрастаць, сталі канчаць 8 класаў. Іх застаўлялі работаць у калхозе, месяц хадзіць, гэта як закон быў»[8]; «Я сама да вайны паднімала, тады ж не было камбайнаў, а касілка такая косіць авёс, а мы, рабяты дашкольнага возраста, ходзім, падымаем гэты авёс, звязваем у кулі, у снапкі такія, і ставім. За гэта падзорную трубу далі нам. Раньшэ робілі, ой робілі <...> Малацілі, і жалі, і касілі. І не хочыцца, і плачыш, падымуць цябе, і пойдзеш робіць»[9].

Разам з тым змены ў матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні сялянскай гаспадаркі, спецыфіка вядзення асабістай гаспадаркі ва ўмовах калектывізацыі, паступова рабілі неактуальнымі некаторыя традыцыйныя віды гаспадарчай дзейнасці, што, у сваю чаргу, не садзейнічала перадачы адпаведных працоўных навыкаў: «Ну, прала мачыха. Я сама нічога не рабіла, малая пры Польшчы была. А як ужо бальшавікі прыйшлі, мне ўжо было 13 гадоў, я нічога не рабіла: ні прала, ні ткала. Мачыха ўсё рабіла»[10]; «Ну я як вам скажу, я як ужо бальшая была, дык мы тады не хадзілі жаць, ужо камбайн. А так як, проста пасля школы хадзіла, проста малаціць, мы падлеткамі хадзілі, летам работалі. А тады ўжо як я стала ўжо сама бальшая, ужо камбайны пачалі... я ні жала»[11].

---

[5] ФА ПДУ : зап. Мішына В. І., Мішын П. І. у 2008 г. ад Хаданёнка Г. П., 1928 г. н., в. Шышкі Шаркаўшчынскага раёна.

[6] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. у 2010 г. ад Раслевіч Л. У., 1932 г. н., в. Стуканы Глыбоцкага раёна.

[7] ФА ПДУ : зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Жаваранак К. С., 1931 г. н., в. Лажані Ушацкага раёна.

[8] ФА ПДУ : зап. Лобач У. у 2002 г. ад Мачульскай Г. М., 1932 г. н., в. Фёдарава Полацкага раёна.

[9] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. і Жолудзева П. у 2008 г. ад Матылёнак Н. І., 1925 г. н., в. Каханавічы Верхнядзвінскага раёна.

[10] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. у 2010 г. ад Папковай В. Ф., 1927 г. н., в. Стуканы Глыбоцкага раёна.

[11] ФА ПДУ : зап. Мішына В. І. і Мішын П. І., Халадкова А. У. у 2007 г. ад Герцык Т. І., 1945 г. н., в. Губіна Лепельскага раёна.

Выхаваўчы патэнцыял працоўнай дзейнасці выдатна ўсведамляецца самімі інфармантамі, якія адзначаюць, што характэрнае для апошніх дзесяцігоддзяў змяншэнне ролі працы ў працэсе выхавання дзяцей мае негатыўныя наступствы для фарміравання асабістых якасцей чалавека: «…цяпер вучуць, вучуць, а вырастаюць абы-якія рабяты. Робіць не застаўляюць! Раньшэ з малых лет робіць застаўлялі: і палоць, і капаць, і на пасту ганяць. Усё-усё робілі. Чуць падрос, 15-16 гадоў, ужо за плугом ідзець. А цяпер гуляюць гульма. Труд – бальшое дзела, фізічэскі нада робіць»[12].

Працоўнае выхаванне было найбольш важнай, але не адзінай сферай народнай педагогікі. Для паўнавартаснага функцыянавання асобы ў традыцыйнай супольнасці патрабавалася забяспечыць фарміраванне цэлага шэрага маральна-этычных якасцей. Адным з важнейшых маральных імператываў у сістэме традыцыйнага выхавання была павага да бацькоў і ўвогуле старэйшых [4, с. 179]. Уласна кажучы, пасродкам гэтага і функцыянаваў увесь механізм народнай педагогікі. Асабліва гэта паказальна адносна вертыкальнай культурнай трансмісіі, паколькі міжпакаленная перадача і замацаванне традыцыйных ведаў і ўяўленняў, норм і каштоўнасцей, засваенне дзецьмі працоўных навыкаў магчымы толькі пры безумоўным прызнанні аўтарытэту старэйшых.

Як паказваюць палявыя запісы, уласцівы традыцыйнай супольнасці бацькоўскі аўтарытэт захоўваў сваю моц і ў першай палове XX ст.: «Даўней болей слухалі бацькоў, сказалі табе, не пойдзеш сёння на вечарыну, значыць, не пойдзеш. <…> Бацька сказаў, значыць так нада, мама сказала!»[13]; «Гадаваліся ж проста. Дысцыпліна была строгаю ў бацёк, нігдзе мы не хадзілі, бацькі робілі, а мы дома па хазяйству, што загадаюць, тое і дзелалі. Гэта цяпер саўсім па-другому»[14].

Бацькам, як і раней, належала галоўная роля ў маральна-этычным выхаванні дзяцей: «Богу маліцца нас вучылі. У мяне папка быў веруючы і матка. У васкрасенне бацька запаліць свечку, паставіць нас на калені, матка заўтрак згатовіць. “Маліцеся Богу!”»[15]; «Ну вот такое можа і яно праўда ўсё ж такі нас навучалі налепшае. Вот не крадзіце, людзей не абіжайце, вот тое, вот Бога маліцеся. Вот такое ўсё вот такое ўчылі. Мы ж даўней, каб на бацьку, ці на матку сказалі «ты»[16].

---

[12] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. і Жолудзева П. у 2008 г. ад Матылёнак Н. І., 1925 г. н., в. Каханавічы Верхнядзвінскага раёна.

[13] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. і Прахарэнка Я. у 2009 г. ад Беззубёнак М. Ф., 1926 г. н., в. Празарокі Глыбоцкага раёна.

[14] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. і Жолудзева П. ад Мядзель М. В., 1927 г. н., і Казловай Н. І., 1941 г. н., в. Дзёрнавічы Верхнядзвінскага раёна.

[15] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. ад Зелянкевіч М. Я., 1919 г. н., в. Экімань Полацкага раёна.

[16] ФА ПДУ : зап. Філіпенка У. С., студ. ПДУ Траццякова А. у 2010 г. ад Хрол Ч. Б., 1926 г. н., і Шалёнак Т. Р., 1956 г. н., в. Хралы Глыбоцкага раёна.

Дзяцей змалку навучалі народнаму этыкету, напрыклад, правілам паводзін за сталом, асабліва ў прысутнасці гасцей: «Даўней жа і мужчыны, як вот садзіліся ўжо есці, дык мужчыны на кут садзіліся ўсігда <…> Ні так як цяпер – каждаму міска, каждаму ложка і каждаму вілка, а раней жа елі с аднэй усе, рабятам ужо тады, садзюць па краях рабят <…> Ну міску, тады сёрбай ужо ш, каму што дадуць <…> Чаго дадуць, тое й ядзім. Уго, каб гэдак як цяпер – што ён табе гатовы за стол заскочыць. Паперад ці госць якій быў <…> За каптур на печ, калі табе дадуць якую скварку там, на хлеб паложуць – дык добра, а так... гэта ўжо перва было: калі госці якія явіліся – шчас ні газу ж, нічога – на загнеце дзве кірпічыны паставюць, лучыну, яешню спякуць – гэта гасцю <…> А рабятам жа гэтага не было»[17]; «Вот прыізджаіць – ну на празднік, хоць які, кірмаш, хоць Пасха, Раждзество, прыізджаець дзядзька, цётка, шчас садзяцца <…> Я вот на печы, хоць і бальшаван, ня будзіш сядзець каля іх <…> А гэта штоб <…> гэта дзеці, дык ужо які дзяцёнак, там ужо дзесяць гадоў ці дзвінаццаць, дык цяпер дык ужо яны на танцы ходзюць, на дзіскацеку, а тады, брат, сядзі на печы і не пісні! Пашлі госці – з'еш ты што хочыш. Есці ж во так хватала, маць не жалела. Но пры людзях ня будзіш»[18].

Варта адзначыць, што сярод традыцыйных сродкаў выхавання не было выключэннем фізічнае пакаранне: «Білі дубцом. Яшчэ як білі бацькі! Як жа не будзеш!»[19]; «У вугал на гарох. Рэмнем у хрэбет стукнеш – і ўсё васпітанне»[20]. Прымянялася яно пераважна ў выпадках, калі дзецьмі парушаліся найбольш істотныя нормы, напрыкад, здзяйсняўся крадзеж: «А ў бацькі ні было пчол, ні дзіржаў саўсём ані, вот, і сад ні садзіў ён, зямлю абрабатываў, пахаў хлеб толька і ўсё. А яблынкаў ні было. А… хочацца яблычкаў – дык туды ў сад ускочу. Раз! – за пазуху. – «А ты ж!» <…> А еслі бацьку скажыць – так ён цябе дзягай і выпарыць. Не імееш права чужое нічога трогаць. Строгі быў бацька. Да ўсей сям'і строгі быў»[21]; «Як я бывала малая злажу, гэта баба поліць буракі там ці чорт яе ведаіць, яблакаў дзічак нарву калі хочацца іх. Дык я во тутака якім матузом падвяжуся і на пазуху. Ну дык што тады скажыць маме, дык мама ж вылупцаіць»[22]. Пры гэтым пакаранні маглі датычыцца не толькі дзяцей, але і дашлюбнай моладзі у выпадку парушэння норм

[17] ФА ПДУ : зап. Мішына В. І., Мішын П. І. у 2007 г. ад Ханяк А. І., 1932 г. н., в. Макараўшчына Лепельскага раёна.

[18] ФА ПДУ : зап. Мішына В. І., Мішын П. І., студ. ПДУ Высоцкая А. у 2009 г. ад Хілько І. І., 1928 г. н., в. Несцераўшчына Докшыцкага раёна.

[19] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. і Жолудзева П. у 2008 г. ад Матылёнак Н. І., 1925 г. н., в. Каханавічы Верхнядзвінскага раёна.

[20] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. і Жолудзева П. ад Мядзель М. В., 1927 г. н., і Казловай Н. І., 1941 г. н., в. Дзёрнавічы Верхнядзвінскага раёна.

[21] ФА ПДУ : зап. Мішына В. І., Мішын П. І. у 2008 г. ад Хаданёнка Г. П., 1928 г. н., в. Нікіцёнкі Шаркаўшчынскага раёна.

[22] ФА ПДУ : зап. Лобач У. А. у 2009 г. ад Васілевіч А. І., 1922 г. н., в. Шалашы Докшыцкага раёна.

вясковага этыкету: «У нас дзеўчаты ў сваю дзярэўню на танцы, у другую дзярэўню не хадзілі, прынята не было. Мальцы дык гэты ідуць. Прыйдуць у адной хаце танцуюць у дзярэўне, у другую пойдуць – вядома ж хлопцы, яны хадзілі хоць дзе! Гэта цяпер дзеўка ляціць 5 км па начы, а раней яе б бацька, матка, як казаў тэй, задніцу збілі рамнём, што яна б не села. Хадзіць па начы з мальцамі – гэта ж ого!»[23].

Старэйшае пакаленне было не толькі агентам сацыялізацыі, але і ажыццяўляла функцыю сацыяльнага кантролю: «А ў дзярэўні старыкоў – на полі ўжо не маглі. Сідзяць пад сцяной і глідзяць рыбяцішак гэтых. Стадамі – любога абы замецілі – хоць ня свой, чужы – нільзя дзелаць! Уловюць, за вушы надзяруць. Маглі ж і спаліць дзярэўню... А тады дзяцей было – у каждай сям'і і пяцёра, і сямёра, ні так як цяпер, па адному»[24]; «Усе лаўкі засядуць старыя людзі, маладым сесці няма куды. Адтанцуем польку ці што якое – няма дзе сесці! Прыхадзілі пасматрэць, абгаварыць дзяўчат. Ой, гаварылі! Выйдзеш пахаладацца: "Во, яна ўжо пайшла з мальцам, як сучка, круціцца!" Да-да. Ляціць пот з цябе, але не ідзеш на двор, баіcся, каб бабы не абгаварылі. Во як было»[25].

Такім чынам, у рэаліях першай паловы – сярэдзіны XX ст. асноўныя механізмы народнай педагогікі Віцебшчыны захоўвалі пераважна традыцыйны характар, абапіраючыся на выхаваўчы патэнцыял працоўнай дзейнасці і моц аўтарытэту старэйшых як галоўнага фактару міжпакаленнай культурнай трансмісіі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Арлова, Г. П.** Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 120 с.

2. **Довнар-Запольский, М. В.** Очерки семейственного обычного права крестьян минской губернии / М. В. Довнар-Запольский // Исследования и статьи. – Киев : А. П. Сапунов, 1909. – Т. 1 : Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. – С. 1–60.

3. **Никифоровский, Н. Я.** Очерки Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровский ; автор предисл. и сост. А. П. Ващенко. – Минск : Беларусь, 2019. – 271 с.

4. **Ракава, Л. В.** Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст. / Л. В. Ракава. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 311 с.

[23] ФА ПДУ : зап. Захарэвіч А. у 2010 г. ад Раслевіч Любові Уладзіміраўны, 1932 г. н., в. Стуканы Глыбоцкага раёна.

[24] ФА ПДУ : зап. Мішына В. І., Мішын П. І. у 2008 г. ад Лагуна І. К., 1928 г. н., в. Шышкі Шаркаўшчынскага раёна.

[25] ФА ПДУ : зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. у 2010 г. ад Папковай В. Ф., 1927 г. н., в. Стуканы Глыбоцкага раёна.

Падстаўленка В.Ф., Лонскі А.П. *(г. Віцебск)*

ПАЧАТАК ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ: ВІЦЕБСК У ЛЁСЕ М.М. БАХЦІНА

У своеасаблівым летапісе нашага горада асобныя старонкі належаць Міхаілу Міхайлавічу Бахціну – знакавай постаці ў сусветнай сістэме навуковай думкі: філасофіі, культуралогіі, эстэтыкі, філалогіі. Бясспрэчным у асяроддзі даследчыкаў з'яўляецца тэзіс, што віцебскі перыяд жыцця М.М. Бахціна стаў пачаткам філасофскай канцэптуальнасці яго мыслення, часам фарміравання яго базісных тэорый, што будуць удасканальвацца вучоным на працягу наступных дзесяцігоддзяў і захапляць не толькі сучаснікаў, але і навукоўцаў XXI ст.

Агульнавядома, што М.М. Бахцін пражыў у Віцебску крыху менш за чатыры гады: з верасня 1920 г. да мая 1924 г. [2, с. 7]. Пераехаў ён сюды з Невеля, дзе займаўся выкладчыцкай працай, стварыў гурток інтэлектуалаў, пачаў друкавацца. Бахцін з дапамогай сябра Льва Пумнянскага перабраўся ў наш горад, стаў супрацоўнікам Віцебскага інстытута народнай адукацыі – установы, ад якой пачынае сваю гісторыю Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава.

Акрамя таго, ён выкладаў філасофію музыкі ў Народнай кансерваторыі і эстэтыку, тэорыю мастацкай творчасці, заходнюю і рускую літаратуры, тэорыю рускай паэзіі, гісторыю мастацтваў і журналістыку ў літаратурнай студыі Губрабіса. Але і гэтым адукацыйная дзейнасць Бахціна не абмяжоўвалася: таксама ён рэгулярна выступаў з публічнымі лекцыямі ў Доме кнігі. Да іх потым далучыліся і прыватныя лекцыі, якія ён арганізоўваў у сябе дома для некалькіх дзясяткаў чалавек; сярод слухачоў нярэдка можна было сустрэць нават школьнікаў. Тэматыка гэтых лекцыйных заняткаў была самая разнастайная: «Пра слова», «Новая руская паэзія», «Мастацтва і сацыялізм», «Гістарычнае і дагістарычнае», «Мастацтва і сучаснасць» і многія іншыя. Вядома, што сярод іх дзве лекцыі прысвячаліся Ніцшэ: яго філасофіі ў цэлым і яго стаўленню да хрысціянства. Былі праведзены цэлыя лекцыйныя цыклы па рускай літаратуры, многія з іх у будучым працягваліся ў Ленінградзе. Удзельнічаў Міхаіл Міхайлавіч і ў своеасаблівых «літаратурных судах», дзе, што цікава, заўжды выступаў у якасці абаронцы.

Вакол вучонага аб'ядналіся многія віцебскія інтэлектуалы: П. Мядзведзеў, І. Салярцінскі, В. Валошынаў, К. Малевіч, Э. Лісіцкі і іншыя выбітныя асобы. Пастаянныя слухачы лекцый Бахціна арганізавалі ў яго дома гурток па вывучэнні рускай літаратуры, тады вучоны пражываў па вул. Смаленскай, 61. Для самога ж Міхаіла Міхайлавіча гэта былі не лепшыя часы. Увесну 1920 г. ён захварэў на тыфус, які выклікаў ускладненне. Бахцін перанёс аперацыю, пасля якой амаль увесь час праводзіў у ложку. У такім выглядзе ён часта і вёў свае хатнія лекцыі: лежачы, накрыўшыся сіняй ватнай коўдрай.

Перажыць гэтыя цяжкасці вучонаму дапамагала жонка. Паводле звестак, у 1921 г. ён ажаніўся з Аленай Аляксандраўнай Акаловіч, выпускніцай віцебскай Аляксееўскай гімназіі [2, с. 8]. Пэўны час яна працававала па спецыяльнасці – настаўніцай, потым – бібліятэкаркай. Верагодна, на апошняй працы яна і пазнаёмілася з Бахціным. А пазней менавіта яна дапамагала вучонаму вытрымаць агромністыя фізічныя выпрабаванні. Як адзначалі знаёмыя Бахціна, Міхаіл Міхайлавіч быў вельмі хворы чалавек: «…бясконцы пот, мокрая кашуля <…> І вось яна за ім сачыла, без ніякіх сядзелак і памочнікаў <…> Абсалютна самаадданы догляд» [3, с. 167].

Нягледзячы на немач, прыкуты да ложка Бахцін актыўна пісаў. У выніку, як адзначалася, падчас жыцця ў Віцебску канчаткова афармляюцца яго філасофскія погляды і эстэтычныя ідэалы. Менавіта да гэтага перыяду адносяць стварэнне першай рэдакцыі кнігі пра творчасць Ф.М. Дастаеўскага, што лічыцца самым вядомым творам даследчыка. Акрамя таго, распрацоўваюцца рукапісы «Да філасофіі ўчынку» і «Аўтар і герой у эстэтычнай дзейнасці», якія не выдаваліся пры жыцці аўтара, але пазней занялі важнае месца ў сусветным літаратуразнаўстве [2, с. 8].

Натуральна, што акрэсліваючы ў гэты перыяд свой асабісты шлях у сферы навуковых адкрыццяў, М.М. Бахцін у працы пад умоўнай назвай «Да філасофіі ўчынку» перадусім разважае пра так званыя фундаментальныя анталагічныя пытанні, у тым ліку пра так званыя культурны план чалавечага быцця і план жыцця. Яны фактычна існуюць ізалявана, але могуць дасягнуць быційнай цэльнасці ў чалавечым учынку. Далей тут вучоны наступным чынам тлумачыць важнасць паняцця «ўчынак»: «Кожная думка мая з яе зместам з'яўляецца маім індывідуальна адказным учынкам, адным з учынкаў, з якіх складаецца ўсё маё адзінае жыццё як суцэльная сукупнасць учынкаў (поступление. – *А. Л., В. П.*), бо ўсё жыцце ў цэлым можа быць разгледжана як нейкі складаны ўчынак: я раблю ўчынкі ўсім сваім жыццём, кожны асобны акт і перажыванне з'яўляюцца момантам майго жыцця як сукупнасці ўчынкаў» [1, с. 8].

У прыведзенай цытаце звяртае на сябе ўвагу тое, што *ўчынак* у Бахціна трактуецца не трывіяльна як пэўная індывідуальна ініцыяваная фізічная падзея, а як учынак-думка. Гэта арганічна самой асобе мысляра, аналітычнай сферы яго дзейнасці. Мы не будзем паглыбляцца ў філасофскую інтэрпрэтацыю такога азначэння Міхаіла Міхайлавіча, але на ўзроўні магчымага, гіпатэтычнага меркавання адзначым, што апеляцыя да нябачнай для большасці думкі-ўчынку магла стаць і адбіткам трагічных абставін жыцця вучонага. Пад уплывам хваробы ён мусіў адмовіцца ад актыўных «фізічных» учынкаў і пераарыентаваць свой велізарны навуковы запал у вытанчаную сістэму канцэптуальнага мыслення.

Пры гэтым важна падкрэсліць, што для М.М. Бахціна любы ўчынак павінен карэляваць з маральным базісам чалавецтва. У гэтай сувязі даслед-

чык папярэджваў, што «бездакорная тэхнічная правільнасць учынку яшчэ не вырашае справу аб яго маральнай каштоўнасці» [1, с. 9].

Раннія працы вучонага, асабліва «Да філасофіі ўчынку», з'яўляюцца найбольш складанымі аб'ектамі ў рэчышчы бахціназнаўчай верыфікацыі. Часткова гэта тлумачыцца незавершанасцю артыкулаў, іх тэзіснасцю, стадыяй станаўлення асабістага навуковага тэзаўруса Бахціна. Невыпадкова і сам вучоны пісаў, што ступень паспяховага ўчынку залежыць ад максімальнай паўнаты выкарыстаных тут слоў: «Мова гістарычна вырастала ў служэнні дзейснага мыслення і ўчынку, і абстрактнаму мысленню яна пачынае служыць толькі ў сённяшні дзень сваёй гісторыі. Для выражэння ўчынку знутры і адзінага быцця-падзеі, у якім здзяйсняецца ўчынак, патрэбна ўся паўната слова: і яго змястоўна-сэнсавы бок (слова-паняцце), і наглядна-выразны (слова-вобраз), і эмацыйна-валявы (інтанацыя слова) у іх адзінстве. І ва ўсіх гэтых момантах адзінае поўнае слова можа быць адказна-значным – праўдай, і не суб'ектыўна выпадковым» [1, с. 31].

Працягваючы размову, адзначым, што ў 1924 г. Міхаіл Міхайлавіч прыняў запрашэнне свайго сябра Паўла Мядзведзева і пераехаў у Ленінград. Там у знакамітым коле Бахціна зноў распачынаюцца дыспуты і семінары, працягваецца актыўная пісьменніцкая і выкладчыцкая праца.

Такім чынам, віцебскі перыяд жыцця Бахціна можна па праве лічыць адным з самых важных у жыцці вучонага, амаль лёсавызначальным. У першую чаргу гэта час росквіту яго адукацыйнай і пісьменніцкай працы. Сваімі лекцыямі ён заваёўвае прыхільнасць усёй віцебскай інтэлігенцыі, а кнігамі, распачатымі тут, – сусветную вядомасць, якая захоўваецца і да нашага часу.

ЛІТАРАТУРА

1. **Бахтин, М. М.** Собрание сочинений : в 7 т. / М. М. Бахтин. – Москва : Русские словари, 2003. – Т. 1 : Философская эстетика 1920-х годов / ред. тома: С. Г. Бочаров, Н. И. Николаев. – 959 с.

2. **Лісаў, А. Г.** Міхаіл Міхайлавіч, князь Мышкін / А. Г. Лісаў // Літаратура і мастацтва. – 2015. – № 45. – 13 лістап. – С. 7–8.

3. **Паньков, Н. А.** О памятном, о важном, о былом... (устные воспоминания С. И. Каган и Ю. М. Каган) / Н. А. Паньков // Диалог. Карнавал. Хронотоп. – 1995. – № 2. – С. 165–181.

Русілка В.І. *(г. Віцебск)*

РЭХА НАД ДЗВІНОЙ: ЛІТАРАТУРНЫЯ КАНТАКТЫ ВІЦЕБСКА І ДАЎГАЎПІЛСА

Духоўныя ўзаемасувязі Віцебшчыны і Латгаліі абумоўлены геаграфічнымі, гістарычнымі, сацыякультурнымі асаблівасцямі рэгіёнаў. Гэтыя сувязі паміж двума народамі-суседзямі, аб'яднанымі адзінай воднай артэрыяй – Дзвіной – Даўгавай, маюць глыбокія карані, што зафіксавана ў фальклоры і праз яго пасрэдніцтва ў літаратурнай творчасці. Многія беларускія пісьменнікі і дзеячы культуры XIX – пачатку XX ст. былі звязаны з Латвіяй і па нараджэнні, і па месцы жыхарства (І. Буйніцкі, Цішка Гартны, Карусь Каганец, К. Езавітаў, В. Ластоўскі, І. Луцкевіч, Б. Эпімах-Шыпіла і інш.). Аднак уласна літаратурныя кантакты Віцебска і Даўгаўпілса набылі сістэмны характар з 1920-х гг. і звязаны перш за ўсё з імем народнага паэта Латвіі Яніса Райніса, якога вядомы беларускі паэт і перакладчык С. Панізнік назваў «сімвалам латышска-беларускага параднення» [6, с. 4].

Яніс Райніс, месцам нараджэння якога быў латгальскі хутар Варславаны, добра ведаў беларускую мову і фальклор, з дзяцінства ад маці часта чуў «сумныя беларускія народныя мелодыі» [11, с. 38] і падкрэсліваў сваё захапленне імі і любоў да трапнага народнага слова, а таксама ўплыў латышскіх, літоўскіх і беларускіх народных песень на з'яўленне ў яго творчасці гумарыстычных і сатырычных матываў. Яшчэ ў час вучобы ў Рыжскай гімназіі Райніс напісаў верш «Мая дудка», які яўна пераклікаецца з аднайменным вершам беларускага паэта Ф. Багушэвіча, з якім пазней іх звязвала асабістае знаёмства:

Беларускі песенны матыў.
Мая дудка,
Мая радасць,
Весялі мяне
На чужой зямлі! [11, с. 339]

Яніс Райніс на працягу ўсяго свайго жыцця збіраў разам з беларускімі настаўнікамі фальклор і дыялектную лексіку Латгаліі, працаваў над фальклорна-этнаграфічнай драмай «Беларусы», выдаў кнігу перакладаў на латышскую мову фальклорных і літаратурных беларускіх вершаў «Беспокойное сердце» (1921). Паэт быў ганаровым членам беларускага культурна-асветніцкага таварыства «Бацькаўшчына» і сябраваў з М. Гарэцкім, чый лёс звязаны з Даўгаўпілсам, а таксама з Якубам Коласам і Янкам Купалам, Цішкам Гартным. Вядома актыўная грамадска-палітычная дзейнасць Яніса Райніса па абароне культурных інтарэсаў беларускай меншасці ў латышскім сейме (асабліва ў час дзейнасці паэта на пасадзе міністра адукацыі). Прамова Я. Райніса ў сейме ад 27 чэрвеня 1922 г. апублікавана пад назвай «Беларускае

пытанне» і з'яўляецца, па словах вядомага беларускага вучонага С. Александровіча, «аргументаваным і змястоўным аналізам узаемаадносін латышоў і беларусаў на сучасным этапе і ў далёкія гістарычныя часы» [3, с. 342]. Па ініцыятыве Я. Райніса былі адкрыты беларускія гімназіі ў Дзвінску і Лудзе. Зараз гімназія ў Даўгаўпілсе (былы Дзвінск) носіць імя Яніса Райніса.

Самыя непасрэдныя кантакты звязвалі Я. Райніса з Віцебскам, дзе жылі яго сястра Дора з мужам, рэвалюцыянерам Пятром Стучкам, і маці Дарта Пліекшане, пахаваная на віцебскіх Старасямёнаўскіх могілках. 21 лістапада 1926 г. Я. Райніс прысутнічаў на адкрыцці ў Віцебску Другога Беларускага дзяржаўнага тэатра (цяпер Нацыянальны драматычны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа), наведаў краязнаўчы музей і выставу карцін студэнтаў Віцебскага мастацкага тэхнікума.

Паэзія Райніса добра вядома ў Беларусі дзякуючы дзейнасці яго першага перакладчыка, ураджэнца в. Пасінь Люцынскага павета Віцебскай губерні Пятра Масальскага (Пятра Сакола), беларускіх паэтаў С. Дзяргая, Э. Агняцвет, С. Грахоўскага, Н. Гілевіча, ураджэнцаў Віцебшчыны П. Броўкі, П. Панчанкі, С. Панізніка, Р. Барадуліна, у перакладзе якога ў 1965 г. на сцэне тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску ўпершыню была пастаўлена п'еса «Вей, ветрык!». Творчасць Яніса Райніса ў 1990-я гг. была шырока прадстаўлена ў школьных праграмах па беларускай літаратуры для класаў з паглыбленым узроўнем літаратурнай адукацыі, дзе прадугледжвалася на працягу трох урокаў вывучэнне біяграфіі паэта, яго паэмы «Ave, sol!», драмы «Агонь і ноч», вершаў «Зламаныя сосны», «Радзіме», «Табе, асноўны клас», «…Цягнік усё далей…», у агульнаадукацыйных класах школ Беларусі ў той час паэзія Яніса Райніса вывучалася аглядава. Сёння творчасць Я. Райніса не ўваходзіць у праграмы па беларускай літаратуры, толькі верш «Дзядуля і яблынькі» выкарыстоўваецца ў дзіцячым чытанні. Аднак з паэзіяй Я. Райніса і яго драматычнымі творамі мэтазгодна знаёміць старшакласнікаў на пазакласным чытанні.

Творчасць Яніса Райніса, якому прысвяцілі свае вершы Я. Пушча, П. Броўка, М. Танк, Р. Барадулін, С. Панізнік, віцебскі паэт Д. Сімановіч і многія іншыя, аказала безумоўны ўплыў на беларускую паэзію. Пра аб'ектыўны працэс узаемаўзбагачэння літаратур як вынік літаратурных кантактаў справядліва гаварыла даследчыца Э. Мартынава: «Успрыняцце іншанацыянальнага вопыту на сучасным узроўні развіцця кожнай з літаратур адбываецца не шляхам яўнага пераймання, а праз творчае асэнсаванне мастацкіх дасягненняў іншай літаратуры… Паэзія іншага народа, асабліва ў працэсе перакладу, можа быць своеасаблівым імпульсам для арыгінальнай творчасці, можа садзейнічаць раскрыццю новых граняў таленту паэта» [2, с. 147].

У гэтым сэнсе паказальным прыкладам з'яўляецца рэцэпцыя ў беларускай паэзіі, у прыватнасці, у творчасці ўраджэнцаў Віцебшчыны, верша Яніса Райніса «Зламаныя сосны». П. Броўка ў вершы «Райнісавы сосны» пад-

крэсліваў дружбу і культурнае адзінства латышскага і славянскіх народаў:

З Пушкіна ялінай
Доля вас з'яднала,
З вішнямі Тараса
І сасной Купалы [4, с. 386].

С. Панізнік у вершы «Незламаныя сосны Райніса» больш камерна, лірычна, апасродкавана праз вобразную структуру гаворыць пра роднасць Я. Райніса і беларусаў:

Падняцца б мне цяпер на дыбкі
і сосны Райніса абняць.
Бо ткуцца ў Янісавых кроснах
і маці Дарты песьні-сосны…
А зык: «Ён – беларусаў хросны!» –
Вятрам ніколі не суняць [6, с. 52].

Народны паэт Латвіі Я. Райніс унёс выключна вялікі ўклад у захаванне і развіццё культурнай самабытнасці жыхароў латгальскага рэгіёна, а таксама ў наладжванне культурных кантактаў Беларусі і Латвіі. Літаратурная спадчына Я. Райніса працягвае жыць у культурнай прасторы абодвух народаў, з'яўляючыся стымулам для творчасці сучасных паэтаў і крыніцай змястоўных, культуралагічна вывераных вобразаў.

Цесныя літаратурныя сувязі з Беларуссю былі і ў латышскага паэта Яна Судрабкална. Вядомая рыжская літаратуразнаўца М. Абала, якая неаднаразова звярталася да даследавання беларускай тэмы ў латышскай літаратуры, у прыватнасці, у творчасці Я. Райніса і Я. Судрабкална, зазначала: «Праз усё сваё жыццё яны пранеслі пачуццё глыбокай сімпатыі да беларускага народа» [1, с. 222]. Я. Судрабкалн неаднаразова быў у Віцебску і Полацку на літаратурных сустрэчах, сябраваў з ураджэнцамі Віцебшчыны П. Броўкам, Р. Барадуліным, Е. Лось, з якімі абменьваўся вершамі-прысвячэннямі і паэзію якіх высока цаніў.

Беларуская тэма ў творчасці Я. Судрабкална прадстаўлена мініяцюрай аб латгальскай зямлі «Бачу беларусаў», якая расказвае пра Каплаву на беразе Дзвіны, Істру і Прыдрую, а таксама прысвечанымі беларускім паэтам вершамі «Сонца дружбы» і «Радасць братэрства», у якіх паэтка эмацыянальна сцвярджае: «Я люблю цябе, брат-беларус!» [10, с. 5].

Сённяшнія сувязі Віцебска і Даўгаўпілса звязаны перш за ўсё з падзвіжніцкай дзейнасцю ўраджэнца Мёрскага раёна, беларускага пісьменніка, старшыні Рады таварыства «Беларусь – Латвія», кавалера вышэйшай латышскай дзяржаўнай узнагароды – ордэна Трох Зорак – Сяргея Панізніка. Ён не толькі найвядомейшы ў Беларусі перакладчык на беларускую мову латышскай паэзіі, але і даследчык і захавальнік культурных традыцый Латгаліі: стваральнік этнаграфічнага музея. С. Панізнік сабраў і выдаў кнігу «Крывіцкія руны: Беларускія пісьменнікі Латвіі» (2003), адкрыў для літаратур-

най грамадскасці імёны латгальскіх беларускамоўных настаўнікаў і паэтаў Э. Вайвадзіша і М. Талеркі, празаіка В. Вальтара.

У творчасці С. Панізніка, які называе сябе «я – балткрэўс», «я – балтарусіс», латышскія матывы настолькі распаўсюджаныя і арганічныя, што ў вершах гучыць нават моўнае шматгалоссе:

А Дуна-Даўгава адгукаецца Сар'яй-Сур'яй,
Асьвеяй (Ашвінаў?) на востраве Ду;
і зь Індры латгальскай віедс-вядун,
нібы кнігаўка, весьціць:
– Свэйкі, сваяк! Свэйкі, сабрыс! [6, с. 5]

Імкненне, як гаворыць паэт, «ступіць у райнісаўскі след» [6, с. 55], нязменнае жыццялюбства, аптымізм і актыўная творчая дзейнасць дазваляюць спадзявацца на працяг латгальскай тэматыкі ў творчасці паэта.

Актыўна кантактуюць з літаратурнай грамадскасцю Віцебска сябры даўгаўпілскага беларускага культурна-асветніцкага таварыства «Уздым» паэты С. Валодзька, Я. Голубеў, А. Сазанкова. Таварыства, якім сёння паспяхова кіруе Ж. Раманоўская, было створана ў 1993 г. і праводзіць вялікую працу па захаванні культурнай адметнасці беларускай дыяспары ў Латвіі і ўмацаванні творчых сувязей з радзімай-Беларуссю. Пры таварыстве створаны жаночы вакальны ансамбль «Купалінка», які выдатна выконвае як беларускія народныя, так і мясцовыя аўтарскія песні і шмат гастралюе, перш за ўсё па памежных тэрыторыях: Верхнядзвінскі і Мёрскі раёны, Краслава, часта наведвае і Віцебск. «Уздым» мае свае пастаянныя беларускамоўныя старонкі: «Беларус Латгаліі» ў газеце «Латгалес лайкс» і «Слова беларуса» ў газеце «Динабург». Рэдактарам абедзвюх старонак з'яўляецца даўгаўпілскі паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Станіслаў Валодзька.

У творчасці С. Валодзькі, аўтара многіх кніг паэзіі для дарослых і дзяцей, матыў радзімы часта гучыць настальгічна і разам з тым светла і з надзеяй.

Бягуць мае сыночкі жвава
І галасочкі іх звіняць
У той краіне, дзе – Даўгава,
І не так часта, дзе – Дзвіна…[5, с. 141]

Віцебская тэма блізкая для паэта, які прысвяціў нашаму гораду верш «Ля помніка маці Райніса ў Віцебску». Песня «Браслаўскія зарніцы» С. Валодзькі, пакладзеная на музыку кампазітарам А. Рудзем, папулярная на Віцебшчыне.

Паэзія даўгаўпілсца Я. Голубева, які піша на рускай мове, вядома чытачу ў перакладах аўтара гэтага артыкула, апублікаваных у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» 28 кастрычніка 2005 г. і ў зборніку беларускай паэзіі Латвіі «А водар Радзімы ўсё кліча і кліча...» (Рыга, 2006). У творчасці паэта, якая адрозніваецца філасофскай разважлівасцю, афарыстычнасцю, дакладнасцю пейзажнага малюнка і мяккім лірызмам, беларускія матывы прысут-

нічаюць як успамін пра гасцінную і сардэчную зямлю, што стала для паэта роднай (верш «Над рэчкай Шчарай»).

Сучасныя літаратурныя кантакты Віцебска і Даўгаўпілса актывізаваліся ў сувязі са святкаваннем у абодвух гарадах 140-гадовага юбілею Яніса Райніса, у якім прымалі ўдзел даўгаўпілскія літаратары А. Салаўёў, Ф. Осіна, Я. Голубеў, С. Валодзька, аўтар сумеснага беларуска-латышскага праекта І. Мукане і віцебскія паэты С. Панізнік, В. Русілка, старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Т. Краснова-Гусачэнка. Паказальна, што ў дні прысутнасці віцебскай дэлегацыі на ўрачыстасцях у Даўгаўпілсе вершы Т. Красновай-Гусачэнкі і В. Русілкі (у перакладзе Я. Голубева) былі апублікаваны ў газеце «Динабург: вестник».

Кантактныя літаратурныя сувязі заканамерна прыводзяць да больш глыбокіх змен у характары літаратурнага працэсу і ў індывідуальнай творчасці пісьменнікаў. Гэтыя змены маюць доўгатэрміновы, паступовы характар і з'яўляюцца тыпалагічнымі сыходжаннямі на ўзроўні тэматыкі, канцэптасферы, вобразнай структуры, жанрава-стылявой дынамікі. Ролю правадніка і каталізатара гэтых працэсаў адыгрывае ўзаемная перакладчыцкая дзейнасць, а таксама прыклады гістарычна моцных, знакавых для культурнага развіцця народаў асоб, такіх, як Яніс Райніс.

У канцэптасферы творчасці сучасных паэтаў Віцебска і Даўгаўпілса прысутнічаюць некаторыя тыпалагічныя сыходжанні. З канцэптаў, агульных для нашых аўтараў, вылучаецца вобраз Дзвіны-Даўгавы, да якога часта звярталіся даўгаўпілсцы А. Салаўёў, С. Валодзька, віцябляне Д. Сімановіч, Т. Краснова-Гусачэнка, А. Салтук, У. Папковіч, В. Русілка, Л. Сіманёнак. Агульнае сэнсавае напаўненне гэтага вобраза – архетып гістарычнай сувязі пакаленняў і народаў (нярэдка ў вершах сустракаюцца гістарычныя назвы ракі – Рубон, Эрыдан, Турун, Радан і інш.). Разам з тым кожны з паэтаў знаходзіць індывідуальнае ўвасабленне вобраза: Д. Сімановічу рэкі ўяўляюцца знакамі няўмольнага часу, ён захапляецца родным тварам старажытнага Віцебска, «изрезанным, как морщинами, / Лучосой, Витьбой и Двиной» [7, с. 215]. Для яго латгальскага калегі А. Салаўёва рака таксама неад'емны атрыбут горада, толькі Даўгаўпілса, вобраз, які дае нагоду для пастаянных філасофскіх роздумаў:

… Даугава –
Зеркально-гладкая…
И в воду опрокинувшийся мост.
И школа Райниса на якоре у берега –
Сундук с преданьями… [8, с. 128]

Блізкае з латгальскім паэтам А. Салаўёвым асэнсаванне канцэпта «Дзвіна» ўласціва, на наш погляд, для паэзіі віцяблянкі Н. Салаўёвай. Для яе Дзвіна, на беразе якой часцей і пішуцца вершы, – таксама штуршок для філасофскіх разваг пра хуткаплыннасць жыцця, яго сэнс і вечныя каштоўнасці:

С времен Ольгерда и Всеслава
На берегах родной Двины,
Торжественной и величавой,
Мне дорог образ тишины [9, с. 8].

Велічная, няспешная інтанацыя, гістарызм мыслення, лёгкі дакладны рытм, багатыя эпітэты – асноўныя сродкі мастацкай выразнасці, з дапамогай якіх ствараецца канцэпт ракі ў паэзіі Н. Салаўёвай. Для пластычных, насычаных фарбамі вершаў паэтэсы Дзвіна – крыніца прыгажосці, натхнення, жывапісных вобразаў.

Як сімвал жыццёвага шляху і жаночага лёсу асэнсоўваецца вобраз Дзвіны ў вершах Л. Сіманёнак («Дзьвіна») і В. Русілкі («Дзвіне»), як знак роднасці з пакінутай «малой» радзімай – у паэзіі А. Салтука, С. Валодзькі і іншых аўтараў.

Яшчэ адзін агульны для паэтаў Віцебска і Даўгаўпілса канцэпт – сасна, аб спецыфіцы сэнсавага напаўнення якога ўжо гаварылася ў сувязі з рэцэпцыяй у беларускай літаратуры верша Яніса Райніса «Зламаныя сосны».

Вобраз сасны ў беларускім фальклоры звязаны з цяжкай жаночай доляй, а ў суседстве з вобразам ветру сімвалізуе нешчаслівы лёс. Абапіраючыся на такое фальклорнае ўяўленне, паэты (услед за Я. Райнісам) нярэдка палемізуюць з ім, гаворачы аб жыццёвай сіле і стойкасці дрэва. Асабліва гэта ўласціва для віцебскіх паэтаў, якія ў дзяцінстве перажылі гады Вялікай Айчыннай вайны і лёс Беларусі – лясной партызанкі, для якой сасновы гушчар – топас выратавання ад гвалтоўнай смерці (Д. Сімановіч, Р. Барадулін, А. Канапелька і інш.). Разам з тым сасна – нязменны атрыбут як латышскіх пейзажаў (у карэляцыі «сосны – дзюны»), так і беларускіх карцін прыроды («сасна – бор») у іх паэтычным асэнсаванні.

Імкненне да культурных кантактаў Віцебска і Даўгаўпілса яўна ўзмацняецца ў апошняе дзесяцігоддзе, аб чым гаворыць наяўнасць міжнародных праектаў супрацоўніцтва, пастаянны абмен культурнымі дэлегацыямі і шматлікія мерапрыемствы з удзелам мастакоў, музыкантаў, фальклорна-этнаграфічных калектываў. Паказальна, што гэтая тэндэнцыя знаходзіць дзяржаўную падтрымку як у Беларусі, так і ў Латвіі. Узрастае і імкненне да літаратурных кантактаў пісьменнікаў Віцебшчыны і Латгаліі, да ўзаемнай перакладчыцкай дзейнасці. Гэта дае магчымасць сцвярджаць, што ўзаемаўзбагачэнне літаратур будзе працягвацца, у тым ліку і на тыпалагічным узроўні.

ЛІТАРАТУРА

1. **Абала, М.** Ян Судрабкалн і беларусы / М. Абала // Полымя. – 1980. – № 9. – С. 222–230.

2. **Адзінства** і ўзаемаўзбагачэнне / рэд. І. Я. Навуменка ; АН БССР, Ін-т. літ-ры імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980.

3. **Александровіч, С.** Слова – багацце / С. Александровіч. – Мінск : Маст. літ., 1981.

4. **Броўка, П.** Збор твораў : у 9 т. / П. Броўка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т. 4.

5. **Валодзька, С.** Памяці гаючая трава / С. Валодзька. – Даугавпилс : SAB, 2001.

6. **Панізьнік, С.** Пры сьвячэньні… / С. Панізнік. – Вільня : Наша будучыня, 2004.

7. **Симанович, Д.** Избранное / Д. Симанович. – Минск : Маст. літ., 1995. – 381 с.

8. **Соловьев, А.** Город чаек и лебедей : [стихи] / Алексей Соловьев. – Даугавпилс : [Б. и.], 2005. – 155 с. : ил.

9. **Соловьева, Н.** Осень ставит концерты : [стихи] / Наталия Соловьева. – Минск : Медисонт, 2010. – 192 с.

10. **Судрабкалн, Я.** Радасць братэрства / Я. Судрабкалн // Беларусь. – 1969. – № 1. – С. 3–6.

11. **Rainis, Y.** Dzive un darbi / Y. Rainis. – Riga, 1925. – T. 1.

Русілка В.І., Лявікіна К.І. *(г. Віцебск)*

АЛЕСЬ РАЗАНАЎ: ДУХОЎНА-КУЛЬТУРНЫ АСПЕКТ КНІГІ ПЕРАСТВАРЭННЯЎ «ФРАНЦЫСК СКАРЫНА. МАЕМ НАЙБОЛЬШАЕ САМІ»

Францыск Скарына – вядомы беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, асветнік, перакладчык, грамадскі дзеяч, кнігавыдавец, вучоны-медык. Асоба Францыска Скарыны займае ганаровае месца сярод дзеячаў эпохі Адраджэння і Рэфармацыі ў Беларусі. Самаадданае служэнне народу было для яго сэнсам жыцця. Скарына імкнуўся далучыць суайчыннікаў да набыткаў агульначалавечай культуры.

Як сведчаць гастарычныя крыніцы, першапачатковую адукацыю Францыск Скарына атрымаў у доме бацькоў, там жа навучыўся чытаць па Псалтыры і пісаць кірылічнымі літарамі. Мову тагачаснай навукі – латынь – ён засвойваў у школе пры каталіцкім касцёле ў Полацку і Вільні. Прыблізна ў 1504 г. таленавіты палачанін паступіў ва ўніверсітэт у Кракаве, які на той час славіўся ў Еўропе сваім факультэтам вольных мастацтваў. Менавіта гэтая навучальная ўстанова стала месцам, дзе Францыск Скарына пашырыў свой кругагляд, атрымаў карысныя практычныя веды па многіх гуманітарных і прыродазнаўчых навуках.

Кнігадрукаванне – значны крок наперад для культуры і адукацыі беларускага народа. Пераклады і выданні кніг Бібліі – адно з самых значных дасягненняў асветніка. Першадрукар выдаў пераважную большасць кніг Старога Запавету. Відавочна, Скарына выбіраў найбольш цікавыя для чы-

тача кнігі, якія таксама маглі быць выкарыстаны ў асветніцкіх мэтах. У сваёй дзейнасці першадрукар кіраваўся дзвюма галоўнымі мэтамі: распаўсюджваць высокія хрысціянскія ідэалы і актыўна змагацца за тагачасную кнігу і культуру.

Францыск Скарына імкнуўся, каб словы яго былі зразумелыя кожнаму чалавеку, таму падаваў у простай і зразумелай форме біблейскія тэксты, каментаваў іх. Першадрукар змяшчаў звесткі аб гістарычных, моўных, побытавых рэаліях, тлумачыў алегарычны змест кніг, асобныя царкоўнаславянскія словы. Лічыў, што чалавек не павінен жыць без кнігі.

Пашырыць кругагляд чытача, узбагаціць яго веды, наблізіць чалавека да кніг Бібліі Францыск Скарына імкнуўся і праз глосы – тлумачэнні незразумелых для звычайнага чалавека слоў, і праз прадмовы, якія ўвёў у шырокі ўжытак. Менавіта ў іх раскрываецца гуманізм, патрыятызм, павага да роднай мовы і свайго народа. Варта адзначыць, што такі наватарскі для тагачаснага кнігадрукавання падыход не быў ухвалены высокімі рэлігійнымі коламі.

Перакладчыцкая, выдавецкая, культурна-асветніцкая дзейнасць гуманіста мела вялікае значэнне для развіцця беларускай культуры, аказала ўплыў і на кнігадрукаванне, садзейнічала культурнаму збліжэнню народаў. Яго выданні вызначаюцца высокай якасцю друку, а спецыфічныя гравюры і арнаменты адлюстроўваюць эстэтыку і прафесіяналізм выдаўца.

Імя Францыска Скарыны стаіць побач з такімі выдатнымі імёнамі дзеячаў сусветнай культуры эпохі Адраджэння, як Леанарда да Вінчы, Рафаэль, Ян Амос Каменскі.

Увекавечана імя Скарыны ў назвах вуліц у Полацку, Лідзе, Мінску, Вільнюсе, Празе. У яго гонар названы Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт і гімназія ў Вільнюсе.

У 2017 г. было адзначана 500-годдзе беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукаваннння. Менавіта гэта паслужыла падставай для асэнсавання і актуалізацыі спадчыны Францыска Скарыны – творцы рэнесанснага тыпу, які аднолькава годна выявіў сябе ў разнастайных сферах духоўнага жыцця народа як першадрукар, вучоны, перакладчык, філосаф-гуманіст, тэолаг. Невыпадкова да гэтай знакавай для беларускага народа асобы, глыбока асэнсаванай у розных галінах навукі і ўвасобленай у шматлікіх творах літаратуры і мастацтва, звярнуўся выдатны паэт і перакладчык, творца еўрапейскага маштабу Алесь Разанаў, які і сам з'яўляецца знакавай фігурай для сучаснай беларускай літаратуры. Кніга перастварэнняў Алеся Разанава «Маем найбольшае самі» стала адметнай з'явай сённяшняга літаратурнага працэсу, а яе ідэйна-тэматычная і мастацкая спецыфіка патрабуе ўсебаковага аналізу.

Кніга перастварэнняў Алеся Разанава «Маем найбольшае самі» скіравана на нацыянальную сітуацыю, на духоўнае ўдасканаленне грамадства на аснове дзейнасці Ф. Скарыны, на высвятленне паняццяў дабра і зла, на ўмацаванне духоўных каштоўнасцей. Біблейскія тэксты, пераствораныя на

аснове скарынаўскай Бібліі, маюць вялікае значэнне для літаратурна-культуралагічнай спадчыны, для духоўных каштоўнасцей грамадства.

У сучаснай беларускай духоўнай культуры асобнае месца належала і самому Алесю Разанаву, з якім беларускае грамадства развіталася 26 жніўня 2021 г. Гэта быў вельмі незвычайны, нетрадыцыйны мастак, чые дасягненні сведчаць пра магутны талент не толькі паэта-філосафа, але і эксперыментатара ў галіне формы верша, словатворцы. Прычым, нягледзячы на пэўныя разбуральныя тэндэнцыі ў літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў, слова і сэнс у яго не толькі не губляюць сувязі, але і ўсё мацней сплятаюцца адно з адным. Паэт імкнуўся спазнаць спрадвечны, першапачатковы сэнс пэўных моўных адзінак, адшукаць самыя патаемныя іх загадкі, убачыць іх шматгранна, ва ўсёй выразнасці. Класічны традыцыяналіст і разам з тым яркі наватар, А. Разанаў заснаваў і ўвёў у паэзію свае, новыя жанры і здолеў пакінуць непаўторнае слова пра час і пра сябе. Адной з адметнасцей разанаўскага падыходу з'яўляецца тое, што празаічны тэкст Скарыны выкладзены ў паэтычнай форме свабоднага верша. Паэт зрабіў невялікае пераструктураванне паслядоўнасці скарынаўскіх прадмоў і стварыў кнігу, якая ўключае ў сябе 18 раздзелаў. У пераварэннях А. Разанаў адзначае актуальныя для XXI ст. праблемы, падае тэксты Скарыны для сучаснага чытача на даступнай і простай мове. Яго паэзія ўвабрала ў сябе нацыянальную культурную памяць і арганічна самавыяўляецца ў кантэксце сусветнай культуры і літаратуры.

Алесь Разанаў звярнуўся да старажытнай літаратуры, а менавіта да вобраза Францыска Скарыны, прадмоў старажытнага першадрукара з мэтай наблізіцца да чытача праз біблейскія сюжэты на зразумелай сучаснаму пакаленню мове. Алесь Разанаў шукае вытокі нацыянальнага характару, звяртаючыся да перастварэння не першы раз, упрыгожваючы тэксты сваімі метафарамі, больш яснымі для чытача. Скарына скарыстоўваў у прадмовах простыя біблейскія ісціны. Але ў той складаны час – а ў наш дык яшчэ ў большай меры – такія простыя ісціны больш неабходныя, чым усе складаныя трактоўкі і вытлумачэнні. Падобным чынам А. Разанаў кажа пра тэксты, з якімі меў справу, пра саму «святую кнігу Біблію». Ён адзначае: «Яна, "як рака цудадзейная", адначасова і плыткая: па ёй можа і дзіця брысці, і незвычайна глыбокая – "слон плысці мусіць"» [2, с. 15].

Яркі, сучасны паэт падкрэслівае асаблівасці беларускага характару, самаідэнтыфікуе яго. Як і ў самога Скарыны была мэта наблізіць біблейскія тэксты да народа ў XVI ст., так і зараз перастваральнік даводзіць гэту ідэю да сённяшняга беларуса, які павінен быць да рэлігіі і царквы значна бліжэй.

А. Разанаў падкрэслівае, што пасля Францыска Скарыны сапраўды засталося шмат каштоўнасцей, але і страцілася шмат. Адсюль і тое вялізнае раз'яднанне са старажытнасцю, нават з часамі нашага героя, праз што давялося ў XIX ст. папросту ствараць ад пачатку новую беларускую літаратуру. Страцілася і жывое адчуванне многіх рэчаў.

Разанаў не акцэнтуе сваё аўтарства кнігі, адводзіць сабе толькі ролю перастваральніка, перакладчыка, трансфарматара аўтэнтычных твораў беларускага першадрукара. Кампазіцыйная структура кнігі А. Разанава, відавочна, абумоўлена храналогіяй выдання Скарынам кніг Старога Запавету. Ідучы ўслед за сваім аўтарам, Разанаў не парушыў яго паслядоўнасці, таму што зразумеў, раскрыў для сябе намер Скарыны, яго галоўную ідэю. Першая прадмова Скарыны была да Псалтыра, першае перастварэнне Разанава – «Псалом – песняспеў анёльскі». Адметна, што беларускае кнігадрукаванне пачалося з вельмі папулярнага і запатрабаванага ў народзе выдання – Псалтыр цара Давіда, адной з самых паэтычных і эмацыянальных кніг Бібліі. Скарына наблізіў Біблію да свайго сучасніка, а Разанаў – да свайго. Аздабляючы пераказ прадмовы Скарыны да Псалтыра сваёй назвай «Псалом – песняспеў анёльскі», Разанаў услед за Скарынам з першых радкоў пачынае размову з чытачом на яго мове аб вечным: аб падзеннях і ўзлётах чалавека, аб пакаянні і Божай дапамозе, «як дасягнуць чалавечага жыцця, над якім не мае ўлады ні тлен, ні смерць» [2, с. 8]. Нездарма пазней не ў Празе, а ўжо ў Вільні Скарына ў другі раз выдаў менавіта Псалтыр. Падобным чынам Алесь Разанаў падыходзіць і да наступных прадмоў.

Найбольш папулярнымі сталі словы Скарыны аб патрыятызме: «Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння, ведаюць сховы свае…» [2, с. 32]. Разанаў вяртае гэтай формуле канкрэтны біблейскі кантэкст, у якім яна набывае нават не толькі больш глыбокі, а ў нечым і адрозны сэнс. У прадмове да Кнігі Юдзіф падаецца шырокая гістарычная палітра падзення і адраджэння з попелу дзяржаў і народаў. Ацэньваюцца гэтыя падзеі з пункту гледжання хрысціянства: развіццё і пагібель дзяржаў падаецца як пакаранне за адступленне ад Бога і веры і як дараванне міласці за вернасць волі Боскай. Напрыклад, Навухаданосар Камбіз: «Ён захацеў быць не толькі царом, а і Богам, як пішацца пра яго ў гэтай кнізе. За гардыню, як адзін з найцяжэйшых грахоў, і быў пакараны» [2, с. 40]. Скарына, а ўслед за ім і Разанаў падкрэсліваюць сацыяльны, надзённы, павучальны характар кніг Бібліі. На іх трэба выхоўваць моладзь, да іх звяртацца за адказам на ўсе пытанні.

Разанаўскія перастварэнні скарынаўскіх кніг выразна выявілі і творчую індывідуальнасць сучаснага паэта, непаўторнасць яго паэтычнага стылю. Алесь Разанаў надаў асаблівую эстэтычную пераканальнасць скарынаўскім тэкстам. Аздабляючы іх яркімі арыгінальнымі метафарамі, выразным рытмічным кодам, глыбокімі афарыстычнымі назвамі, Алесь Разанаў наблізіў скарынаўскія тэксты Бібліі да сённяшняга чытача, ён творча актуалізаваў духоўную аснову нацыі. Кнігі Скарыны ўспрымаюцца сёння як духоўны скарб і нацыянальная святыня беларускага народа. Такім чынам, перастварэнні А. Разанава ўзбагачаюць беларускую культуру новымі філасофскімі асэнсаваннямі і новымі пошукамі ў галіне формы верша.

ЛІТАРАТУРА

1. **Ладуцька, К.** Як золата пералітоўваецца агнём / К. Ладуцька // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 3 лют. – С. 4.

2. **Разанаў, А.** Францыск Скарына. Маем найбольшае самі : кніга перастварэнняў / А. Разанаў. – Мінск : Маст. літ., 2017. – 223 с.

3. **Трафілаў, С.** Маем найбольшае самі … Алесь Разанаў: перастварыць Скарыну, каб прабіцца да сучасніка / С. Трафілаў // Культура. – 2017. – 18–24 лют. – С. 6.

Силина А.В. *(г. Витебск)*

НЕ ТОЛЬКО ВЕЛИКИЙ ТЮРКОЛОГ. К БИОГРАФИИ АЛЕКСАНДРА ПОЦЕЛУЕВСКОГО

Профессор Александр Петрович Поцелуевский – ученый, посвятивший четверть века изучению тюркской группы языков, заложивший основы туркменского языкознания. Обращение к фигуре Александра Петровича, как правило, происходит в связи с его деятельностью в Туркменской ССР, тогда как витебский период жизни филолога ранее рассматриваем не был.

Александр Поцелуевский родился 13 (26) мая 1894 г. в с. Букмуйже Режицкого уезда Витебской губернии (совр. Эзерниеки, Латвия) в семье Петра Осиповича и Марии [Фоминичны] Поцелуевских. Сведения о родных ученого мы можем получить из материалов Первой всеобщей переписи 1897 г. В то время Поцелуевские проживали в с. Букмуйже; в расположенном там же Вайводовском народном училище глава семьи служил учителем.

Мария [Фоминична] – мещанка православного вероисповедания. На момент переписи ей было 28 лет, родилась в Люцинском уезде, получила домашнее образование. Петр Осипович – мещанин православного вероисповедания, родился в 1864 г. в г. Дисне, образование получил в учительской семинарии. Обращаясь к переписному листу, уделим внимание одной из граф, в которую вписывали фамилию, имя и отчество, в ней же отмечали, является ли человек слепым, немым, глухонемым или умалишенным. В данном столбце указано: «Поцелуевский он же Иозефатов» [10].

Кроме Александра в семействе были сыновья Павел и Николай. Заметим, что Павел, в отличие от других членов семьи, на постоянной основе пользовался фамилией Иозефатов-Поцелуевский [7].

Под двойной фамилией Александр Петрович опубликовал поэтические произведения в литературно-художественном альманахе «В родной долине» (1912). Это был второй сборник, выпущенный московским издательством «Дружба», которое предположительно было создано одноименным литературным кружком писателей-самоучек, организованным Григорием Деевым-Хомяковским в 1911 г. [16].

В издании были представлены стихотворения Александра Петровича «Стансы», «К року», «У березы» и «Желание», посвященное некой Е. Раздел с работами будущего тюрколога озаглавлен как «Стихи А.П. Иозефатова-Поцелуевского», в конце данного тематического блока присутствует подпись «А. Поцелуевский».

Вероятно, к этому времени Поцелуевские уже обосновались в Витебске. На основании того факта, что Петр Осипович получил работу в местном отделении Крестьянско-поземельного банка в 1906 г., мы можем предположить, что переезд семьи состоялся в указанный период времени [9].

В городе на Двине Александр Поцелуевский поступил в гимназию, по окончании которой в 1914 г. продолжил обучение в Москве в Лазаревском институте восточных языков. В годы учебы занимался на курсах французского языка при обществе «Альянс Франсэз» и изучал английский язык на курсах «Общества сближения России с Англией» [1, с. 124].

По приезде в Витебск в 1918 г. Поцелуевский начал работать в местном отделении Московского археологического института, в котором в 1920 г. вел курсы эсперанто. Занятия посещали не только студенты, но и горожане. Язык Заменгофа пытались сделать обязательной дисциплиной для слушателей учебного заведения [11, с. 277].

Возвращаясь к событиям первого послереволюционного года, заметим: в сентябре Александр Петрович был заявлен как участник организованного Витебским обществом эсперантистов вечера, посвященного юбилею писателя Льва Толстого. В афише мероприятия анонсировалось выступление Поцелуевского с докладом «Homaranismo, tolstojanismo kaj bahaismo» («Хомаранизм, толстовство и бахаизм») [3].

Обратим внимание на бахаизм как одну из тем рассказа филолога. Ключевой идеей религии, появившейся в XIX в., являлось объединение человечества в единое планетарное государство. Бахаизм предполагает введение единого мирового языка, поэтому среди приверженцев данного учения немало эсперантистов. В более позднем документе, датируемом 1922 г., Александр Петрович называл себя бахаистом [12, с. 292].

Об истории Витебского общества эсперантистов следует сказать отдельно. Попытки создания организованных групп в Витебске относятся к 1910 г., когда было открыто отделение Всероссийской лиги эсперантистов («Ruslanda Ligo Esperantista»), однако вскоре центральная организация и ее филиалы были закрыты. Бывшие участники отделения создали Общество эсперантистов, в котором преимущественное положение занимали врачи В. Тутурин и К. Урбанович, в 1916 г. к ним присоединился В. Григорович [14, с. 279].

На сегодняшний момент не установлено, когда именно Поцелуевский стал участником объединения. В 1919 г. он являлся председателем комитета общества, домашний адрес филолога был указан как адрес организации [8].

Одноэтажный деревянный пятикомнатный дом под номером 89 по ул. Нижне-Петровской (совр. ул. Комсомольская) принадлежал отцу тюрколога [5].

Значительные преобразования в местном эсперанто-движении произошли в декабре 1919 г., когда был организован Витебский союз юных эсперантистов. Важнейшей из задач участники объединения считали возникновение союзов юных эсперантистов по всей России. Цель группы заключалась в создании Всероссийского объединения юных эсперантистов, поэтому 18 апреля 1920 г. было организовано Бюро по организации и объединению в России союзов юных эсперантистов (Бюро ПОРСЮЭ) [13, с. 71]. В его состав входили не только члены Союза юных эсперантистов Б. Шабер (председатель), Х. Файнберг (секретарь), Л. Гуфенберг, но и представители Общества эсперантистов А. Поцелуевский и А. Виноградов [17].

В периодике того периода сообщалось об открытии курсов по подготовке преподавателей эсперанто, которыми руководил Поцелуевский [17]. В октябре 1920 г. исследователь по заданию Витебского отделения Московского археологического института уехал в Среднюю Азию, где изучал персидский язык. Итогом командировки стало составление руководства по изучению персидского языка; были собраны материалы для составления русско-персидского словаря до буквы е включительно [6].

В журнале «Al eterna lumo» за февраль – март 1921 г. указано: «…прибывший в Ташкент командированный член Бюро ПОРСЮЭ М.М. Тимофеева организовала там инициативную группу, которая оживила эспер. движение. В настоящее время там существуют: эспер. о-во, Турк. ЦК ВФЭ, секретарем которого состоит член Бюро ПОРСЮЭ А.П. Поцелуевский. Открыты курсы при школе Л. Толстого. Преподает А. Поцелуевский. Кроме того, организовано еще 2 курсов. Одними руководит председ. ЦК П. Рудницкий, другими М. Тимофеева. Срок командировки последней продлен до 1 мая с. г. В настоящий момент она заканчивает работы по организации объединения юнэсов. Тур. ЦК ВФЭ приступил к изданию журнала «Туркестанский Пионер», который будет выходить пока рукописным, ввиду резкой враждебности к эсперанто лиц, от которых зависит печатное слово Туркестана. Редактор «Аль Етерна Люмо» получил горячее единомышленническое приветствие от ед. П. Рудницкого» [15, с. 19].

В июне 1922 г. Поцелуевский вернулся в Витебск, работал в Конторе американской администрации помощи (АРА) [6]. В январе следующего года Александр Петрович начал преподавать на общегородских курсах эсперанто, организованных Центральным комитетом Западной федерации Союза эсперантистов советских стран [4].

Заметим, что по итогу III Всероссийского съезда эсперантистов, состоявшегося летом 1921 г., коммунистической фракцией был организован Союз эсперантистов советских стран (СЭСС). Борис Шабер был назначен уполномоченным ЦК СЭСС по работе среди молодежи и заведующим Секцией

молодежи ЦК СЭСС, а Бюро ПОРСЮЭ было ликвидировано. В тот год также был создан ЦК Западной федерации СЭСС [13, с. 72].

На общегородском собрании Витебских эсперантистов в 1923 г. Шабер говорил о необходимости привлечения в ЦК Западного фронта СЭСС новых работников, не занятых в других эсперанто-организациях, в частности Поцелуевского, на что последний заявил, что является идейным противником СЭСС и поэтому не может работать в ее организациях, согласен работать только в качестве преподавателя и переводчика [2]. В этот период времени служба просвещения Среднеазиатской железной дороги в г. Ашхабаде пригласила будущего ученого на должность инструктора-методиста. Дальнейшие биография и деятельность Александра Петровича были связаны с Туркменистаном [1, с. 124].

ЛИТЕРАТУРА

1. **Александр** Петрович Поцелуевский (1894–1948) / Г. Ф. Благова [и др.] // Восток. Афро-азиатские общества: история и современность. – 2004. – № 5. – С. 122–135.

2. **Государственный** архив Витебской области (ГАВт). – Ф. 41. Оп. 1. Д. 463. Л. 516 об.

3. **ГАВт.** – Ф. 56. Оп. 6. Д. 5. Л. 284.

4. **ГАВт.** – Ф. 59. Оп. 1. Д. 32. Л. 9.

5. **ГАВт.** – Ф. 123. Оп. 1. Д. 1329. Л. 57.

6. **ГАВт.** – Ф. 131. Оп. 2. Д. 22. Л. 15.

7. **ГАВт.** – Ф. 175. Оп. 1. Д. 99 Л. 6.

8. **ГАВт.** – Ф. 200. Оп. 1. Д. 4. Л. 59.

9. **ГАВт.** – Ф. 449. Оп. 2. Д. 358. Л. 1.

10. **Государственный** исторический архив Латвии. – Ф. 2706. Оп. 1. Д. 198. Л. 655.

11. **Лисов, А. Г.** Организации эсперантистов в г. Витебске 1910-х – 1920-х гг. / А. Г. Лисов // Віцебскі край : матэрыялы IV Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, 22 лістап. 2018 г. – Мінск, 2019. – Т. 4. – С. 276–279.

12. **Мартыненко, А. В.** История распространения религиозной общины бахаи в России (имперский, советский, постсоветский периоды) / А. В. Мартыненко // Известия Самарского научного центра РАН. – 2010. – № 6. – С. 292–298.

13. **Силина, А. В.** Борис Шабер – человек многих талантов / А. В. Силина // Искусство и культура (Витебск). – 2021. – № 3 (43). – С. 70–75.

14. **Силина, А. В.** Журнал «Al eterna lumo» как источник об эсперанто-движении / А. В. Силина // Актуальные проблемы источниковедения : материалы VI Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 23–24 апр. 2021 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2021. – С. 279–281.

15. **Хроника** // Al eterna lumo. – 1921. – № 3/4. – С. 15–20.

16. **Шруба, М.** «Дружба» / М. Шруба // Литературные объединения Москвы и Петербурга 1890–1917 годов : словарь / под науч. ред. А. И. Рейтблата. – Москва, 2004. – С. 51.

17. **Эсперанто** среди молодежи // Esperantista movado. – 1920. – № 2 (9). – С. 10.

Сіўко Ф.І. *(г. Віцебск)*

ТАПОНІМЫ НІЖНЯГА ЦЯЧЭННЯ РАКІ ВЯТЫ Ў ДАЎНЕЙШЫХ І СУЧАСНЫХ СПІСАХ, ДАВЕДНІКАХ, СЛОЎНІКАХ І СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

У агульным значэнні тапонім (грэч. *τόπος, ὄνομα* – месца, імя) – назва геаграфічнага аб'екта пэўнай мясцовасці. Як вядома, адзінага падыходу да класіфікацыі тапонімаў на сённяшні дзень не існуе, навукоўцы падзяляюць іх паводле знешніх прыкмет на некалькі класаў[1]:

• гідронімы – назвы водных аб'ектаў: рэк (патамонімы), азёр (лімнонімы) і г. д.;

• айконімы – назвы населеных пунктаў: гарадоў (асціонімы), сельскіх паселішчаў (камонімы);

• мікратапонімы – назвы невялікіх месцаў (калодзежаў, крыніц, вадаспадаў і г. д.);

• урбаноімы – найменні ці назвы ў межах тапаграфічнага аб'екта;

• аронімы – назвы ўзнятых форм рэльефу (гор, узгоркаў, хрыбтоў і г. д.);

• ойкадамонімы – назвы будынкаў;

• эклезіонімы – уласныя імёны культавых месцаў.

Тапонім можа шмат сказаць пра гісторыю мясцовасці і лад жыцця ды побыт яе насельнікаў, а праз ступень аўтэнтычнасці пры падачы на мапах, у выданнях практычнага прызначэння (даведніках, спісах, слоўніках) – пра стан тапанімікі як навукі. У плыні адзначанага прааналізуем некаторыя тапонімы ніжняга цячэння р. Вяты (мясц. – Вяткі), што ўліваецца ў Заходнюю Дзвіну на ўскрайку аднайменнае в. Вяты Мёрскага раёна. Мясціны, куды, з прычыны яе аддаленасці ад буйных населеных пунктаў, нага тапаніміста калі і ступала, дык вельмі рэдка.

Рака Вята

Даўжыня р. Вяты, левага прытока Заходняй Дзвіны, – 31 км. У пераліку на так званыя малыя беларускія вёрсты, якімі карысталіся нашы продкі да ўвядзення метрычнай сістэмы мер, гэта прыкладна 20 вёрст[2]. Вята выцякае з воз. Набіста (Дзедзіна, Дзедзінскае) ля в. Перабродзе Мёрскага раёна і да воз. Шчоўна мае іншую назву (патамонім) – *Хараброўка*. У «Матэрыялах па гісторыі і геаграфіі Дзісенскага і Вілейскага паветаў Віленскай губерні»[3] А. Сапунова і кн. У. Друцкага-Любецкага 1893 г. гэта назва падаецца з няпоў-

[1] У прыведзеным далей пераліку названыя толькі тыя класы, якія сустракаюцца ў гэтым даследаванні.

[2] Малая вярста = 1559,7 м.

[3] Тут і далей пераклад назваў прац і тапонімаў з рускай і польскай моў, а таксама адаптацыя пададзеных па-польску тапонімаў да кірыліцы аўтара артыкула.

нагалоссем: *Храброўка*. Паводле выдання І.І. Гашкевіча «Віленская губерня: поўны спіс населеных месцаў са статыстычнымі дадзенымі пра кожнае паселішча» 1905 г., усе населеныя пункты Друйскай воласці[4], што знаходзяцца ўздоўж левага берага ракі, месцяцца па-над *Вятай*, у той час, як большасць вёсак і хутароў суседняй Лявонпальскай воласці, што знаходзяцца на процілеглым правым беразе і часам літаральна за некалькі соцень метраў ад першых, – ужо чамусьці па-над *Хараброўкай*. Гэткая недарэчнасць тлумачыцца, відаць, тым, што складальнік выдання карыстаўся пры падрыхтоўцы рукапісу да друку звесткамі з розных крыніц і на неадпаведнасць адных другім адносна аднаго і таго ж аб'екта належнае ўвагі не звярнуў.

У дадатак адзначым, што абодва адрэзкі ракі маюць кожны ў сваім цячэнні аднайменны ўласнай назве населены пункт: Вята – в. Вяту, Хараброўка – в. Хараброва.

Рака Вята ў сярэдзіне ніжняга цячэння. Здымак А. Немянёнак. 2021 г.

Як сцвярджаецца ў рускамоўнай версіі апісання р. Вяты ў Вікіпедыі, яна ўпадае ў Заходнюю Дзвіну за 1 км ніжэй па цячэнні ад в. Вяты. Хаця правільна было б – за 1 км ад цэнтра в. Вяты. Бо р. Вята, калі зыходзіць з запісаў у дакументах пра месцапражыванне насельнікаў мясціны пры ўтоку Вяты ў Заходнюю Дзвіну – элемент не ваколіц вёскі, а яе самой. Што да дзвюх назваў (патамонімаў) ракі – *Хараброўка, Вята*, – то такое ў яе ніжнім цячэнні і адносна назваў паселішчаў таксама не рэдкасць. Прыкладна за 3 км ад в. Вяты да нядаўняга часу месцілася цяпер ужо згаслая в. Міжрэчча [15]

[4] Найменшая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка часоў Расійскай імперыі і савецкага перыяду прыкладна да 1930-х гг.

(мясц. – Мі(е)зарэча), перайменаваная гэтак у XVII ст. з Дубровіцы (Дуброўкі), назву якой не след блытаць з аднакарэннымі назвамі дзвюх яшчэ раней зніклых тутэйшых вёсак, што месціліся на беразе суседняй (упадае ў Заходнюю Дзвіну прыкладна за 4 км ад Вяты) р. Мёрыцы: Надмірэчча (Надмерыца) і Надрэчча. Ды і назва в. Вяты, як убачым далей, калі і не мянялася ніколі кардынальна, дык трансфармавалася паводле нюансаў гучання неаднойчы.



Рака Вята і некаторыя населеныя пункты яе ніжняга цячэння на мапе польскага Вайсковага геаграфічнага інстытута 1932 г.[5] Уверсе стрэлкаю ў кірунку Заходняй Дзвіны, якая ад гэтага месца на процілеглым, латвійскім баку называецца Даўгаваю, пазначаны пункт размяшчэння першага па ліку (нулявога) слупа на тагачаснай мяжы Польшчы, Латвіі і СССР.

Кухальшчына

Маляўнічы ўскраек (урочышча) в. Вяты пры месцы ўпадзення р. Вяты ў Заходнюю Дзвіну наўзбоч колішняе мяжы трох дзяржаў цяпер зусім бязлюдны, а яго старадаўняя назва *Кухальшчына* – мікратапонім, не проста абмінуты ўвагаю тапанімістаў, краязнаўцаў і мапографаў, а і зусім забыты. Ад часоў распаду СССР – гэта глухая пясчаная мясціна, густа зарослая хмызам і дрэвамі лесапасадкі частка памежнае паласы. Сёння і ўявіць нават цяжка, што некалі тут, як і ва ўсёй Вяце, віравала жыццё: людзі гадавалі дзяцей, ураблялі зямлю, даглядалі статак, займаліся рыбалоўствам і плытагонствам,

[5] Да сённяшняга дня гэта мапа мясцовасці, бадай, самая падрабязная.

і нават дзейнічала, як сцвярджалі да адыходу ў іншы свет некаторыя старажылы, ткацкая (і быццам бы не адна) ці то мануфактура, ці то – хутчэй за ўсё – саматужная арцель. У пачатку 1930-х гг. мясцовыя сяляне сяліліся ў Кухальшчыне ўздоўж правага берага ракі згодна з аб'яўленай польскімі ўладамі праграмай хутарызацыі. Гэта быў час, калі ніводзін лапік зямлі так званых крэсаў не заставаўся без гаспадара, а хаты ды гаспадарчыя пабудовы тубыльцаў ва ўзгорыстым закутку паміж Заходняю Дзвіной і пятлястаю Вятай спраўна ляпіліся да кустоўя на высокім і часам надта ж стромым беразе прытока.



Апошняя, ад не так даўняга часу спусцелая хата ў Кухальшчыне, у якой на момант нараджэння аўтара кватаравалі ягоныя бацькі. Належала селяніну Данату Анашку, затым – яго сыну Антону. Злева – цяперашні выгляд будынка звонку. Справа (у кірунку стрэлкі) – фрагмент столі (мясц. – сталявання) з круком для прывязвання зыбкі немаўляці. Здымкі Д. Росала. 2021 г.

Прудніцкае гарадзішча. Фартэцыя Вята

Вядомы па крыніцах з XVI ст. (першая згадка датуецца 1515 г.) замак-фартэцыя Вята (Betha, Wetta, Viviata, Wieta, Wiata), ад якога цяпер застаўся, на жаль, толькі курган, знаходзіўся на Прудніцкім гарадзішчы, прыкладна за кіламетр ад сённяшняга цэнтра вёскі, што і сталася прычынаю наяўнасці двух тапонімаў для абазначэння гэтага месца: *Прудніцкае гарадзішча; замак Вята.* Калі для чалавека дасведчанага такое розначытанне не праблема, то для асобы, далёкай ад метамарфозаў тапанімікі, – відавочна. Тым больш, што ўзведзены Іванам Сапегам на старажытным гарадзішчы замак падчас

вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у сярэдзіне XVII ст. быў разбураны, а здабыць дакладныя звесткі з яго папярэдняй і наступнай гісторыі не так проста. Але, як бы ні было, кожная з дзвюх назваў мае права на існаванне. *Замак-фартэцыя Вята,* што месціўся на *Прудніцкім гарадзішчы*; *Прудніцкае гарадзішча*, на якім месціўся *замак-фартэцыя Вята*, – так, відаць, будзе правільна казаць пры выкарыстанні назваў у спалучэнні аднае з другой. Для чалавека ж неабазнанага ў гісторыі мясціны гэты курган сёння – не больш як аронім, застылая ў часе ўзнятая форма рэльефу без зместу і прыкмет жыцця.

Рэшткі Прудніцкага гарадзішча, сённяшні выгляд. Здымак Д. Росала. 2021 г.

Кардоннае прадпрыемства (пазней – млын, гідраэлектрастанцыя) у фабрычнай асадзе Міжрэчча

Прудніцкае гарадзішча – не адзіная мясціна ніжняга цячэння Вяты, назва якой часам патрабуе ўдакладнення. І найперш маецца на ўвазе маляўнічы куток пры згібе ракі ў месцы найбольшага перападу ўзроўню яе рэчышча крыху больш за паўкіламетра ад кургана. Сёння гэта ўлюбёнае месца адпачынку і спасціжэння хараства прыроды не толькі жыхароў Мёршчыны, але і іншых рэгіёнаў Беларусі. У друкаваных выданнях і сеціве мікратапонім для яго абазначэння гучыць так: *вадаспад на Вяце.* Гэта правільна, аднак раз-пораз мільгаюць і такія няслушныя назвы, як *вадаспад у Суромшчыне (у Вяце, у Прудніках).* І нават, як, напрыклад, у прысвечаным Мёршчыне раздзеле кнігі «Гарады і вёскі Беларусі» 2019 г. выдання, – *у Мёрах*. Што прыкладна тое самае, як прыпісаць купалаўскую сядзібу ў Ляўках Оршы, а Германавіцкі музей мастацтва і этнаграфіі імя Язэпа Драздовіча – Шаркаўшчыне.

На згаданай польскай мапе 1932 г. гэтае месца, як і двор (маёнтак), што знаходзіўся вышэй супраць цячэння ракі, прыкладна за кіламетр адсюль, названае *Міжрэччам*. І пададзенае курсівам (гэта значыць кваліфікаванае як гаспадарчая адзінка, прыналежная да двара Міжрэчча), з пазнакаю-скаротам аб размяшчэнні тут кардоннай фабрыкі. У спісе мясцовасцей Рэчы Паспалітай 1938 г. назва месца выглядае так: os. fabr. (osada fabryczna – фабрычная асада[6]. – *Ф. С.*) Międzyrzecze.

Такая аднайменнасць двара і аднесенай да яго фабрычнай асады спарадзіла ў тагачасных даведніках і спісах пэўную блытаніну. Так, паводле спіса ўладальнікаў маёнткаў Лявонпальскай гміны[7] 1929 г., гаспадаром двара Міжрэчча з'яўляецца Альгерд Аскерка. А ў спісе крэсавых маёнткаў на 1 верасня 1939 г. (але паводле стану на папярэдні, 1928 г.) у якасці ўладальніка гэтага ж двара фігуруе Багдан Козел-Паклеўскі (Bohdan Kozieł-Poklewski). У той час, як паводле спіса млыноў гміны 1938 г. яго цёзка па прозвішчы В. Козел-Паклеўскі (W. Kozielł-Poklewski) з'яўляецца ўладальнікам млына ў фабрычнай асадзе Міжрэчча. Ці гэта аднафамільцы, ці сваякі, ці, можа, наогул адна і тая ж асоба, толькі з апіскамі ў ініцыяле і ў першай частцы падвойнага прозвішча ў другім выпадку – сёння сказаць цяжка. Як і цяжка пагадзіцца са складальнікамі спіса ўладальнікаў земскіх маёнткаў Браслаўскага павета 1930 г. наконт таго, быццам Альгерд Аскерка – уладальнік толькі маёнтка ў Ільмовіках, а пры гэтым Міжрэчча ў пераліку двароў нават не ўзгадваецца, быццам яго наогул не існуе ў прыродзе.

З самых відавочных фактычных памылак датычна колішняй асады больш позняга часу варта адзначыць тую, што, з увагі на аддаленасць фабрычнай асады ад двара Міжрэчча, жыхары паваеннае, узніклае на месцы двара аднайменнае вёскі адносілі асаду, а затым і штучны вадаспад пры руінах колішняй фабрыкі (млына, гідраэлектрастанцыі) не да свайго паселішча, а да другой, крыху бліжэйшай да асады мясціны – Устжэжа. І называлі яго, адпаведна, або *Устжэжам*, або – часцей за ўсё – проста *Фабрыкай* (мясц. – *Фабаркай*).

Устжэжа і яго ваколіцы

Камонім *Устжэжа* на мапе 1932 г., у адраснай кнізе Польшчы 1929 г., у пераліку земскіх маёнткаў Браслаўскага павета 1930 г., у іншых крыніцах падаецца на польскай мове па-рознаму: *Ustrzesz*, *Ustrzeż*, *Ustrzerz* (тут і далей падкрэсліванні аўтара. – *Ф. С.*). Назва, відавочна, утвораная ад польскага слова ustrzec *(зберагчы, абараніць, уварта ваць)* і звязаная з наяўнасцю паблізу маёнтка памежнай заставы (на мапе 1932 г. па-польску са скаротам – strażn.), што знаходзілася за паўвярсты ад фабрыкі ў кірунку в. Вяты, насу-

[6] Сядзіба, пасяленне.

[7] Польск. gmina – найменшая адміністрацыйная адзінка ў Польшчы, бел. – воласць.

праць в. Прудніkі. Таму і пададзены складальнікамі кнігі «Памяць. Мёрскі раён» пераклад яго назвы паводле працы О. Гедэмана «Гісторыя павета Браслаўскага» як *Устраж*, хаця з пункту гледжання практыкі падачы тапонімаў іншамоўнага паходжання і некарэктны, аднак жа зместава ўяўляецца дакладным. Гэтаксама, як і пераклад назвы на рускую мову ў спісе населеных пунктаў Мёрскага раёна «Геаграфічнага ўказальніка да пагаспадарчых кніг» 2013 г. выдання, – Устреже (Устеже).

Што да варыянтаў напісання камоніма ў сучасных выданнях без перакладу (*Устжэша, Устшэжа, Утжэша*), то гэта, з улікам згаданае адсутнасці адзінства ў напісанні назвы ў польскіх крыніцах і спецыфікі перадачы на пісьме некаторых спалучэнняў зычных гукаў у мове нашых заходніх суседзяў, быццам бы зразумела. З гледзішча ж патрэбы ўніфікацыі гучання і напісання назваў, канечне, непажадана. *Устжэжа* – так падаецца найменне мясціны ў большасці вартых даверу крыніц, і такой яна павінна заставацца ў спадчыну нашчадкам.

Як ужо адзначалася, жыхары прылеглых да колішняе фабрычнае асады вёсак здаўна называлі яе проста Фабрыкай (Фабаркай). Пасля спынення працы электрастанцыі гэтая назва замацавалася за месцам знаходжання вадаспада. Гісторыя ж самой мясціны збольшага вядомая, хаця і ўдакладненя, зразумела, патрабуе. Ад XIX ст. тут дзейнічала фабрыка па вытворчасці кардону [3, с. 487]. З ваколіц в. Рачнёва, Павяцце і іншых населеных пунктаў сюды па Вяце сплаўляліся (дастатковы для сплаву ўзровень вады ў рацэ забяспечваўся дзякуючы запрудам пры млынах) асінавыя бярвенні даўжынёю да 2–3 м. Тут яны пілаваліся, пілаванае драбілася на шчэпкі, крышылася, малолася, молатае прасавалася ў пласты, якія затым сушыліся (сушарняў было дзве: адна ўнізе, на доле, другая – вышэй на ўзгорку, абедзве былі пашкоджаныя ў 1939 г. падчас моцнага дваццаціхвіліннага градабою) і, даведзеныя да належнае кандыцыі, адвозіліся ў Друю для далейшай адпраўкі ў Вільню.

Затым фабрыка была перароблена на вадзяны млын[8]. Гаспадарамі яго, паводле І.І. Гашкевіча, з'яўляліся ўладальнікі Міжрэчча Мірскія, а ў канцы 1930-х гг., калі даваць веры растыражаваным сродкамі масавай інфармацыі звесткам паводле расповедаў некаторых тутэйшых жыхароў, – селянін па прозвішчы Казлоўскі. Ці сапраўды гэта быў Казлоўскі, а не згаданы вышэй В. Козел-Паклеўскі, якому млын належаў паводле спіса 1938 г. і падвойнае прозвішча якога дасціпныя тубыльцы цалкам маглі перарабіць на аднакарэннае, больш простае ў вымаўленні, – сёння спраўдзіць складана. Таму застаецца толькі спадзявацца, што сярод краязнаўцаў Мёрскага раёна маладзейшага веку знойдзецца з часам хтосьці, каму будзе цікава зрабіць гэта на карысць аднаўлення справядлівасці мясцовага, так бы мовіць, маштабу.

[8] Там жа.

У 1995 г. в. Сташулі, радзіму сваіх прашчураў, наведаў нехта К. Казлоўскі – унук колішняга ўладальніка сташулёўскага млына А. Судніцкага[9]. Але ці мелі продкі гэтага чалавека дачыненне да міжрэчанскага млына, уласнікам якога калісьці быццам бы з'яўляўся яго цёзка па прозвішчы (а ці, можа, сваяк?), – невядома. Затое вядома, што ў першай палове 1930-х гг. пэўны час працаю млына кіраваў выпускнік Друйскай гімназіі імя С. Баторыя Антон (Антоні) Пупін, пазней – настаўнік Міжрэчанскай пачатковай школы (памёр у 1982 г., пахаваны на могілках в. Бабарыкі).

Да слова, заробак кожнага з работнікаў млына складаў каля 30–40 польскіх злотых, на якія ў той час можна было купіць каля 20 пудоў хлеба. Без працы ж прадпрыемства не прастойвала, бо вальцаваць (плюшчыць) і малоць зерне ды часаць воўну прывозілі сюды нават з Латвіі. Пазней, калі млыны на р. Вяце перасталі дзейнічаць, наадварот, мясцовае насельніцтва пачало вазіць малоць збожжа і даводзіць да ладу воўну ў Латвію[10].

Рэшткі будынка фабрыкі (млына, электрастанцыі). Здымак Д. Росала. 2021 г.

Лічбы на мапе 1932 г. даводзяць, што ў фабрычнай асадзе Міжрэчча былі 4 хаты. А паводле выдання «Пералік мясцовасцей Польскай Рэчы Паспалітай» 1938 г., тут (толькі ўжо не пры кардоннай фабрыцы, а пры млыне) налічвалася 6 хат і 37 жыхароў. Як і ўсюды па-над Вятаю, хаты пасялення месціліся ўздоўж правага берага ракі.

[9] Гл.: Leonpol – Brasławszczyzna (obecnie gmina Użmiony...) leonpol1.wordpress.com.

[10] Звесткі паводле расповедаў жыхароў в. Міжрэчча Антона Пупіна (запіс прыкл. 1980 г.) і Яські Голуба (запіс 2007 г.).

Двор Устжэжа на мапе 1932 г. пазначаецца толькі як маёнтак, без згадкі пра фабрычную асаду. Гэта значыць, да Устжэжа апошнюю прылічаць, як гэта заўсёды рабілі жыхары паваеннае в. Міжрэчча, і, адпаведна, Устжэжам называць – няправільна.

У раздзеле «Пералік земскіх уладальнікаў у гміне Лявонпаль» з адраснай кнігі Польшчы 1929 г. уладальнікам маёнтка Устжэжа з надзелам 410 га чамусьці названы памерлы яшчэ ў 1892 г. Віктар Святаполк Мірскі, які годам раней, у пераліку 1928 г. фігуруе ў якасці гаспадара фальварка ў суседніх Чамярах. У спісе ж крэсавых маёнткаў на 1 верасня 1939 г. гаспадыня Устжэжа – Ядвіга Ліхтаровіч. Што да Мірскага, дык, магчыма, складальнікі карысталіся старымі звесткамі. Але гэта, з увагі на грунтоўнасць апісанняў і ахопу гэтымі апісаннямі нашых тагачасных паселішчаў польскімі навукоўцамі ды статыстыкамі і, на жаль, адсутнасць такога ахопу з боку пазнейшых айчынных, беларускіх спецыялістаў, агрэх не такі ўжо недаравальны.

З прыходам саветаў ва Устжэжы быў арганізаваны адзін з першых у Мёрскім раёне калгасаў. Улетку 1940 г., падчас падрыхтоўкі саветаў да акупацыі Латвіі (гэтую падзею, толькі ў дачыненні да іншае мясцовасці, згадвае ў сваіх успамінах «Пад знакам Пагоні» ўраджэнец Прывяцця Язэп Малецкі[11]) ва Устжэжы часова асела частка адселенага з меркаванняў бяспекі насельніцтва з прымежнае Вяты. Каля дзясятка сем'яў пасяліліся тады ў пакінутым гаспадарамі маёнтку (пакоях) і жылі там да прыходу немцаў і затым пэўны час і пры немцах. Апроч прасторнае аднапавярховае драўлянае панскае сядзібы, ва Устжэжы меліся на той час яшчэ дзве хаты для работнікаў (афіцыны[12]).[13]

Вадаспад – Міжрэчанскі!

Заключная фаза выкарыстання чалавекам патэнцыялу воднае стыхіі р. Вяты ў фабрычнай асадзе Міжрэчча – гідраэлектрастанцыя. Афіцыйна называлася яна Міжрэчанскай і, напрыклад, у 1948 г. выпрацавала, сумесна з Мёрскай станцыяй, 45 300 квт/гадзін электраэнергіі. У 1960-х гг. прадпрыемства было закрыта. Апошнім, хто заставаўся пры будынку былой электрастанцыі пасля яе спынення, быў Янка Альхімовіч, які стала жыў непадалёк на хутары на другім баку ракі, у кірунку в. Суромшчыны. Ён жа распараджаўся і хатаю, што стаяла амаль усутыч з будынкам і ў часы функцыянавання фабрыкі, млына і электрастанцыі служыла, магчыма, жытлом для адміністрацыі ды канцараю і прыстанкам для памольшчыкаў[14]. Паводле прыпаміну ўраджэнкі гэтых мясцін Юлі Блажэвіч, бацькоў-

[11] Грамадскі дзеяч, лекар, нарадзіўся ў в. Якужы.
[12] Oficyna (польск.) – флігель.
[13] Звесткі паводле расповеду ўраджэнкі в. Вяты Альбіны Анашкі (запіс 2021 г.).
[14] Тых, што прывезлі збожжа для памолу.

скі хутар якой знаходзіўся на тым жа баку ракі, што і суромскі хутар Янкі Альхімовіча, хата пры фабрыцы на момант гаспадарання ў ёй Альхімовіча належала аднаму са сваякоў яго жонкі. Нізіна (дол) з тылу хаты аж да 1980-х гг. апрацоўвалася, выкарыстоўвалася ў якасці гарода ці сенажаці.

На гэтым жа баку ракі, што і гідраэлектрастанцыя, толькі вышэй, крыху воддаль ад схілу гары, месцілася хата апошніх жыхароў былое фабрычнае асады Міжрэчча Альжбеты (памерла ў 1970 г.[15]) і Станіслава (Стася, памёр у 1985 г.) Анашкаў. Яна стаяла справа на ўзгорку пры пад'ездзе да фабрыкі з боку в. Александрыны і хутара Навінкі[16] і была аж да зносу на мяжы 1980-х – 1990-х гг. адзіным напамінам пра тое, што тут, пры мяжы дзвюх гаспадарак (калгасаў «Светлы шлях» і «Гігант»), калісьці жылі і працавалі людзі. Апошнім бліжэйшым да асады жытлом (месцілася метраў за 350–400 ад яе, у кірунку в. Чамяры) доўгі час заставалася хата Чэслава і Тамары Анашкаў. Іх хутар, які лічыўся адным з самых заможных у наваколлі, адносіўся да в. Вяты і знік у пачатку XXI ст.

Міжрэчанскі вадаспад. Здымак аўтара. 2005 г.

[15] Згодна з запісам у пасведчанні аб смерці, памерла ў Вяце, хаця сканала ў той самай хаце ў асадзе Міжрэчча, у якой пражыла ўсё жыццё. Казус здарыўся ў выніку перапаразмеркавання земляў паміж калгасамі.

[16] Хутар справа прыкладна на палове шляху ад фабрыкі да в. Александрыны, насупраць в. Міжрэчча.

У беларускамоўнай версіі апісання в. Вяты ў Вікіпедыі сцвярджаецца, што ў міжваенны перыяд тут дзейнічалі школа, карчма і кардонная фабрыка. Што да карчмы – сапраўды, такая гандлёва-піцейная кропка, і нават (у розныя часы) не адна, у вёсцы мелася, пра што ўзгадваецца ў выданні І.І. Гашкевіча. Мелася таксама і школа, але яна была ў канцы 1930-х гг. перанесеная ў в. Чамяры, дзе праіснавала каля 30 гадоў. А вось прылічаць да Вяты і фабрыку (млын, электрастанцыю) не след. Тым больш што і польскія даследчыкі, і складальнікі мапы 1932 г., як і кіраўніцтва ды прэса Мёрскага раёна паваеннага часу, называючы тутэйшую электрастанцыю не іначай як *Міжрэчанскай*, тым самым адназначна адносяць яе да Міжрэчча. Неабвержнае сведчанне апошняга – і асабістыя дакументы Станіслава і Альжбеты Анашкаў і іх дзяцей, паводле якіх месцам іх жыхарства (а дзяцей – і нараджэння) з'яўляецца менавіта Міжрэчча.

Дык і атрымліваецца, што, нягледзячы на звычку насельнікаў паваеннае в. Міжрэчча называць гэту мясціну *Устжэжам*, або, без спасылкі на прыналежнасць да канкрэтнага абназоўленага месца, проста *Фабрыкай*, праўдзівая назва яго ўсё-такі – *Міжрэчча*. А сённяшняга вадаспада, адпаведна, – *Міжрэчанскі*. Або, калі прывязваць назву мясціны да назвы ракі: *вадаспад на Вяце*. (Трэба дадаць, між іншым, што ні ў атласе БССР 1958 г. выдання, ні на генеральнай мапе «Беларускія землі ў пачатку XX ст.» Устжэжу і Міжрэччу, у адрозненне ад старых польскіх мапаў, месца не знайшлося.)


ЧЛЕНСКАЯ КООПЕРАТИВНАЯ
КНИЖКА № 221
Фамилия Анашко
Имя Альбета
Отчество Петровна
Член кооперации с Александрии
Местожительство Шешуй
Книжка выдана 12. X. 48

Фрагмент членскай кааператыўнай кніжкі жыхаркі Міжрэчча (у дакуменце па-руску з памылкаю: Междурече) Александрынскага сельсавета Альжбеты Анашкі, хата якой месцілася прыкладна за паўтары сотні метраў ад цяперашняга вадаспада. 1948 г.

Сённяшнія руіны фабрыкі (млына, гідраэлектрастанцыі) – толькі аддалены напамін пра тое, што тут было якіх-небудзь 50 гадоў таму: дыхтоўны, крыху змрачнаваты прадаўгаваты мураваны будынак з трывалейшай чырвонай цэглы; хата пры ім; велічны вадаспад наўзбоч драўлянага моста; чыстая вада, у якой вольна пачуваліся ракі ды шчупакі, сноўдалі ў пошуку спажывы самавітыя акуні, курмялі, язі, плоткі, якіх можна было лавіць вудаю нават без паплаўка, на вока, стоячы на выступе мура, часам трапляліся ў браднік або крыгу вугры (мясц. – угорычы); абрысы гліністае Чырвонае гары метраў за 120 ад моста па цячэнні ракі; усюды панадрэччу – сцежкі, пратаптаныя сярод хмызу нагамі руплівых, знэнджаных няскончнаю калгаснаю працаю міжрэчанцаў і іх статку. Увесну – квецень чаромхі, улетку ўранні – туманы, што гайдаюцца па-над вадою і берагам пухнатаю зыбкаю коўдрай – такой застанецца гэтая мясціна ў памяці тых, каму пашчасціла быць сведкам яе хараства ў пару чароўнае некранутасці.

Капліца ў Вяце. Здымак Д. Росала. 2021 г.

Капліца ці касцёл?

З тапонімаў сучаснай в. Вяты найбольшую цікавасць уяўляе эклезіонім (назва, тытул) размешчанай на прыгорку наўзбоч вясковага могільніка культавай драўлянай каталіцкай пабудовы ў гонар святога Яна Хрысціцеля. Святыня з'явілася тут на пачатку 1930-х гг., фундатарам яе пабудовы быў вядомы ксёндз Юзаф Бародзіч [5], а непасрэдна працамі па ўзвядзенні зай-

маўся лявонпальскі святар Ян Завістоўскі. Мясцовыя жыхары заўсёды называлі яе і працягваюць называць выключна *капліцаю*, у той час як у таблоідах яна рэпрэзентуецца як *касцёл*. Прынамсі ў артыкуле сяржанта мясцовай стражніцы Корпуса аховы памежжа (месцілася ў в. Чурылава Далёкае) Юзафа Трыянкоўскага пра пасвячэнне ў святыні 24 чэрвеня 1937 г. звона імя маршалка Юзафа Пілсудскага, змешчаным у 5-м нумары выдання «Wiarus» за той жа год, яна называецца *касцёлам*. З увагі на тое, што адна з адметнасцей капліцы – адсутнасць алтара, гэта правільна, бо ў вяцкім храме маецца не толькі алтар, але і амбон – узвышэнне (катэдра) для прамаўлення казанняў.

Капліца ў Вяце. Злева: укрыжаванні Езуса Хрыста пры ўваходзе. Справа: фрагмент алтарнай часткі з абразом Маці Божай Вастрабрамскай, прэзентаваны святыні ўладальніцай устжэжаўскага маёнтка падчас асвячэння звона імя Ю. Пілсудскага 24 чэрвеня 1937 г. Здымкі Д. Росала. 2021 г.

У польскамоўным календары Лявонпальскай парафіі, да якой належала Вята пасля таго, як, паводле рашэння духоўнага суда, – дваццаццю шасцю галасамі супраць трынаццаці – адышла на пачатку тых жа 1930-х гг. ад парафіі Друйскай[17] (справа ўскосна датычыла прабеларускай дзейнасці друйскіх

[17] Звесткі паводле аўдыязапісу размовы аўтара з апошнімі жыхарамі в. Вяты ўлетку 2002 г. (знаходзіцца ў фондах Мёрскага краязнаўчага музея).

святароў, апісанай ва ўспамінах а. А. Надсана), святыня ў Вяце называецца *капліцай*. Што, з улікам наяўнасці ў парафіі галоўнай (цэнтральнай) святыні і таго, што службы ладзіліся ў будынку не рэгулярна, цалкам зразумела. Гэтаксама капліцаю называецца яна і ў пераліку каталіцкіх святынь Мёрскага дэканата 1928 г. У той час, як бажніцы ў Паташні (у «Вялікім гістарычным атласе Беларусі» 2016 г. па-руску – *Поташная*) і Узмёнах фігуруюць у тым жа спісе, у адрозненне ад таго, як падпісаныя яны на здымку ў парафіяльным календары, у статусе філіяльных касцёлаў.



Злева: вокладка календара Лявонпальскай парафіі за 1938 г. (знойдзены на гарышчы хаты жыхароў в. Рыбакі Юльяна (Юліся) і Глены Сіўко, знаходзіцца ў фондах музея сярэдняй школы № 3 г. Мёры). Справа: змешчаныя ў выданні здымкі парафіяльных капліц у Вяце, Паташні і Узмёнах

Млыны

Як ужо згадвалася, ніжняе цячэнне Вяты даўней было багатае на млыны. На адлегласці ў 10 км іх было ажно 5: у Павяцці (паводле выдання Гашкевіча, гаспадар – Панізнік, загадчык у другой палове XX ст. – Мечыслаў Альхімовіч); Рачнёве (загадчыкі-млынары ў другой палове XX ст. – Пётр Савуць

і Мечыслаў Альхімовіч); Аблятове (закладзены ксяндзом Ю. Бародзічам, у слоўніку мясцовасцей Польскага каралеўства фігуруе ў статусе папяровае фабрыкі, па стане на 1905 г. – вадзяны млын, у другой палове XIX ст. гаспадар – Марціноўскі, у першай палове XX ст. – Зыгмунт Абрампальскі (у адраснай кнізе Польшчы 1928 г., відаць, памылкова – Обенпальскі. – *Ф. С.*), млынары паваеннага часу – Клеафас Альхімовіч, Пётр Цярэшка); Сташулях (гаспадары: па стане на 1905 г. – Вялічка, у адраснай кнізе Польшчы 1928 г. – А. Судніцкі) і Міжрэччы. (Гаспадары млыноў, як і млынары, зразумела, маглі мяняцца.) Апроч названых, паводле польскага адраснага даведніка 1931 г., яшчэ два млыны дзейнічалі ў цэнтры гміны – не так далёкім Лявонпалі (мясц. – Люмполе, у А. Сапунова – Леонъ-Поль) і адзін (у перыяд да першага падзелу Польшчы) – на хутары Юзэфова (2 хаты, 15 жыхароў) наўзбоч балотца на ўскраіне Сташулёў. А таксама па адным у Багданаве і Ільмовіках (абодва на р. Мёрыцы). Усе яны не толькі спраўна выконвалі сваю непасрэдную функцыю – малоць зерне, з іх дапамогаю рэгуляваўся ўзровень вады ў рацэ ў адпаведнасці з гаспадарчымі патрэбамі, напрыклад, з тым жа сплавам асінніку на фабрыку ў Міжрэчча, пра што згадваюць у кароткай характарыстыцы р. Вяты А. Сапуноў і кн. У. Друцкі-Любецкі.

Адметнасцю некаторых найбольш буйных з названых млыноў з'яўлялася іх шматпрофільнасць, якая дасягалася дзякуючы наяўнасці некалькіх колаў, што прыводзілі ў рух не толькі жорны, але і станкі для часання воўны, пілы. Так, млыны ў Міжрэччы і Аблятове займаліся і часаннем воўны, на млынах у Сташулях і Ільмовіках была наладжана сукнавальная (валюшная) вытворчасць. Таму не дзіўна, што іх паслугі ў насельніцтва карысталіся вялікім попытам.

З поступам часу запатрабаванасць млыноў знізілася, на многіх з іх на змену вадзяному колу прыйшоў хаця і больш выдаткоўны, але ж і больш мабільны рухавік – матор трактара. А неўзабаве і наогул дзейных млыноў на Вяце не засталося. Сёння пабачыць наяве, а не толькі даведацца з расповедаў старэйшых тубыльцаў, якіх ужо на пальцах адной рукі пералічыш, ці прыблізных (часта далекаватых ад праўды) апісанняў у таблоідах, як некаторыя з тых старых млыноў маглі выглядаць, можна на прыкладзе аднаго – у Аблятове. Каркас гэтага ўнушальнага будынка, што месціцца на беразе Вяты (а не Волты, як гэта чамусьці пададзена ў згаданым «Слоўніку мясцовасцей Польскага каралеўства», а затым – няйначай па інерцыі – у «Кнізе назваў населеных пунктаў Беларусі. Віцебская вобласць» 2009 г., бо Волта цячэ паралельна Вяце за добры дзясятак кіламетраў ад яе), наўзбоч колішняга маёнтка (фальварка) Марціноўскіх (пазней Абрампальскіх) за паўкіламетра ад в. Якужы на фоне тутэйшых несамавітых хат па-ранейшаму ўражвае і кожны раз нагадвае пра значнасць нашай страчанай матэрыяльнай спадчыны, якую мы не здолелі захаваць і з-за ўласнае абыякавасці, і з-за трагічнага збегу абставін. Такіх, напрыклад, як паводка на Заходняй Дзвіне ўвесну

1931 г., калі яе воды пачалі падымацца па прытоках, утвараючы лядовыя заторы, што пашкодзілі, а то і наогул знеслі некалькі млыноў. Большасць з іх былі драўляныя, а значыць – вельмі ўразлівыя да падобных стыхійных катаклізмаў.

Каркас былога млына ў Аблятове. Здымак А. Немянёнак. 2021 г.

Халуй

Мясціна-трохкутнік на згібе ракі пры былым сядзібным доме ў в. Міжрэчча. Гэтае месца, у якім пасля веснавой паводкі на р. Вяце застаецца шмат рознага друзу, калісьці з'яўлялася часткаю парка, а пясчаны ўскраек яго пры самай вадзе служыў гаспадарам двара купальняю.

Лука

Мыс пры дугападобным павароце р. Вяты прыкладна на палове адлегласці ад в. Міжрэчча да вадаспада. У паваенным часе выкарыстоўваўся ў якасці пастаўніка для кароў на час дзённага даення. Мікратапонім (як і папярэдні) утвораны шляхам пераходу агульнага імя ў асабовае.

Лямус

Пабудова для захоўвання харчу, адзення, зерня, якая ўлетку магла выкарыстоўвацца і ў якасці жытла, за пару дзясяткаў метраў ад міжрэчанскай сядзібы. Яе ніжняя, выштукаваная з каменя паўпадземная частка ў паляваенны час служыла калгасу ў якасці ямы для захоўвання сіласу.

Белыя плямы

Аналізуючы тапонімы мясцовасці, нельга не звярнуць увагу і на некаторыя іншыя, апроч ужо згаданых, недакладнасці ў іх апісанні ў дасавецкай

(той жа польскай) тапанімічнай навуцы. Напрыклад, адносна месцазнаходжання воз. *Мядзведзь* (*Mi̲ądźwiedź, Mi̲edźwiedź*). Паводле «Геаграфічнага слоўніка Польскага каралеўства», па стане на 1865 г. адразу аж дзве вёскі Лявонпальскае гміны месціліся пры ім – Сташулі і Суромшчына. (Цікава, што ў «Перапісе мясцовасцей Віленскага ваяводства» 1938 г. праз зноску пададзена і старадаўняя назва апошняй – S̲oromszczyzna. На генеральнай жа мапе «Беларускія землі ў пачатку XX ст.» гэты камонім наогул падаецца па-руску толькі ў адным – старадаўнім – варыянце: C̲ромщина.)

Адлегласць паміж в. Сташулі і Суромшчына, аднак, – не менш за два кіламетры, так што на беразе аднаго і таго ж возера яны месціцца, зразумела, не могуць. Да таго ж, Сташулі месцяцца па-над р. Вятаю, а возера там наогул няма. Праўда, ёсць тое самае згаданае балотца, што, можа, і магло калісьці з'явіцца на месцы менавіта возера, але ж ці так яно было – невядома. Што да Суромшчыны, то сумнеў развейвае ўсё тое ж выданне 1905 г. І.І. Гашкевіча, якое ва ўнісон з традыцыяй тубыльцаў называе возера гэтаксама, як гучыць сёння назва вёскі: *Суромшчына*. Так што лімнонім *Мядзведзь*, калі ён сапраўды існаваў, на сённяшні дзень відавочна можна залічыць да страчаных.

Белых плям у падачы тапонімаў ніжняга цячэння р. Вяты польскімі тапанімікамі, складальнікамі і выдаўцамі атласаў, слоўнікаў ды спісаў дастаткова. Аднак, зноў заўважым, каштоўнасці іх прац гэта не перакрэслівае. Як і не паніжае заслуг перад нашчадкамі такога адданага свайму краю даследчыка, якім быў А. Сапуноў. Бо менавіта дзякуючы высілкам гэтых людзей мы можам сёння хаця б збольшага ўзнавіць нашы старыя назвы і тыпы паселішчаў. Напрыклад, такога невялічкага, на шэсць хат (паводле мапы 1932 г.), *засценка*[18], як Каснарэўшчына. Праўдзівая назва якога, паводле «Спіса мясцовасцей Рэчы Паспалітай» 1938 г., – ці то Красна(о)ўшчына, ці то Краснарэўшчына, а магчыма, як пазначана з пытальнікам у дадатку да назвы ў «Геаграфічным слоўніку Польскага каралеўства», – Касп̲арэўшчына. Паводле выдання І.І. Гашкевіча, гэта – Крсноревщина (з пропускам літары «а») ці наогул – Цегельня.

Апошняе дзіўна, бо гэткі камонім у слоўніках больш нідзе датычна Каснарэўшчыны не сустракаецца. Затое на мапе 1932 г. ён сустракаецца (з пазнакаю, што гэта леснічоўка) аж двойчы за добры дзясятак кіламетраў ад засценка, побач з Лявонпалем. Што, з увагі на наяўнасць у мястэчку па стане на 1886 г. цагельні, не дзіўна. Гэтаксама двойчы, пад назвамі Цагельня Новая (Cegielnia Nowa) і Цагельня Старая (Cegielnia Stara) фігуруе ён з тою ж пазнакаю і ў спісе 1938 г.

[18] Паселішча, што засталося па-за межамі зямель феадальнага маёнтка, арандаваных шляхтаю ці заможнымі сялянамі. Паводле польска-рускага слоўніка, паселішча дробнапамеснай (дробнамаёнткавай) шляхты.

Рачнёва

Апроч функцыі рэпрэзентатыўнай, тапонім (айконім) выконвае функцыю дакументальнага замацавання (праз запіс у метрыцы, пашпарце, іншых дакументах) асабістых даных чалавека. Таму, зразумела, дакладнасць яго – справа важная. На жаль, і ў буйных гарадах скажэнне асціонімаў ды ўрбаноімаў не рэдкасць, пра камонімы ж такіх закінутых мясцін, як ніжняе цячэнне р. Вяты, і казаць не выпадае. Яскравы прыклад – в. Рачнёва, што знаходзіцца прыкладна метраў за 700 ад аблятоўскага млына. Дакладней – дзве аднайменныя вёскі: Рачнёва-1 і Рачнёва-2. Раздзеленыя толькі ракою, яны ўспрымаюцца як адзінае цэлае, а вось паводле дакументаў – гэта зусім не адно і тое. Аднойчы нейкаму неахайнаму службоўцу собіла назвы памяняць месцамі, і цяпер жыхарам абодвух Рачнёваў пры афармленні актаў куплі-продажу ці наследавання, ці з нейкай іншай нагоды даводзіцца з-за неадпаведнасці найменняў вельмі несалодка.

Злева: чалавек у муцэ – млынар Мечыслаў Альхімовіч ля дзвярэй млына. Загадваў млынамі ў Рачнёве і Павяцці ад канца 1950-х – да пачатку 1970-х гг. Сямейную справу – млынарства – пераняў ад бацькі Клеафаса, які млынарыў у Аблятове. Здымак другой паловы 1960-х гг.
Справа: рэшткі ніжняй, каменнай часткі млына ў Рачнёве. Здымак Д. Росала. 2021 г.

Чурылава

Хаця в. Мёршчыны з гэткаю часткай у назве месцяцца воддаль ад р. Вяты, гісторыя іх назваў так заблытана, што патрабуе хаця б павярхоўнага тлумачэння. У працы А. Сапунова і кн. У. Друцкага-Любецкага пры ўпамінанні месца ўпадзення р. Волты ў Заходнюю Дзвіну згадваецца в. Чурылава Бліжняе. Нязначна адрозным камонімам – *Чурылава Блізкае* – пазначана яна і на мапе 1932 г. На той жа мапе за некалькі соцень метраў ад яе знаходзіцца в. Чурылава Далёкае (у спісе І.І. Гашкевіча – Чурылава Дальняе). Абедзве назвы прысутнічаюць і ў «Спісе мясцовасцей Рэчы Паспалітай» 1938 г. У 1975 г. вёскі былі аб'яднаны ў адну пад назваю Чурылава Дальняе (Ніжняе). Назва ж Чурылава Бліжняе, аднак таксама не знікла, бо дзеля зручнасці перайшла да Чурылава, што знаходзіцца на беразе аднайменнага возера больш як за 10 км ад прыдзвінскіх «цёзак» і адносілася калісьці, у адрозненне ад іх, не да Лявонпальскай, а да Мёрскай воласці. У кнізе «Памяць. Мёрскі раён» яно называецца па-ранейшаму – Чурылавам, так, як называецца і вёска на супрацьлеглым ад Чурылава Бліжняга баку Заходняе Дзвіны, у Бігосаўскім сельсавеце Верхнядзвінскага (раней Дрысенскага) раёна. А вось, напрыклад, у раскладзе руху транспарту Мёрскай аўтастанцыі яно падаецца як Чурылава Бліжняе. Што ж, тапаніміка таксама не стаіць на месцы і мусіць паспяваць за пераменамі, якія ўносіць час у наша жыццё.

Сельсавет Аляксандраўскі ці ўсё-такі Александрынскі?

Вёска Александрына (мясц. – Ле(і)ксандрына), якая знаходзіцца прыкладна за 2,5 км ад р. Вяты, у паваенным часе з'яўлялася цэнтрам сельсавета і ў сельсавецкіх дакументах толькі так, без варыянтаў – Александрынаю і называлася. У «Геаграфічным слоўніку мясцовасцей польскай Рэчы Паспалітай» яна мае назву Aleksandryno. Гэтаксама – Александрино – называецца яна і паводле выдання Гашкевіча. На мапе 1932 г. і ў «Спісе мясцовасцей Рэчы Паспалітай» 1938 г. гучанне камоніма, хаця і лацінаю, але выключна бела-рускае – *Aleksandryna*. Гэткі ж камонім (толькі кірыліцай) фігуруе ўсюды ў кнізе «Памяць. Мёрскі раён» і на сучасных дарожных указальніках пры ўездзе ў населены пункт і пры выездзе з яго. Александрина – так пазначана вёска на Генеральнай мапе «Беларускія землі ў пачатку 20 ст.».

Адзінадушнасць у падыходзе да спаконвечнай назвы вёскі парушаюць складальнікі Атласа БССР 1958 г., якія, пераблытаўшы яе, відаць, з іншым паселішчам, што месціцца кіламетраў за дванаццаць адсюль і за сем ад Мёраў, змяшчаюць на мапе пад назваю Александрова. І невыпадкова, бо, паводле спіса населеных пунктаў Мёрскага раёна «Геаграфічнага ўказальніка да пагаспадарчых кніг», ад самага пачатку ўтварэння ў раёне ў кастрычніку 1940 г. дзевятнаццаці органаў мясцовага кіравання сельсавета з назваю Александрынскі, аказваецца, не было. Затое быў Александроўскі (у спісе па-руску Александровский. – *Ф. С.*), які быццам бы існаваў аж да

1960 г. Як такое магло стацца, калі ў завераных пячаткаю сельсавета дакументах мясцовага насельніцтва ўсюды разборліва падаецца назва Александрынскі, а сама в. Александрова, паводле таго ж спіса, яшчэ ў 1949 г. адышла да Павяцкага сельсавета, незразумела.

Аблудную практыку перайначвання, хай сабе і ненаўмыснага, падхопліваюць складальнікі выдання «Гарады і вёскі Беларусі», якія ў пераліку ўтвораных у 1940 г. сельсаветаў Мёрскага раёна надаюць аднаму з іх высмактаную з пальца назву *Александроўскі*, а сапраўдную – *Александрынскі* –пішуць чамусьці ў дужках. Ім наследуюць аматары вольнага стаўлення да фактаў у Вікіпедыі і на іншых інтэрнэт-пляцоўках, раз-пораз тыражуючы відавочную лухту: *Аляксандраўскі* сельсавет. Што нават у дачыненні да Александрова з націскам на перадапошнім складзе было б няправільна, не кажучы ўжо пра Александрыну.

Уверсе: фрагмент пасведчання аб шлюбе бацькоў аўтара. 1951 г. Месца рэгістрацыі – Александрынскі сельсавет Мёрскага раёна Полацкай вобласці. Унізе: фрагмент цяперашняга дарожнага ўказальніка пры ўездзе ў вёску Александрыну. Здымак Д. Росала. 2021 г.

Сённяшні статус мноства паселішчаў ніжняга цячэння абмялелай р. Вяты, як і яе бліжэйшай суседкі Мёрыцы і больш дальняй Волты, – зніклыя. Аблятова, Аніські, Грузды, Дарожкі, Каснарэўшчына, Міжрэчча, Навінкі, Надмірэчча, Надрэчча, Пагулянка, Паршэлева, Рыбакі, Сташулі, Тараракі, Устжэжа, Чарнілова, Юзэфова, Якужы – усім ім было наканавана лёсам адысці ў нябыт, пакінуўшы пасля сябе сведчанні бытавання і мыслення насельнікаў – гістарычныя назвы (тапонімы) ды фотаздымкі і запісы ў дакументах (калі такія захаваліся). На чарзе Чамяры, і Вята, і Лупаўшчына, і Прудзнікі, і, напэўна, некаторыя іншыя. Што казаць пра паселішчы малыя, калі нават такая калісьці шматлюдная вёска, як Бабарыкі, некалі званая суседзямі за

адносную заможнасць насельніцтва *Амерыкай*, і тая ўжо ледзь-ледзь ліпіць. Таму гэтак важна сёння захаваць усё, што можа стацца ў будучыні матэрыялам для вывучэння акалічнасцей існавання так званых неперспектыўных населеных пунктаў рэгіёна, крутых паваротаў іх гісторыі. Канечне ж, захаванне праўдзівага, на грунце ўдумлівага аналізу тых крыніц, што яшчэ не канулі ў Лету пад ціскам капрызлівых павеваў часу.

ЛІТАРАТУРА

1. **Атлас** БССР : Витебская область / редкол.: Малинин С. Н. [и др.]. – Минск ; Москва : Академия наук БССР ; Главное управление геодезии и картографии МВД СССР, 1958.

2. **Виленская** губерния : полный список населенных мест со статистическими данными о каждом поселении, составленный по официальным сведениям И. И. Гошкевичем. – Вильна, 1905.

3. **Гарады** і вёскі Беларусі : Віцебская вобласць. – Мінск : БелЭн, 2019. – Кн. ІІІ : Мёрскі раён. – С. 323–586.

4. **Географический** указатель к похозяйственным книгам [Электронный ресурс] / [составители: Н. А. Боровик и др. ; редкол.: О. В. Пашкевич, С. В. Рублевский]. – 2013. – Ч. 3 : Список населенных пунктов Дисненского, Миорского, Шарковщинского районов (1944–2006 гг.). – Режим доступа: https://archives.gov.by/home/arhivnyespravochniki. – Дата доступа: 18.05.2022.

5. **Ермалёнак, В.** Чароўных вандровак пярсцёнкі : краязнаўчыя маршруты па Мёрскаму раёну / Вітаўт Ермалёнак. – Мінск : Капитал Принт, 2017. – 202 с.

6. **Ермалёнак, В. А.** Юзэф Бародзіч – нястомны будаўнік святыняў / Ермалёнак В. А. // Віцебскі край. – Мінск, 2021. –Т. 6. – С. 256–266.

7. **Зборны** аркуш генеральнай карты «Беларускія землі ў пачатку ХХ ст.» // Вялікі гістарычны атлас Беларусі : [у 4 т.]. – Мінск : Белкартаграфія, 2016. – Т. 3. – С. 158–159.

8. **Малецкі, Я.** Пад знакам Пагоні / Я. Малецкі // Спадчына. – 1994. – № 2–5.

9. **Надсан, А.** Беларускае рэлігійнае і культурнае жыццё : гісторыя і асобы : выбранае / Аляксандр Надсан. – Мінск : Кнігазбор, 2014. – С. 169–472.

10. **Назвы** населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Віцеб. вобл. : нармат. давед. / У. М. Генкін, І. Л. Капылоў, В. П. Лемцюгова ; пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – С. 318–333.

11. **Памяць** : Міёрскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. М. Маняк [і інш.] ; уклад. Л. А. Матэлёнак ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1998. – 630 с.

12. **Сапунов, А.** Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / А. Сапунов и кн. В. Друцкий-Любецкий. – Витебск : Губернская Типо-Литография, 1896. – С. 16.

13. **Сапунов, А.** Река Западная Двина / А. Сапунов. – Витебск : Типо-Литография Г. А. Малкина, 1893. – С. 65, 133.

14. **Сіўко, Ф.** Капліца ў Вяце / Ф. Сіўко // Ave Maria. – 2002. – № 11 (90).

15. **Сіўко, Ф. І.** «Куба» – любоў мая … / Сіўко Ф. І. // Віцебскі край. – Мінск, 2021. – Т. 6. – С. 229–238.

16. **Ткачоў, М. А.** Замкі і людзі / М. А. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 158.

17. **Штыхаў, Г. В.** Крывічы : па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 191 с.

18. **Aftanazy, R.** Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej / Roman Aftanazy. – Wrocław, 1993. – T. 4 : Województwo Wileńskie.

19. **Baza** miejscowości kresowych. – Warszawa : Wojskowy inctytut geograficzny, 1932.

20. **Księga** adresowa Polski. – Warszawa : Towarzystwo reklamy międzynarodowej, 1928.

21. **Księga** adresowa Polski : Wykaz właścicieli ziemskich w gminie Leonpol. – Warszawa, 1929.

22. **Rokicki, J.** Majontki kresowe, stan na 1 września 1939 r. : Majątki ziemskie i nieruchomości miejskie – woj. Nowogródzkie, Lwowskie, Poleskie, Stanisławowskie, Tarnopolskie, Wileńskie i Wołyńskie / J. Rokicki.

23. **Słownik** geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. – Warszawa, 1885. – T. I–XV.

24. **Tryjankowski**, **J.** Poswięcenie dzwonu im. Marszałka Piłsudskiego ufundowanego przez podoficerów / Tryjankowski J. – Wiarus, 1937. – № 5 ; № 30.

25. **Wykaz** miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa, 1938. – T. 1 : Województwo Wileńskie.

ДАДАТКІ

Дадатак 1

Да матэрыялу А.М. Дулава

Фота 1. Сялянская сям'я на Палессі. 1930-я гг.

Фота 2. Стары і хлопчык плятуць лапці



Фота 3. Лагер у Бярозе-Картузскай

Фота 4. Лагер у Бярозе-Картузскай

Фота 5. Жыхары Заходняй Беларусі сустракаюць вызваліцеляў

Фота 6. Заходняя Беларусь, паблізу Вільні. Чырвонаармейцы раздаюць свежыя маскоўскія газеты

Фота 7. Беласточчына. Сяляне на сходзе прымаюць адзінагалоснае рашэнне аб падзеле зямлі князя Любамірскага

Фота 8. Народны сход Заходняй Беларусі ў Беластоку. 1939 г.

Фота 9. Паўнамоцная камісія Народнага Сходу Заходняй Беларусі на сустрэчы з вышэйшым кіраўніцтвам СССР. Масква. 3 лістапада 1939 г.

Да матэрыялу Т.У. Аляксеевай

Фота 1. Герой Савецкага Саюза Іван Паўлавіч Собалеў

Фота 2. Банер «Беларускі краязнаўчы алфавіт Акцябрскага сельскага савета»

Да матэрыялу Т.В. Бараненкі

Фота 1. Выхавальніцы і выкладчыкі Полацкай жаночай гімназіі (у другім радзе злева – настаўніца французскай мовы Віктарына Розіа). Копія фатаграфіі 1912 г. фатографа Бернштэйна [5]

Фота 2. Выпускніцы Полацкай жаночай гімназіі – Таццяна Іванаўна Вышынская (Азернікава) і Алена Георгіеўна Казьяніна (Александровіч). Невядомы фатограф. 1917 г. [5]

Фота. 3. Група гімназістак (першая злева – Елізавета Віктараўна Кучынская (Краўчанка)). Копія фатаграфіі невядомага фатографа пачатку XX ст. [5]

Фота. 4. Ігумення Ніна (Баянус) з вучаніцай Кацяй Лявонавай.
Фатограф Т.Л. Паноў, г. Растоў. 1916 г. [6]

Фота. 5. Манахіня Ніна з паслушніцай Фёклай Клоп. Невядомы фатограф.
Пачатак XX ст. [6]

Фота. 6. Глафіра Кузьмінічна Валуйская – сястра міласэрнасці 2-га зводнага шпіталя РТЧК.
Фатограф Бернштэйн. г. Полацк. 1914 г. [5]

Да матэрыялу К.Р. Карпекіна

Фота 1. Маёнтак Чарнаручча ў 1783 г. [11, арк. 1]

Фота 2. Сядзібны дом у маёнтку Чарнаручча. Каля 1914 г. [15, s. 286]

Фота 3. Рэшткі сядзібнага дома былога маёнтка Чарнаручча. 1950-я – 1960-я гг.
Фотаздымак з фондаў Лёзненскага ваенна-гістарычнага музея

Да матэрыялу М.А. Ляшчынскага

Фота 1

Фота 2

Фота 3

Список воспитанников горы-горецких учебных заведений, перешедших на сторону польских мятежников при нападении сими последними на город Горки и Горы-Горецкий институт 24 апреля 1863 года

А. Студенты Института			
№	Имя и фамилия	Из какой губернии родом	Какого вероисповедания
1.	Висковский Станислав	Могилевской	католического
2.	Доморацкий Войтех (убит)	Волынской	католического
3.	Запольский Людвиг	Витебской	католического
4.	Дзердзеевский Эдмунд	Ковенской	католического
5.	Шульц Владислав	Могилевской	католического
6.	Червинский Раймунд (ранен и в плену)	Витебской	католического
7.	Березинский Николай	Ковенской	православного
8.	Гацицкий Болеслав		
9.	Заблоцкий Онуфрий	Витебской	католического
10.	Козелл-Поклевский Евстафий	Виленской	католического
11.	Кржишталович Иван	Витебской	католического
12.	Кушелевский Август	Виленской	католического
13.	Лятоскович Евгений	Волынской	православного
14.	Лятоскович Осип	Волынской	православного
15.	Антонович Осип	Виленской	католического
16.	Бржезинский Мечеслав	Могилевской	католического
17.	Бродовский Иосиф	Виленской	католического
18.	Бутович Иосиф	Витебской	католического
19.	Вислоцкий Вацлав	Гродненской	католического
20.	Казак Георг	Лифляндской	лютеранского
21.	Ковзан Людвиг	Минской	католического
22.	Кудревич Петр	Ковенской	католического
23.	Манюшко Иосиф	Могилевской	католического
24.	Моргулец Стефан	Волынской	католического
25.	Нитославский Николай	Могилевской	католического
26.	Прус-Жуковский Болеслав	Могилевской	католического
27.	Рабей Владимир	Могилевской	католического
28.	Рапацкий Константин	Виленской	католического
29.	Романовский Александр	Минской	католического
30.	Ростковский Эразм	Могилевской	католического
31.	Сулимо-Самуйло Болеслав	Витебской	католического
32.	Сурин Петр	Могилевской	католического
33.	Сурин Фелициян (ранен и в плену)	Могилевской	католического
34.	Схнейдер Иван	Могилевской	католического
35.	Хрусцевич Франц	Волынской	католического
36.	Шемиот Александр	Виленской	католического
37.	Янковский Михаил	Царства Польского	католического

Б. Ученики Училища			
1.	Городко Франц	Минской	католического
2.	Подмостко Станислав		католического
3.	Зеленевский Казимир	Минской	католического
4.	Родневский Бронеслав	Виленской	католического
5.	Рутайтис Никодим		католического
6.	Струмилло Антоний	Могилевской	католического
7.	Винкевич Владислав	Виленской	католического
8.	Гладковский Александр	Гродненской	католического
9.	Парфенович Павел	Виленской	католического
В. Ученики таксаторских классов			
1.	Малиновский Осип	Минской	католического
2.	Лапша Осип	Могилевской	католического
3.	Рогинский Эдуард	Могилевской	католического
4.	Ястржембский Иван	Могилевской	православного
5.	Савицкий Владислав	Могилевской	православного
6.	Кильдыш Донат	Виленской	католического
7.	Козловский Антон	Минской	католического
8.	Тарасевич Сильвестр	Минской	католического

Дадатак 6

Да матэрыялу С.М. Мясаедавай

Фота 1. Камушар Рыгор Абрамавіч

Фота 2. Камушар (Фрадкіна) Вера Канстанцінаўна

Фота 1. Мемарыял на Брацкай магіле загінуўшых савецкіх воінаў
у аг. Заронава Віцебскага раёна

Фота 2. Пліты з імёнамі загінуўшых на тэрыторыі Віцебскага раёна лётчыкаў 3 ПА.
Мемарыял на Брацкай магіле загінуўшых савецкіх воінаў у аг. Заронава Віцебскага раёна

Дадатак 8

Да матэрыялу Г.С. Арлоўскага, А.Г. Свістуновай



Фота 1. План часткі гарадской зямлі з дачы «Юр'ева слабада», уступленай па пастанове Віцебскай Гарадской Думы на ўладкаванне Вайсковых могілак у колькасці 2009 кв. саж. і пад Лютэранскія могілкі ў колькасці 2080 кв. саж. НГАБ. – Ф. 2496. Воп. 1. Спр. 1130. Л. 25

Фота 2. Цагляная арка Старасямёнаўскіх могілак. Фота Г.С. Арлоўскага. 05.06.2020

Фота 3. Гістарычнае пахаванне з гранітным надгроб'ем і каванай агароджай на Старасямёнаўскіх могілках. Фота Г.С. Арлоўскага. 13.08.2021

Фота 4. План, які фіксаваў усходнія межы Адзінаверскіх могілак (цяпер Абрадніцкіх). ДАВВ. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 412. Л. 25

Фота 5. Пескавацінскія могілкі. дарэвалюцыйная каваная балконная агароджа, прыстасаваная пад магільную агароджу, з пераліцаваным гістарычным гранітным надгроб'ем.
Фота Г.С. Арлоўскага. 09.11.2021

Фота 6. Клеймы майстроў гістарычных надгроб'яў на Пескавацінскіх могілках

Да матэрыялу І.У. Спірына



Мал. 1. Схема крэпасці Міцькоўшчына

Мал. 2. Фрагменты пячной кафлі з раскопак крэпасці Міцькоўшчына. 2015 г.

Мал. 3. Металічныя і касцяныя вырабы з раскопак гарадзішча Горная Веравойша. 2018 г.

Да матэрыялу Н.І. Цітовай



Автобиография

Родился в августе м-це 1914 г. в дер. Ан-
ховик, Уновского с/сов., Лиозненского
района в семье крестьянина-середняка.
До 1930 г. учился в Лиозненской семилет
и был на содержании родителей. С 1930 г.
по 1932 г. работал на Лиозненском льно-
воде в качестве чернорабочего и одновре-
менно оканчивал Лиозненскую Школу Кочхо
кой Молодежи. В комсомол вступил
в Октябре м-це 1931 г.
С 1932 г. по 1933 г. работал в г. Витебске
на швейной ф-ке "Профинтерн" в качестве
кочегара. В 1933 г. поступил в Витебский
рабфак им-та Народного хозяйства и
окончил его в 1934 г. После окончания
рабфака поступил в Минский институт
Народного Хозяйства на планово-эко-
номический факультет и окончил его
в июле м-це 1938 г. и был послан Гос-
планом БССР на работу в г. Гомель
на станкостроительный завод

Фота 1. Копія аўтабіяграфіі А.Я. Белахвосцікава з фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці

